Дзмітрый Люцік

# НЁМАНСКІ ФРОНТ

## 15-25 ліпеня 1944г.

**БАІ ЗА ГРОДНА.**
**АНАЛІЗ ПАДЗЕЙ, ДАНЯСЕННІ, УСПАМІНЫ, СТАТЫСТЫКА.**



ГАРАДЗЕНСКАЯ
БІБЛІЯТЭКА

# НЁМАНСКІ ФРОНТ

ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА

Дзмітрый Люцік

# НЁМАНСКІ ФРОНТ

## 15-25 ЛІПЕНЯ 1944 ГОДА

## БАІ ЗА ГРОДНА: АНАЛІЗ ПАДЗЕЙ, ДАНЯСЕННІ, УСПАМІНЫ, СТАТЫСТЫКА

Гародня -Wrocław 2012

ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА

*ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА прысвячаецца той Гародні, якой мы ганарымся.*

*Дзякуем усім, хто з намі.*

**Каардынатар кніжнай серыі «ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА»:**
Павал Мажэйка (p.mazheika@gmail.com)
**Ідэя серыі:** Эдвард Дмухоўскі
www.hrodna.org

**"Нёманскі фронт. 15 – 25 ліпеня 1944 года. Баі за Гродна: аналіз падзей, данясенні, успаміны, статыстыка"** – гэта 13-я кніга кніжнай серыі ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА.

Кніга набліжае да нас праўду пра падзеі Другой сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі і Гарадзеншчыны. Аўтар, дапытлівы гарадзенскі гісторык, крок за крокам, дзень за днём раскрывае планы і дзеянні савецкіх і нямецкіх войскаў у баях за Гродна 12-25 ліпеня 1944 года. У аснову кнігі ляглі звесткі з нямецкіх даследванняў, расійскіх архіваў, успаміны ўдзельнікаў і жыхароў горада, дзённікі баявых дзеянняў, аператыўныя дакументы, справаздачы, данясенні. Кніга будзе цікавая тым, хто цікавіцца гісторыяй войнаў у нашым рэгіёне.

**Тэкст кнігі:** Дзмітрый Люцік
**Карэктура:** Ала Роман, Хрысціна Марчук
**Здымкі:** Роберт Урублеўскі, Дзмітрый Люцік
**Графічная апрацоўка і вёрстка:** Зміцер Гупянец
**Вокладка:** Іра Саранчукова

ISBN 978-83-61617-69-3
Kolegium Europy Wschodniej im. Jana Nowaka-Jeziorańskiego
www.kew.org.pl

Друкарня: Wrocławska Drukarnia Naukowa PAN im. S. Kulczyńskiego Sp. z o.o.

Copyright © Гарадзенская бібліятэка, 2012
© Дзмітрый Люцік, 2012
© Kolegium Europy Wschodniej im. Jana Nowaka-Jeziorańskiego, 2012

# ЗМЕСТ

Прадмова...6
Спіс скарачэнняў, якія выкарыстоўваліся ў кнізе...12
**Раздзел 1**
Аперацыя "Баграціён"...14
а) Планаванне аперацыі. Сілы бакоў...14
б) Правядзенне аперацыі "Баграціён"...22
**Раздзел 2.**
Баі на падыходах да горада Гродна...38
а) Сілы і планы бакоў. Выхад савецкіх войскаў да мястэчка Скідзель...38
б) Баі за мястэчка Скідзель...50
**Раздзел 3.**
Баі за горад Гродна...59
а) Баі на рубяжы в. Жытомля-Верцялішкі...59
б) Штурм горада Гродна...79
**Раздзел 4.**
Стабілізацыя лініі фронту на р. Нёман...91
а) Узмацненне нямецкай групоўкі на левым беразе р. Нёман...91
б) Фарсіраванне р. Нёман Чырвонай арміяй...93
в) Баі на левым беразе р. Нёман на поўнач ад Гродна...126
**Раздзел 5.**
Баі на Свіслацкім фронце...194
**Раздзел 6**
Вынікі...229
Спасылкі...258
Спіс крыніц і літаратуры...281
Дадатак 1...290
Дадатак 2...291
Дадатак 3...292
Дадатак 4...295
Дадатак 5...295
Дадатак 6...296
Дадатак 7...300
Склад вайсковых падраздзяленняў Чырвонай арміі, Вермахту і СС...304
Спасылкі да дадаткаў...320
Кароткая характарыстыка ўзораў узбраення і бранятэхнікі...323

# ПРАДМОВА

Гэта кніга нарадзілася як вынік доўгіх разваг пра падзеі на савецка-германскім фронце Другой сусветнай вайны, іх ходзе і сапраўдным значэнні для беларускай гісторыі. Калі не казаць у такім глабальным маштабе, то гэтая кніга разглядае завяршальную частку аперацыі “Баграціён” – **Беластоцкую франтавую аперацыю**. Як жыхара горада Гродна, мяне, безумоўна, цікавілі абставіны яго вызвалення, баі ў бліжэйшых ваколіцах.

Яшчэ з дзяцінства мне запалі ў памяць аповеды дзеда пра цяжкія баі 1944 года. Паўставала шмат пытанняў, аднак ніхто не мог дапамагчы мне з адказам на іх. А знайсці адказы хацелася. Спрабуючы разабрацца ва ўсіх нюансах баявых дзеянняў, я шукаў інфармацыю пра падраздзяленні, якія прымалі ўдзел у баях 1944 г. на Гродзеншчыне, удзельнікаў і сведкаў апісаных падзей. Мне хацелася апісаць вайну з максімальнай падрабязнасцю, ацэнкаю, аналізам. У Беларусі такіх глыбокіх даследаванняў яшчэ не праводзілася.

Праца над кнігай заняла некалькі год. Вайна, якой ва ўсім былым Савецкім Саюзе, а тым больш у нашай краіне, надавалася і надаецца вялізнае ідэалагічнае значэнне, у многім застаецца невядомай і па сённяшні дзень. Парадаксальна, але і сёння, не зважаючы на заявы пра бессмяротнасць у памяці народа падзеі 65-гадовай даўніны, нягледзячы на выданне ўсё новых і новых кніг пра вайну, на з’яўленне абавязковага навучальнага курса “Вялікая Айчынная вайна ў кантэксце Другой сусветнай вайны”, беларуская гістарычная навука зусім не прасунулася наперад у вывучэнні падзей 1941-1945 гадоў. Шматлікія кнігі, навуковыя артыкулы, манаграфіі, зборнікі навуковых канферэнцый багатыя на даўно прынятыя штампы, спрашчаюць і хаваюць аб’ектыўны бок найвялікшага ў свеце ваеннага канфлікту. Гісторыкі, якія займаюцца дадзенай тэматыкай, упарта ігнаруюць нямецкія архіўныя крыніцы, матэрыялы гістарычнай літаратуры. Хоць для айчыннай гістарычнай навукі менавіта яны з’яўляюцца скарбніцай яшчэ не распрацаванага матэрыялу. Што яшчэ больш дзіўна, дык гэта прак-

тычна поўнае ігнараванне такой унікальнай крыніцы, як успаміны ўдзельнікаў вайны. Гаворка ідзе не толькі пра ветэранаў вайны, але і пра мясцовых жыхароў, што былі сведкамі баёў. Менавіта ад іх можна даведацца, якой была вайна не для франтавікоў, а для мірнага насельніцтва Беларусі.

Неабходна прызнаць: **нягледзячы на тое, што пытаннямі вайны айчынная гістарычная навука займаецца аддаўна, на сённяшні дзень не існуе добрай абагульняючай працы, прысвечанай не толькі асобным аспектам вайны (напрыклад, аперацыі "Баграціён"), але і падзеям 1941-1945 гг. увогуле.**

Фундаментам маіх даследванняў сталі архіўныя матэр'ялы і крыніцы. Унікальнай крыніцай па гісторыі 3-га Гвардзейскага кавалерыйскага корпуса, аднаго з галоўных "герояў" кнігі з'яўляецца "История боевых действий ордена Ленина Краснознамённого 3-го Гвардейского Гродненского кавалерийского корпуса в период Великой Отечественной войны 1941-1945 годов". Яна была напісана ў 1945-46 гг. па загаду палітычнага аддзела корпуса і планавалася ў якасці асобнага выдання, дзе асвятлялася б гісторыя баявога шляху корпуса. Аднак такая кніга так і не была выдадзена. Рукапіс быў памножаны ў некалькіх асобніках для ветэранаў корпуса. Трэба заўважыць, што "История боевых действий..." з'яўляецца даволі падрабязнай працай. Відавочна, што аўтары-складальнікі "Истории боевых действий..." карысталіся не толькі і не столькі ўспамінамі ўдзельнікаў баёў, колькі аператыўнымі дакументамі, справаздачамі, данясеннямі і г.д. Тым не менш шэраг цікавых момантаў быў апушчаны (інфармацыя аб стратах, аб праціўніку). Яскрава дапоўнілі гэтыя недахопы мемуары афіцэраў-кавалерыстаў 3-га Гв. кавалерыйскага корпуса: Д.І.Вадзінскага ў кнізе "Испытание мужеством" ( у 2-х т. – Мн., 1996), Івана Якушына (кніга "Czerwony kawalerzysta" (Warzsawa, 2007) і Хаіма Гарэліка.

Каштоўнымі крыніцамі па дадзенай тэме з'яўляюцца матэрыялы Цэнтральнага Архіва Міністэрства Абароны Расійскай Федэрацыі (далей - ЦАМА). Менавіта там захоўваюцца ўсе франтавыя дакументы Чырвонай арміі: "Журналы баявых дзеянняў", данясенні аб стратах, звесткі аб баявым колькасным складзе войск і г.д. Удалося папрацаваць і з матэрыяламі архіўнага фонду 50-й савецкай арміі, падраздзяленні якой вялі баі за горад Гродна і яго раён у ліпені 1944 года. Пры ўсёй унікальнасці гэтых дакументаў неабходна таксама мець на ўвазе, што некаторыя дадзеныя з'яўляюцца недакладнымі як у выніку аб'ектыўных прычын (напрыклад, данясенні аб стратах часта ўлічвалі не ўсё, многія

загінулыя лічыліся зніклымі без вестак і г. д. ), так і ў выніку суб'ектыўных прычын (напрыклад, дадзеныя аб нямецкіх стратах даваліся прыблізныя, свае страты, што прыводзіліся ў журналах баявых дзеянняў, памяншаліся). Пры ўсіх гэтых недахопах архіўныя дакументы выдатна дапаўняюць увесь астатні матэрыял і ў комплексе даюць больш ці менш дакладную карціну апісаных баявых дзеянняў. Акрамя таго, лісты баявых страт з ЦАМА ўтрымліваюцца ў Абагульненай базе дадзеных "Мемарыял". Гэта вялікі інтэрнэт праект, зроблены расійскімі гісторыкамі, які ўтрымлівае рознабаковую інфармацыю аб загінуўшых савецкіх салдатах і афіцэрах.

Нельга не адзначыць і ўспаміны савецкіх афіцэраў сярэдняга звяна, удзельнікаў баёў за горад Гродна, якія з'явіліся яшчэ ў савецкі перыяд – Ф.С. Фядотава, М.Г. Хамулы, С.М. Вернікава, М. Максімцова, М.С. Глазунова. Нягледзячы на пэўную ідэалагізацыю падзей вайны, аўтары-афіцэры прыводзілі цікавыя факты, свае меркаванні аб баях у раёне горада Гродна. Аднак, бадай, ніякія мемуары не змогуць стварыць цэласнай карціны той ці іншай маштабнай падзеі.

Сярод шматлікай літаратуры хацелася б адзначыць манаграфію Я.П. Елісеева "На белостокском направлении" (М., 1971). Гэта адзіная манаграфія, якая цалкам прысвечана Беластоцкай франтавой аперацыі. Нягледзячы на дастаткова даўні год выдання, кніга не страціла сваёй каштоўнасці і ў нашы дні. Напісана яна выключна на архіўным матэрыяле. Аўтар прысвячае асобныя раздзелы характарыстыцы войск (як савецкіх, так і нямецкіх!), робіць падрабязны аналіз падзей баёў і г.д. На жаль, да нашага часу гэта праца застаецца самым глыбокім даследваннем завяршальнай стадыі аперацыі "Баграціён".

Нельга было абысціся без успамінаў удзельнікаў і сведкаў вайны. Кажучы пра ветэранаў, хацелася б адзначыць, што большасць з іх свядома-несвядома выкрэсліла са сваёй памяці ўспаміны пра няўдачы і паражэнні, бо савецкая гістарычная навука мэтанакіравана стварала шматлікія "парадныя" вобразы вайны. Ветэраны не аднойчы распавядалі прадстаўнікам малодшых пакаленняў свае ўспаміны і стварылі іх "дзяжурны" варыянт, які часцей за ўсё не адпавядаў рэчаіснасці. Кажу так, але ніякім чынам не хачу пакрыўдзіць гэтых людзей. Гэта віна не толькі іх, але і ўсяго нашага грамадства. Таму вельмі каштоўнымі былі ўспаміны ветэрана 99-га пантоннага батальёна Сяргея Фадзеевіча Іванова, жыхара нашага горада. Гэты чалавек распавёў сумную гісторыю гібелі свайго падраздзялення, паважанага камандзіра, баявых

сяброў. Вартымі ўзгадвання з'яўляюцца ўспаміны ветэрана 3-га Гв. кавалерыйскага корпуса ст. л-та М.Г. Гарабчука. Цэлы пласт забытых успамінаў – успаміны мясцовых жыхароў. Шматлікія выезды ў прынёманскія вёскі, доўгія размовы з жыхарамі, інфармацыя, якую прыходзілася адбіраць і адфільтроўваць па крупіцах. Вайна, пра якую распавядалі мне дзядулькі і бабулькі гэтых вёсках значна адрознівалася ад той, якую мы часта бачым па тэлевізары, ці чытаем у кнігах: сумныя гісторыі пра жахлівыя разбурэнні, шматлікія страты савецкіх салдат і г.д.

Сярод нямецкіх гістарычных даследванняў варта ўзгадаць кнігу нямецкага гісторыка Рольфа Хінцэ "Das Ostfront-Drama 1944. Rückzugskämpfe Heeresgruppe Mitte" (Stuttgart, 1987) . Кніга заснавана на літаратуры, выдадзенай у ФРГ у пасляваенны перыяд. Варта прызнаць, што яна не страціла свайго значэння і сёння. Другой, не менш каштоўнай, крыніцай была кніга Вольфганга Ваперсаля "SOLDATEN – KÄMPFER – KAMERADEN. Marsch und Kämpfe der SS-Totenkopf-Division" (Bielefeld, 1990) . Гэта кніга выдавалася ў пяці тамах (некаторыя з іх складаюцца з дзвюх частак) з 1983 па 1991 год у ФРГ у якасці юбілейнага выдання для ветэранаў 3-й танкавай дывізіі СС "Мёртвая галава". Непасрэдна баям у раёне Гродна прысвечана першая частка пятага тома. Нягледзячы на некаторыя, уласцівыя многім заходнім работам недахопы (адсутнасць аналізу апісаных падзей, празмерная насычанасць фактамі і г. д.), кніга з'яўляецца ўнікальнай, бо ўтрымлівае практычна вычарпальную інфармацыю пра баявыя дзеянні ўсіх падраздзяленняў 3-й танкавай дывізіі СС "Мёртвая галава", дапоўненую ўспамінамі яе ветэранаў і фотаздымкамі.

Адным з вядучых спецыялістаў па пытаннях ваенных дзеянняў на савецка-германскім фронце летам 1944 года з'яўляецца польскі даследчык Роберт Урублеўскі. Найбольшую цікавасць гэтага даследчыка выклікае гісторыя бранятанкавых злучэнняў Вермахта і СС (такіх падраздзяленняў як 12-я танкавая дывізія, 20-я танкавая дывізія, 3-я танкавая дывізія СС "Мёртвая галава", 5-я танкавая дывізія СС "Вікінг" і інш.). Р. Урублеўскі выкарыстоўвае пры напісанні сваіх артыкулаў баявыя данясенні падраздзяленняў 4-й і 2-й нямецкіх армій у чэрвені – ліпені 1944 года. Зараз усе гэтыя матэрыялы захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве ў Александрыі ў ЗША. Р.Урублеўскі апісвае дзеянні з дакладнасцю да роты. Акрамя таго аўтар выкарыстоўвае ўнікальныя фотаздымкі, зробленыя пад час баявых дзеянняў у нямецкай арміі. Праўда, працам польскага даследчыка характэрна іншая крайнасць – практычна адсутнічае інфармацыя пра савецкі бок, што варта лічыць істотным недахопам.

Мэта гэтай кнігі – максімальна поўна і аб'ектыўна **паказаць дзесяць дзён баёў у раёне горада Гродна** на завяршальным этапе аперацыі "Баграціён" у ліпені 1944 года. Чалавеку, які не сутыкаўся з вайсковай тэрміналогіяй, літаратурай, прысвечанай апісанню баявых дзеянняў, чытаць кнігу будзе даволі цяжка. Нажаль, абысціся без гэтай тэрміналогіі нельга. Таму, паважаны чытач, трэба будзе звяртацца да спіса скарачэнняў, які размешчаны ў пачатку кнігі. Большасць з гэтых скарачэнняў агульнапрынятая для вайсковай літаратуры. Акрамя таго, у тэксце сустракаецца вялікая колькасць населеных пунктаў, якія размешчаныя ў раёне Гродна. Карты, якія змешчаныя ў кнізе, дапамогуць Вам лепш арыентавацца і ўяўляць нюансы тых ці іншых падзеяў. Тыпы і назвы населеных пунктаў падаюцца ў адпаведнасці з рэчаіснасцю тых часоў (напр.: мястэчка Скідзель, Друскенікі, Вільна, Коўна і інш.). Некаторыя тэрміны (напр. – Свіслацкі фронт) з'яўляюцца асабістай распрацоўкай аўтара. Няхай Вас не палохаюць шматлікія падрабязнасці, пералічэнні вайсковых частак і г.д. Сапраўднае даследванне магчыма толькі пры наяўнасці як мага больш поўнай інфармацыі. Толькі даследчык, які мае ў сваім распараджэнні максімальную колькасць фактаў, сведчанняў сучаснікаў, мемуараў і літаратуры можа зрабіць правільныя высновы. Я прапаную аматарам вайсковай гісторыі далучыцца да справы пошука ісціны разам са мною.

Перад сабою я паставіў наступныя задачы:

- *параўнаць метады вядзення вайны Чырвонай арміі і арміі Вермахта, іх узбраенне, падрыхтоўку і страты;*
- *разгледзець нямецкі контрудар сіламі 3-й тд СС "Мёртвая галава" па савецкіх войсках, якія фарсіравалі раку Нёман;*
- *зрабіць колькасны аналіз планаў і дзеянняў савецкага і нямецкага бакоў у баях за горад Гродна, а таксама ў баях на плацдарме на левым беразе ракі Нёман і ўздоўж ракі Свіслач*
- *высветліць прычыны няўдач у наступленні савецкіх войск у раёне горада Гродна.*

У канцы хацелася б падзякаваць тым людзям, якія ў той ці іншай ступені паспрыялі з'яўленню гэтай кнігі. Вялікі дзякуй ветэрану 99-га пантоннага батальёна, удзельніку вызвалення горада Гродна Сяргею Фадзеевічу Іванову – аднаму з першых рэдактараў дадзенай працы; старшыні гарадскога Савета ветэранаў Аляк-

сею Міхайлавічу Кузняцову; краязнаўцам Алесю Госцеву, Янку Лялевічу, Мсціславу Сімаку і гісторыкам Анатолю Вапу і Сяргею Піваварчыку за дапамогу ў зборы матэрыялаў для кнігі. Асаблівую ўдзячнасць хацелася б выказаць Ігару Іванавічу Іўлеву за падтрымку, мудрыя парады і бясцэнны матэрыял; Андрэю Вашкевічу, які прыклаў немалыя намаганні ў справе напісання кнігі, а таксама Аляксандру Іосіфавічу Фядуту. Дзякуй і ўсім жыхарам прынёманскіх вёсак, якія падзяліліся сваімі ўспамінамі пра падзеі ліпеня 1944 года.

**Дзмітрый Люцік**

**Спіс скарачэнняў, якія выкарыстоўваюцца ў кнізе:**

**Вайсковая тэрміналогія**

**Савецкая армія**

ап – артылерыйскі полк;
Гв – Гвардзейскі;
кк – кавалерыйскі корпус;
зап – знішчальны авіяцыйны полк;
зстабр – знішчальна-супрацьтанкавая артылерыйская брыгада;
зстап – знішчальна-супрацьтанкавы артылерыйскі полк;
ісб – інжынерна-сапёрны батальён;
кп – кавалерыйскі полк;
кап – карпусны артылерыйскі полк;
азстд – асобны знішчальна-супрацьтанкавы дывізіён;
арр – асобная разведвацельная рота;
арс – асобная рота сувязі;
амінж. бр – асобная матарызаваная інжынерная брыгада;
атбр – асобная танкавая брыгада;
атп – асобны танкавы полк;
апіб – асобны пантонна-інжынерны батальён;
ашісб – асобны штурмавы інжынерна-сапёрны батальён;
ашісбр – асобная штурмавая інжынерна-сапёрная брыгада;
габр – гарматна-артылерыйская брыгада;
сап.бр – сапёрная брыгада;
ск – стралковы корпус;
сд – стралковая дывізія;
сп – стралковы полк;
сап – самаходны артылерыйскі полк;
тп – танкавы полк;
тбр – танкавая брыгада;
шап – штурмавы авіяцыйны полк;
шад – штурмавая авіяцыйная дывізія;

**Нямецкая армія**

ак – армейскі корпус;
гп – грэнадзёрскі полк;
пд – пяхотная дывізія;
пмд – пяхотная матарызаваная дывізія;
палп – паліцэйскі полк;
палсп – паліцэйскі стралковы полк;
пп – пяхотны полк;
тгр полк – танкава-грэнадзёрскі полк;
тд – танкавая дывізія;
II./«Eicke», ці II./«E» – 2-гі батальён палка «Эйке»;

1/«Е» - 1-я рота палка «Эйке»;
Panzer-Aufklärungs-Abteilung (Pz. AA) – танкавы разведвальны батальён;
SS-Panzer Regiment (SS-Pz. Rgt.) – танкавы полк СС.

**Скарачэнні вайсковых званняў:**
г.-а. – генерал-арміі;
г.-арт. – генерал ад артылерыі;
г.-і. – генерал ад інфантэрыі (пяхоты);
г.-л. – генерал-лейтэнант;
г.-м. – генерал-маёр;
г.-п. – генерал-палкоўнік;
г.-ф. – генерал-фельдмаршал;
к-н – капітан;
л-т – лейтэнант;
м-р – маёр;
обрл-т – оберлейтэнант;
палк. – палкоўнік;
ппалк. – падпалкоўнік;
с-на – старшына;
ст. с-т – старшы сяржант;

**Іншыя скарачэнні:**
НП – назіральны пункт;
СПА – супраць паветраная абарона;
СТР – супрацьтанкавае ружжо;
БФ – Беларускі фронт
ДАК –даўгачасовая абаранiцельная кропка;
ГСС – Герой Савецкага Саюза;
СТА – супрацьтанкавая абарона;
РГК – рэзерв галоўнага камандвання;
РС – рэактыўны снарад;
САУ – самаходная артылерыйская ўстаноўка;
СУ – самаходная ўстаноўка;
StuG – (Sturmgeschütz), штурмавая гармата.

**Умоўныя тактычныя сімвалы**
кавалерыйская дывізія
пехотная дывізія
танкавая дывізія
кавалерыйская брыгада
пехотны полк
кавалерыйскі полк
танкавы полк
артылерыйскі полк танкавай дывізіі
пехотны батальён
танкавы разведвальны батальён
SS 3 3-ці дывізіён знішчальнікаў танкаў СС
SS 3 3-ці танкавы сапёрны батальён СС
штаб корпуса

# РАЗДЗЕЛ 1
# АПЕРАЦЫЯ “БАГРАЦІЁН”

## *а) Планаванне аперацыі. Сілы бакоў*

Летам 1944 года на савецка-германскім фронце перавага Чырвонай арміі была відавочнай. У выніку папярэдніх наступленняў савецкія войскі занялі большую частку Украіны і Палесся, выйшлі да Прыбалтыкі.

Вызваленне тэрыторыі Беларусі пачалося яшчэ восенню-зімой 1943 г. Гэтыя аперацыі пачаліся паспяхова. Войскі Беларускага фронта вызвалілі гарады Камарын, Хоцімск, Клімавічы, Касцюковічы, Крычаў. 26 лістапада быў вызвалены Гомель. Аднак савецкія войскі панеслі вялікія страты ў папярэдніх баях, адчувалася стомленнасць. Тым больш што нямецкая абарона нарастала. Не мелі поспехаў і зімовыя аперацыі (вызвалены г. Мазыр і Калінкавічы) і вясеннія наступленні ў Беларусі. Адной з прычын няўдач наступлення Заходняга фронту ў Беларусі зімой 1943-1944 гг. была яго малая аператыўнасць, расцягнутасць пазіцый. Акрамя таго, генерал В. Сакалоўскі вельмі дрэнна сябе паказаў на пасадзе камандуючага Заходнім фронтам, за што і быў адхілены ад кіравання.

У 1944 годзе лінія фронту ў Беларусі апісвала моцна выгнутую на ўсход дугу. Гэты выступ атрымаў назву “Беларускі балкон”. Захаванне нямецкай групай армій “Цэнтр” лініі фронту ў Беларусі давала ім шэраг выгод. Старшыня аператыўнага ўпраўлення Генеральнага штаба Сяргей Матвеевіч Шчеменка характарызаваў іх наступным чынам: “Ён (*маецца на ўвазе фронт у Беларусі* – Д. Л.) мог служыць плацдармам для флангавых ударaў праціўніка ў выпадку наступлення савецкіх войск на межах Усходняй Прусіі і ў роўнай меры пагражаў нашаму флангу і тылу ў паўднёва-заходнім накірунку – контрдзеяннямі адсюль магло быць сарвана наступленне на Львоў і Венгрыю. Акрамя гэтага, з Беларусі можна было здзяйсняць авіяцыйныя налёты на Маскву. Нарэшце, войскі праціўніка, што займалі “Беларускі балкон”

і мелі магчымасць хутка манеўраваць па добра развітых чыгуначных лініях і шашэйных дарогах, скавалі тут даволі моцныя сілы Савецкай Арміі"[6]. Для савецкага камандвання існаванне "беларускага балкона" давала рэальную магчымасць паспрабаваць акружыць значныя сілы групы армій "Цэнтр". Безумоўна, гэта была б грандыёзная аперацыя, аднак, яе ўдалае завяршэнне давала магчымасць распачаць вызваленне Еўропы.

Адным з рашэнняў Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання (далей - Стаўка) было разбуйненне Заходняга фронту і стварэнне на яго аснове 2-га і 3-га Беларускіх франтоў. Камандуючымі франтамі былі прызначаны адпаведна генералы І.Я. Пятроў і І.Д. Чарняхоўскі. Для апошняга гэта было першае прызначэнне на пасаду камандуючага фронтам. Да гэтага генерал І.Д. Чарняхоўскі камандаваў толькі арміяй. Аднак, улічваючы яго вялікі вайсковы вопыт, Стаўкай было прынята рашэнне прызначыць камандуючым 3-м Беларускім фронтам менавіта яго. Адначасова Беларускі фронт, які ўзначальваў генерал К.К. Ракасоўскі, перайменавалі ў 1-ы Беларускі. Гэтыя крокі сведчылі аб тым, што вярхоўнае камандаванне Чырвонай арміі ўлічвала няўдачы зімовага наступлення. Будучае летняе наступленне павінна было праводзіцца іншымі метадамі. Разгледзім нямецкія сілы, якія супрацьстаялі савецкім франтам у Беларусі.

### *Група армій "Цэнтр"*

Нямецкія сілы, якія абараняліся ў Беларусі, былі зведзены ў групу армій "Цэнтр" (ням. – "Heeresgruppe Mitte"). Абарона нямецкай групы армій абапіралася на буйныя ўмацаваныя гарады ўсходняй Беларусі: Віцебск, Оршу, Магілёў і Бабруйск. Працягласць пазіцый групы армій дасягала 950-1100 км. Большасць сіл нямецкай групы "Цэнтр" размяшчалася ў тактычнай зоне. Рэзервы ў тыле нямецкіх армій былі вельмі слабымі. Таму савецкае камандаванне лічыла неабходным прыкласці ўсе намаганні на прарыў нямецкай абароны і выхад на аператыўную прастору.

Для ўмацавання фронту ў Беларусі яшчэ ў 1943 г. нямецкім камандаваннем было санкцыянавана будаўніцтва ўмацаванай лініі. Яна атрымала назву "Пантэра". Гэта была частка Усходняга вала – абарончай лініі, якая працягнулася ад Балтыйскага да Азоўскага мора. Так на працягу прыкладна 1 года ўздоўж лініі "Пантэра" было ўзведзена да 5-6 тыс. бункераў. Праўда, большасць з іх была разлічана на 2-3 чалавек[7]. Такім чынам, бункераў хапала толькі на 2 паўнакроўныя дывізіі. Гэтага было вельмі мала. Акрамя таго, было запланавана ўзвядзенне ўмацаванай лініі "Мядзведзь", якая павінна была праходзіць уздоўж р. Днепр. Аднак яе будаўніцтва знаходзілася толькі на пачатковым этапе.

Сілы групы армій "Цэнтр" складаліся з 3-й танкавай арміі, 4-й, 9-й, 2-й палявых армій. Узначальваў групу армій фельдмаршал Эрнст Буш. Лінію фронту займалі 49 нямецкіх дывізій і 3 брыгады[8]. Паводле дадзеных савецкай літаратуры, у складзе сіл групы было 1200 тыс. салдат і афіцэраў, 9,5 тыс. гармат і мінамётаў, 900 танкаў і САУ. Паветранае прыкрыццё здзяйсняла авіяцыя 6-га Паветранага флоту (1300-1400 самалётаў)[9]. Аднак гэтыя дадзеныя не зусім дакладныя. Звесткі з еўрапейскіх крыніц прыводзяць колькасны склад групы ў 800 тыс. чалавек і 1555 самалётаў[10].

Прааналізуем колькасць бранятэхнікі, якая знаходзілася на ўзбраенні групы армій "Цэнтр" перад пачаткам аперацыі "Баграціён". Колькасць бранятэхнікі ў складзе нямецкай групы армій была меншай за названую лічбу ў 900 адзінак. У складзе нямецкіх сіл знаходзілася 9 брыгад штурмавых гармат, кожная з якіх, паводле штату, складалася з 31 самаходкі. На жаль, аўтар не валодае дакладнымі дадзенымі па колькасці штурмавых гармат у гэтых брыгадах. Калі меркаваць, што ўсе яны былі ўкамплектаваны (што, праўда, малаверагодна), колькасць САУ групы "Цэнтр" была роўнай 279. Акрамя гэтага, немцы мелі ў сваім распараджэнні толькі адну танкавую дывізію, а менавіта 20-ю. На яе ўзбраенні было толькі 49 спраўных сярэдніх танкаў Т-IV (агулам у дывізіі іх было 56). Да 30 чэрвеня дывізія атрымала яшчэ 27 танкаў[11]. Матарызаваная дывізія "Feldherrnhalle" мела 8 непашкоджаных танкаў Т-IV. Яшчэ 9 знаходзілася ў рамонце. У чэрвені дывізія была папоўнена 25 танкамі. Акрамя гэтага, у складзе групы армій "Цэнтр" знаходзіўся 501-ы цяжкі танкавы батальён. Ён меў на ўзбраенні 20 цяжкіх танкаў Т-VI "Tiger" [12]. Таксама ў складзе нямецкіх пяхотных дывізій былі асобныя батальёны штурмавых гармат. Колькасць САУ ў іх была меншай за штатную, аднак агульная колькасць штурмавых гармат у пяхотных дывізіях групы "Цэнтр" дасягала 452 штук. Такім чынам, агульная колькасць штурмавых гармат на момант пачатку аперацыі "Баграціён" была роўнай 731 штуцы. Колькасць танкаў, паводле інфармацыі аўтара, вагалася ў межах 100-120 штук. Агульная колькасць адзінак бранятэхнікі дасягала такім чынам 800. У ходзе аперацыі ў групу армій перакідваліся падмацаванні, у тым ліку і бранятанкавыя: 2 танкавыя дывізіі і 2 батальёны цяжкіх танкаў. Акрамя гэтага, папаўняліся і падраздзяленні, якія вялі баявыя дзеянні. Аднак вызначэнне дакладнай колькасці бранятэхнікі падчас правядзення аперацыі "Баграціён" – дастаткова складаная задача, якая патрабуе асобнага даследавання.

Наконт нямецкай авіяцыі варта адзначыць, што 31 мая 1944 г. у складзе 6-га Паветранага флоту знаходзілася 729 прыдатных да палётаў самалётаў. З іх знішчальнікаў – 104: 84 Ме-109 і 30 нач-

ных Ju-88. Яшчэ 51 знішчальнік FW-190 выкарыстоўваліся ў якасці штурмавікоў[13]. Такім чынам, савецкія дадзеныя па колькасці нямецкай авіяцыі завышаны ў 2 разы. Адзін з удзельнікаў баёў і аўтар адной з фундаментальных прац па гісторыі Другой сусветнай вайны г.-і. К. фон Ціпельскірх адзначаў, што 22 ліпеня ў флоце засталося толькі 40 знішчальнікаў якія былі спраўнымі і маглі падняцца ў паветра.

Цяпер прааналізуем склад групы армій "Цэнтр". 3-я танкавая армія абараняла раён горада Віцебска. Яна складалася з трох пяхотных карпусоў ў складзе: 252-й, 246-й, 206-й, 197-й, 299-й, 256-й, 95-й пяхотнай, 201-й ахоўнай, 4-й і 6-й авіяпалявых дывізій і тактычнай групы "D". Цікава, што ў склад танкавай арміі не ўваходзіла ні адна танкавая дывізія (!). Таму назва арміі – "танкавая" існавала толькі на паперы. З механізаваных сіл арміі можна назваць толькі 245-ю і 281-ю брыгады штурмавых гармат[14].

4-я армія абараняла цэнтральны накірунак будучага савецкага наступлення. У цэнтры яе абароны знаходзіўся горад Магілёў. Армейскія злучэнні ўтрымлівалі вялікі плацдарм на ўсходнім беразе ракі Днепр. Узначальваў армію г.-і. К. фон Ціпельскірх. У склад арміі ўваходзілі 260-я, 110-я, 337-я, 12-я, 31-я, 267-я, 57-я пяхотныя, 78-я штурмавая, 18-я і 25-я матарызаваныя, 286-я ахоўная дывізіі. Армія была ўзмоцнена 667-й, 185-й і 190-й брыгадамі штурмавых гармат, а таксама 501-ым цяжкім танкавым батальёнам.

Сілы 9-й нямецкай арміі ўтрымлівалі раён горада Бабруйска[15]. Асноўны накірунак атакі горада Бабруйска з савецкага плацдарма на поўнач ад горада Рагачова быў умацаваны нямецкімі войскамі. На поўдзень пачыналіся вялікія балоты. Магчымасць атакі праз іх буйнымі сіламі немцы не разглядалі. Армія складалася з 134-й, 296-й, 6-й, 383-й, 45-й, 36-й, 35-й, 129-й, 292-й і 102-й пяхотных дывізій і была ўзмоцнена 244-й брыгадай штурмавых гармат.

2-я армія займала пазіцыі па рацэ Прыпяць аж да горада Ковеля. Армія складася з 203-й ахоўнай, 7-й і 211-й пяхотных, 5-й стралковай і 12-й, 5-й, 23-й рэзервовых венгерскіх дывізій, 1-й кавалерыйскай венгерскай дывізіі, 17-й брыгады, 3-й і 4-й кавалерыйскіх брыгад, тактычнай групы "E". Армія ўзмацнялася 237-й і 904-й брыгадамі штурмавых гармат.

У рэзерве групы "Цэнтр" знаходзіліся 20-я танкавая, 60-я матарызаваная "Feldherrnhalle"[16], 14-я, 707-я пяхотныя, 52-я, 221-я, 391-я ахоўныя і 390-я паліцэйская дывізіі, 177-я брыгада штурмавых гармат[17].

Такім чынам, найбольш слабымі сіламі нямецкай групы былі 3-я танкавая і 2-я арміі. У многіх месцах абарона была занята авіяпалявымі ці ахоўнымі дывізіямі, якія па сіле ў некалькі разоў

саступалі пяхотным дывізіям. Група армій "Цэнтр" мела вельмі слабыя танкавыя сілы. Група распараджалася толькі 20-й танкавай дывізіяй, што была ў рэзерве ў раёне на захад ад Бабруйска. 15 чэрвеня 1944 года, г. зн. за тыдзень да савецкага наступлення, 5-я танкавая дывізія была перададзена з групы "Цэнтр" ў групу армій "Паўночная Украіна". Мала было і матарызаваных дывізій – толькі 3.

*Сілы Чырвонай арміі*

Да 14 мая 1944 года савецкі Генеральны штаб пад кіраўніцтвам генерала А.І. Антонава скончыў распрацоўку планаў наступлення ў Беларусі. Назву аперацыі прапанаваў Вярхоўны Галоўнакамандуючы І.В. Сталін. Генерал С.М. Шчеменка ўзгадваў: "Паводле першапачатковага варыянта плана "Баграціён", мэта аперацыі заключалася ў тым, каб ліквідаваць выступ варожай абароны ў раёне Віцебска, Бабруйска, Мінска і выйсці на рубеж Дзісны, Маладзечна, Стоўбцаў, Старобіна. Задумай прадугледжваўся разгром флангавых груповак праціўніка, ахоп флангаў і прарыў цэнтра яго пазіцый з наступным развіццём поспеху па накірунках на Мінск. Усе сілы чатырох нашых франтоў – трох Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага – нацэльваліся на групу армій "Цэнтр". Забеспячэнне аперацыі з поўначы і паўночнага захаду здзяйснялася нязначнай часткай войскаў" [18]. Такім чынам, галоўнай задачай аперацыі быў прарыў фронту групы армій "Цэнтр" і акружэнне часткі яе сіл ва Усходняй Беларусі. Глыбіня правядзення аперацыі дасягала 70-160 км – не далей за горад Мінск. Сілы групы армій "Цэнтр" ацэньваліся ў 42 дывізіі. Савецкія сілы павінны былі налічваць 77 стралковых дывізій, 3 танкавыя карпусы, 1 механізаваны, 1 кавалерыйскі, 6 дывізій ствольнай артылерыі і 3 дывізіі Гвардзейскіх мінамётаў[19]. Займальна таксама і тое, што ў перыяд планавання не прадугледжвалася акружэнне вялікіх сіл праціўніка. Сам тэрмін "акружэнне" ўжываўся толькі для віцебскай групоўкі немцаў, дзе выгін лініі фронту спрыяў гэтаму. У адносінах да астатніх накірункаў наступлення меркавалася прарываць фронт і змушаць да адступлення нямецкія войскі. Пасля правядзення Сталінградскай аперацыі ў савецкім Генеральным штабе лічылася, што акружэнне значных нямецкіх сіл патрабуе вялікага часу і сродкаў і не заўжды апраўдана.

У хуткім часе аказалася, што першапачатковая ацэнка нямецкіх сіл у Беларусі была некалькі заніжана Генеральным штабам. Да таго ж, савецкія войскі, рыхтуючыся да наступлення, яшчэ не мелі дастатковай колькасці рухомых бранятанкавых сродкаў. Гэта зніжала моц і хуткасць планаемага наступлення. У выніку далейшага абмеркавання ў Стаўцы, а таксама з камандучымі франтоў планы былі адкарэк-

таваны[20]. 30 мая 1944 года план аперацыі "Баграціён" зацвердзілі ў Стаўцы. Мэтай аперацыі было "... акружыць і знішчыць у раёне Мінска буйныя сілы групы армій "Цэнтр" [21]. Меркавалася, што гэта будуць сілы 4-й нямецкай арміі. Папярэднічаць гэтаму акружэнню павінен быў разгром нямецкіх армій у раёне гарадоў Віцебска, Магілёва і Бабруйска. Акрамя гэтага, была зменена задача для 1-га Прыбалтыйскага фронту: ён павінен быў засцерагчы ад небяспекі групоўку 1-га, 2-га і 3-га Беларускіх франтоў ад магчымага ўдару з поўначы.

2-і Беларускі фронт павінен быў скаваць масу сіл групы армій "Цэнтр". Яму не былі дадзены буйныя танкавыя сілы. Аднак для рашэння аператыўных задач у складзе частак фронту была створана рухомая група пад камандаваннем намесніка камандуючага 49-й арміі генерала А.А. Цюрына. У склад групы ўваходзілі дзве танкавыя брыгады, адна знішчальна-супрацьтанкавая артылерыйская брыгада і невялікія спецыяльныя падраздзяленні. Мэтай фронту была атака горада Магілёва з наступным выхадам у накірунку Стоўбцаў, Навагрудка, Ваўкавыска.

Галоўны ўдар у Беларусі наносілі 1-шы і 3-ці Беларускія франты. Менавіта яны атрымалі буйныя бранятанкавыя сілы з рэзерва. Паўночная групоўка атрымала 3-і Гвардзейскі механізаваны корпус, 3-ці Гвардзейскі кавалерыйскі корпус, 2-гі Гвардзейскі танкавы корпус і 5-ю Гвардзейскую танкавую армію. Паўднёвая наступальная групоўка (1-ы Беларускі фронт) атрымала 1-шы танкавы Данскі корпус, 9-ты танкавы корпус, 1-шы механізаваны корпус і 2-ю Гвардзейскую танкавую армію. Агулам у наступальных савецкіх войсках было сканцэнтравана 2 танкавыя арміі, 5 танкавых і 2 механізаваныя карпусы, 16 танкавых брыгад, 39 танкавых палкоў і больш за 70 палкоў самаходнай артылерыіі[22](!!!). Як бачна, бранятанкавыя сілы на самой справе былі шматлікімі.

3-ці Беларускі фронт наносіў удар у накірунку г. Віцебск – Орша (у Віцебску планавалася акружыць нямецкія сілы); пасля ўводу ў прарыў механізаваных сіл наступаць у накірунку гарадоў Мінск, Маладзечна, Ліда, Гродна. 5-я Гв. танкавая армія павінна была атакаваць уздоўж шашы Орша – Мінск, у паласе прарыву 11-й Гвардзейскай арміі.

1-шы Беларускі фронт на першым этапе аперацыі атакаваў горад Бабруйск сваім правым флангам. Для гэтага выдзяляліся 4 арміі (3-я, 48-я – атакавалі з поўначы, 65-я і 68-я – з поўдня). На другім этапе аперацыі – фронт працягваў наступленне ў накірунку Баранавічаў, Пінска, Брэста. Цікава, што 65-я армія фронту наносіла ўдар праз багну, загадзя падрыхтаваўшы пераправы-гаці для пяхоты і танкаў.

Наступленне на добра ўмацаваны горад Барысаў планавалася арганізаваць з двух накірункаў.

Сілы савецкіх франтоў, якія ўдзельнічалі ў наступленні ў Беларусі, складаліся са:

- *118 стралковых дывізій,*
- *8 танкавых і механізаваных карпусоў,*
- *13 артылерыйскіх дывізій,*
- *6 кавалерыйскіх дывізій.*

Усяго падраздзяленні франтоў налічвалі 2 331 700 чалавек (1-ы Прыбалтыйскі фронт – 359500 чалавек, 3-ці Беларускі фронт – 579300 чалавек, 2-гі Беларускі фронт – 319500 чаплавек, 1-шы Беларускі фронт – 1071100 чалавек). Войскі падтрымлівалі, па рознай інфармацыі, ад 4070 да 5200 танкаў і САУ (з іх 811 танкі Т-34), 5300 самалётаў, 36400 гармат і мінамётаў[23]. Трэба адзначыць, ўто значную колькасць танкаў і САУ складала тэхніка атрыманая з ЗША і Вялікабрытаніі па праграме "lend-lease". Гэта былі танкі M4 "Sherman", Мк "Valentine", САУ М-10,

Згодна з планам, аперацыя павінна была пачацца 19-20 чэрвеня 1944 года. Падчас падрыхтоўкі наступлення ў Беларусі савецкае кіраўніцтва прытрымлівалася выключнай сакрэтнасці. Для ўвядзення ў зман нямецкіх сіл фальшывую падрыхтоўку да наступлення праводзілі ў Прыбалтыцы і Заходняй Украіне. Варта адзначыць, што нямецкае камандаванне сапраўды ўдалося падмануць. Аж да пачатку чэрвеня камандаванне групы армій "Цэнтр" не дапускала магчымасці савецкага наступлення ў Беларусі[24].

Важную ролю ў падрыхтоўцы аперацыі "Баграціён" адыгралі чыгуначныя перавозкі. З Крыма ў склад наступальных франтоў перакідваліся дзве агульнавайсковыя арміі, з тэрыторыі Украіны – танкавая армія. Да прызначанага часу канцэнтраванне войскаў завершана не было: нездавальняючы працавалі чыгуначныя дарогі. У прыватнасці маршал А.М. Васілеўскі дакладваў у Стаўку: "Нэрвуе праца чыгункі і выклікае насцярожанасць у своечасовым зборы некаторых з прызначаных франтам войскаў, а таксама ў падачы некаторых відаў забеспячэння"[25]. Падобны стан быў і ў войсках 1-га Беларускага фронту. Кепская арганізацыя чыгуначных перавозак патрабавала ўмяшання самога Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Толькі пасля гэтага падвоз войскаў да фронту стаў здавальняючым. Тым не менш пачатак аперацыі ўсё ж быў адкладзены на некалькі дзён (на 23 чэрвеня).

Акрамя гэтага, перад пачаткам аперацыі, з прычыны даносу члена вайсковага савета 2-га Беларускага фронту генерал-лейтэнан-

та Л.З. Мехліса быў зняты з пасады камандуючы 2-ім Беларускім фронтам генерал І.Я. Пятроў[26]. На яго месца прызначылі генерала-палкоўніка Г.Ф. Захарава. У адносінах да генерала-палкоўніка Г.Ф. Захарава прадстаўнік Генеральнага штаба генерал С.М.Шчеменка ўспамінаў: "...генерал-палкоўнік Г.Ф. Захараў быў чалавекам даволі натурыстым і не ў меру гарачым. Я вельмі асцерагаўся, што ён пачне па-свойму трактаваць ужо зацверджаны Стаўкай план аперацыі, ускладніць адносіны са старшынёй штаба фронту генерал-лейтэнантам А.М. Багалюбавым, работнікам вопытным, аднак таксама запальчывым. Да таго ж і Л.З. Мехліс заставаўся тут" [27]. Для аказання дапамогі новаму камандуючаму ў 2-гі Беларускі фронт была накіравана група работнікаў Генеральнага штаба. Такім чынам, перад пачаткам аперацыі двое з чатырох камандуючых былі прызначаны напярэдадні яе правядзення. Такія рашэнні Стаўкі, вядома ж, былі даволі рызыкоўнымі.

Для агульнага кіраўніцтва аперацыяй у дзеючыя войскі са складу Стаўкі былі прызначаны два прадстаўнікі: намеснік Вярхоўнага Галоўнакамандуючага маршал Г.К. Жукаў (для каардынацыі дзеянняў 1-га і 2-га Беларускіх франтоў), старшыня Генеральнага штаба маршал А.М. Васілеўскі ( для каардынацыі дзеянняў 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў). Менавіта па ініцыятыве маршала Г.К. Жукава была распрацавана галоўная задача для 1-га Беларускага фронту: акружэнне нямецкіх сіл, што супрацьстаялі фронту, у раёне горада Бабруйска. Аднак дзеянні прадстаўнікоў Стаўкі таксама не былі ідэальнымі. Так старшыня аператыўнага ўпраўлення Генеральнага штаба генерал С.М. Шчеменка, які знаходзіўся ў штабе 2-га Беларускага фронту, узгадваў: "Нямала хваляванняў прынесла і авіяцыя дальняга дзеяння. У прынцыпе, з прымяненнем яе ўсё было ясна, аднак на практыцы атрымлівалася інакш. Два маршалы – Жукаў і Васілеўскі – арганізавалі баявыя дзеянні справа і злева ад 2-га Беларускага фронту і ўсё прыбралі да сваіх рук. Пасля нашых настойлівых просьбаў Георгій Канстанцінавіч выдзяліў нам некаторую колькасць авіяцыі дальняга дзеяння, аднак толькі на паперы. На справе ж да самага апошняга моманту мы не мелі магчымасці нават ставіць задачы цяжкім бамбардзіроўшчыкам: іх прадстаўнікі ў штабе 2-га Беларускага фронту не з'яўляліся. Гэтая сіла, здавалася, цалкам выпадае з агнявога балансу фронту"[28]. Толькі дзякуючы таму, што ў апошні момант наступленне 1-га Беларускага фронту было перанесена на дзень пазней, дальнюю авіяцыю змог задзейнічаць і 2-гі Беларускі фронт. Як бачна, прадстаўнікі Стаўкі часта выкарыстоўвалі сваё становішча ў інтарэсах сваіх войскаў, мала турбуючыся пра астатнія.

Акрамя таго, Стаўкай ВГК у штабы франтоў былі прызначаны наступныя прадстаўнікі: па авіяцыі – камандуючы ваеннапаветранымі сіламі Чырвонай Арміі галоўны маршал авіяцыі А.А. Новікаў, начальнік Галоўнага артылерыйскага ўпраўлення маршал М.Д. Якаўлеў у 1-ым і 2-ім Беларускім фронце, камандучы артылерыяй Чырвонай Арміі маршал М.М. Чысцякоў у 3-ім Беларускім і 1-ым Прыбалтыйскім франтах.

Непасрэдна перад пачаткам аперацыі "Баграціён" савецкія войскі праходзілі палявую падрыхтоўку. Кожны батальён дывізій 1-га эшалона прайшоў некалькі трэніровак па пераадольванні нямецкіх умацаванняў, узаемадзеянню з артылерыяй і танкамі.

## б) Правядзенне аперацыі "Баграціён"

У ноч з 19 на 20 чэрвеня партызанскія падраздзяленні нанеслі ўдар па нямецкіх тылавых камунікацыях у Беларусі. Мэтай аперацыі было вывядзенне са строю чыгуначных дарог напярэдадні наступлення савецкіх войскаў. 22 чэрвеня ўзмоцненыя батальёны 1-га Прыбалтыйскага і 2-га і 3-га Беларускіх франтоў правялі разведку боем. Яе мэтай было вызначэнне нямецкай агнявой сістэмы. Самыя значныя поспехі былі дасягнуты на поўнач ад горада Віцебска, дзе былі захоплены некалькі ліній нямецкіх акопаў на фронце шырынёй 3 км і глыбінёй 8 км[29].

Аперацыя пачалася 23 чэрвеня. У наступленне перайшлі 2-гі і 3-ці Беларускія і 1-шы Прыбалтыйскі франты. Дрэннае надвор'е (нізкая воблачнасць) перашкодзіла выкарыстаць савецкую авіяцыю ў запланаваным маштабе. Тым не менш, г.-і. К. фон Ціпельскірх лічыў дзеянні савецкай авіяцыі былі "выключна эфектыўнымі" [30].

У першы дзень наступлення нямецкі фронт быў прарваны на поўнач і поўдзень ад горада Віцебска (43-я і 39-я савецкія арміі). Над нямецкім LIII-ім армейскій корпусам, які абараняўся ў раёне горада, навісла пагроза акружэння. Аднак А. Гітлер забараніў яму адступаць[31]. На поўнач ад горада Оршы, у сутыку нямецкіх 3-й танкавай і 4-й армій нанесла ўдар 5-я агульнавайсковая армія пры падтрымцы 2-й танкавай брыгады. Пазіцыі нямецкага VI-га корпуса былі прарваны. Цяжкія баі разгарэліся за горад Багушэўск (на паўночны захад ад горада Оршы). 25 чэрвеня горад быў узяты. Ужо 24-25 чэрвеня ў прарыў на поўдзень ад Віцебска быў уведзены 3-ці Гв. кавалерыйскі корпус (у яго складзе 100 танкаў) і 3-ці Сталінградскі механізаваны корпус (196 танкаў: 110 – M4A2 "Sherman", 70 – "Valentine-IX", 16 – Т-34). На наступны дзень карпусы ўварваліся ў горад Сенна.

На аршанскім накірунку наступленне 11-й Гвардзейскай і 31-й армій 3-га Беларускага фронту спынілася: савецкія войскі

здолелі захапіць толькі першую лінію нямецкай абароны (яны прасунуліся пры гэтым толькі на 2-3 км). Нямецкія 78-я штурмавая, 25-я матарызаваная, 256-я і 14-я дывізіі контратакавалі дывізіі 31-й арміі. У гэтых атаках нямецкую пяхоту падтрымлівалі танкі T-VI "Tiger" з 501-га цяжкага танкавага батальёна. Менавіта гэтым і тлумачыліся цяжкасці савецкага наступлення. У гэтых баях батальён страціў 14 танкаў T-VI[32].

Савецкія танкі не змаглі дапамагчы сваім войскам і неслі вялікія страты. За 23-26 чэрвеня ў раёне Асінаўка ў баях было падбіта 70 савецкіх танкаў і САУ[33]. Няўдала развівалася наступленне 11-й Гвардзейскай арміі. Армія была цалкам укамплектавана. У якасці ўзмацнення ёй быў дададзены 2-гі Гв. танкавы корпус (252 танкі), артылерыйская дывізія прарыву РГК, выдзелена авіяцыя. Аднак прарваць нямецкую абарону не ўдалося.

Па загаду маршала А.М. Васілеўскага 5-я Гв. танкавая армія ў ноч на 24 чэрвеня пачала вылучацца ў баявыя парадкі пехоты 11-й арміі. Для яе прарыву ўздоўж Мінскай шашы было падрыхтавана прыкрыццё артылерыяй і авіяцыяй[34]. Шаша адмыслова пакідалася свабоднай. 5-я Гв. танкавая армія была самым вялікім бранятанкавым фарміраваннем пад час правядзення аперацыі "Баграціён". У складзе танкавай арміі знаходзіліся: 350 сярэдніх танкаў Т-34, 64 – M4A2 "Sherman", 39 – "Valentine-IX", 29 ІС-2, 23 ІСУ-152, 42 СУ-85, 22 СУ-76, 21 САУ М-10, 37 СУ-57.

Аднак нямецкая абарона не была прарвана на працягу дня. Гэтыя няўдачы прывялі да таго, што 5-ю Гв. танкавую армію па рашэнні камандуючага фронтам прыйшлося ўводзіць у бой на поўначы, на ўчастку прарыву 5-й агульнавайсковай арміі[35]. Камандуючы 5-й Гв. танкавай арміяй генерал П.А. Ротмістраў пазней пісаў: "Выконваць манёўр уздоўж фронту не ўяўлялася магчымым з-за адсутнасці дарог і вялікай колькасці балот. Таму 5-ю Гвардзейскую танкавую армію прыйшлося вяртаць назад у зыходнае становішча, а потым перагрупоўваць у паласу дзеянняў 5-й арміі. У выніку 5-я Гвардзейская танкавая армія страціла больш за суткі часу і ўвайшла ў прарыў толькі на трэці дзень, зрасходаваўшы дарма шмат паліва і рэсурсаў. Праціўнік за гэты час паспеў падцягнуць з рэзерва танкавую дывізію. Яна заняла праходы праз лясіста-балоцістую мясцовасць, чым ускладніла баявыя дзеянні 5-й Гвардзейскай танкавай арміі"[36].

26 чэрвеня танкавая армія была ўведзена ў прарыў. Дарэчы, гэта рашэнне нарадзіла канфлікт паміж камандуючым танкавай арміяй генералам П.А. Ротмістравым і камандуючым фронтам І.Д. Чарняхоўскім. Генерал П.А. Ротмістраў лічыў памылковым змяненне планаў і ўвод арміі ў непадрыхтаваным напрамку. У той жа дзень

11-я армія здолела, нарэшце, прарваць нямецкую абарону і прасунуцца на 20-22 км. У прарыў увайшлі танкавыя брыгады 2-га Гв. танкавага корпуса. 26 чэрвеня сілы корпуса абышлі горад Оршу. Перад савецкімі танкамі корпуса, па ўспамінах камандзіра ген. А. Бурдзейнага, адкрывалася магчымасць наступлення ў глыбокі тыл нямецкіх войскаў. Аднак камандаванне 3-га Беларускага фронту накіравала танкі корпуса на ліквідацыю нямецкіх акружаных сіл, якія апынуліся ў катле ў раёне горада[37]. Толькі праз суткі савецкія танкі вызваліліся для працягу далейшага наступлення.

25 чэрвеня савецкімі войскамі быў акружаны горад Віцебск. Ужо на наступны дзень горад быў вызвалены. У раёне Віцебска ў акружэнне трапіла некалькі нямецкіх дывізій: 252-я, 206-я пяхотныя, 4-я і 6-я авіяпалявыя, часці 197-й, 95-й, 246-й пяхотных дывізій. "Віцебскі кацёл" быў ліквідаваны да 28 чэрвеня. У палон было ўзята каля 10 тысяч чалавек. Яшчэ каля 20 тысяч – былі забіты[38]. Толькі 200 чалавек (!) з усяго LIII-га нямецкага армейскага корпуса здолелі прарвацца да сваіх. 27 чэрвеня быў вызвалены горад Орша. 28 чэрвеня савецкія войскі ачысцілі ад немцаў горад Лепель.

Паспяхова пачалося наступленне 49-й арміі 2-га Беларускага фронту. Ужо 23 чэрвеня савецкія войскі значна ўкліняліся ў абарону нямецкай 4-й арміі. Камандаванне нямецкай арміі запытала штаб групы "Цэнтр" аб адступленні да ракі Днепр, аднак атрымала адмову. 25 чэрвеня цэнтр 4-й нямецкай арміі быў прарваны. Увечары таго ж дня камандуючы арміяй г.-і. К. фон Ціпельскірх загадаў падраздзяленням арміі адступаць да ракі Днепр. Рака Днепр была фарсіравана савецкімі часцямі ўжо 26 чэрвеня і на супрацьлеглым беразе былі захоплены плацдармы. Ужо ўвечары 27 чэрвеня злучэнні 49-й і 50-й савецкіх армій акружылі горад Магілёў. У горадзе трапілі ў акружэнне часці 12-й нямецкай пяхотнай дывізіі. У выніку баёў, 28 чэрвеня, Магілёў быў вызвалены савецкімі войскамі. У палон трапіў штаб 12-й пяхотнай дывізіі на чале з камандзірам дывізіі генералам Бамплерам[39].

Наступленне войскаў 1-га Беларускага фронту пачалося на дзень пазней – 24 чэрвеня. Артылерыйская падрыхтоўка працягвалася 1,5 гадзіны. Шчыльнасць канцэнтравання гармат і мінамётаў на 1 км фронту дасягала 207 адзінак[40]. Ужо праз 3 гадзіны баёў падраздзеленні паўднёвай ударнай групоўкі дасягнулі поспеху. Войскі 65-й савецкай арміі прарвалі нямецкую абарону. У прарыў былі ўведзены 1-шы Данскі танкавы корпус, а 25 чэрвеня і конна-механізаваная група генерала І.А. Пліева. У гэты крытычны для нямецкай абароны момант камандаваннем групы армій "Цэнтр" быў зняты з пасады камандуючага 9-й арміяй генерал Г. Іэрдан. У якасці прычыны называлася недастаткова хуткае выкарыстанне рэзерваў на ўчастку арміі[41].

Паўночная савецкая групоўка сутыкнулася з моцным нямецкім супраціўленнем. 3-я і 48-я арміі фронта практычна не прасунуліся наперад. Па словах маршала Г.К. Жукава, адрэзак наступлення быў кепска разведаны і нямецкая абарона аказалася мацнейшай за мяркуемую. Маршал прызнаваў: "У выніку гэтай памылкі 3-й і 48-й арміям быў дадзены завышаны ўчастак прарыву. Да таго ж арміі не мелі дастатковых сродкаў для забеспячэння прарыву. Я, як прадстаўнік Стаўкі, своечасова не выправіў камандванне фронтам"[42]. 25 і 26 чэрвеня на адрэзку паўночнай групоўкі ў бой быў уведзены 9-ты танкавы корпус, хоць прарыў нямецкай абароны так і не атрымаўся[43]. За два дні баёў сілы 3-й арміі і 9-га танкавага корпуса прасунуліся наперад толькі на 8 км.

27 чэрвеня войскі 65-й арміі, 1-га танкавага корпуса і 48-й арміі замкнулі кола вакол горада Бабруйска. 15-я Гвардзейская танкавая брыгада 27 чэрвеня, у другой палове дня, атакавала горад. Не маючы прыкрыцця пяхоты і артылерыі, брыгада страціла ў баях за горад 27 танкаў Т-34-85 з наяўных 65 адзінак паводле штату[44]. У той жа дзень перадавыя атрады 18-га корпуса 65-й арміі вызвалілі буйную чыгуначную станцыю Асіповічы.

У акружэнні ў раёне горада Бабруйска аказаліся сілы 6 нямецкіх дывізій, колькасцю каля 40 тыс. чалавек. Яны ўваходзілі ў склад XXXV-га армейскага корпуса пад камандаваннем барона генерала К. фон Лютцава і XLI-га танкавага корпуса генерала Э. Гофмейсцера[45]. Абарону горада Бабруйска ўзначаліў камендант г.-м. А. Гаман. Немцы ўтрымлівалі горад да 29 чэрвеня. Паводле савецкіх дадзеных, у палон у горадзе трапіла 6-10 тыс. чалавек, яшчэ ад 10 да 17 тыс. былі забіты. Акрамя гэтага, былі захоплены 432 гарматы, 250 мінамётаў, 60 танкаў, больш за 500 машын[46]. Агулам у "Бабруйскім катле" былі ўзяты ў палон 23 680 чалавек. Былі захоплены 366 танкаў і САУ, больш за 5 тыс. гармат і мінамётаў, больш за 16 тыс. машын, забітыя 50 тыс. чалавек. Ліквідацыя "Бабруйскага катла" патрабавала прыцягнення вялікіх сіл: 65-й і 48-й армій, а таксама 1-га танкавага корпуса. Аднак менавіта на працягу гэтых баёў былі разбіты галоўныя сілы 9-й нямецкай арміі. Толькі невялікай колькасці акружаных нямецкіх войскаў пашчасціла вырвацца з катла. Нямецкая авіяцыя скінула акружаным падраздзяленням баепрыпасы і паліва. Дзякуючы гэтаму, прарвацца здолелі рэшткі 20-й танкавай дывізіі. Менавіта яны прарвалі савецкае кола акружэння. Паводле інфармацыі г.-і. К. фон Ціпельскірха, са складу арміі засталося толькі каля 15 тыс. чалавек[47]. Па іншай інфармацыі ў 9-й арміі засталося толькі каля 30 тыс. чалавек. Ліквідацыя "Барбуйскага катла" была бліскучым поспехам наступлення 1-га Беларускага фронту[48].

28 чэрвеня, па загаду А. Гітлера, фельдмаршал Э. Буш быў заменены на пасадзе камандуючага армій “Цэнтр” фельдмаршалам В. Модэлем. Сумяшчаючы камандаванне групай армій “Паўночная Украіна”, новы камандуючы фронтам неадкладна загадаў перакінуць у Беларусь танкавыя дывізіі з поўдня. Акрамя гэтага, ён настойваў на адводзе групы армій “Поўнач” для скарачэння лініі фронту. А.Гітлер адхіліў гэту прапанову.

Камандаванне групы армій “Цэнтр” імкнулася арганізаваць абарону па рацэ Бярэзіна. Дарэчы, рыхтаваць пазіцыі на рацэ Бярэзіна немцы пачалі загадзя, нават без згоды фюрэра[49]. Да групы армій падыходзілі рэзервы: 12-я, 4-я і 5-я танкавыя дывізіі, 505-ты і 507-мы цяжкія танкавыя батальёны (на ўзбраенні цяжкія танкі T-VI “Tiger”). 5-я танкавая дывізія была ўведзена ў бой супраць наступаючых сіл 3-га Беларускага фронту. 12-я і 4-я танкавыя дывізіі былі кінуты супраць 1-га Беларускага фронту. Контратакі сіламі пералічаных танкавых дывізій былі вельмі моцнымі. Яны нанеслі вялікі ўрон наступаючым савецкім танкавым злучэнням. Коратка ахарэктарызуем іх.

5-я нямецкая танкавая дывізія павінна была закрыць прарыў паміж 3-й танкавай і 4-й арміямі па рацэ Бярэзіна. Да ракі адступалі часці 4-й нямецкай арміі. У выніку савецкіх прарываў у раёне гарадоў Орша, Магілёў і Бабруйск для адступлення 4-й арміі засталася толькі адна дарога: Магілёў – Бярэзіна – Мінск. Гэту дарогу пастаянна бамбіла савецкая авіяцыя, замаруджваючы адступленне немцаў. Мост праз раку Бярэзіна пастаянна разбураўся. Пры паспяховым і хуткім адступленні нямецкіх сіл на заходні бераг ракі лінія фронту магла быць узноўлена. Аднак 3-ці Гв. кавалерыйскі корпус Гвардыі генерала М.С.Аслікоўскага фарсіраваў раку Бярэзіна на поўнач ад Барысава і захапіў плацдарм, апярэдзіўшы немцаў.

Паміж рэкамі Бобр і Бярэзіна немцы арганізавалі контрудар сіламі 5-й танкавай і 286-й ахоўнай дывізій. Для ўзмацнення танкавай дывізіі немцы далучылі да яе сіл 505-ты цяжкі танкавы батальён. Батальён налічваў у сваім складзе 51 цяжкі танк T-VI “Tiger”[50]. Танкавая група мусіла абараняць мост праз раку Бярэзіна каля горада Барысава. Цяжкія танкі “Tiger” былі вельмі моцным праціўнікам і маглі затрымаць савецкія войскі, перавышаючыя іх па колькасці ў некалькі разоў.

У першым жа баі 27 чэрвеня каля населенага пункта Крупкі (каля ракі Бобр на шашы Орша – Мінск ) 1-я рота 505-га танкавага батальёна знішчыла 16 савецкіх танкаў без уласных стратаў. 28 чэрвеня савецкія атакі ў раёне пункта Крупкі працягваліся. У іх удзельнічала 70 савецкіх танкаў. Аднак абарону нямецкага танкавага батальёна прарваць не ўдалося. У гэтым баі група танкаў “Tiger” знішчыла 34 савецкія танкі[51]. 505-ты батальён згубіў 6 танкаў T-VI[52].

Гэтыя атакі крыху затрымалі прасоўванне сіл 5-й Гв. танкавай арміі. Да 28 чэрвеня баі вяліся ў раёне Крупкі – Барысаў. У гэты час да месца баёў падышлі танкі 5-й тд (78 T-IV і 79 T-V), якія ўзмацнілі абарону 286-й ахоўнай дывізіі і 505-га батальёна (група г.-л. фон Альтрока). Вялікія страты ў гэтых баях панёс савецкі 29-ты танкавы корпус. Аднак прарывы нямецкай абароны на поўначы і пагроза выхада савецкіх часцей да Барысава прымусілі немцаў адступаць. Пасля адводу сіл 5-й нямецкай танкавай дывізіі з Барысава была вымушана адступіць і паліцэйская група К. фон Готберга, якая абаранялася тут жа. На працягу баёў 27-30 чэрвеня батальён цяжкіх танкаў "Tiger" знішчыў каля 70 савецкіх танкаў, страціўшы пры гэтым толькі 9 сваіх[53]. Усяго за два тыдні баёў нямецкі батальён цяжкіх танкаў знішчыў 128 савецкіх танкаў і САУ.

1 ліпеня ў горад Барысаў уварваліся сілы 5-й Гв. танкавай і 31-й савецкіх армій. На працягу наступных дзён цяжкія баі ішлі ў раёне горада Лагойска, дзе абаранялася нямецкая 5-я танкавая дывізія з падраздзяленнямі ўзмацнення. У прыватнасці тут таксама дзейнічаў 505-ты цяжкі танкавы батальён[54]. На працягу папярэдніх баёў сіламі 5-й тд пры падтрымцы танкаў "Tiger" было знішчана 295 (!) адзінак савецкай бранятэхнікі[55]. Падраздзяленні 5-й Гв. танкавай арміі тым не менш рухаліся наперад. Разам з тым камандаванне 3-га Беларускага фронту было занепакоена вельмі марудным прасоўваннем арміі. Яе апераджалі нават пяхотныя падраздзяленні. Камандуючаму арміяй генералу П.А. Ротмістраву была зроблена заўвага. Для расследавання маруднага наступлення была створана спецыяльная камісія з прадстаўнікоў Стаўкі.

Занадта павольнае прасоўванне савецкай танкавай арміі было выклікана, па словах генерала П.А. Ротмістрава, марнаваннем часу пры манёўры арміі ў тыле фронту для наступлення ў паласе 5-й агульнавайсковай арміі ў пачатку аперацыі. У выніку танкавая армія не выканала сваёй ролі, не дабіўшыся значнага прарыву праз нямецкую абарону.

На паўднёвым флангу наступаючых франтоў, з раёна на поўдзень ад Слуцка, па савецкіх войсках 1-га Беларускага фронту нанесла ўдар толькі што перакінутая ў Беларусь 12-я танкавая дывізія. Яна налічвала 12,5 тыс. чалавек (з іх 681 чалавек Hi-Wi ці Hilfswillige – дабравольныя памочнікі, прадстаўнікі акупаваных тэрыторый), 35 танкаў T-IV, 9 танкаў T-III (з доўгім ствалом), 91 бронетраспарцёр, 22 гарматы (з іх 12 САУ "Wespe")[56]. Праўда, дывізія дзейнічала не ў поўным складзе. Так адсутнічаў (знаходзіўся на перафарміраванні) 12-ты танкавы разведвальны батальён. Ён далучыцца да дывізіі пазней – у канцы ліпеня.

Дывізія павінна была стабілізаваць фронт на паўднёвы ўсход ад Мінска, а таксама дапамагчы нямецкім войскам, якія прарываліся з "Бабруйскага катла". 28 чэрвеня часці дывізіі дасягнулі раёна на захад ад Асіповічаў і перакрылі шашу і чыгунку Бабруйск – Мінск. У гэтым раёне дывізія злучылася з рэшткамі адступаючых ад Бабруйска частак 9-й арміі, у тым ліку і 20-й танкавай дывізіяй. 20-я танкавая дывізія страціла ў баях усе свае танкі і САУ. Падраздзяленні, якія выйшлі з катла налічвалі толькі 20% ад першапачатковага яе складу[57].

Нямецкія войскі імкнуліся наладзіць абарону на мяжы ракі Свіслач да яе ўпадзення ў Бярэзіну. Акрамя танкавых дывізій, тут занялі абарону часткі XXXV-га армейскага корпуса 9-й арміі: 36-й матарызаванай, 134-й, 45-й, 6-й і 383-й дывізій. Абарона сіламі 12-й танкавай дывізіі працягвалася аж да 1-2 ліпеня, пасля чаго апошняя была вымушана прарывацца на поўдзень ад горада Мінска, у накірунку г. Стоўбцы.

29-30 чэрвеня на поўдзень ад гэтых пазіцый, у накірунку Слуцка, нанесла ўдар конна-механізаваная група генерала І.А.Пліева. Гэтым ударам была адкінута 4-я нямецкая кавалерыйская брыгада, што абараняла падыходы да горада. Вынік гэтага ўдару – вызваленне Слуцка 30 чэрвеня. Далейшае прасоўванне групы спыніла нямецкая 4-я танкавая дывізія (у складзе 70 танкаў T-IV і 76 танкаў T-V "Panther")[58]. Такім чынам бачна, што пасля ўводу ў бой танкавых дывізій немцы затрымалі наступленне савецкіх войск.

2 ліпеня ўдарныя часткі 1-га Беларускага фронту (конна-механізаваная група генерала І.А. Пліева) занялі гарады Стоўбцы і Нясвіж і акружылі раён Мінска з поўдня. 2 ліпеня брыгады 2-га Гвардзейскага танкавага корпуса ўварваліся ў Смалявічы. У баях на подступах да Мінска вялікія страты панесла 4-я танкавая брыгада. Зноў былі дапушчаны тыповыя для савецкага камандвання памылкі: не была арганізавана разведка, танкі не абараняла пяхота. Камандзір корпуса генерал А.С. Бурдзейны абвінаваціў у стратах камандаванне брыгады[59]. У той жа дзень камандаванне групы армій "Цэнтр" дало загад войскам пакінуць горад Мінск і адступіць. Пачалася хуткая эвакуацыя. За дзень немцы вывезлі з горада 45 эшалонаў з грузамі[60].

3 ліпеня танкі 2-га Гвардзейскага Тацынскага танкавага корпуса генерала А.С. Бурдзейнага ўварваліся ў Мінск. Немцы падрыхтавалі горад да абароны. Аднак яны не мелі для гэтага дастатковых сіл. Увечары танкі 2-га Гвардзейскага Тацынскага танкавага корпуса аб'ядналіся з часткамі 1-га танкавага корпуса 1-га Беларускага фронту. Ужо да канца дня горад быў вызвалены ад нямецкіх войскаў. Нягледзячы на поспех, абедзве часці панеслі значныя страты. У 1-ым




**3 ліпеня 1944 г. Нямецкая абарона Мінска. Фрагмент нямецкай вайсковай карты**

танкавым корпусе страты дасягнулі 176 танкаў, у 2-м – 40% ад усёй колькасці падраздзялення[61].

Аж да 4 ліпеня часткі нямецкай 16-й арміі групы "Поўнач" абаранялі раён Полацка. Усе савецкія атакі горада заканчваліся няўдачай. Толькі 4 ліпеня, атрымаўшы дазвол на адступленне, 16-я армія адышла[62]. У Полацк увайшлі войскі Чырвонай арміі.

Такім чынам, вялікія сілы 4-й і 9-й нямецкіх армій – XII-ты, XXVII-ты, XXXV-ты армейскія карпусы, XXXIX-ты і XLI-шы танкавыя, агульнай колькасцю да 105 тыс. чалавек – аказаліся ў "Мінскім катле". Для ліквідацыі "катла" былі выкарыстаны сілы 2-га Беларускага фронту і 3-й арміі 1-га Беларускага фронту. 5 ліпеня акружаная групоўка немцаў здолела ўсталяваць сувязь з камандаваннем групы армій "Цэнтр". У той жа дзень нямецкая авіяцыя даставіла акружаным войскам харчаванне і боепрыпасы. 6 ліпеня былі распачаты некалькі атак з мэтай прарыву ў заходнім накірунку. 12 ліпеня акружаныя нямецкія войскі капітулявалі. У палон было ўзята 35 тыс. чалавек[63]. Вызваленнем гарадоў Мінск і Полацк завяршыўся першы этап аперацыі "Баграціён".

На другім этапе франты павінны былі працягваць наступленне і да 10-15 ліпеня выйсці да гарадоў:

– Маладзечна – Ліда – Вільна – рака Нёман (3-ці Беларускі фронт)

– Навагрудак – Ваўкавыск – Беласток (2-гі Беларускі фронт)

– Баранавічы – Слонім – Пінск – Брэст (1-шы Беларускі фронт).

На захад ад Мінска наступленне савецкіх сіл запаволілася. Адчуваўся недахоп добрых дарог. Вялікі лясны масіў Налібоцкай пушчы таксама замаруджваў тэмпы наступлення. Гэта дало магчымасць немцам упарадкаваць войскі для адступлення. Часткі 2-й арміі, што панеслі найменшыя страты, усталявалі сувязь з рэшткамі 4-й арміі. На фронт спешна перакідваліся новыя рэзервы, а таксама гарнізонныя войскі з Усходняй Прусіі.

Нямецкія войскі паспрабавалі замацавацца па лініі на ўсход ад лініі гарадоў Ліда- Баранавічы – Лунінец. На захад ад Нясвіжа абаранялася карпусная група генерала Хартэнека (4-я танкавая дывізія, 4-я кавалерыйская брыгада, полк 1-й венгерскай кавалерыйскай дывізіі, 507-мы батальён цяжкіх танкаў у складзе 10 T-VI “Tiger”, 904-я брыгада штурмавых гармат)[64]. У раёне горада Навагрудка абаранялася 12-я танкавая дывізія і рэшткі 20-й танкавай дывізіі, а таксама 28-я пяхотная дывізія. На ўсход ад Ліды пазіцыі заняла корпусная група г.-арт. Г.Вейдлінга.

Баі на гэтым рубяжы разгарэліся 5-7 ліпеня. Да Ліды прарваліся кавалерыйскія часці корпуса Гв. генерала М.С. Аслікоўскага. Нямецкая корпусная група г.-арт. Г. Вейдлінга займала абарону на ўсход ад горада. Яна не вытрымала ўдараў савецкіх кавалерыстаў. Пасля непрацяглых баёў 8-9 ліпеня чырвоная кавалерыя ўзяла г. Ліда. 10 ліпеня 3-ці Гв. кавалерыйскі корпус перайшоў у наступленне ў накірунку Гродна.

На поўдні група генерала Хартэнека адступіла да горада Баранавічы. Аднак 8 ліпеня ў горад увайшлі савецкія танкавыя часткі 1-га Беларускага фронту. Нямецкая 4-я танкавая дывізія адступіла яшчэ далей на ўсход да горада Слоніма.

Такім чынам, нямецкім сілам 4-й і 2-й армій не ўдалося стварыць трывалую абарону на захад ад Мінска. Аднак варта прызнаць, што, дзякуючы перакінутым у групу армій “Цэнтр” падмацаванням, ужо ў пачатку ліпеня ўдалося стварыць нейкае падабенства лініі фронту.

Падводзячы вынікі трэба адзначыць, што ў выніку савецкага наступлення ў чэрвені 1944 года група армій “Цэнтр” панесла цяжкія страты. 3-я танкавая армія страціла 81% сваіх падраздзяленняў, 9-я армія – 70%[65]. Найбольшыя страты былі ў 4-й арміі, што адступала на цэнтральным напрамку. Агульная колькасць страт групы армій “Цэнтр” у жывой сіле дасягнула, паводле рознай інфармацыі, ад 290 да 381 тыс. чалавек забітымі, параненымі і страчанымі без вестак. 158 тыс. салдат і афіцэраў трапілі ў савецкі палон (у тым ліку 22 генералы). Цікавымі падаюцца

дадзеныя даследчыка К. Бергстрома. Ён прыводзіць лічбы па стратах групы армій "Цэнтр".

**Табліца №1. Страты групы армій "Цэнтр" у ходзе правядзення аперацыі "Баграціён"[66]**

| | 3-я танкавая армія | 4-я армія | 9-я армія | 2-я армія |
|---|---|---|---|---|
| Забітыя | 8311 | 8015 | 2955 | 7080 |
| параненыя | 33508 | 29383 | 13957 | 32833 |
| зніклі без вестак | 72066 | 113155 | 64762 | 12976 |
| агулам | 113885 | 150553 | 81764 | 41209 |

Як бачна з табліцы № 1, найбольшыя страты панеслі 4-я і 3-я танкавыя арміі. Большасць стратаў 4-й арміі склалі прапаўшыя без вестак – гэта салдаты і афіцэры, якія трапілі ў акружэнне ў "Мінскам катле". Агульная лічба нямецкіх страт групы армій дасягала 398 тыс. чалавек. Акрамя гэтага, нямецкія войскі панеслі цяжкія страты ва ўзбраенні – бранятанкавай тэхніцы, артылерыі і аўтамабільным транспарце.

На працягу аперацыі "Баграціён" савецкія войскі страцілі 178 507 чалавек забітымі (немцы – толькі 26 тыс. чалавек) і 587 308 чалавек параненымі. Сярэднясуткавыя страты дасягалі 11 262 чалавекі[67]. Такім чынам, войскі страцілі да 33% ад складу сіл перад пачаткам аперацыі – 765 тыс. чалавек. Калі параўнаць страты бакоў, бачна, што **савецкія былі ў 2 разы большымі**.

Страты савецкіх войскаў у тэхніцы дасягнулі 2957 танкаў і САУ[68]. Наогул, варта прызнаць, што страты ў танках былі надзвычай вялікімі. Нягледзячы на вялізную перавагу ў сілах авіяцыі і артылерыі, танкі часцяком кідаліся ў бой без падтрымкі, для атак гарадоў і г. д. У той жа час выкарыстанне немцамі сваіх танкаў можна назваць дастаткова ўдалым. Невялікія сілы стрымлівалі наступленне перавышаючых падраздзяленняў Чырвонай арміі. Акрамя гэтага, савецкія войскі страцілі 2447 гармат і мінамётаў і 822 баявыя самалёты.



**Камандаванне групы армий Цэнтр. Злева направа – ген. фон Холцхаўз, ген.-ф. Э.Буш, ген. Х.Крэбс, Ф.Хосбах, Р. фон Роман, ген. О.Вейс, Х.Спеш. Беларусь. Май 1944 г.**



**Генерал-фельдмаршал Э. Буш, камандуючы групай армій Цэнтр.**



**В. фон Модэль, камандуючы групай армій Цэнтр. 3 ліпеня 1944 г.**



**генерал К. фон Ціппельскірх, камандуючы 4-й арміяй групы армій Цэнтр пад час адступлення ў Беларусі**



**Аўтамабіль камандуючага групай армій Центр фельдмаршала В.Моделя. Беларусь.Лета 1944г.**



Sd. Kfz. 10 з 6-ці ствольным мінамётам Nebelwerfer 42. 51-шы мінамётны полк 4-я армія. Лета 1944 г.



T-IV з 35-га тп 4-й тд. Ліпень 1944 г.



T-VI з 505-га цяжкага танкавага батальёна. Побач 2 падбітых Т-34-76 5-й Гв. ТА. Лета 1944 г.



**StuG III на ўзарваным мосце праз р. Бася. Аперацыя Баграціён.**



**Бабруйскі кацёл. Траса з горада. Наперадзе StuG.**



**Беларусь. Лета 1944 г. Адступленне групы Цэнтр.**



Г.К.Жукаў.



Генерал С.М.Шцеменка. Кіраўнік аператыўнага аддзела Генштаба.



Генерал П.А. Ротмістраў, камандуючы 5-й Гв. ТА на Бярэзіне.1 ліпеня 1944 г.



Камандуючы 2-ім БФ генерал арміі Г.Ф. Захараў з членамі штаба. Лета 1944 г.



**Амерыканскі трактар M1-Allis-Chalmers HD-10W у Чырвонай арміі. Аперацыя "Баграціён".**



**Цяжкая 203-мм гаўбіца Б-4. 3-ці БФ. Аперацыя"Баграціён".**



**Англійскі танк Мк-VIII Valentine групы ген. Пліева. Раён Бабруйска. Чэрвень 1944 г.**



**Цяжкі савецкі танк ІС-2. Злева танк Т-34. 3-ці БФ. Беларусь. Чэрвень 1944 г.**

**Штурмавік Іл-2. Беларусь. Лета 1944г.**






**Т-34-85. Мінск. 3 ліпеня 1944 года**

**Амерыканскія танкі М-4 Sherman з матапехотай 1-га Прыбалтыйскага Фронту на вуліцах г. Барысава.1944 г.**






**Савецкі бронеаўтамабіль у якасці перасоўнага КПП.1-ы БФ. Ліпень 1944 г.**

# РАЗДЗЕЛ 2.

# БАІ НА ПАДЫХОДАХ ДА ГОРАДА ГРОДНА.

## *а) Сілы і планы бакоў. Выхад савецкіх войскаў да мястэчка Скідзель*

### *Чырвоная армія*

Разгром і акружэнне нямецкіх войскаў у раёне горада Мінска стварылі спрыяльныя ўмовы для хуткага і паспяховага наступлення савецкіх войскаў на завяршальным этапе аперацыі "Баграціён". Галоўнай мэтай гэтага наступлення было поўнае вызваленне Беларусі, выхад войскаў да даваеннай мяжы СССР, наступленне ў Польшчы.

Для вырашэння гэтых задач была распрацавана **Беластоцкая франтавая наступальная аперацыя**. Праводзілася яна злучэннямі 2-га Беларускага фронту (камандуючы г.-п. Г.Ф. Захараў, член Ваеннага Савета г.-л. Л.З. Мехліс, начштаба г.-л. А.М. Багалюбаў), якія наступалі на цэнтральным накірунку. Дырэктыва войскам на правядзенне аперацыі была выдадзена Стаўкай 4 ліпеня 1944 года[69]. Наогул Беластоцкая аперацыя з'яўлялася адной з канчатковых частак аперацыі "Баграціён". У ходзе гэтай аперацыі планавалася вызваліць гарады Навагрудак, Ваўкавыск, Гродна і Беласток. Для гэтага войскам трэба было пераадолець каля 300 км, а таксама фарсіраваць некалькі вялікіх водных перашкод. Самай буйной з іх была рака Нёман. Каля выгіну ракі каля г. Гродна яе шырыня дасягла 100 метраў, пасля выгіну – да 120-140 м. Іншай воднай перашкодай на шляху да Беластока з'яўлялася рака Свіслач. Галоўную ролю ў аперацыі павінны былі адыграць 3-я, 49-я і 50-я савецкія арміі фронта, а таксама частка сіл 3-га Беларускага фронту (камандуючы г.-а. І.Д. Чарняхоўскі, член Ваеннага Савета г.-л. В.Я. Макараў, начштаба г.-л. А.П. Пакроўскі) – 3-ці Гв. кавалерыйскі корпус (з 15 ліпеня – у складзе 2-га БФ).

Галоўнай умовай правядзенне аперацыі Стаўка лічыла бесперапыннае праследаванне разбітых падраздзяленняў адступаючай 4-й нямецкай арміі. Таму войскі не атрымалі ніякага перапынку і, адразу ж пасля ліквідацыі "Мінскага катла" працягвалі наступленне на Захад. 4 ліпеня Стаўка паставіла задачу 2-му БФ на правядзенне Беластоцкай аперацыі. Аперацыя пачалася 5 ліпеня 1944 г. Аднак у наступленне перайшлі не ўсе арміі. Часткова савецкія сілы яшчэ былі заняты ліквідацыяй асобных груповак разбітых нямецкіх падраздзяленняў. Яны далучаліся да наступлення па меры завяршэння зачыстак тэрыторыі "катла".

4 ліпеня 1944 г. прадстаўнік Стаўкі маршал Г.К. Жукаў загадаў камандванню фронта паскорыць выхад 3-й арміі ў раён г.Стоўбцы, 49-й арміі – раён на поўнач ад г.Навагрудка і 50-й арміі – у накірунку г. Навагрудка. Паветранае прыкрыццё войск 2-га Беларускага фронту здзяйснялася самалётамі 1-й паветранай арміі г.-п. Ц.Ц. Хрукіна і 4-й паветранай арміяй пад камандаваннем г.-п. К.А. Вяршыніна. У складзе яго 5 дывізій налічвалася 518 знішчальнікаў, штурмавікоў і бамбардзіроўшчыкаў[70].

Камандуючы фронтам г.-п. Г.Ф.Захараў прыняў рашэнне распачаць наступленне 3-й арміяй. Дзве астатнія павінны былі далучыцца да яго трошкі пазней. Тым больш што армія ген. А.В. Гарбатава знаходзілася ў больш выгадным становішчы, у параўнанні з астатнімі. Перад войскамі армій павінны былі быць створаны армейскія рухомыя атрады. Яны павінны былі наступаць наперадзе асноўных сіл армій, забяспечваць пераправы праз рэкі, знішчаць невялікія групы адступаючых нямецкіх войск. Акрамя армейскіх перадавых атрадаў, рухомыя атрады высылаліся і кожнай наступаючай дывізіяй. На думку камандавання, гэтыя меры дазволілі б палепшыць разведку войск праціўніка і лепш забяспечыць наступленне.

Планаванне аперацыі было праведзена ў кароткія тэрміны аператыўным аддзелам штаба фронта пад кіраўніцтвам г.-м. П.М. Котава-Леганькова[71]. Увага надавалася пашырэнню выкарыстання інжынерных сродкаў фронта для забеспячэння паспяховага наступлення, а таксама авіяцыі і артылерыі[72].

Фактычна войскі 2-га БФ не праводзілі падрыхтоўкі да аперацыі. Пасля таго як яны вызваляліся ад папярэдніх задач, падраздзяленні фронта прыступалі да выканання новай аперацыі. Як ужо адзначалася вышэй яны не атрымалі нават ніякай перадышкі. Арміі не атрымалі таксама і папаўнення ні ў асабовым складзе, ні ў матэрыяльна-тэхнічных сродках.

3-я армія першай распачала наступленне на Захад. З-за яе правага фланга павінны былі наступаць 50-я армія і пазней далучыцца –

49-я армія. Першапачаткова наступленне праводзілася толькі сіламі 3-й арміі. З-за гэтага яе камандуючы ген. А.В. Гарбатаў вымушаны быў расцягнуць баявыя парадкі арміі практычна на ўсю шырыню наступлення фронта (!). Пагаршала становішча арміі і тое, што некаторыя падраздзяленні арміі яшчэ займаліся ліквідацыяй акружаных частак немцаў. Тым не менш ужо 8 ліпеня падраздзяленні 3-й арміі фарсіравалі р.Сервеч і Нёман і авалодалі населенымі пунктамі Карэлічы, Уселюб. Да наступлення далучыўся і рухомы армейскі атрад 50-й арміі, які 9 ліпеня выйшаў у раён м. Сялец. Рэшткі нямецкай 4-й арміі адступалі ў накірунку м. Скідзель і г. Ваўкавыск. З гэтага часу камандванне фронтам пачало планаваць наступленне сваіх армій у накірунку горада Гродна.

9 ліпеня 1944 года камандуючы 2-ім Беларускім фронтам г.-п. Г.Ф. Захараў аддаў загад 50-й арміі, што ўваходзіла ў склад фронту і знаходзілася на той момант у раёне населеных пунктаў Шчорсы – Карэлічы. Згодна з гэтым загадам, армія павінна была сіламі чатырох карпусоў (агулам 10 дывізій) выйсці да 12 ліпеня на мяжу Гродна – Індура і авалодаць горадам Гродна[73]. Для выканання гэтага загаду 50-й арміі трэба было пераадолець адлегласць каля 140 кіламетраў за двое сутак і пры гэтым авалодаць горадам Гродна. Адносна тэрмінаў выканання гэтага загаду выказваў сумненні ў сваёй манаграфіі, напісанай яшчэ ў 1971 годзе, Я.П. Елісееў. У прыватнасці, ён адзначаў, што "... такі тэмп прасоўвання войскаў, усталяваны камандуючым фронтам (да 60 км у суткі з пераадоленнем водных перашкод ва ўмовах нарашчэння сіл і ўзмацнення супраціву праціўніка), для пяхоты быў завышаны і, як паказаў далейшы ход падзей, войскі ... не змаглі выканаць пастаўленыя задачы ў запланаваны тэрмін"[74]. Як паказалі далейшыя падзеі, армія выкананала гэты загад толькі праз тыдзень.

50-й савецкай арміяй камандаваў г.-л. Іван Васільевіч Болдзін[75]. Ён вельмі добра ведаў мясціны, па якіх наступала яго армія. Яшчэ ў 1939 г. ён камандаваў конна-механізаванай групай – ударнай сілай Беларускага фронту, якая наносіла галоўны ўдар у Заходняй Беларусі. Менавіта яго войскі штурмавалі горад Гродна ў верасні 1939 г. У выніку паспяховага правядзення вайсковай аперацыі, Заходняя Беларусь была далучана да БССР. З 1940 г. генерал І.В. Болдзін застаецца ў Беларусі. У раёне горада Гродна ён пачынаў вайну ў якасці намесніка камандуючага войскамі Заходняга фронту. Адсюль ён і адступаў у 1941 годзе ажно да Масквы. У тым жа годзе г.-л. І.В. Болдзін уступіў у камандаванне 50-й арміяй. На пасадзе камандуючага арміяй ён заставаўся аж да 1945 г. Верагодна, што адсутнасць службовага росту тлумачылася менавіта катастрофай Заходняга фронту 1941 г. А Іван

Васільевіч быў тады намеснікам камандуючага фронтам. Ён таксама нёс адказнасць за знішчаныя арміі. Яму пашчасціла. Генерал не быў растраляны, як многія іншыя з кіравання арміямі і штаба фронту. Аднак і павышэння генерал не атрымліваў. Дарэчы, у сваіх мемуарах Іван Васільевіч наогул не ўзгадвае пра падзеі 1944 г. Чаму? Гэта застаецца невядомым.

50-я армія (глядзі склад яе падраздзяленняў у дадатку) была тыповай арміяй для перыяду Другой Сусветнай вайны ў СССР. У яе склад не ўваходзіла гвардзейскіх падраздзяленняў. Не было ў складзе арміі і кадравых часцей. Усе стралковыя дівізіі былі сварміраваны пад час вайны. 42-я сд была знішчана летам-восенню 1941 г. (менавіта яе палкі абаранялі Брэсцкую крэпасць). Пазней дывізія была сфарміравана ў другі раз. Другі раз былі сфарміраваны: 153-я, 199-я, 238-я, сд. А 95-я і 139-я дывізіі былі сфарміраваны ў 3-ці раз (!). Перафарміраванне дывізій азначала, што яны былі амаль цалкам знішчаны пад час баёў. У такім выпадку дывізія фарміравалася нанова. Толькі 153-я сд была перафарміравана ў 3-ю Гвардзейскую стралковую дывізію, а лічбавы нумар “153” быў дадзены новаму падраздзяленню.

Падраздзяленні 50-й арміі прымалі ўдзел у аперацыі “Баграціён” з самага яе пачатку. У момант апісаных падзей страты дывізій былі даволі відавочнымі і даходзілі да 50% асабовага складу (у сярэднім заставалася 5,5-6 тыс. чалавек у дывізіі).

Для павелічэння моцнасці арміі ёй былі прыданыя танкавыя і самаходныя часці. Аднак зыходзячы з таго, што 50-я армія не выкарыстоўвалася на накірунках галоўных удараў фронта гэтыя часці былі невялікімі. Для арміі г.-л. І.В. Болдзіна былі дадзены ў якасці падмацавання наступныя механізаваныя сродкі (інфармацыя на 2 ліпеня 1944 г.):

> 43-я Гв. Верхнядняпроўская Чырвонасцяжная асобная танкавая брыгада (10 Т-34 і 3 СУ-76) – Гв. палк. М.П.Лукашаў;

> 23-я Гв. Ельненская атбр (2 СУ-76) – Гв. палк. Козікаў

* начальнік штаба – Гв. ппалк. Прахарэнка;

→ танкавы батальён,

→ мотастралковы батальён,

→ узвод сувязі, узвод сапёраў;

> 233-ці атп (з 64-х па штату танкаў у палку налічвалася толькі 5 англійскіх танкаў Мк-III “Valentine”, у разведроце – амерыканскія М 3 “Scaut”) – палк. Л.С. Тулоўскі;

> 1444-ы сап (10 СУ-76) – палк. Ф.П. Мячаў;

> 1902-гі сап (7 СУ-76) – ппалк. М. Грдзенішвілі;

> 1819-ты сап (6 СУ-85);

> 1434-ты сап (5 СУ-85) – м-р М.Е. Самуілкін;

> 334-ты Гв. цсап (14 ІСУ-152) – ппалк. М.П. Татарэнка;

> 342-гі Гв. цсап (11 ІСУ-152) – м-р. М.С. Каралёў[76].

Ва ўмовах хуткага тэмпа руху савецкіх войскаў вялікія цяжкасці мелі, у першую чаргу, механізаваныя падраздзяленні, якія ўваходзілі ў склад 50-й арміі. Яны панеслі вялікія страты ў папярэдніх баях. Шмат тэхнікі выйшла са строю з-за механічных паломак. Палкі самаходнай артылерыі налічвалі 21 самаходку па штату. Такім чынам, з прыведзенай вышэй інфармацыі бачна, што палкі самаходнай артылерыі страцілі больш за палову сваёй тэхнікі. Тое ж самае можна было сказаць і пра танкавыя часці, дзе страты былі яшчэ большымі. Цікава адзначыць, што на ўзбраенні асобных танкавых палкоў часта выкарыстоўваліся англійскія і амерыканскія танкі.

Узмацніць стралковыя дывізіі, такім чынам, армія магла толькі 15 танкамі і 58 самаходнымі ўстаноўкамі. Але ўлічваючы тое, што армія праследавала разбітага і дэмаралізаванага ворага, а таксама тое, што немцы ў паласе наступлення арміі не валодамі якімі-небудзь значнымі бранятанкавымі сродкамі, дадзеных арміі механізаваных сіл было цалкам дастаткова.

З рэзерва Стаўкі 2-му БФ была падпарадкавана 1-я Гвардзейская Магілёўская штурмавая інжынерна-сапёрная брагада. У аперацыі "Баграціён" яна дапамагала 69-му ск у прарыве нямецкай абароны па р. Проня і Бася. Байцы брыгады штурмавалі горад Магілёў. У далейшым ходзе аперацыі брыгада засталася ў падпарадкаванні фронта. У Беластоцкай франтавой наступальнай аперацыі 1-я Гв. ашісбр таксама дзейнічала разам з падраздзяленнямі 50-й і 49-й армій.

Трэба адзначыць, што падобныя падраздзяленні складалі эліту Чырвонай арміі. Сваёй падрыхтоўкай і ўзбраеннем яны павінны былі якасна пераўзыходзіць нямецкія войскі. Усяго на працягу вайны было арганізавана толькі 20 штурмавых брыгад. У іх задачы ўваходзіў прарыў абарончых ліній праціўніка, размініраванне мінных палей, падрыхтоўка пераправаў праз рэкі, рамонт мастоў, дарог і інш. Акрамя таго брыгада павінна была праводзіць разведку мясцовасці, выяўляць наяўнасць умацаваных раёнаў, сістэму абароны праціўніка[77].

Штурмавая брыгада магла ўдзельнічаць у аперацыях толькі па загаду Стаўкі, прычым падраздзяленне трэба было выкарыстоўваць цалкам, на вузкім участку фронта, не падзяляючы яе батальёны паміж пяхотнымі часцямі.

Пасля паспяховага прарыва лініі фронту брыгада павінна была быць выведзена ў рэзерв для папаўнення і баявой падрыхтоўкі. Імклівасць і паспяховасць аперацыі "Баграціён" прывялі да таго, што 1-я Гв. ашісбр была пакінута ў наступаючых войсках. Магчыма таксама, што камандванне фронтам спецыяльна рыхтавалася выкарыстаць брыгаду ў баях за горад Гродна. 1-й Гвардзейскай Магілёўскай штурмавой інжынерна-сапёрнай Чырвоназмённай ордэна Кутузава брыгадай РГК камандаваў Гвардыі палкоўнік А.Ф. Везіраў.

Асабовы склад брыгады набіраўся з маладых (да 40 гадоў) салдат. У кожнага кандыдата правяраліся асабістыя фізічныя дадзеныя. Байцы вывучалі прыёмы рукапашнага бою, што было даволі незвычайна для Чырвонай арміі. У адрозненні ад звычайных вайсковых частак, байцы брыгады, пад час баёў, былі абмундзіраваны ў камуфліраваныя балахоны. Яны былі ўзброены аўтаматычнай зброяй і фінскімі нажамі (фінкамі), гранатамі. Распаўсюджаны былі ручныя кулямёты і супрацьтанкавыя ружжы[78]. Цікава што частка салдат брыгады была ўзброена стальнымі нагруднікамі СН-42, якія захоўвалі байцоў ад асколкаў і куль. За гэта такіх салдат празвалі "панцырная пяхота", "браняносцы" ці проста – "ракі"[79]. Асобны батальён брыгады быў узброены ранцавымі агнямётамі РОКС-3. У склад брыгады ўваходзілі пяць інжынерна-сапёрных батальёнаў агульнай колькасцю каля 2 тыс. сапёраў. Больш падрабязней ахарактарызуем падраздзяленні брыгады.

У значнай ступені брыгада была матарызавана яе аўтапарк складаў – 8 легкавых, 64 грузавыя і 53 спецыяльны аўтамабілі. Кожны штурмавы батальён брыгады (392 чалавекі) быў узброены пісталет-кулямётамі, 20 кулямётамі, 9 супрацьтанкавымі ружжамі і 125 стальнымі нагруднікамі. У кожнага салдата было мінімум па 2 гранаты. У разведвальную роту (поўны склад – 102 чалавекі) уваходзілі: узвод сапёраў-матацыклістаў, узвод сабак-мінашукальнікаў, матарызаваны ўзвод сапёраў. Увесь склад разведроты быў матарызаваны – 6 грузавых машын, 2 легкавыя і 7 матацыклаў. Батальён ранцавых агнямётаў не прымяняўся ў баях цалкам. Групы агнямётчыкаў даваліся асобным узводам брыгады для павялічэння іх моцнасці. Вельмі добра выкарыстоўваліся агнямёты пры штурме неселеных пунктаў, пры адбіцці танкавых контратак праціўніка. Быў у брыгадзе і свой медзіка-санітарны ўзвод – для аператыўнай дапамогі параненым[80]. Такім чынам 1-я Гв. ашысбр была спецыяльным, аўтаномным падраздзяленнем для вырашэння штурмавых і інжынерных задач фронту.

Нягледзячы на дырэктыву Стаўкі аб выкарыстанні брыгады цалкам на асобных участках фронту, батальёны 1-й Гв. ашісбр

размяркоўваліся пад час Беластоцкай аперацыі ў розныя пяхотныя падраздзяленні для выканання канкрэтных задач.

Як ужо адзначалася, для таго, каб не адарвацца ад адступаўшых немцаў і не даць ім магчымасці стварыць доўгачасовую лінію абароны, у авангардзе асноўнай масы савецкіх войскаў выкарыстоўваліся мабільныя сілы. Яны складаліся з бранятанкавых падраздзяленняў і былі ўзмоцнены пяхотай. Мабільныя сілы праследавалі разбітыя і адыходзячыя часці нямецкай групы армій "Цэнтр".

Перад наступаючымі падраздзяленнямі савецкай 50-й арміі прасоўваўся армейскі рухомы перадавы атрад пад камандаваннем намесніка камандуючага арміяй г.-л. А.А. Цюрына[81]. Армейскі рухомы перадавы атрад быў створаны 6 ліпеня 1944 г. У яго склад уваходзілі (дадзеныя на 6 ліпеня 1944 г.):

> 23-я Гв. атбр (4 Т-34) – Гв. палк. Козікаў;

> 1444-ты сап (4 СУ-76) – палк. Ф.П. Мячаў;

> 1434-ты сап (7 СУ-85) – м-р М.Е. Самуілкін;

> 58-мы зстап 5-й зстабр;

> дзве роты аўтаматчыкаў 238-й сд;

> 4-ты Гв. ашісб 1-й Гв. ашісбр – Гв. ппалк. Белаконь[82].

Такім чынам рухомы атрад складаўся з САУ і танкаў, быў узмоцнены супрацьтанкавай артылерыяй і штурмавым батальёнам. Акрамя таго, пяхотнае прыкрыццё ажыццяўлялася байцамі 238-й дывізіі.

Мэтай атрада было, не адрываючыся, ісці за адступаючымі нямецкімі войскамі і не даваць ім ніякай магчымасці для стварэння моцнай абароны. Армейскі атрад атрымаў загад наступаць у накірунку населеных пунктаў – Турэц, Карэлічы, Навагрудак, Шчучын, Скідзель, Гродна.

Пасля двухдзённага маршу рухомы перадавы атрад арміі выйшаў да горада Навагрудка. Тут часці атрада сутыкнуліся з ар'ергардамі адступаючай 12-й нямецкай тд. Вечарам 8 ліпеня танкі і САУ атрада г.-л. А.А. Цюрына ўварваліся ў горад сумесна з палкамі 283-й сд 3-й арміі. Вечарам таго ж дня горад быў вызвалены.

У баях за Навагрудак была страчана 1 СУ-76 са складу рухомага атрада. Небаявыя ж страты атрада пасля двухдзённага маршу былі намнога большымі. Так да вечара 8 ліпеня 1944 г. у выніку паломак атрад згубіў: 3 Т-34, 1 СУ-76, 4 СУ-85. У справаздачы бранятанкавых сілаў 50-й арміі ў сувязі з гэтым адзначалася: "Вялікі знос матэрыяльнай часткі перавысіў усе дазволеныя нормы эксплуатацыі, а адсутнасць магчымасці правесці яе тэхнічнае абслугоўванне прыводзіла да выключна вялікага расходу масла рухавікамі машын і да вялікага

працэнту выхаду машын са строю па тэхнічных прычынах"[83]. Сілы атрада адчувалі востры недахоп гаруча-змазачных матэрыялаў. Менавіта па гэтых прычынах наступленне атрада ў заходнім напрамку зацягвалася. Для выпраўлення гэтага становішча самалётамі У-2 была арганізавана дастаўка гаручага і масла для тэхнікі. 10 ліпеня 1944 г. бранятанкавыя сілы рухомага атрада налічвалі толькі 1 Т-34, 1 СУ-76, 5 СУ-85.

Пасля ўзяцця горада Шчучына армейскі рухомы атрад атрымаў загад наступаць у накірунку мястэчка Скідзель, заняць яго і прасоўвацца па трасе ў напрамку Гродна. 12 ліпеня атраду далі ўзмацненне ў якасці 398-га Гв. мінамётнага дывізіёна 100-га Гв. мінамётнага палка. Дывізіёнам камандаваў Гв. м-р Васільеў. На ўзбраенні дывізіёна стаялі ўстаноўкі БМ-13Н, вядомыя як "кацюшы". Устаноўкі дывізіёна размяшчаліся на базе амерыканскага трохвосевага грузавіка "Студэбекер".

Такім чынам камандаванне 2-ім Беларускім фронтам планавала авалодаць горадам Гродна з усходу сіламі 50-й арміі. Армія панесла значныя страты ў папярэдніх баях, была вельмі слаба ўмацавана бранятанкавымі сродкамі. Падраздзяленні арміі значна стаміліся. Праследаванне адступаючага праціўніка было арганізавана нязначнымі сіламі перадавога рухомага атрада. Аднак 50-я армія не была адзіным падраздзяленнем Чырвонай арміі, якое наступала на гродзенскім накірунку.

На поўнач ад падраздзяленняў 2-га Беларускага фронту, наступаў 3-ці Гв. кавалерыйскі корпус 3-га Беларускага фронту. 8-9 ліпеня 1944 г. падраздзяленні корпуса авалодалі горадам Ліда. Пасля гэтага корпус атрымаў загад наступаць у накірунку горада Гродна. У адрозненні ад пехоты корпус быў больш аператыўным злучэннем. Яго наступленне таксама праходзіла больш хуткімі тэмпамі.

Камандаванне кавалерыйскім корпусам вырашыла наступаць праз мястэчкі Васілішкі – Астрына і выйсці да горада з паўночнага-усходу. Справа ў тым, што тут распалагаўся вялікі лясны масіў (раён м. Парэчча – Азёры). Камандаванне корпусам спадзявалася, што немцы пакінуць выхады з масіва лесу непрыкрытымі[84]. Праўда, з іншага боку існавала рызыка, што падраздзяленні корпуса завязнуць у лясах і страцяць каштоўны час.

На самой справе наступленне 3-га Гв. кк праз лясныя масівы было вельмі складаным. Адсутнасць добрых дарог, балоты тармазілі прасоўванне тэхнікі. Кавалерысты вымушаны былі цягнуць гарматы на руках на працягу кіламетраў. Аднак спадзяванні на нечаканы прарыў да Гродна спраўдзіліся. Мінуючы лясны масіў кавалерыйскі корпус нечакана для немцаў выйшаў да в. Бершты.

3-ці Гв. кк быў вельмі моцным злучэннем. Усе падраздзяленні корпуса былі ці кавалерыйскімі, ці механізаванымі. Корпус складаўся з трох кавалерыйскіх дывізій. Кожная кавалерыйская дывізія была ўзмоцнена танкавымі палкамі (на ўзбраенні палкоў стаялі сярэднія танкі). На пачатак аперацыі "Баграціён" (22.06.1944 г.) у корпусе налічвалася да 95 танкаў і САУ (11 Т-34, 63 – Мк. III "Valentine–IX", 21 – СУ-76)[85]. Акрамя таго, у кожнай кавалерыйскай дывізіі знаходзіўся асобны зенітна-артылерыйскі дывізіён. Ён складаўся з батарэі 37-мм зенітных гармат (знаходзіліся пры штабе дывізіі) і 3-х эскадронаў крупнакаліберных кулямётаў ДШК, калібра 12,7-мм[86]. Гэтыя эскадроны дадаваліся кавалерыйскім палкам з мэтай павялічэння іх агнявай магутнасці. Кожны кулямётны эскадрон складаўся з 4-х кулямётаў ДШК, якія перавозіліся на тачанках. Універсальны кулямёт ДШК мог весці агонь як па паветраных цэлях, так і па наземных.

Кожны кавалерыйскі полк, у сваю чаргу, складаўся з 4-х эскадронаў, артылерыйскай батарэі. На ўзбраенні артылерыйскай батарэі стаялі 45-ці мм і 76,2-мм гарматы (узору 1939 г.). У 2-ім узводзе артылерыйскай батарэі 24-га Гв. кп стаялі на ўзбраенні дзве 45-мм гарматы. Для таго каб батарэя не адставала ад кавалерыйскіх эскадронаў, кожную гармату цягнулі 4 кані, яшчэ 2 кані цягнулі боекамплект. Цалкам укамплектаваны артылерыйскі ўзвод складаўся з 23 чалавек і 35 коней[87].

Паводле поўнага баявога складу, у кожнай кавалерыйскай дывізіі было па 6 тыс. чалавек, у корпусе – 21 тыс. чалавек і 19 тыс. коней[88].

Акрамя гэтага, падраздзяленні 3-га Гв. кк у час баявых дзеянняў у раёне Гродна павінна была прыкрываць цэлая 309-я зад (на 1 ліпеня 1944 года  мела 110 знішчальнікаў). Яе камандуючы палк. В.М. Вус для гэтага знаходзіўся на нп кавалерыйскага корпуса[89].

Як бачна з пераліку падраздзяленняў, кавалерыйскі корпус быў у стане самастойна вырашаць сур'ёзныя задачы. Маючы ўласныя бранятанкавыя сродкі ён мог нават супрацьстаяць танкавым дывізіям немцаў. Праўда ў ходзе правядзення аперацыі "Баграціён" танкавыя і самаходныя часці корпуса панеслі адчувальныя страты – уплываў хуткі тэмп наступлення і дрэннае абслугоўванне тэхнікі. Таму ў апісаных ніжэй падзеях яны амаль не ўдзельнічалі[90]. Сур'ёзныя страты меў корпус і ў асабовым складзе. Так колькасць некаторых палкоў скарацілася ў два разы (напрыклад, 24-й Гв. кп). Некаторыя эскадроны налічвалі толькі па 10 чалавек (!). Акрамя гэтага, з прычыны хуткага прасоўвання кавалерыйскіх частак, за імі не паспявалі многія часці падмацавання (у прыватнасці артылерыя). Тым не менш корпус не страціў свайго галоўнага козыра – аператыўнасці. Менавіта дзякуючы гэтаму ён заставаўся ў стане вырашаць складаныя самастойныя задачы і хутка рэагаваць на змяненні франтавых падзей.

Услед за дывізіямі 3-га Гв. кк наступалі злучэнні 31-й арміі 3-га БФ. Пехота 31-й арміі не адставала ад кавалерыстаў і выйшла на подступы да горада Гродна амаль адначасова.

*Нямецкія войскі*

Нямецкія сілы, якія супрацьстаялі наступаючым савецкім войскам на гродзенскім напрамку, былі разрозненымі і спустошанымі часткамі 4-й арміі. Яны панеслі вялікія страты ў папярэдніх баях. Камандаваў 4-й нямецкай арміяй г.-і К. фон Ціпельскірх (уступіў у камандаванне замест г.-п. Г. Хейнрыцы, які пайшоў у адпачынак, і камандаваў арміяй да 19 ліпеня 1944 года). Паводле дадзеных польскага гісторыка Т. Савіцкага, у 4-й нямецкай арміі з пачатку аперацыі "Баграціён" былі знішчаны ці разбіты 2 штабы корпуса і 11 дывізій[91]. У арганізацыйным плане злучэнні 4-й нямецкай арміі на гродзенскім напрамку ў пачатку ліпеня 1944 г. складаліся з баявой групы г.-арт. Гельмута Вейдлінга[92] і групы обрг-ра К. фон Готберга (у аператыўным плане падпарадкоўвалася г.-арт. Г.Вейдлінгу). Падрабязней пра склад групы г.-арт. Г. Вейдлінга глядзі ў дадатку.

Сярод найбольш баяздольных падраздзяленняў арміі, што супрацьстаяла перадавому атраду г.-л. А.А. Цюрына, была 50-я пяхотная дывізія, перакінутая на фронт з горада Перлеберг (Германія) у пачатку ліпеня, дзе яна была перафарміравана. Камандаваў дывізіяй г.-м. Г. Хаўс.

Акрамя 50-й дывізіі, савецкія часці, бесперапынна атакуючыя па фронту, стрымлівалі падраздзяленні 14-й пяхотнай матарызаванай дывізіі. Дывізіяй камандаваў г.-л. Г. Флёрке[93]. 14-я пмд была адной з нешматлікіх дывізій групы армій "Цэнтр", якой удалося хаця б часткова захаваць свае падраздзяленні пасля адступлення праз усю Беларусь[94]. На пачатак аперацыі "Баграціён" дывізія была адной з трох рэзервных дывізій групы армій "Цэнтр". Акрамя гэтых сіл, тут жа дзейнічалі падраздзяленні нямецкіх 12-й і 20-й танкавых дывізій (рэшткі 20-й тд аб'ядналіся з адыходзячай на поўдзень 2-й нямецкай арміяй). Адкатваліся ва ўсходнім накірунку і рэшткі разгромленых у раёне Магілёва і Мінскім катле 12-й пяхотнай (48-мы гп), 337-й пяхотнай, 21-й пяхотнай (12-ты гп) дывізій.

Другім падраздзяленнем, якое ўваходзіла ў гэты час у склад 4-й арміі была група обергрупэнфюрэра К. фон Готберга[95]. Спынімся больш дэтальна на гэтым цікавым армейскім фарміраванні. "Баявая група Готберга" не была звычайным франтавым падраздзяленнем. Сам камандуючы – обергрупэнфюрар Курт фон Готберг быў генеральным камісарам і кіраўніком паліцыі ў Цэнтральнай Расіі і Беларусі. На гэтым пасту ён змяніў Вільгельма Кубэ, забітага мінскімі падпольшчыкамі ў 1943 годзе.

Група обергрупэнфюрара К. фон Готберга была ўтворана ўвесну 1943 года. Складалася яна з паліцэйскіх палкоў СС і больш дробных фарміраванняў СС і паліцыі. Галоўнымі задачамі паліцэйскіх падраздзяленняў была ахова парадка на акупаваных тэрыторыях, збор зброі, барацьба з рухам супраціўлення і правядзенне ўласных карных аперацый. У выпадку цяжкага становішча на фронце паліцэйскія палкі маглі выкарыстоўвацца, для "стабілізацыі" становішча[96]. Паводле інфармацыі англійскага гісторыка М. Гібса, адна з першых згадак уласна групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга адносіцца да правядзення на тэрыторыі Беларусі акупацыйнымі нямецкімі сіламі карнікавай аперацыі "Герман" (7 ліпеня 1943 года ў раёне гарадоў Радашковічы, Заслаўль, Валожын)[97]. У сярэдзіне мая 1944 года (на момант правядзення аперацыі "Вясенні Фестываль" у раёне горада Лепеля) група ўключала ў сябе 2-гі, 24-ы, 26-ы паліцэйскія палкі СС, 31-шы (толькі 4-ты батальён) і 36-ты (толькі 2-гі батальён) паліцэйскія стралковыя палкі. Таксама ў групу ўваходзіла брыгада Камінскага, што складалася з добраахвотнікаў, набраных на тэрыторыі акупаванага СССР.

Паліцэйскія палкі СС былі сфарміраваны ў нямецкай арміі ў 1942 г. Фарміраваліся яны з немцаў. Так 2-гі, 17-ы, 22-гі, а таксама 4-ты (увайшоў у склад баявой групы К. фон Готберга пазней) палп СС складаліся з немцаў. У адрозненні ад іх, паліцэйскія стралковыя палкі былі сфарміраваны ў 1943 г. і камплектаваліся з прадстаўнікоў акупаваных тэрыторый, пад камандай нямецкіх афіцэраў. Пры абазначэнні гэтыя палкі не атрымоўвалі ў назве дадатак "СС". У склад баявой групы ўваходзілі 31-шы, 34-ты і 36-ты палсп. Так, напрыклад, 31-шы палсп баявой групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга складаўся з 1-га нямецкага, а таксама 2-га і 3-га батальёнаў дзе служылі беларусы (?) і ўкраінцы. 34-ты полк быў укамплектаваны згодна падобнага прынцыпу (1-ы батальён нямецкі, 2-гі і 3-ці - украінскія). 36-ты палсп фарміраваўся ў канцы 1943 г. на тэрыторыі Беларусі. Яго 2-гі і 3-ці батальёны былі ўкамплектаваны беларусамі.[98] Летам 1944 года пад камандваннем обергрупэнфюрара К. фон Готберга, акрамя паліцэйскіх палкоў, знаходзіліся паасобныя часці жандармерыі і дапаможнай паліцыі генеральнай акругі "Беларусь".

2 ліпеня баявая група перайшла ў аператыўнае падпарадкаванне 4-й арміі. Група обергрупэнфюрара К. фон Готберга павінна была ўтрымліваць горад Мінск, аднак гэтага не адбылося. Ужо 3 ліпеня Мінск быў вызвалены савецкімі войскамі. Праўдападобна, што ў момант адступлення нямецкай групы армій "Цэнтр" обергрупэнфюрар К. фон Готберг адмовіўся падпарадкавацца камандаванню VI-га нямецкага пяхотнага корпуса (пазней – група г.-арт. Г. Вейдлінга) і адвёў

падраздзяленні сваёй групы да чыгуначнай лініі Маладзечна – Ліда. 6 ліпеня група заняла свае пазіцыі ў раёне чыгункі. Аднак імклівае прасоўванне савецкіх войскаў, у прыватнасці ўзяцце Ліды сіламі 3-га кк, прымусіла К. фон Готберга адвесці паліцэйскія палкі ў бок Гродна.

Акрамя гэтых частак, у склад арміі уваходзіў XXXIX-ты танкавы корпус, што займаў абарону на поўнач ад Гродна па рацэ Нёман. Ён складаўся з 131-й, 170-й і рэштка 221-й пяхотных дывізій немцаў. Таксама корпусу падпарадкоўвалася і 5-я танкавая дывізія[99].

Пад Гродна ваяваў і 1-шы Усходнемусульманскі полк СС. Ён складаўся з Азербайджанскага і Волжска-Татарскага легіёнаў. Камандзір гэтага палка загінуў у баях пад Гродна[100]. Аднак больш поўнай інфармацыі знайсці не ўдалося.

Адну з першасных роляў у прыкрыцці адступаючых немцаў грала авіяцыя. Не зважаючы на цяжкія страты ў асабовым складзе і матэрыяльнай частцы, нямецкая авіяцыя прыкладала ўсе намаганні для таго, каб замарудзіць наступленне савецкіх армій. На працягу ўсіх наступных баёў у раёне Гродна немцы задзейнічалі наступныя авіяцыйныя злучэнні 6-га Паветранага флота Люфтвафэ:

→ 1-я група 1-й штурмавой эскадры (SG 1) – аэрадромы Коўна і “Дубава” у раёне горада Сувалкі

→ 2-я група 1-й штурмавой эскадры – аэрадром Сувалкі

→ 1-я група 4-й штурмавой эскадры (SG 4) – аэрадром горада Тыльзіта

→ 2-я група 4-й штурмавой эскадры – аэрадром горада Тыльзіта

→ 1-я група 10-й штурмавой эскадры (SG 10) - аэрадром Коўна.

На ўзбраенні гэтых падраздзяленняў былі самалёты-штурмавікі Ju-87 і FW-190F (у варыянце штурмавіка). У дзвюх групах SG 1 у канцы чэрвеня налічвалася 118 штурмавікоў. Таксама ў раёне Гродна дзейнічалі: 10-я супрацьтанкавая эскадрылля 3-й штурмавой эскадры (10(Pz.)/SG 3), 10-я супрацьтанкавая эскадрылля 1-й штурмавой эскадры (10(Pz.)/SG 1) з аэрадромамі ў Коўне і Дубава. Яны былі ўзброены Ju-87G з 37-мм супрацьтанкавымі гарматамі, ў кожнай эскадрыллі па 20 самалётаў.

Бамбардзіроўшчыкі 2-й (35 самалётаў) і 3-й груп 27-й бамбардзіровачнай эскадры (KG 27) дзейнічалі адпаведна з аэрадромаў гарадоў Нойхаўзен і Шыпенбайль ва Усходняй Прусіі. У гарадах Модлін і Нойхаўзен таксама базіраваліся 2-я (35 самалётаў) і 4-я групы 55-й бамбардзіровачнай эскадры (KG 55). Гэтыя эскадры былі ўкамплектаваны бамбардзіроўшчыкамі He-111.

Знішчальнае прыкрыццё выконвалі 1-я і 3-я групы 51-й знішчальнай эскадры (JG 51)[101]. На іх узбраенні стаялі 66 знішчальнікаў Ме-109 G6 (аэрадромы Крэвіца і Коўна).

Нягледзячы на тое, што камандаванне 4-й нямецкай арміі амаль не мела паўнакроўных фарміраванняў (за выключэннем 50-й пд), войскі страцілі большую частку цяжкага ўзбраення, былі дэмаралізаваны і стомлены, было вырашана спыніць савецкае наступленне, выкарыстоўваючы р. Нёман. Галоўным вузлом будучага наступлення планавалася зрабіць г. Гродна. Камандаванне арміі чакала моцных рэзерваў, якія былі паабяцаны штабам групы армій "Цэнтр".

### *б) Баі за мястэчка Скідзель*

У сувязі з тым, што злучэнні 50-й савецкай арміі выйшлі на бліжнія падыходы да горада Гродна, 12 ліпеня 1944 г. камандуючы арміяй г.-л. І.В. Болдзін паставіў сваім карпусам наступныя задачы:

69-ты ск павінен быў узаемадзейнічаць з правафлангавымі падраздзяленнямі 121-га ск, што рухаўся на поўдзень, і 13 ліпеня ўзяць Гродна;

121-шы ск – фарсіраваць раку Нёман, рухацца па яе паўднёвым беразе, выйсці да Занёманскага фардштата (левабярэжная частка горада), заняць в. Малахавічы – Капцёўка;

70-ты ск 13 ліпеня мусіў выйсці на мяжу мястэчка Індура, на поўдзень горада Гродна;

81-шы ск мусіў рухацца ў другім эшалоне за часткамі 69-га ск[102].

У адпаведнасці з гэтым загадам, 50-я армія павінна была рухацца па абодвух берагах ракі Нёман у заходнім напрамку. Па паўночным беразе наступалі – 69-ты і 81-шы ск, па паўднёвым – 121-шы і 70-ты ск. Трэба заўважыць, што тэрміны, якія паставіў камандуючы сваім войскам, – 13 ліпеня яны павінны былі ўзяць Гродна – былі мала выканальныя. Фактычна за суткі армія павінна была прайсці адлегласць 30 км, да таго ж авалодаць дастаткова вялікім горадам, які немцы, напэўна, збіраліся абараняць. Верагодна, г.-л. І.В. Болдзін лічыў, што нямецкія падраздзяленні хутка адступаюць і яны не ў стане аказаць якое-небудзь значнае супрацьдзеянне. Праўда, на правым флангу арміі вялікія сілы 3-га Гв. кк дасягнулі значнага прарыву і далёка абыйшлі немцаў, прарваліся ў в. Парэчча і выйшлі да прыгарадаў Гродна. Магчыма, камандуючы арміяй палічыў, што немцы пачнуць эвакуацыю Гродна, баючыся быць заціснутымі паміж падраздзяленнямі 3-га Гв. кк і дывізіямі 50-й арміі.

У авангардзе рухомага армейскага атрада г.-л. А.А. Цюрына 50-й савецкай арміі рухаліся дзве сярэднія САУ (СУ-85) з 1434-га сап,

частка 58-га зстап і роты аўтаматчыкаў. Далей ішлі асноўныя сілы атрада – 58-мы зстап і 398-мы Гв. мінамётны дывізіён. Г.-л. А.А. Цюрын меў інфармацыю пра адступленне па шашы на Скідзель нямецкіх 14-й пмд, 50-й пд і іншых падраздзяленняў 4-й нямецкай арміі. Таму ён вырашыў са сваім атрадам абысці немцаў і адрэзаць ім шляхі да адыходу. Для гэтага трэба было перакрыць шашу на ўсход ад Скідзеля. У выпадку поспеху перад падраздзяленнямі савецкай 50-й арміі подступы да Гродна заставаліся практычна непрыкрытымі немцамі.

Нямецкія войскі, між тым, пачалі падрыхтоўку будучых абараніцельных рубяжоў. Паводле інфармацыі нямецкага гісторыка Р. Хінцэ, падраздзяленні 14-й пмд (5-я і 6-я роты 1069-га гп) у сераду 12 ліпеня занялі абарону па заходнім беразе ракі Котра па поўдзень трасы Гродна – Ліда[103]. 7-я рота 1069-га палка на грузавіках рушыла да пераправы ў в. Коматава, дзе таксама заняла пазіцыі. Рота была ўзмоцнена групай цяжкіх кулямётаў і сярэдніх мінамётаў, батарэяй супрацьтанкавых і батарэяй лёгкіх гармат. Такім чынам, немцы стваралі перадмостнае ўмацаванне каля в. Коматава, куды адступалі падраздзяленні групы г.-арт. Г. Вейдлінга.

Першае сутыкненне групы г.-л. А.А.Цюрына з немцамі, што займалі абарону на поўдзень ад мястэчка Скідзель, адбылося ў раёне в. Пратасаўшчына. Каля 18.00 авангард рухомага атрада г.-л. А.А. Цюрына быў абстраляны нямецкай артылерыяй. Аднак узвод кіравання 58-га зстап пад камандаваннем л-та Жураўлёва нечакана для немцаў выйшаў на іх правы фланг і атакаваў. Баявая ахова 14-й нямецкай пмд адступіла, не прыняўшы бою, у накірунку в. Ахрымавічы і Прыступічы[104].

У гэты час немцы атакавалі рухомы атрад з тылу. Машыны 398-га Гв. мінамётнага дывізіёна рухомага атрада трапілі пад іх удар. Дарога была абстраляна нямецкімі мінамётамі і артылерыяй. Дзве машыны, што ішлі галоўнымі, былі падбітыя. Астатнія пяць машын – спыніліся. Апошняй у калоне рухалася рэактыўная ўстаноўка камандзіра Ігнацьева. Камандзір не разгубіўся і развярнуў машыну і адкрыў агонь па нямецкай пяхоце. Намеснік камандзіра дывізіёна па палітычнай частцы Гв. к-н Брыксін арганізаваў баявую групу з салдат і афіцэраў і заняў кругавую абарону. Дывізіёну прыйшлося тэрмінова заняць абарону з захаду і ўсходу і адбіць некалькі нямецкіх атак. Толькі тэрміновая дапамога камандзіра дывізіёна Гв. м-ра Васільева выратавала акружаных. Уведзеныя ў бой дзве ўстаноўкі БМ-13Н выратавалі становішча. Пасля некалькіх залпаў рэактыўных мінамётаў – "кацюш", што рассеялі атакуючых немцаў, перадавому атраду ўдалося вырвацца з акружэння[105].

Да вечара 12 ліпеня перадавы атрад г.-л. А.А. Цюрына сутыкнуўся з арганізаваным нямецкім супраціўленнем у раёне вышынь у в. Пяс-

чанка (вышыня 133.0). Супрацьтанкавай артылерыяй немцаў была падбіта адна з дзвюх савецкіх САУ. Каля 22.00 атрад г.-л. А.А. Цюрына заняў абарону па шашы Ліда – Гродна ў раёне в. Сікорыца – Пясчанка – Прыступічы.

У той жа час на шашу ў тыле передавога атрада выйшлі падраздзяленні 50-й нямецкай пяхотнай дывізіі (121-шы і 122-гі грэнадзёрскія палкі)[106]. У выніку перадавы атрад заціснулі з усходу і захаду нямецкія сілы. Ён быў вымушаны заняць абарону фронтам на ўсход. Г.-л. А.А. Цюрын аддаў загад 398-му Гв. дывізіёну і батарэям 58-га зстап заняць абарону ў раёне в. Сікорыца – Прыступічы і перашкаджаць адступленню сілам 50-й нямецкай пд.

Увечары пачаўся дождж. Цемра і лівень дапамаглі немцам наблізіцца да пазіцый рухомага атрада незаўважанымі. Нямецкія атакі па прарыву праз пазіцыі атрада г.-л. А.А. Цюрына пачаліся ў 22.30. Першая атака была адбіта дзякуючы выкарыстанню савецкімі войскамі рэактыўнай артылерыі. М.С. Навасёлаў, што служыў у той час у 398-м Гв. мінамётным дывізіёне, узгадваў: "…немцы нечакана аказаліся ў тыле нашага дывізіёна і з ходу адкрылі кулямётны і аўтаматны агонь. За лічаныя хвіліны мы страцілі каля двух дзесяткаў салдат і камандзіраў. Быў ранены камандзір дывізіёна маёр Васільеў, аднак з бою не выйшаў. Разам з намі адбіваліся ад ворага салдаты і афіцэры падраздзяленняў ствольнай артылерыі і яшчэ нейкіх частак. Мы былі перашкодай на шляху адступаючых на захад немцаў. Узнікла парадаксальная сітуацыя: цяпер адступаючыя немцы асцервянела наступалі на нас, а мы, наступаючыя, адступалі, адыходзілі назад. У нас не хапіла сіл іх стрымліваць, і мы былі вымушаны адвесці баявыя машыны ўбок ад шашы. Тым больш, што выкарыстоўваць іх у сумятні, калі ўсё перамяшалася, было немагчыма. Ішла ўжо рукапашная схватка, некалькі баявых машын, звярнуўшы з шашы, завязлі ў балоце. І каб яны не трапілі ў рукі немцаў, іх спалілі і ўзарвалі. У гэтым баі я застаўся жывы, аднак страціў добрага сябра Эпрыкяна, армяніна па нацыянальнасці. Ён здзейсніў гераічны ўчынак: засланіў сабой камандзіра ўзвода сувязі, лейтэнанта Аверкіна, застрэліў немца, які падскочыў амаль ушчыльную да камузвода, але іншы немец смяротна раніў Эпрыкяна"[107]. Пасля ранення камандзіра дывізіёна кіраўніцтва прыняў начальнік разведкі 100-га Гв. мінамётнага палка Гв. к-н Алейнік. Вёў бой і 4-ы Гв. ашісб Гв. ппалк. Белаконь. "Панцырная пяхота" і штурмавікі ўмела вялі шчыльны аўтаматычны агонь па наступаючай нямецкай пяхоце.

Баі з падраздзяленнямі нямецкай 50-й пд працягваліся ўсю ноч. 58-мы зстап, што ўваходзіў у склад атрада г.-л. А.А. Цюрына, узяў на сябе асноўны цяжар гэтых баёў. Паводле данясенняў у штаб




**12 ліпеня 1944г. Бой атрада ген. Цюрына. Нямецкі фронт па р. Котра**

5-й знішчальнай супрацьтанкавай брыгады, бой цягнуўся 10 гадзін, неаднаразова пераходзячы ў рукапашны. У гэтым баі артылерыйскі полк згубіў забітымі 8 афіцэраў і 63 сяржанты і радавыя. Практычна быў знішчаны 398-мы Гв. мінамётны дывізіён – былі спалены тры ўстаноўкі рэактыўных мінамётаў БМ-13Н, яшчэ дзве былі поўнасцю выведзены са строю. У дывізіёне засталася толькі адна спраўная машына. 20 чалавек былі забіты. Столькі ж паранены[108]. М.С. Навасёлаў успамінаў, што 398-мы Гв. мінамётны дывізіён страціў у гэтым баі 90% сваёй тэхнікі. Акрамя таго, увесь рухомы атрад страціў 3 самаходныя ўстаноўкі і 5 аўтамашын з боепрыпасамі[109].

На поўдзень ад шашы ў другой палове дня рухомы атрад 64-й Магілёўскай сд 70-га ск (2-гі батальён 440-га сп і 1902-гі самаходна-артылерыйскі полк), наступаў з в. Ражанка і заняў в. Ка-

менка[110]. Да поўначы ў в. Каменка падцягнуліся ўсе сілы дывізіі. Такім чынам часці нямецкай 50-й пд, што вялі баі па прарыву ў напрамку Гродна, аказаліся пад пагрозай знішчэння з поўдня.

Раніцай 13 ліпеня спробы нямецкай 50-й пд прарвацца на захад і на поўдзень узнавіліся. Па-геройску дзейнічаў экіпаж СУ-85. Гэта была апошняя ўстаноўка, што засталася ў рухомым атрадзе. Калі ў самаходцы скончыліся боепрыпасы, яна гусеніцамі пачала давіць нямецкую пяхоту.

Пасля двух гадзін бою, раніцай 13 ліпеня, у атрадзе г.-л. А.А. Цюрына скончыліся боепрыпасы і паліва. На шчасце савецкіх войскаў, з усходу пачалі падыходзіць сілы 23-й Гв. атбр Гв. палк. Козікава, што ўваходзіла ў склад атрада г.-л. А.А.Цюрына разам з ротамі 238-й сд, аднак адстала. Становішча ў атрадзе г.-л. А.А.Цюрына было на самой справе вельмі цяжкім. Маёр А.В. Скабельцын са 238-й сд у ліпені 1944 года камандаваў авангарднымі ротамі. Атрад генерала А.А. Цюрына адарваўся ад іх. Толькі ноччу 13 ліпеня пяхота 238-й дывізіі і танкі 23-й Гв. атбр падышлі да месца бою мабільных сілаў рухомага атрада. Ноччу атрад маёра А.В. Скабельцына сутыкнуўся з нямецкім абозам на падыходзе да Скідзеля. Завязалася перастрэлка. І савецкія, і нямецкія падраздзяленні аказаліся заціснутымі, нагадваючы "пластовы пірог". У гэты ж час атрад г.-л. А.А. Цюрына вёў цяжкі бой з палкамі 50-й нямецкай дывізіі. Маёр А.В. Скабельцын успамінаў: "Калі мы выйшлі з доміка, радзіст раптам мне паведаміў, што тэлефануе Цюрын, які гаворыць адкрытым тэкстам. Я ўзяў трубку радыёстанцыі і пачуў: "Я, Цюрын! Я, Цюрын! Адказвай, з якой ты дывізіі?" Мой кодавы адказ яго не задаволіў, і ён спытаў яшчэ раз: "З якой ты дывізіі, гэта не ты вёў бой ноччу на ўсход ад Скідзеля, што ў цябе ёсць?" Адказваю – "Я Краснаштанавец (па прозвішчу камандзіра 238-й сд), бой ноччу пад Скідзелем вёў я, у мяне ёсць усё." Зноў Цюрын: "Я знаходжуся на высотцы ў лесе ў 1 км на ўсход ад Скідзеля, "Кацюшы" спаліў, абараняюся кацюшынцамі, тэрмінова дзейнічай, калі праз 30 хвілін цябе не будзе, то мяне таксама не будзе"[111].

З паўднёвага ўсходу да месца начнога бою падышоў таксама і рухомы атрад 70-га ск. Здавалася б, умела праведзеная аперацыя скончылася поспехам. Аднак, менавіта, у гэты момант камандзір рухомага армейскага атрада г.-л. А.А. Цюрын загадаў адступіць з шашы на поўдзень, каб вызваліць немцам дарогу. Гэта было выклікана тым, што ў падраздзяленнях у складзе атрада былі вялікія страты, скончыліся боепрыпасы і паліва. Сілы нямецкай 50-й дывізіі прарваліся на паўднёвы захад, у накірунку да м. Лунна, дзе яны фарсіравалі р.Нёман. Страты немцаў у баі з рухомым атрадам былі ацэнены савецкім камандаваннем ў 700 чалавек забітымі, 120 палоннымі. Савецкімі войскамі былі захоплены 16 гармат з цягамі і да 150 падводаў[112].

Пасля кароткай перадышкі, папаўнення боепрыпасамі і палівам рухомы атрад працягнуў наступленне. 23-я Гв. атбр выйшла да в. Пясчанка. Пры ўваходзе ў мястэчка Скідзель савецкія войскі ізноў павінны былі спыніцца. Мост праз р.Скідлянка быў узарваны немцамі. Нягдедзячы на тое, што рака была невялікая, фарсіраваць яе тэхнікай не ўдалося. З цэнтра мястэчка немцы адкрылі агонь. Аднак бой працягваўся нядоўга. Каля 13.00 13 ліпеня мястэчка Скідзель было занята. Рухомы атрад выйшаў да ракі Котра, якую ён фарсіраваў у той жа дзень. Далейшае наступленне было спынена моцным нямецкім агнём. На наступны дзень рухомы атрад быў расфарміраваны. Яго часці былі размеркаваны ў падраздзяленні 81-га ск 50-й арміі.

Разам з рухомым атрадам у мястэчка Скідзель уварваліся і палкі 238-й сд. Адразу пасля ўступлення ў мястэчка немцы пачалі яго абстрэл з-за ракі Котра, якая працякала ў 1 км на захад ад населенага пункта. З'явіліся нямецкія самалёты. Абстрэл вуліцы Гродзенская, дзе рухаліся савецкія войскі, працягваўся да вечара. У адказ, з наступленнем цемры, з мястэчка Скідзель (раён в. Гліняны) адкрылі агонь па нямецкіх батарэях савецкія "кацюшы".

Мястэчка Скідзель было ўзята пасля напружаных баёў на падыходах да яго. Падраздзяленні нямецкай 14-й пмд занялі абарону на захадзе – па рацэ Котра. Узяцце гэтага населенага пункта фактычна адкрывала савецкімі войскамі шлях на г. Гродна. Немцы, аднак здолелі выйсці з акружэння і адступіць на ўсход. Акрамя таго, баі за м. Скідзель дазволілі немцам выйграць час. Група г.-л. Г. Флёрке паспела стварыць абарончы рубеж у раёне в. Жытомля (у 10 км на ўсход ад Скідзеля). Частка сіл нямецкай групы пачала перапраўляцца на супрацьлеглы бераг р. Нёман.

У пятніцу 14 ліпеня 238-я сд, умацаваная 23-й Гв. атбр і 233-ім атп, 1444-ым і 1434-ым сап пры падтрымцы 16-га Гвардзейскага гап, пачала фарсіраванне ракі Котра ў раёне мястэчка Скідзель – в. Котра. У канцы дня адзін з палкоў дывізіі фарсіраваў раку. Пры фарсіраванні Котры дапамогу войскам аказалі салдаты і афіцэры 3-га і 5-га асобных штурмавых інжынерных сапёрных батальёнаў (1-й Гв. ашісбр). Будаўніцтва перапраў праходзіла ў складаных умовах, пад нямецкім агнём. Пры гэтым 5-ты Гв. ашісб страціў 3 чалавек забітымі[113]. Два палкі 238-й сд працягвалі знаходзіцца на ўсходнім беразе ракі ў раёне в. Некрашы, на поўнач ад мястэчка Скідзель. Адначасова пачаліся работы па ўзнаўленні чыгуначнага маста праз раку Котра, узарванага немцамі пры адступленні. Дапамогу ў будаўніцтве аказвалі таксама і жыхары мястэчка. У Скідзелі размясціўся штаб 121-га ск г.-м. Д.І. Смірнова. У раён Скідзеля пачалі падыходзіць астатнія сілы савецкай 50-й арміі. На поўнач ад населенага пункта (у раёне в. Юрэвічы – Лакно) выйшлі 42-я і 153-я сд 69-га ск.

14 ліпеня да в. Пясчанка (за 5 км на ўсход ад Скідзеля) выйшлі падраздзяленні 199-й сд 70-га ск. Яны паспрабавалі адсекчы адыходзячыя на захад нямецкія злучэнні[114]. Аднак немцы, выкарысталі нешматлікую бранятэхніку (бронетранспарцёры), а таксама моцны артылерыйскі агонь, змаглі прарваць абарону савецкай дывізіі і адысці. Асноўны цяжар гэтых баёў выпаў на роту Гв. л-та В.І. Дзячкова. Рота адбіла 5 нямецкіх атак, аднак панесла вялікія страты. У гэтым баі загінуў і сам камандзір роты[115]. Магчыма, згаданыя нямецкія падраздзяленні былі 2-ім дывізіёнам (дзве лёгкія і дзве цяжкія батарэі) 14-га ап, што прарваліся з “Мінскага катла” і вывезлі цяжкую зброю і боепрыпасы[116]. На поўдзень ад Скідзеля часці 718-га сп 139-й Чырвонасцяжнай Раслаўльскай сд 121-га ск выйшлі да в. Пузавічы (цяпер в. Партызанская).

Такім чынам, у выніку баёў з удзелам падраздзяленняў 50-й арміі г.-л. І.В.Болдзіна 12-13 ліпеня 1944 года ўдалося выйсці на адлегласць аднаго дзённага пераходу да Гродна. На жаль, савецкім войскам не ўдалося адсечы адступаючыя нямецкія войскі і тым самым палегчыць сваё будучае наступленне. Ударная сіла армейскага рухомага атрада г.-л. А.А. Цюрына – бранятанкавыя сілы – былі вельмі нязначнымі па колькасці, расцягнуліся ў час маршу з-за паломак і недахопу паліва-змазачных матэрыялаў і не змаглі своечасова перашкодзіць прарыву 50-й нямецкай дывізіі. Беластоцкая франтавая аперацыя працягвалася і войскі 2-га БФ усё бліжэй падыходзілі да Гродна. Праўда, прарыў да горада здзейснілі падраздзяленні 3-га БФ. Менавіта ім удалося прарвацца да ваколіцаў Гродна першымі.





**Обергрупэнфюрар Курт фон Готберг**

**Генерал Г.Вейдлінг.**



**Генерал Г. Хаўс, камандзір 50-й пд**



**Маёр Х. Эгелейн. Камандзір PzAA 12**



**Камандзір 14-й пяхотной матарызаванай дывізіі г.-л. Г. Флёрке**



Камандуючы 50-й арміяй генерал І.В.Болдзін



Член ваеннага савета 50-й арміі – г.-м. А.І.Карамышаў



Генерал А.А.Цюрын, намеснік камандуючага 50-й арміі



Наступленне савецкіх войск пад Гродна ў ліпене 1944 г. 45-мм супрацьтанкавыя гарматы на коннай цязе.



СУ-85.1944 год

# РАЗДЗЕЛ 3.

# БАІ ЗА ГОРАД ГРОДНА

## *а) Баі на рубяжы в. Жытомля-Верцялішкі*

З выхадам савецкіх войскаў да Гродна і фарсіраваннем ракі Нёман (апошняй вялікай воднай перашкоды на гэтым накірунку) з'явіліся перспектывы для прасоўвання не толькі да даваенных межаў СССР, але і да тэрыторыі Германіі – Усходняй Прусіі. Натуральна, гэта выклікала заклапочанасць нямецкага камандавання, якое імкнулася не дапусціць лініі фронту да межаў Рэйха.

Сілы 4-й нямецкай арміі, якая адыходзіла ў напрамку Гродна, былі занадта малымі, каб стрымліваць падраздзяленні Чырвонай арміі, што імкліва рухаліся наперад. Найбольшую пагрозу для левага фланга немцаў уяўляў 3-ці Гвардзейскі кавалерыйскі корпус Гв. г.-л. М.С. Асलікоўскага[117], прыданы 3-му Беларускаму фронту. Тым не менш, камандаваннем нямецкай арміі 10 ліпеня было вырашана стварыць фронт на ўсход ад Гродна па лініі Лунна – Азёры – Парэчча – Ліскева (в. Лішкява, на поўнач ад Гродна па рацэ Нёман). Для гэтага меркавалася выкарыстаць загараджальную групу г.-арт. Г. Вейдлінга на правым флангу і паліцэйскую групу обергрупэнфюрара К. фон Готберга – на левым.

Як ужо адзначалася, гэтыя часці 4-й арміі, былі значна аслаблены папярэднімі баямі і панеслі вялікія страты ў цяжкай зброі. Аднак камандаванне нямецкай арміі спадзявалася на прыбыццё танкавых злучэнняў. Яны павінны былі спыніць савецкае наступленне і стабілізаваць фронт на подступах да межаў Усходняй Прусіі.

Аднак планам нямецкага камандаванння не было наканавана пераўтварыцца ў жыццё. Нямецкія войскі не змаглі заняць усю лінію меркаванага фронту на адрэзку Лунна – Азёры – Парэчча – Ліскева. Непрыкрытым застаўся адрэзак абарончай лініі ад в. Хамуты (за 2 км на поўнач ад воз. Белае) да ракі Нёман у в. Ліскева. Левафлангавы 22-гі паліцэйскі полк СС з групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга не здолеў своечасова злучыцца з баявой паліцэйскай групай СС

оберста Г. Ганібала, што ўтрымліваў сувязь з нямецкім XXXIX-ым танкавым корпусам, які займаў пазіцыі ніжэй па цячэнні ракі. Сутык паміж двума нямецкімі карпусамі застаўся непрыкрытым. Яго і выкарыстала савецкае камандаванне для прарыву. Менавіта тут нанеслі ўдар кавалерысты, што рухаліся наперадзе.

Першымі да горада Гродна падышлі з паўночнага ўсходу злучэнні 3-га Гвардзейскага кавалерыйскага корпуса і дывізіі 31-й арміі (г.-п. В.В. Глаголеў) 3-га Беларускага фронту. Так у баях на падыходах да горада прымалі ўзел 174-я, 220-я і 352-я дывізіі 36-га стралковага корпуса. 174-я Барысаўская дывізія была сфарміравана ў трэці раз летам 1943 года. 220-я дывізія была перафарміравана з мотастралковай. Дарэчы, арганізавана дывізія была яшчэ ў красавіку 1941 года з ураджэнцаў Заходняй Беларусі і Украіны.

Кавалерыйскі корпус з 9 ліпеня знаходзіўся ў падпарадкаванні камандуючага 31-й арміі. Згодна дырэктыве 3-га БФ корпус павінен быў да канца 13 ліпеня 1944 года заняць горад Гродна ўдарам з поўначы. Акрамя таго, корпус павінен быў захапіць плацдарм на левым беразе Нёмана ў раёне горада. У задачу 31-й арміі ўваходзіла вылучыць моцныя перадавыя атрады, якія павінны былі замацавацца на рубяжах, якія занялі кавалерысты.

**12 ліпеня** 1944 года перадавыя падраздзяленні кавалерыйскага корпуса Гв. г.-л. М.С. Асліко̆ўскага нанеслі ўдар з раёна в. Бершты па непрыкрытаму немцамі лясістаму ўчастку фронту ў паўднёва-заходнім напрамку ў раён в. Парэчча, не даўшы немцам як след замацавацца. Праз Парэчча праходзіла чыгунка ў накірунку горада Вільня. Захоп станцыі пераразаў камунікацыі 4-й нямецкай арміі. Таму захоп станцыі быў неабходнай умовай для далейшага наступлення.

Верагодна, у вёсцы і на чыгуначнай станцыі Парэчча знаходзіліся батальёны 22-га палп СС. Аднак ніякай нямецкай абароны станцыі не існавала. Паводле ўспамінаў Гв. г.-л. М.С. Асліко̆ўскага, атака Парэчча была праведзена “імгненным ударам”[118]. 28-мы Гв. кп і 198-мы атп 6-й кд занялі в. Парэчча практычна без бою да 11 гадзін дня[119]. Першымі на станцыю ўварваліся эскадроны Гв. к-наў Я.М. Нӗўмоева, Шэпелёва і Крывенкі. Танкі 198-га атп атакавалі проста па чыгунцы[120]. На чыгуначнай станцыі былі кінуты некалькі саставаў: немцы не паспелі іх знішчыць. Адзін з іх быў з танкамі T-IV[121]. Акрамя гэтага, кавалерыйскія часці захапілі і харчовыя прыпасы. Камандзір кулямётнага ўзвода ДШК 6-й кд л-т Хаім Гарэлік успамінаў: “Па дарозе, пры ўзяцці станцыі Пажэч’е (Парэчча – Д.Л.) захапілі першыя харчовыя трафеі ў нямецкіх вагонах. Надоўга запасліся партугальскімі сардынамі і смачнымі мяснымі кансервамі”[122].




**12-13 ліпеня 1944г., савецкая атака ст. Парэчча. Нямецкі фронт Скідзель-Азёры**

Камандаванне 4-й нямецкай арміі паспрабавала ў спешцы арганізаваць атаку з наяўных рэзерваў. Кінутыя немцамі ўвечары ў раён прарыву разрозненыя сілы (з раёна горада Друскенікі – часткі 48-га грэнадзёрскага палка, рота 78-й штурмавой дывізіі групы В. Остэрхольда[123] XXXIX-га тк, з Гродна – 2-гі батальён 17-га паліцэйскага палка СС[124]) аказаліся не ў стане яго ліквідаваць і вярнуць станцыю Парэчча. Батальён 17-га паліцэйскага палка к-на Стрэкера, верагод-

на, адступіў у Гродна, не ўтрымаўшы пазіцый. Такім чынам, спробы немцаў ліквідаваць гэты прарыў не далі вынікаў.

Астатнія сілы кавалерыйскага корпуса таксама падыходзілі да месца баёў. Так 5-я Гв. кд у гэты час выйшла да в. Новая Руда (за 10 км на паўднёвы ўсход ад в. Парэчча). Яе перадавыя атрады знаходзіліся ў раёне в. Рыбніца. 32-я Смаленская кавалерыйская дывізія скончыла фарсіраванне ракі Котра і прасоўвалася ў другім эшалоне корпуса ў раёне в. Бершты[125].

Такім чынам прарыў да станцыі Парэчча 3-га Гв. кк стварыў перадумовы для хуткага ўзяцця Гродна ўдарам з поўначы. Немцы да гэтага не былі гатовы.

**13 ліпеня** разгарэліся баі на ўсход ад горада Гродна па лініі фронта в. Котра – Губінка – Азёры. Наступленне на гэтым накірунку вялі дывізіі 50-й савецкай арміі. На гэтым участку абараняліся падраздзяленні нямецкай групы г.-л. Г. Флёрке (часткі 14-й дывізіі і 1069-ты грэнадзёрскі полк), а таксама часткі 2-га паліцэйскага палка СС (на паўночным флангу). На поўдні да палкоў групы г.-л. Г. Флёрке далучыліся 121-шы і 122-гі гп 50-й нямецкай дывізіі. Аднак хутка нямецкія падраздзяленні вымушаны былі адступіць[126] на новую лінію абароны, якая праходзіла праз в. Верцялішкі – Табала – Жытомля.

Асаблівай сілы дасягнулі баі за в. Жытомля (за 19 км на ўсход ад Гродна). Праз вёску праходзіла чыгунка Гродна – Масты, а таксама дарога са Скідзеля на Гродна. Да раніцы 13 ліпеня на рубеж р. Пыра, што працякала непадалёку ад Жытомлі, выйшлі перадавыя часці савецкай 290-й Магілёўскай ордэна Чырвонага сцяга сд г.-м. І.Г. Гаспарана. У авангардзе яе падраздзяленняў рухаліся 878-мы стралковы і 1420-ты артылерыйскія палкі. Немцы пабудавалі абарону вёскі ў 2 эшалоны: асноўную пазіцыю – па вышынях на паўночны ўсход ад Жытомлі, перакрываючы дарогу Скідзель – Гродна (яна праходзіла праз чыгуначную станцыю Жытомля), і далей на поўдзень праз чыгунку і праз шашу Ліда – Гродна. Перад гэтай пазіцыяй размясціліся дазоры нямецкай пяхотнай матарызаванай дывізіі. Савецкія крыніцы ўзгадваюць, што абарону пазіцыі занялі 1065-ты, 1068-мы і 1069-ты грэнадзёрскія палкі, якія былі перакінуты ў раён Гродна з-пад Варшавы[127]. Згодна нямецкай інфармацыі на станцыі і вёсцы Жытомля ўмацавалася група палк. Г. Трэптава (рэшткі 101-га грэнадзёрскага палка, 2-гі батальён 1065-га гп, 2-гі батальён 1068-га гп).

Зыходзячы з характару нямецкай абароны, камандзір 878-га стралковага палка ппалк. М.Г. Хамулы вырашыў атакаваць нямецкія пазіцыі на ўчастку паміж шашой і чыгункай сіламі двух батальёнаў. Пасля кароткай артпадрыхтоўкі 1-шы і 3-ці батальёны прарвалі лінію баявой аховы немцаў і да поўдня выйшлі да чыгуначнай станцыі

Жытомля[128]. Рухацца далей савецкая пяхота не здолела з-за моцнага нямецкага агню. Працытуем ппалк. М.Г. Хамулы: "Па інтэнсіўнасці і дакладнасці артылерыйска-мінамётнага абстрэлу было ясна, што праціўнік добра падрыхтаваў свае рубяжы. Ды і абсталяваць абарону таксама паспеў. На асобных адрэзках мясцовасці, асабліва на бачных з нашага боку схілах пагоркаў, у бінокль былі відаць паўнапрофільныя і старанна замаскіраваныя траншэі. Актыўнасць жа кулямётнай стральбы сведчыла пра тое, што ў абароне праціўніка дастатковая колькасць гэтага віду зброі. Асабліва лютавалі фашысцкія кулямёты на чыгуначнай станцыі Жытомля. Адтуль адначасова білі некалькі ручных і адзін буйнакаліберны кулямёты. Да таго ж цагляны двухпавярховы будынак станцыі заўважна ўзвышаўся над мясцовасцю. А гэта давала магчымасць фашыстам праглядаць з яго гарышча не толькі баявыя пазіцыі палка, але і наш глыбокі тыл, карэктаваць агонь сваёй артылерыі"[129].

Некалькі лабавых атак чыгуначнай станцыі ні да чаго не прывялі. Полк ппалк. М.Г. Хамулы быў вымушаны залегчы. Пасля гэтага камандаваннем дывізіі было прынята рашэнне атакаваць Жытомлю ў ноч з 13 на 14 ліпеня, пры гэтым задзейнічаць і 882-гі сп пад камандваннем ппалк. Ф.М. Сцефаненка для абыходу немцаў з правага фланга і ўдару па населеным пункце Жытомля.

13 ліпеня баі пачаліся таксама ўздоўж паўночнай ускраіны Гродна за в. Малышчана, Кульбакі Лапенкі, Путрышкі, сяло Верцялішкі, дзе праходзіў першы нямецкі рубеж абароны горада. Сюды прарваліся злучэнні 3-га Гв. кк і перадавыя злучэнні 31-й арміі.

Фронт непазбежна набліжаўся да Гродна. Немцы праводзілі спешную эвакуацыю. Жыхар горада Я. Карпюк запісаў у гэты дзень у сваім дзённіку: "Каля дзвюх гадзін паказалася эскадрылля з 30 самалётаў. Яны накіроўваліся на ўсход. Самалёты былі нямецкія – значыць, недалёка павінны былі знаходзіцца перадавыя часткі. Мы хваляваліся за маму і Галю, якія засталіся дома. Пачалі прыбягаць з горада заклапочаныя людзі, якія таксама шукалі сховішча. Хутка прыйшлі і нашы. Мама расказвала мне, што ў горадзе паніка, што падаюць снарады і што першы ўпаў каля пошты. Стрэлы станавіліся часцейшымі. Над горадам з'явіліся нашы самалёты. Уверсе ўспыхвалі малочныя воблакі ад ўзрываў снарадаў. Было зразумела, што немцы адкрылі агонь з зянітак. Збоку з'явіліся нямецкія самалёты, а нашы, зрабіўшы круты паварот, пайшлі насустрач. Распачаўся паветраны бой. Было чуваць выццё матораў і траскатня кулямётаў"[130].

Нямецкія сілы, што абаранялі бліжэйшыя падыходы да Гродна з поўначы, былі размешчаны наступным чынам: 2-гі батальён 17-га палп СС займаў пазіцыі па ўсходнім беразе ракі Нёман (ад в. Астравок

да мястэчка Гожа, кантралюючы дарогу ў накірунку м. Друскенікі), 1-шы батальён таго ж палка займаў в. Грандзічы. Тут жа размясціўся і 1-шы зянітны дывізіён СС гаўптштурмфюрэра Г. Фібінгера. 22-гі палп СС (два батальёна) заняў пазіцыі у раёне в. Путрышкі. Камандаванню палка быў падпарадкаваны зводны батальён 530-га гп, які заняў раён в. Вялікая Капліца. У раёне в. Касцёлаўшчызна заняў пазіцыі 2-гі батальён 1068-га гп. Матарызаваны батальён палявой жандармерыі і батальён 51-га ахоўнага палка рыхтавалі абарону ў раёне маёнтка Станіславова[131]. Нямецкі гісторык В.Ваперсаль адзначаў, што ў раёне сяла Верцялішкі абараняліся 2-гі палп СС і 529-ты батальён м-ра Венкеля з 299-й дывізійнай групы[132].

Вядома, што ў раёне в. Путрышкі – Капліца – Грандзічы немцы выкарыстоўвалі для абароны лінію Гродзенскай крэпасці, што засталася тут з часоў Першай сусветнай вайны. На гэтым адрэзку яна ўяўляла сабой пас невялікіх бетонных бліндажоў, ніш для боепрыпасаў, назіральных пунктаў, злучаных паміж сабой ланцугом акопаў з калючым дротам. Такім чынам, нямецкае камандаванне мела на пазіцыях у раёне Гродна вельмі нязначныя сілы – каля трох-чатырох пяхотных палкоў няпоўнага складу. У савецкай літаратуры нямецкі гарнізон Гродна дасягаў проста фантастычных памераў – каля 6 дывізій (!), уключаючы танкавую дывізію СС "Мёртвая галава", якая ў гэты час наогул не скончыла сваю перадыслакацыю ў раён горада[133]. У артыкуле, прысвечаным вызваленню Гродна ў энцыклапедычным даведніку "Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941 – 1945" колькасць нямецкіх дывізій па фронце Гродна – Свіслач наогул дасягае – 10 штук (!)[134].

Кавалерысты пасля прарыву ў в. Парэчча завязалі баі за бліжэйшыя падыходы да горада Гродна. 13 ліпеня савецкая 6-я Гв. кд Гв. г.-м. П.П. Брыкеля выйшла на лінію в. Грандзічы – вышыня 181.4 – Лапенкі – Малышчана – Кульбакі (зараз усе гэтыя вёскі знаходзяцца ў межах горада). Кантралюючы шэраг вышынь і выкарыстоўваючы кулямёты, немцы спынілі наступленне савецкіх войск. Кавалерыя вымушана была спешвацца і займаць пазіцыі. Прарваць нямецкую абарону з ходу не ўдалося. 23-ці Гв. кп 6-й Гв. кавалерыйскай дывізіі страціў у баях на гэтым рубяжы 8 кавалерыстаў[135]. На гэтых пазіцыях кавалерысты занялі некаторыя ўмацаванні Гродзенскай крэпасці. Так Гв. ст. с-т Д.К. Памагайка, які служыў у артылерыйскай батарэі 45-мм гармат 6-й Гв. кд успамінаў: "І вось пад Гродна мы ўжо вялі абстрэл нямецкіх пазіцый, там была якаясьці вышыня, казалі, што раней тут стаялі царскія войскі, мы выцягнулі гарматы на ўзвышша. І горад, праз раку Нёман, быў нам відаць, як на далоні, мы па ім стралялі"[136].

Увечары перадавая ўзмоцненая рухомая група 352-й сд 31-й арміі

выйшла на мяжу Лісіная Гара – Верцялішкі – вышыня 174.0. Група складалася са стралковага батальёна 1160-га сп, разведвальнай роты і пяці артылерыйскіх батарэй 914-га ап на механізаванай цязе (амерыканскія грузавікі "Студэбекер")[137]. Рухомай групай камандаваў намеснік камандзіра дывізіі па палітычнай частцы палк. А.С. Логінаў. Разам з падраздзяленнямі 352-й сд рухаліся і злучэнні 5-й Гв. кд. Так 17-ты Гв. кп Гв. ппалк. М.Ц. Шаўчэнка 13 ліпеня выйшаў да ваколіц вёсак Путрышкі – Ялаўшчызна, разам з 22-ім Гв. кп. Да в. Казіміроўка – Баяры выйшаў 24-ты Гв. кп. Пачаліся баі за в. Путрышкі, якую кавалерысты атакавалі з паўночнага ўсходу. Аднак першыя атакі вёскі скончыліся беспаспяхова. Нямецкім пяхотным падраздзяленням эфектыўна дапамагала свая авіяцыя. На працягу дня 22-гі Гв. кп згубіў у баях за вёску 8 чалавек забітымі[138]. 65-ты кп 32-й Смаленскай кд – падышоў да сяла Верцялішкі[139].

Нягледзячы на тое, што першыя савецкія атакі не здолелі прарваць нямецкую абарону, немцы не чакалі такога імклівага прасоўвання савецкіх падраздзяленняў. Яны арганізоўвалі абарону ў спешцы, прыцягваючы для павелічэння трываласці фронту новыя падраздзяленні. Так для адбіцця атак кавалерыі нямецкае камандванне выкарыстала 12-ы танкавы разведвальны батальён пад камандваннем м-ра Г. Эгелійна[140]. Разведвальны батальён уяўляў сабой моцнае механізаванае злучэнне. Ён складаўся з 5 ротаў: штабной, 1-й разведвальнай, 2-й разведвальнай (лёгкай), 3-й разведвальнай і 4-й роты падтрымкі (цяжкай). У батальёне налічвалася 122 бронетранспарцёры SdKfz 250, 251, 222, 223 і 232[141].

Ужо раніцай 13 ліпеня камандванне групы г.-арт. Г. Вейдлінга аддало загад аб падпарадкаванні PzAA 12 групе обергрупэнфюрэра К. фон Готберга. Батальён павінен быў спыніць кавалерыйскія атакі ў раёне на поўнач ад Гродна. Для правядзення атакі камандзір батальёна м-р Г.Эгелійн падзяліў падраздзяленне на тры часткі: 1-я павінна была забяспечыць дарогу на ўсход ад горада на адлегласць да 10 км; 2-я – атакаваць у паўночным накірунку (в. Грандзічы); 3-я – павінна была кантраляваць раён в. Вялікая Капліца. Контрудар сіламі танкавага батальёна быў нанесены з раёна в. Грандзічы.

У 16.22 2-я група разведвальнага батальёна заняла Грандзічы. Пасля гэтага сілы групы пачалі прасоўвацца ва ўсходнім напрамку. Тут нямецкія бронетранспарцёры трапілі пад агонь савецкіх кавалерыстаў. Працытуем баявое данясенне батальёна: "16.49. У 16.30 у раёне 24 (*зашыфраванае абазначэнне вышыні 181,4* – Д.Л.) дзве супрацьтанкавыя гарматы, два супрацьтанкавыя ружжы і стралкі. Адзін наш бронетранспарцёр падбіты"[142]. Такім чынам немцы панеслі стра-

ты, а сілы кавалерыйскай дывізіі патроху працягвалі прасоўвацца ў накірунку Грандзіч. Ужо ў 17.30 баі праходзілі ў 80 м на ўсход ад вёскі. Нямецкія бронетранспарцёры стрымлівалі атакі кавалерыстаў. У данясеннях PzAA 12 адзначалася, што яны вялі "цяжкі бой" на гэтым рубяжы. Паводле баявога данясення 6-й Гв. кд ад 13 ліпеня, штаб дывізіі ацэньваў сілы немцаў у два батальёны, падтрыманыя танкамі (да 15 адзінак) і зенітнымі ўстаноўкамі на шасі транспарцёраў. Штаб кавалерыйскай дывізіі паведамляў, што ў выніку адбіцця контратакі быў выведзены са строю 1 нямецкі танк. Як відаць, нямецкія бронетранспарцёры былі прынятыя за танкі. Танкаў, аднак, на ўзбраенні нямецкіх танкавых разведвальных батальёнаў не было.

Вечарам савецкая кавалерыя атакавала в. Верцялішкі і Путрышкі. Атакі в. Верцялішкі 65-ым кавалерыйскім палком была адбіта сіламі паліцыі. Тут абараняліся 2-гі батальён 2-га палп СС і батальён 529-га гп. Камандзір 1-га эскадрона 65-га кп ст. л-т І.Я. Паўлаў узгадваў: "У в. Верцялішкі наш полк сустрэў упартае супраціўленне праціўніка, які меў да батальёна пяхоты падтрыманы мноствам кулямётаў і мінамётаў, і быў вымушаны прыпыніць далейшае прасоўванне..."[143]

У выніку ж атак вышынь каля в. Путрышкі праз нямецкую абарону прарваліся кавалерысты 17-га, 22-га і 24-га палкоў, пацясніўшы батальёны 22-га палп СС. Выкарыстоўваючы слабы сутык паміж 22-ім палп СС, што абараняўся ў в. Путрышкі, і 2-ім палп СС, які сваім левым флангам займаў в. Верцялішкі, чырвоныя кавалерысты прарваліся і раз'ядналі нямецкія паліцэйскія палкі. У гэтай атацы кавалерысты дзейнічалі сумесна з рухомым атрадам 352-й савецкай сд.

У выніку атакі кавалерыя перарэзала дарогу Гродна – Азёры, якая адыгрывала істотную ролю ў абароне паўночна-ўсходніх падыходаў да горада. Згодна нямецкай інфармацыі праз нямецкую абарону прарваліся два эскадроны з артылерыяй і супрацьтанкавымі гарматамі. Немцы спешна кінулі ў прарыў трэцюю частку 12-га танкавага разведвальнага батальёна. Аднак гэта контратака скончылася безпаспяхова. Савецкая артылерыя надзейна абараняла кавалерыстаў і не давала магчымасці немцам наступаць. Гэты бой апісаў у сваіх успамінах камандзір мінамётнага ўзвода агітатар 24 Гв. кп старшына Д.І. Вадзінскі: "Праціўнік увёў у бой танкі і штурмавыя гарматы (*размова ізноў ідзе пра бронетранспарцёры PzAA 12 –* Д.Л.). Некалькім танкам праціўніка ўдалося прарвацца і наблізіцца да агнявой пазіцыі мінамётчыкаў. Пайшлі ў ход супрацьтанкавыя гранаты. 2 танкі ахуталіся дымам, іншыя палівалі нас смертаносным свінцом. Да нас на выручку падаспела супрацьтанкавая батарэя старшага лейтэнанта Мікалая Агафонава... У гэтым баі загінула шмат мінамётчыкаў, частка атрымала раненні. Вялікія страты былі




**13 ліпеня 1944г. Савецкая атака рубяжа Грандзічы-Верцялішкі**

і ў іншых падраздзяленнях палка"[144]. У гэтых жа баях (пры налёце нямецкай авіяцыі) загінуў намеснік камандзіра 24-га Гв. кп па палітычнай частцы м-р Мікалай Фёдаравіч Выдайка. Пасмяротна ён быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

У 4 гадзіны раніцы 14 ліпеня немцамі была запланавана новая атака кавалерыстаў, якія прарваліся. Для яе былі прыцягнуты ўсе сілы 12-га танкавага разведвальнага батальёна (на пазіцыях засталіся толькі бронетранспарцёры батальёна ў Грандзічах). Гэтая атака скончылася паспяхова. Савецкія кавалерысты вымушаны былі адступіць. Контратакай нямецкія бронетранспарцёры адкінулі савецкія падраздзяленні на зыходныя пазіцыі і ачысцілі ад іх вышыні на поўнач ад в. Путрышкі. Такім чынам немцы палепшылі становішча 22-га паліцэйскага палка, які панёс вялізныя страты і з цяжкасцю ўтрымліваў свае пазіцыі.

Камандаванне нямецкай 4-й арміі разумела недахоп сілаў для абароны Гродна. Таму было вырашана накіраваць у раён Гродна 5-ю танкавую дывізію нямецкага XXXIX-га танкавага корпуса, што вяла баі на левым флангу 4-й арміі. Першапачаткова немцы планавалі перакінуць дывізію па ўсходнім беразе Нёмана. Такім чынам яна павінна была ударыць у тыл падраздзяленням Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскага, якія выйшлі да Гродна.

У авангардзе 5-й танкавай дывізіі па дарозе на Ротніцу – Гожу – Гродна наступаў 5-ты танкавы разведвальны батальён пад камандваннем к-на Ф. Фэсмана. Услед за ім выступіў 2-гі батальён 14-га тгп. Разведвальны танкавы батальён здолеў бесперашкодна прайсці да м. Гожа (на поўнач ад горада). Аднак батальён грэнадзёраў, што ішоў за ім, сутыкнуўся з савецкімі войскамі, якія ўжо выйшлі да ракі Нёман на фронце на поўдзень г. Меркіне – Ротніца. Сілаў батальёна было недастаткова для таго, каб прарвацца да Гродна. Таму батальён 14-га тгп быў вымушаны вярнуцца назад[145].

Штаб 5-й тд, улічваючы што дарога на Гродна занята савецкімі войскамі, аддаў распараджэнне аб прасоўванні падраздзяленняў па заходнім беразе ракі. Такім чынам нямецкія планы павялічыць гарнізон у Гродна былі сарваны. Да горада дайшоў толькі разведвальны батальён. У ноч на 14 ліпеня ў раёне горада Меркіне 5-я дывізія пераправілася на левы бераг ракі Нёман. Пасля гэтага яна пачала рух на поўдзень. Яе задача была ў тым, каб не дапусціць фарсіравання р. Нёман савецкімі войскамі.

Выхад кавалерыі на паўночныя подступы да Гродна рабіў бессэнсоўным утрыманне нямецкай арміяй лініі фронта на ўсход ад горада. Зыходзячы з гэтага, камандуючы арміяй г.-і. К. фон Ціпельскірх (знаходзіўся на камандным пункце г.-арт. Г.Вейдлінга ў в. Кашэўнікі, размешчанай за 4 км ад Гродна вышэй па плыні ракі Нёман) дазволіў адвесці войскі арміі далей на захад да выгіну ракі – каля горада Нёман крута паварочвае на поўнач. Гэтым манёўрам немцы спадзяваліся скараціць лінію фронту і адарвацца ад савецкіх войск. Аднак гэты загад толькі канстатаваў дадзены стан рэчаў – сілы групы і без таго адкатваліся ў заходнім накірунку. Нягледзячы на спробы павялічэння сваёй групоўкі ў раёне Гродна 13 ліпеня (выкарыстоўванне 12-га і ў перспектыве 5-га разведвальных танкавых батальёнаў), камандаванне 4-й арміі не спадзявалася ўжо ўпарта абараняць горад. Аднак штаб групы армій “Цэнтр” меў на гэты конт іншыя планы. Немцы пачалі планаваць стварэнне трывалага фронту па плыні ракі Нёман. 13 ліпеня г.-ф. Вальтэр Модэль[146], з 28 чэрвеня камандуючы разам з групай армій “Паўночная Украіна” яшчэ і групай армій “Цэнтр”, прызначыў г.-арт. Г.Вейдлінга ваенным

камендантам Гродна. Генералу быў дадзены загад "...**умацаваны пункт** (*маецца на ўвазе г. Гродна* – Д.Л.) **трымаць абавязкова**"[147]. Аднак увесь цяжар будучых баёў за ўтрыманне немцамі г. Гродна клаўся на паліцэйскія палкі групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга, якія дзейнічалі на паўночным абводзе горада. Падраздзяленні ж г.-арт. Г. Вейдлінга пасля баёў за в. Жытомля адкаціліся на поўдзень, да выгіну ракі Нёман, і пачалі яго фарсіраванне. У баях за сам горад яны ўдзелу не прымалі. Безумоўна, гэты загад штаба групы "Цэнтр" быў проста невыканальным. Немцам проста не хапала сілаў для абароны такога вялікага горада. Адзінае, на што яны яшчэ маглі спадзявацца, дык гэта на затрымку савецкага наступлення.

**14 ліпеня** падраздзяленні 3-га Гв. кк працягвалі весці баі на падыходах да горада Гродна. Не маючы дастатковых сілаў, каб стрымліваць савецкае наступленне, немцы актыўна выкарыстоўвалі сваю авіяцыю. Ветэраны 174-й сд узгадвалі: "Авіяцыя праціўніка кантралявала ўсе падыходы да горада, наносіла моцныя бомбавыя ўдары па конніцы (*маецца на ўвазе кавалерыя 3-га кк* – Д.Л.), абстрэльвала з кулямётаў"[148].

Яшчэ з раніцы разгарэліся жорсткія баі за в. Путрышкі. Атаку наносіў 12-ты разведбатальён. Раніцай савецкія падраздзяленні вымушаны былі пакінуць вёску. Атакуючыя нямецкія бронетранспарцёры паглыбіліся ў савецкія пазіцыі на 2-4 км. Аднак камандванне 5-й Гв. кд вельмі хутка арганізавала сустрэчную контратаку. З поўначы вёску атакавалі палкі кавалерыйскай дывізіі, а з паўночнага ўсходу – падраздзяленні 352-й сд. Вельмі жорсткія баі разгарэліся на ўзвышшах на поўнач ад в. Путрышкі, дзе знаходзіліся ўмацаванні Гродзенскай крэпасці. 1158-мы полк 352-й дывізіі атакаваў вышыню 170.0 (пазіцыі форта № XI). Савецкія атакі пачаліся ў 6 гадзін раніцы. Яны адбіваліся немцамі толькі дзякуючы бронетранспарцёрам PzAA 12. І нямецкая абарона не вытрымала. Каля 18.00 22-гі палп СС вымушаны быў адступіць. Увечары рэшткі батальёнаў 22-га паліцэйскага палка СС злучыліся з батальёнам 2-га палп СС, заняўшы новую лінію абароны, якая праходзіла праз цэнтр в. Путрышкі. Згодна нямецкім данясенням страты чырвонай кавалерыі і пяхоты дасягнулі 450 чалавек. Былі знішчаны 7 супрацьтанкавых гарматаў, 4 лёгкія гарматы, больш за 50 кулямётаў, 30 павозак і 10 аўтамабіляў[149]. Страты разведвальнага танкавага батальёна, на жаль, невядомыя.

На працягу ўсяго дня шлі цяжкія баі таксама і за сяло Верцялішкі[150]. Падраздзяленні 32-й кд на працягу дня вялі баі за гэтае сяло. Разам з імі наступаў 1162-гі стралковы полк 352-й дывізіі. Пасля няўдалай папярэдняй атакі вёскі, кавалерысты 65-га палка правялі новую атаку больш арганізавана. Ёй папярэднічала кароткая артылерыйская

падрыхтоўка, праведзеная артылерыяй 65-га кп: батарэяй 45-мм, 76-мм гармат і 82-мм мінамётаў. Затым, паводле ўспамінаў ст. л-та І.Я. Паўлава, "...эскадрон у конным строі з шашкамі нагала і воклічамі "За Радзіму!" спачатку паўзводна, а з набліжэннем да праціўніка па камандзе: "Усе ў розныя бакі" (*рассыпаліся ў ланцуг* – Д.Л.) уварваліся ў вёску. Наш эскадрон заняў паўднёва ўсходнюю ўскраіну вёскі, а справа, памятаю, дзейнічаў 4-ты эскадрон к-на М.Г. Штыфанава. Усё гэта адбылося нечакана для праціўніка, і ён не змог адразу ўтрымаць імклівы націск нашых эскадронаў. Але, спахапіўшыся, адкрыў бязлітасны агонь з усіх відаў зброі, якая засталася непадаўленая нашай артмінпадрыхтоўкай (*артылерыйскай і мінамётнай падрыхтоўкай* – Д.Л.). Каб не несці бессэнсоўныя страты, мы перадалі коней каняводам і працягвалі атакаваць праціўніка ў пешым строі. Прасоўвацца было вельмі цяжка з-за шчыльнага агню, часам немагчыма было падняць галаву. Узводы былі прыціснуты да зямлі. Бой ішоў з пераменным поспехам. Руху эскадрона перашкаджаў станкавы кулямёт, што займаў выгадную пазіцыю. Ацаніўшы абстаноўку бою і праявіўшы ініцыятыву, неперад высунуўся са станкавым кулямётам радавы Філіпаў. Трапным агнём ён заглушыў гэтую агнявую кропку, аднак сам загінуў"[151]. Эскадрон пасля гэтага перайшоў у атаку і заняў вёску. Але прасунуцца далей кавалерыстам не ўдалося. 2-гі батальён 2-га палп СС і батальён 529-га палка адступіўшы, зноў занялі абарону. У баі гэтага дня 1-шы эскадрон страціў забітымі 4 чалавекі, яшчэ 6 былі паранены. Страты немцаў склалі больш за 20 чалавек забітымі. Акрамя таго, у сяле былі захоплены два станкавыя кулямёты і пяць аўтамашын. У баях за Верцялішкі прымаў удзел і 927-мы САП (камандзір ппалк. Ф.А. Легеза, начальнік штаба Гв. м-р Басаў). На ўзбраенні палка стаялі лёгкія самаходкі СУ-76. У баях за сяло адна самаходка была падбіта. Механнік-вадзіцель с-т М.К. Лупенка забіты[152]. 1162-гі полк 352-й дывізіі страціў у гэтым баю 30 чалавек забітымі і 70 – параненымі.

З накірунку в. Путрышкі наступленне падраздзяленняў 5-й Гв кд, 65-га кавалерыйскага палка і 352-й стралковай дывізіі стрымлівалі батальёны 22-га палп СС, батальён 530-га гп, і дзве роты PzAA 12 (штабная і 4-я роты). Выкарыстанне немцамі бронесілаў значна павялічвала іх магчымасці і баявую моц падраздзяленняў. Бронетранспарцёры забяспечвалі ў першую чаргу дарогу Азёры – Гродна, якая была адзінай камунікацыяй нямецкіх войскаў у гэтым раёне. Бронесілы былі выведзены з бою ў Гродна толькі ў 1.00 ночы 15 ліпеня[153].

Тым часам, да падраздзяленняў кавалерыі, што вырваліся наперад, сталі падыходзіць стралковыя часці. 14 ліпеня палкі 352-й дывізіі займалі наступныя пазіцыі: 1158-мы сп – в. Ялаўшчына, Капліца, вы-

шыня 170.0; 1162-гі сп – заходняя ўскраіна сяла Верцялішкі і на ўсход ад сяла; 1160-ты сп у раёне в. Галаўнічы[154]. Увечары 1158-мы сп 352-й сд заняў в. Ялаўшчына і распачаў абход в. Путрышкі з паўночнага захаду ў напрамку в. Малая Капліца[155].

628-мы і 508-мы сп савецкай 174-й Барысаўскай сд пад каманадваннем палк. М.І. Дзёміна 36-га ск 31-й арміі падышлі да акраіны в. Дзевятоўка (зараз адзін з мікрараёнаў горада), узмацніўшы, такім чынам, баявыя парадкі кавалерыстаў. 1-шы і 2-гі батальёны 508-га сп атакавалі вёску, аднак вымушаны былі залегчы пад фланкіруючым агнём нямецкіх кулямётаў з цагельнага заводу.

Яшчэ з канца XIX ст. гэта было самае буйное прадпрыемства па выпрацоўцы цэглы ў горадзе. Немцы вырашылі выкарыстаць гэта прадпрыемства, якое знаходзілася на падыходах да горада. Мясцовасць перад ім выдатна кантралявалася кулямётным агнём. Сам завод складаўся з некалькіх цагляных будынкаў (у цяперашнім горадзе гэта раён вуліцы Дубко, будынкі завода не захаваліся) з высокімі трубамі. Удзельнікі атакі заводу ўспаміналі, што ў сценах будынкаў немцы зрабілі бетонныя амбразуры, прыстасаваўшы іх да абароны. Будынкі завода былі акружыны дзвюма лініямі траншэяў. Такім чынам, цагельны завод быў адным з ключавых пунктаў нямецкай абароны. Абарону тут трымалі матарызаваны батальён палявой жандармерыі і батальён 51-га ахоўнага палка. Некалькі спробаў атак завода батальёнамі 174-й дывізіі скончыліся безпаспяхова[156]. Аднак і немцы панеслі адчувальныя страты. У гэтых і папярэдніх баях матарызаваны батальён палявой жандармерыі страціў 9 чалавек забітымі, 75 параненымі і 14 прапаўшымі без вестак[157].

6-я Гв. кд у гэты дзень поспеху не мела. 28-мы Гв. кп вёў баі на падыходзе да в. Дзевятоўка – Касцёлаўшызна. Моцны нямецкі агонь з цагельнага завода не даваў магчымасці працягваць наступленне. Спыніў наступленне і 23-ці Гв. кп. Абарона матарызаванага батальёна палявой жандармерыі (цагельны завод - Станіслававова) была вельмі эфектыўнай. 25-ты Гв. кп знаходзіўся на паўднёва-ўсходняй ускраіне в. Грандзічы і на працягу дня выйшаў да в. Пярэселка. У савецкіх данясеннях фігуруюць 6 нямецкіх танкаў, якія двойчы атакавалі палкі 6-й дывізіі на працягу дня. Хутчэй за ўсё гаворка ідзе пра бронетранспарцёры 12-га танкавага разведвальнага батальёна, якія кантралявалі дарогу Грандзічы – Гродна. Страты дывізіі за дзень склалі: спалена САУ і падбіты танк са 198-га атп, спалена санітарная машына. Страты асабовага складу – адзін чалавек забіты і два паранены[158]. Відавочна, менавіта на правы фланг 6-й Гв. кд (25-ы полк), а таксама падраздзяленні 32-й кд, якія выходзілі да ракі Нёман, прыйшоўся ўдар 5-га танкавага разведвальнага батальёна, які

прарываўся ад Друскенікаў да Гродна, праходзячы па дарозе праз м. Гожа да в. Грандзічы. Адкінуўшы на некаторы час гэтыя часці, разведвальны батальён прайшоў у Гродна, дзе пераправіўся на заходні бераг па гарадскім мосце.

Атакі савецкіх войск праводзіліся і з накірунку в. Грандзічы. Жыхар Гродна Я. Карпюк, які знаходзіўся ў гэтыя дні ў раёне Крэйдавых гор (*распрацоўка радовішча крэйды на ўскраіне горада* – Д.Л.), успамінаў: "… Гаспадар наш увечары заўважыў у полі два нямецкія танкі тыпу Тыгр. Адзін з іх стаў насупраць нас і замаскіраваўся"[159]. Безумоўна, цяжкіх танкаў T-VI "Tiger" тут быць не магло. Хутчэй за ўсё гэта зноў жа былі бронетранспарцёры 12-й ці 5-й тд. У ноч на 14 ліпеня бронетранспарцёры занялі пазіцыі ўздоўж р. Нёман па ўсходнім беразе. Адтуль яны вялі агонь па савецкай пяхоце, што з'яўлялася з боку в. Грандзічы і Пярэселка (зараз гэтыя вёскі знаходзяцца ў рысе горада).

Нягледзячы на тое, што савецкія войскі трапілі пад удар разведвальнага батальёна, 2-гі батальён 17-га палп СС групы абергрупэнфюрара К. фон Готберга пад камандаваннем к-на Стрэкера быў вымушаны звярнуць сваё перадмаставое ўмацаванне на ўчастку Астравок – Гожа і пераправіцца на заходні бераг ракі пад націскам падыходзячых савецкіх частак. Такім чынам, задача групы абергрупэнфюрара К. фон Готберга ўтрымаць Гродна і пазіцыі на паўночны захад ад горада па рацэ Нёман значна ўскладніліся.

На працягу папярэдніх баёў паліцэйскія батальёны групы "Готберг" панеслі вялікія страты. Вольфганг Ваперсаль цытуе вячэрняе данясенне штаба паліцэйскай групы ў штаб 4-й арміі, дзе, у прыватнасці, паведамлялася: "…сур'ёзныя прарывы фронту, з улікам чаканых моцных атак ворага, якія будуць працягвацца, ставяць пад пытанне далейшую паспяховую абарону…"[160] Увечары ў штабе групы армій "Цэнтр" у горадзе Ломжа было прынята рашэнне адвесці аслабленую паліцэйскую групу абергрупэнфюрара К. фон Готберга з Гродна на заходні бераг ракі Нёман[161]. Безумоўна, планы немцаў на абарону Гродна праваліліся.

У гэты час 69-ты і 81-шы карпусы 50-й арміі г.-л. І.В. Болдзіна набліжаліся да горада Гродна з усходу. Дывізіі арміі пасля баёў на працягу дня займалі пазіцыі: 153-я і 42-я сд – в. Казловічы – Жытомля, 95-я і 290-я сд – Жытомля – Абуховічы. Такім чынам, дывізіі 50-й арміі знаходзіліся на адлегласці 15-17 км ад Гродна[162].

Працягваліся баі за Жытомлю. Запланаваная напярэдадні атака 878-га палка 290-й дывізіі пачалася ў 3.15, за гадзіну да ўзыходу сонца. Ветэраны дывізіі ўспамінаюць: "З першых жа хвілін праціўнік аказаў нам упартае супраціўленне. Як мы даведаліся пазней, ён усю ноч чакаў пачатку

нашых атак. На першы наш залп імгненна адгукнуліся некалькі батарэй праціўніка, застрачылі дзесяткі варожых кулямётаў. Лавіна свінца і металу ўдарыла па ланцугах наступаючых батальёнаў”[163]. У выніку гэтай атакі роты 3-га батальёна к-на Дзюсенава ўварваліся на станцыю Жытомля. 9-я рота распачала баі ў самім будынку. Пасля боя, які цягнуўся да 14.15, станцыя была занята. Роты 1-га батальёна к-на Хірнага занялі нямецкія траншэі. Атака вёскі, аднак, вынікаў не дала. Не дапамог увод у бой і другога эшалона. Немцы прадпрынялі контратаку, якую падтрымлівалі 3 танка (згодна ўспамінаў ветэранаў дывізіі). Наогул, на працягу дня немцы, пры падтрымцы бронясілаў, сем разоў контратакавалі палкі 290-й дывізіі, аднак змяніць становішча на сваю карысць не змаглі. На самой справе так званыя “танкі” былі бронетранспарцёрамі 12-га разведвальнага батальёна. Справа ў тым, што штаб карпусной групы г.-арт. Г. Вейдлінга, занепакоены прарывам абароны групы палкоўніка Г. Трэптава, загадаў перакінуць на гэты ўчастак частку PzAA 12. Згодна загаду 1-я рота батальёна ў 19.00




**13-14 ліпеня 1944г. Баі 290-й сд за Жытомлю**

выйшла да трасы Ліда – Гродна на поўнач ад в. Абухава.

Цяжкія баі праходзілі і на фронце 42-й сд, якая наступала на паўночным адрэзку фронту. Так на працягу 14 ліпеня немцы некалькі разоў пераходзілі ў контратакі. Падчас адной з іх яны прабіліся да каманднага пункта 2-га батальёна 459-га Верхнедняпроўскага сп ппалк. Казлова. Быў забіты камандзір батальёна м-р М.М. Шушарын і 3 афіцэры[164]. У гэтым баі вылучыўся чырвонаармеец – стралок 7-й роты І.А. Шыраеў, які сваім агнём не дапусціў захопу каманднага пункта. За гэты бой ён быў прадстаўлены да ўзнагароды ордэнам Славы 2-й ступені[165].

Яшчэ больш адсталі дывізіі 121-га ск г.-м. Д.І.Смірнова. На працягу дня 238-я Карачаўская сд з часцямі ўзмацнення вяла баі за в. Котра (за 2-3 км на захад ад Скідзеля)[166]. Да канца дня вёска была ўзята. У гэтым жа месцы адзін з палкоў дывізіі фарсіраваў р. Котра. Астатнія сілы дывізіі заставаліся на ўсходнім беразе. На левым флангу баі вяла 139-я сд. Упартыя баі за вёску і раку Котра тлумачацца тым, што яна размяшчалася на трасе Ліда – Гродна. Немцы не маглі дапусціць, каб савецкія войскі авалодалі ею.

Новы дзень – **15 ліпеня** – пачаўся з моцнага тумана. За некалькі крокаў нічога не было відаць. Толькі каля 9 гадзінаў раніцы ён разышоўся. Галоўныя намаганні савецкіх войск былі накіраваны на прарыў нямецкай абароны вакол Гродна і штурм горада. З гэтага дня падраздзяленні кавалерыйскага корпуса Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскага па рашэнні Стаўкі пераходзілі ў падпарадкаванне камандавання 2-га Беларускага Фронту[167]. Дывізіі корпуса працягвалі атакі горада Гродна з поўначы. Так кавалерыйскія палкі Гв. г.-м. М.С. Чапуркіна з боем цалкам ачысцілі ад немцаў в. Путрышкі. На працягу баёў за вёску 17-й Гв. кп страціў 22 кавалерысты і 2 афіцэры забітымі[168]. З гэтага напрамку да горада заставалася толькі 4-5 км. Для ўмацавання лініі фронту з горада ў накірунку вёскі немцамі былі высланы падмацаванні (ва ўспамінах удзельнікаў баёў з савецкага боку - нямецкае афіцэрскае вучылішча) колькасцю да батальёна пяхоты. Аднак гэта падраздзяленне не паспела заняць абарону і было ўшчэнт разбіта кавалерыстамі[169]. Вось як успамінаў гэтую атаку камандзір 2-й батарэі 178-га артылерыйска-мінамётнага палка ст. л-л М.Г. Гарабчук: “Палкавыя разведчыкі (*24-га Гв. кп* – Д.Л.) выявілі калону нямецкай пяхоты, чалавек восемсот, што спускалася па супрацьлегламу склону, нам на перарэз. Ткаленка загадаў спыніцца і падрыхтавацца да бою. Укрытыя дамамі і дрэвамі, паросшымі ўздоўж патоку, не будучы заўважанымі праціўнікам, эскадроны, батарэі разгарнулі свае агнявыя сродкі. Не падазраваючы аб небяспецы, калона ворага спусцілася палогім касагорам на шырокі луг і, не размыка-

ючы строю, спынілася насупраць на адлегласці двухсот метраў. У гэты момант на яе абрынуўся лівень аўтаматнага, кулямётнага, гарматнага агню. Пяць хвілін і ад немцаў засталіся толькі трупы на шырокім беларускім лузе"[170].

На ўсход ад кавалерыстаў наступала 352-я сд г.-м. М.М. Стрыжэнкі. Цікава адзначыць, што ў складзе дывізіі ваявала і 138-я асобая армейская штрафная рота[171]. У выніку баёў 14-15 ліпеня савецкія палкі выйшлі да в. Путрышкі з паўднёвага ўсходу, занялі гай, на поўнач ад дарогі праз Верцялішкі і першую лінію абароны немцаў на гэтым напрамку. На працягу начы 1-шы батальён 1158-га сп праз багну выйшаў да вёскі Малышчына. Контратакі немцаў адбівалі батарэі гаўбіц і пушак, падцягнутыя ў пярэднія шэрагі пяхоты[172]. На гэтым жа накірунку дзейнічаў і 927-мы САП. У баях ён страціў бранявік Ба-64. Камандзір ст. с-т А.П. Ваганаў быў забіты[173].

6-я Гв. кд працягвала прадпрымаць атакі на фронце в. Грандзічы – Дзевятоўка. На працягу дня 23-ці Гв. кп страціў 8 чалавек з радавога і сяржанцкага складу[174]. 25-ы Гв. Апшэронскі кп раніцай уварваўся ў в. Грандзічы. Супраць кавалерыстаў немцы кінулі 5-ы танкавы разведвальны батальён пад камандаваннем к-на Ф. Фэсмана. Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскі пісаў, што атакі немцаў "пацярпелі няўдачу". Немцы, у сваю чаргу, адзначалі, што адкінулі кавалерыстаў і ўварваліся ў Грандзічы, заняўшы палову вёскі[175]. Па ўспамінах камандзіра ўзвода кулямётаў ДШК 6-й Гв. кд л-та Х. Гарэліка, падчас адной з нямецкіх контратак на падыходах да горада 25-ты Гв. Апшэронскі кп Гв. ппалк. М.П. Ляліна ў паніцы адступіў: "Мы падымаліся ўверх па схілу ў накірунку горада і амаль дайшлі да водападзелу, як насустрач нам у беспарадку хлынула маса салдат, а наперадзе ўсіх бег з пісталетам у руках камандзір палка Лялін. Я саскочыў з каня і спытаў: "У чым справа, таварыш падпалкоўнік?" Ён спыніўся і разгублена пракрычаў: "Падняліся ў атаку… маса немцаў!" – "Ну дык што? – кажу я. – Давайце спынім салдат, а я ўдару з кулямётаў". Лялін прыйшоў у сябе, павярнуўся тварам да салдат, якія ў паніцы беглі за ім. Мы спынілі салдат, Лялін стаў прыводзіць іх у парадак. А я падняў кулямёты на водападзел і адкрыў шквальны агонь па наступаючых немцах"[176]. Нямецкая контратака была адбіта. Камандзір 1-га эскадрона 65-га кп ст. л-т І.Я. Паўлаў узгадваў, што становішча 6-й Гв. Кд у той дзень "істотна пагоршылася"[177]. За дзень палкі дывізіі страцілі 17 чалавек забітымі і 77 – параненымі. Былі знішчаны 3 станковыя і 2 ручныя кулямёты, 2 СТР.

174-я Барысаўская сд палк. М.І. Дзёміна наступала на фронце Станіслававa – цагельны завод, разам з кавалерыстамі 6-й Гв. кд. Галоўны цяжар баёў неслі матарызаваныя ўзводы батальёна палявой жандармерыі (поўны склад гэтага падраздзялення глядзі ў апошняй главе).

Каралеўскі маёнтак Станіславова – адна з былых рэзідэнцый апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага – размяшчаўся на паўночным усходзе ад Гродна (зараз гэты будынак знаходзіцца ва ўласнасці аграрнага ўніверсітэта). Пад час акупацыі горада немцы арганізавалі тут "арбайтсамт" – бюро па ўліку і размеркаванні рабочай сілы для адпраўкі ў Германію. У 1944 годзе будынак быў прыстасаваны для абароны. Акопы апаясвалі маёнтак. Тут жа знаходзіліся і кулямётныя кропкі. Штурмаваў Станіславова 495-ты сп ппалк А.П. Булаўка. Баі за маёнтак працягваліся 4 гадзіны. Толькі пасля таго, як рота аўтаматчыкаў абышла немцаў з флангаў, маёнтак удалося ўзяць[178]. 508-мы і 628-мы сп дывізіі, разам з кавалерыстамі, занялі цагельны завод. Немцы зрабілі 6 контратак з мэтай вярнуць яго. Усе яны былі адбіты. Асабліва ў гэтым баі вылучыўся камандзір гарматнага разліку с-на С.Я. Нікулін. Падчас бою ён застаўся адзін з ліку прыслугі гарматы і падбіў тры нямецкія гарматы і кулямёт.

Бой за Гродна фактычна быў выйграны. Немцы не мелі дастатковых сіл нават для далейшага стрымлівання савецкіх часцей. Увечары яны пачалі выводзіць свае падраздзяленні з горада. Я. Карпюк узгадваў, што пад вечар на заходні бераг Нёмана перапраўіліся нямецкія танкі ў раёне Крэйдавых гор (знаходзяцца на заходняй ускраіне горада на беразе Нёмана)[179].

Такім чынам, злучэнні 36-га корпуса 31-й арміі выйшлі да Гродна з поўначы і паўночнага ўсходу. Наогул, трэба адзначыць, што дывізіі 36-га ск увязлі ў баяў за Гродна. Горад жа знаходзіўся ў зоне адказнасці 2-га БФ і 50-й арміі. Аднак армія адставала. Згодна загаду камандуючага 3-ім Беларускім фронтам, 31-я армія павінна была фарсіраваць Нёман усімі сваімі сіламі. Камандуючы 31-й арміяй вырашыў штурмаваць Гродна разам з кавалерыйскім корпусам.

Неабходна адзначыць, што абарона немцамі пазіцый каля в. Грандзічы – Путрышкі была дастаткова трывалай, каб вытрымаць першы націск савецкіх перадавых частак. 13-14 ліпеня дасягнуць тут значных поспехаў савецкім падраздзяленням не ўдавалася, нягледзячы на іх колькасную перавагу. Гв. г.-л. М.С. Асліноўскі тлумачыў гэта актыўнасцю нямецкай авіяцыі і "...бесперапынным фланкіруючым агнём праціўніка з Верцялішак"[180]. Нельга не сказаць і пра істотную ролю 12-га танкавага разведвальнага батальёна. Менавіта дзякуючы гэтаму падраздзяленню немцы здолелі так доўга абараняць бліжэйшыя подступы да горада.

Таксама трэба адзначыць, што немцы не выкарыстоўвалі ў абарончых баях на бліжэйшых подступах да горада танкі ці САУ, пра што неаднаразова ўзгадвалі ўдзельнікі баёў за горад. Так, Гв. г.-л.

М.С. Асλікоўскі ў сваіх успамінах узгадвае нямецкія танкі і САУ, якія атакавалі дывізію Гв. г.-м. М.С. Чапуркіна 13 ліпеня на мяжы в. Ялаўшчызна – Баяры[181]. Пра нямецкія танкі згадваюцца і ў данясеннях 6-й Гв. кд і 352-й сд. Затое адну з галоўных роляў у нямецкай абароне подступаў да горада адыгралі бронетранспарцёры танкавых разведвальных батальёнаў (5-га і 12-га).

Тым часам, з усходу перайшлі ў наступленне на Гродна і савецкія дывізіі 50-й арміі. Раніцай група палк. Г. Трэптава прадпрыняла дзве контратакі супраць пазіцый 290-й дывізіі, якія былі паспяхова адбіты. Да 16.00 на фронце ў раёне Жытомлі стаяла зацішша. Менавіта ў гэты час немцы адступілі. Батальёны групы палк. Г. Трэптава паступова адыходзілі ў заходнім накірунку. Калі палкі 290-й сд перайшлі ў далейшае наступленне каля 17.00, перад імі адступілі толькі невялікія заграджальныя групы[182]. Толькі зараз савецкімі войскамі была ўзята в. Жытомля. Паспяховым атакам садзейнічала падмацаванне: падраздзяленні 95-й сд і 1444-га сап (у складзе 14 СУ-76). Ппалк. М.Г. Хамулы ацэньваў нямецкія страты у баях за Жытомлю наступным чынам: “Каля трохсот яго (*нямецкіх* – Д.Л.) салдат і афіцэраў былі забіты, некалькі соцен параненны, захоплены адзін танк (*бронетранспарцёр* – Д.Л.), больш за два дзесяткі палявых гармат, каля трыццаці мінамётаў, сорак кулямётаў, некалькі дзесяткаў палонных”[183].

Ішлі баі і на поўнач ад Жытомлі. Нямецкая абарона праходзіла праз вышыню 143 (у 2-х км на ўсход ад в. Казловічы) – Табала – на поўдзень ад Верцялішак. Абарону тут трымалі батальёны 2-га палп СС штандантэнфюрэра Г.Ангальта, батальён 529-га гп, узмоцненыя 1-й ротай PzAA 12. Наступленне вялі палкі 153-й і 42-й сд. Каля абеда штаб карпуснай групы г.-арт. Г.Вейдлінга загадаў роце PzAA 12 тэрмінова заняць пазіцыі на поўдзень ці паўднёвы захад ад в. Абуховічы, дзе намеціўся прарыў батальёнаў 290-й сд.

Пасля заняцця в. Жытомля баявая група г.-л. Г. Флёрке (14-я пмд) пачала адыходзіць да ракі Нёман. У нямецкай абароне ўтварыўся разрыў. Менавіта яго, камандванне карпуснай групы і жадала прыкрыць сіламі разведвальнага танкавага батальёна. Атака бронетранспарцёраў пачалася каля 15.00. Мясцовасць у раёне в. Абуховічы была забалочанай, што не спрыяла прымяненню бранявых сіл. У выніку атакі 1/PzAA 12 страціла два бронетранспарцёры: адзін быў падбіты супрацьтанкавай савецкай артылерыяй, другі – заграз у багне[184]. Дарэчы гэты эпізод апісвае і ўдзельнік баёў за Жытомлю ппадп. М.Г. Хамулы. Па яго словах немцы контратакавалі пазіцыі палка ротай пяхоты пры падтрымцы двух САУ “Фердынанд”(!!!). Адну з самаходак падбілі




**15 ліпеня 1944г. Выход савецкіх войск да Гродна**

пэтээраўцы (салдаты, на ўзбраенні якіх знаходзіліся супрацьтанкавыя ружжы – скарочана СТР) палка, а другая завязла ў балоце і была кінута сваім экіпажам[185]. Праўда савецкі афіцэр памыліўся ў даціроўцы – нямецкая атака была праведзена не 13 (як у тэксце ўспамінаў), а 15 ліпеня. Бронетранспарцёры SdKfz 250-251 таксама не тое ж самае, што і знішчальнік танкаў “Ferdinand”.

Пасля няўдалай контратакі рота 12-га разведвальнага батальёна адступіла ў Гродна, дзе далучылася да галоўных сіл падраздзялення. Палкі групы г.-л. Г.Флёрке працягвалі адступленне да Нёмана. У в.

Мігава гэтыя сілы пачалі пераправу на паўднёвы бераг ракі. 2-гі палп СС групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга таксама адступіў да р. Нёман у в. Шчацінава.

Шлях да горада з усходу быў, такім чынам, адкрыты. 290-я сд фарсіраваным маршам пачала наступаць на Гродна. Выхад савецкіх падраздзяленняў да ракі Нёман у в. Коматава – Мігава стварыў перадумовы для хуткага фарсіравання ракі і выхаду ў тыл нямецкай 50-й пд, якая адступіла на рубеж р. Свіслач. За нямецкае перадмостнае ўмацаванне ў в. Коматава пачаліся цяжкія баі.

### *б) Штурм горада Гродна*

Горад Гродна быў дастаткова вялікім заходнебеларускім горадам. Так у 1931 годзе тут пражывала 41 тыс. чалавек. Горад складаўся з двух частак. Большая з іх размяшчалася на правым беразе ракі. Занёманскі фарштат – левабярэжная частка горада ўяўляла сабою драўляную забудову. Абедзве часткі злучаліся дзвума мастамі – чыгуначным і аўтамабільным. Гэта былі адзіныя камунікацыі праз р. Нёман у гэтым раёне.

Выкарыстанне горада ў якасці доўгатэрміновай пазіцыі для абароны штабам групы армій “Цэнтр” не планавалася. Думкі аб абароне горада з’явіліся толькі ў пачатку ліпеня, калі рака Нёман пачала разглядацца немцамі ў якасці верагоднай лініі фронту. Аднак хуткае наступленне падраздзяленняў Чырвонай арміі не дазволілі ўмацаваць горад належным чынам. Немцы не мелі для гэтага а ні часу, а ні адпаведных войскаў. Як адзначалася вышэй, штаб 4-й арміі наогул аддаў загад пакінуць горад і адступаць на левы берег ракі Нёман.

У дакументах перыяду чэрвеня – ліпеня 1944 года Гродна завецца “горадам-крэпасцю”. Прычым тэрмін гэты ўжываўся і савецкім і нямецкім бакамі. Аднак гэтая назва ў 1944 годзе не мела пад сабою ніякага фундамента. Справа ў тым, што горад лічыўся крэпасцю ў перыяд Першай сусветнай вайны. Вакол яго былі пабудаваны 13 бетонных фартоў, умацаваныя пункты і інш. фартыфікацыйныя збудаванні. Кайзераўская армія пасля захопу Гродна ў верасні 1915 г. праводзіла працы па яго ўмацаванні (1915-1918 гг.). Так імі былі ўзведзены некалькі дзесяткаў бліндажоў, нішаў, ДАК-аў на ўсходзе і поўначы ад горада. Пасля заканчэння Першай сусветнай вайны Гродна ўваходзіў ў склад Польшчы. З тых часоў умацаванні вакол горада не ўзводзіліся. Рускія фартавыя збудаванні былі знішчаны яшчэ пад час Першай сусветнай вайны. Такім чынам у перыяд Другой сусветнай вайны горад не ўмацоўваўся дадаткова і крэпасцю яго лічыць нельга. Тэрмін “горад-крэпасць” азначаў хутчэй гістарычнае мінулае Гродна.

Не было ў горадзе і асобнага гарнізона. Немцы выкарыстоўвалі ў абароне горада адступіўшыя сілы паліцэйскай групы "Ангальт". Сваю назву баявая група атрымала па імені штандартэнфюрара СС Гюнтэра Ангальта, камандуючага 2-ім палп СС[186]. Яна складалася з 2-га палп СС (у баях за горад не ўдзельнічаў), рэшткаў 22-га палп СС, батальёна 530-га гп, матарызаванага батальёна палявой жандармерыі, батальёна 51-га ахоўнага палка, 1-га зенітнага дывізіёна СС і іншых невялікіх падраздзяленняў. Зразумела, што гэтых сіл было недастаткова для абароны такога буйнога горада як Гродна. Галоўная ўдарная сіла карпуснай групы г.-арт. Г. Вейдлінга – PzAA 12, быў выведзены з горада і перакінуты на левы бераг Нёмана ў в. Каўпакі (за 15 км на паўднёвы ўсход ад Гродна). Хутчэй за ўсё, не ўдзельнічаў у баях за горад і 5-ы танкавы разведвальны батальён.

Часці 50-й арміі г.-л. І.В. Болдзіна, якім камандуючы 2-га Беларускага фронту г.-п. Г.Ф. Захараў 15 ліпеня двойчы (у 14.25 і а 17.00 гадзіне)[187] загадаў авалодаць Гродна, сутыкнуліся з супраціўленнем ужо на падыходзе да горада. Варта заўважыць, што першапачаткова г.-п. Г.Ф. Захараў арыентаваў 121-шы ск на заняццё Гродна ўдарам з поўдня, чаго не адбылося. 153-я і 42-я сд, узмоцненыя 4-й зстабр і сапёрамі 2-га Гв. ашісб, толькі да 21.00 выйшлі за мяжу в. Путрышкі – Шчачынава. Дывізіі 81-га ск пры дапамозе 1444-га сап, 233-га атп і 210-га ісб рухаліся на левым фланзе і займалі пазіцыі в. Сіўкава – Абухава – Будомля. За дзень яны прасунуліся на 5 км[188]. Дывізіі 121-га ск да вечара выйшлі да в. Саволеўка – Мазанава. Часцям 50-й арміі было загадана не спыняцца на дасягнутых межах і максімальна хутка прасоўвацца наперад, да Гродна, нават з надыходам цемры.

Баі ў самім горадзе пачаліся толькі позна ўвечары 15 ліпеня, калі Гродна з поўначы атакавала 6-я Гв. кд корпуса Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскага. У горад уварваўся 25-ты Гв. Апшэронскі кп Гв. ппалк. М.П. Ляліна, а ўслед за ім 28-мы Гв. Дубненскі кп Гв. м-ра Ярмолава (дарэчы маёр будзе цяжка паранены пры фарсіраванні Нёмана праз некалькі дзён). Чатыры эскадроны 25-га Гв. кп позна ўвечары, пераадольваючы нязначнае супраціўленне немцаў, выйшлі да рэчкі Гараднічанка, у цэнтры горада. Наступалі яны ўздоўж сучаснай вуліцы Горкага[189]. Апоўначы немцы сталі адступаць перад эскадронамі 25-га Гв. кп. Адным з першых у горад прарваўся сабельны эскадрон Гв. к-на М.Ц. Аўчыннікава з 23-га Гв. Падгайцаўскага кп. У баях за горад эскадрон захапіў 3 нямецкія гарматы, 6 кулямётаў і склад з рэчавай маёмасцю[190].

Услед за кавалерыстамі ў горад уварваліся часці 174-й і 352-й сд 36-га корпуса 31-й арміі. У горадзе палкі 174-й сд пачалі наступаць у накірунку цэнтра (уздоўж сучаснай вуліцы Дзяржынскага). Перад

імі была пастаўлена баявая задача – выйсці да гарадскіх мастоў праз р. Нёман і захапіць іх[191]. 2-я стралковая рота 628-га сп (камандзір палка – ппалк. І.С. Мудрак) першай уварвалася ў горад. 1-шы батальён 508-сп пад камандаваннем ст. л-та М.К. Глазунова ў першыя гадзіны 16 ліпеня прарваўся на шашэйны мост[192]. Гэтую атаку падтрымлівалі сапёры 877-га асб. Аднак немцы тут жа ўзарвалі пралёты маста. Стралковы батальён замацаваўся па правым беразе р. Нёман – ад каралеўскіх замкаў да чыгуначнага маста. Камандны пункт батальёна размясціўся ў Барысаглебскім манастыры (быў на месцы сучаснага драматычнага тэатра).

Акрамя 174-й сд, у паўночна-заходняй частцы горада (в. Грандзічы, Касцелаўшчызна, Пярэселка) змагаліся 653-ці і 673-ці сп 220-й Аршанскай сд (камандуючы г.-м. В.А. Палявік), а таксама часці 352-й сд. Палкі 352-й сд у баях у горадзе падтрымлівалі 8 батарэй 914-га артылерыйскага палка. Узаемадзеянне з артылерыстамі было добра наладжана: пушкі яны падкатвалі ўручную наўпрост у шэрагі пехацінцаў і ва ўпор расстрэльвалі агнявыя кропкі немцаў. Батальёны 1158-га палка падпалкоўніка Калеснікава выйшлі да будынку пошты (зараз вул. Э. Ажэшкі). Раніцай 16 ліпеня полк падышоў да Нёмана каля моста. Дывізіі 36-га корпуса падтрымлівалі 926-ты, 927-мы і 959-ты палкі самаходнай артылерыі 31-й арміі. Такім чынам горад быў заняты часцямі 6-й Гв. кд і дывізіямі 36-га стралковага корпуса.

Увечары 15 ліпеня да ўсходніх подступаў Гродна падышлі перадавыя атрады 153-й сд 69-га ск 50-й арміі. Камандзір дывізіі палк. А.А. Шчэннікаў загадаў, не затрымліваецца і наступаць у накірунку Каложскай царквы (знаходзіцца на беразе Нёмана, правей за каралеўскія замкі). Пачатак атакі быў прызначаны на 20.00[193]. Цікавы з'яўляецца факт, што, рыхтуючыся да штурму, палкі дывізіі атрымалі дадзеныя аэрафотаздымкаў нямецкіх пазіцый у горадзе. Баі ў горадзе палкі дывізіі пачалі толькі ноччу. Пры штурме дамоў, дзе ўмацаваліся немцы, выкарыстоўвалася артылерыя, якая выкатвалася на прамую наводку. Батальёны 557-га палка выйшлі на цэнтральную плошчу горада (зараз – Савецкая). На некаторы час яго часці затрымліваў кулямёт, што біў са званіцы царквы (напэўна, Фары Вітаўта – галоўнага каталіцкага храма горада, што стаяў на цэнтральнай плошчы)[194]. "Да царквы дабраўся радавы Вяткін. Ён мінуў прытвор, знайшоў лесвіцу на званіцу. Доўга караскаўся па ёй, рызыкуючы кожнае імгненне быць заўважаным. Пераадолеў лесвіцу, кінуў у пралом на пляцоўку, адкуль біў кулямёт, гранату і прыціснуўся да сцяны. Аглушаны, засыпаны вапнай і асколкамі цэглы, Вяткін вылез на пляцоўку і знішчыў астатніх фашыстаў..." – узгадваў камандзір 557-га сп м-р Ф.С. Фядотаў[195]. Раніцай 16 ліпеня батальёны палка выйшлі да ракі Нё-

ман у раёне Каложы і правей за яе. Разам з падраздзяленнямі корпуса ў горад уварваліся штурмавыя групы з 2-га Гв. ашісб.

Адначасова з усходу ў горад уварваліся часці 290-й і 95-й сд 81-га ск (камандзір корпуса – г.м. Ф.Д. Захараў). Яшчэ ў сярэдзіне дня 290-я сд г.-м. І.Г. Гаспарана вяла баі за в. Жытомля. Здзейсніўшы фарсіраваны марш, дывізія зходу ўварвалася ў горад Гродна. 878-мы сп (камандзір – М.Г. Хамулы) наступаў па шашы Гродна – Ліда. У раёне цяперашняга прадпрыемства ОАО "Гродна-Азот" батальёны палка былі абстраляны[196]. На правым флангу наступалі 882-гі і 885-ты сп. Батальёны 878-га палка прасоўваліся ўздоўж сучаснай вуліцы Праспект Касманаўтаў (дарэчы, у доме са шпілем, камандзір дывізіі абсталяваў свой камандны пункт). Немцы занялі абарону на Скідзельскай плошчы (зараз плошча ў раёне аўтавакзала). Тут наступаў 2-гі батальён 878-га сп к-на Пяцерыкова. 1-шы батальён (к-н І.П. Хірны, намеснік па палітычнай частцы к-н А.П. Карчагін) амаль адразу ж захапіў чыгуначны вакзал. Цяжкія баі ішлі за чыгуначнае дэпо. Пасля гэтага роты былі накіраваны ўздоўж чыгункі ў накірунку чыгуначнага маста. Немцы таксама спрабавалі арганізаваць абарону на старых могілках каля чыгуначнага маста, аднак былі рассеяны трапным савецкім мінамётным агнём.

У цэнтры горада наступаў 882-гі полк пад камандаваннем ппалк. Ф.М. Сцефаненка. Батальёны выйшлі ў раён Барысаглебскага манастыра. Асабістым прыкладам камандзір палка падпалкоўнік Фёдар Міхайлавіч Сцефаненка падняў у атаку салдат батальёна[197]. Тут жа палкавыя артылерысты ва ўпор расстралялі немцаў, што выбягалі з гарадскіх замкаў. Гэтая нямецкая частка была, верагодна, зажата савецкімі падраздзяленнямі ў раёне Старога і Новага замкаў і адступала да мастоў праз раку.

Па камандзе палкавога інжынера м-ра Б.Я. Хаўронскага, з 878-га палка, салдаты адразу ж сталі наводзіць пераправу праз Нёман пры дапамозе лодак[198]. Гэта адбывалася пад агнём з супрацьлеглага берага. Так пры падыходзе да ракі Нёман савецкія часці сутыкнуліся з моцным агнём зенітнай артылерыі немцаў (1-шы зянітны дывізіён СС), якая загадзя заняла пазіцыі на высокім супрацьлеглым беразе ракі. Гарматы дывізіёна прыкрывалі адыход разрозненых паліцэйскіх частак з горада.

Савецкія войскі ў гарадскіх баях падтрымліваў 1444-ты сап палк. Ф.П. Мячава, што дзейнічаў сумесна з часцямі 95-й сд (90-ты, 161-шы, 241-шы сп, 57-мы ап, 97-мы азстд). У палку засталося толькі 10 СУ-76 (з 20 артылерыйскіх установак па штату). Тым не менш ён быў адным з двух палкоў у арміі, якія хоць на палову былі ўкамплектаваны тэхнікай. Самаходныя ўстаноўкі з дэсантам пяхоты ўварваліся ў го-

рад з боку в. Капліца Вялікая ў 2 гадзіны ночы 16 ліпеня[199]. Дзякуючы цеснаму ўзаемадзеянню з пяхотай полк не панёс стратаў у баях за горад. Пры гэтым вылучыўся экіпаж СУ-76 л-та М.Г. Закрыжэўскага, які адным з першых уварваўся ў Гродна[200]. Дарэчы ў баях за горад полк, быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга[201]. У данясеннях паведамлялася, што экіпаж самаходкі знішчыў у Гродна 2 супрацьтанкавыя гарматы, 2 дзоты, 5 павозак з маёмасцю і да 100 нямецкіх салдат.

На досвітку **16 ліпеня** 1-шы батальён 878-га сп 290-й сд пераправіўся праз чыгуначны мост на заходні бераг ракі Нёман. Аднак мост тут жа быў падарваны немцамі і група салдат была адарвана ад частак дывізіі. Першым уварваўся на левы бераг камсорг кулямётнай роты, памочнік камандзіра ўзвода, ст. с-т М.Ц. Курбатаў (ён загінуў 18 ліпеня, падарваўшы сябе і немцаў гранатай). Сапёры наладзілі пераправу каля лодачнай станцыі. 885-ты сп рыхтаваўся да пераправы. А 882-гі сп увесь дзень размяшчаўся ў гарадскім парку, прыводзячы сябе ў парадак[202].

На досвітку 16 ліпеня баі ў паўночнай частцы Гродна скончыліся. Немцы працягвалі абстрэл цэнтра горада і вакзала з-за ракі Нёман. Яны працягвалі кантраляваць Занёманскі фарштат. Увесь дзень працягвалася перастрэлка. На вежы Бернардзінскага манастыра камандны пункт абсталяваў к-н Карасёў – камандзір мінамётнай роты 1158-га палка. 352-я сд завяршыла канчатковую ачыстку горада і стала несці каменданцкую службу. Першым камендантам Гродна быў прызначаны маёр І.Ф. Ялецкіх. У другой палове дня 352-я дывізія пачала здачу горада і трафеяў 69-му стралковаму корпусу 50-й арміі. 17 ліпеня яна выйшла ў раён в. Прывалкі – Друскенікі каля Нёмана. 174-я дывізія канцэнтравалася ў раёне в. Зарыца. Наогул, начальнік штаба 31-й арміі г.-м. М.І. Шчадрын адзначаў, што горад Гродна быў вызвалены выключна дывізіямі 36-га корпуса. Дывізіі ж 50-й арміі падышлі толькі раніцай 16 ліпеня.

Як толькі горад быў заняты савецкімі войскамі, для размінавання будынкаў прыцягнулі 1-ю Гвардзейскую Магілёўскую штурмавую інжынерна-сапёрную брыгаду[203]. Гэта работа была выклікана неабходнасцю – немцы, адступаючы, замініравалі вялізную колькасць будынкаў і аб'ектаў. Паводле паведамленняў разведгрупы брыгады, обергрупэнфюрар К. фон Готберг атрымаў загад з Берліна знішчыць горад Гродна. Шыфроўкі разведгрупы 1-й Гв. ашісбр атрымалі ў 96-м асобным Чырвонасцяжным Магілёўскім ордэнаў Суворава і Кутузава і Чырвонай зоркі палку сувязі[204]. Своечасовае атрыманне гэтай інфармацыі выратавала горад ад разбурэння. "Панцырная пяхота" выдатна справілася з пастаўленай задачай. Далейшыя загады для брыгады датычыліся арганізацыі пераправаў праз Нёман.

У ходзе баёў за горад 352-я сд данесла аб 5 знішчаных нямецкіх танках. 174-я дывізія падбіла 3 нямецкія САУ[205]. Невядома, якой частцы належылі танкі і САУ, магчыма, гэта таксама былі бронетранспарцёры 5-га разведбата.

16 ліпеня 174-я сд атрымала загад здаць свае пазіцыі падраздзяленням 50-й арміі і выйсці ў раён на поўнач Гродна, да мястэчка Гожа, дзе і адбывалася пераправа праз раку Нёман частак 31-й арміі.

Увечары, у 23.00, 16 ліпеня ў гонар вызвалення Гродна ў Маскве быў дадзены салют 20 залпамі з 224 гармат.

Такім чынам, баі за горад характарызаваліся імклівым напорам савецкіх частак. Немцы фактычна не абаранялі горад. Як было бачна, усе іх пазіцыі праходзілі па за яго межамі (па навакольных вёсках). Баі ў горадзе вяліся толькі з нешматлікімі нямецкімі падраздзяленнямі, якія не паспелі адступіць на левы бераг Нёмана. Таму войскі 50-й арміі змаглі прарвацца ў горад вельмі хутка. Сам горад пры гэтым практычна не пацярпеў. Безумоўна, гэта быў поспех савецкіх войскаў. Забяспечаны ён быў бліскучым прарывам 3-га кавалерыйскага корпуса Гв. г.-л. М.С. Асlікоўскага. Планы штаба групы армій на ўтрыманне Гродна не рэалізаваліся.

Немцы паспелі вывесці з горада амаль усе свае войскі (толькі 22-гі палп СС застаўся адрэзаным у горадзе і ўплаў фарсіраваў раку)[206] і цалкам разбурыць абодва гарадскія масты. Напрыклад, у 1941 годзе прарыў аўтамабільнага маста адступаючымі савецкімі войскамі быў неэфектыўны, і немцы давялі яго да ладу за паўгадзіны. Падрыў мастоў сарваў спробы савецкіх войскаў ачысціць занёманскую частку ад нямецкай арміі, а таксама пераправіцца цераз раку Нёман і працягнуць наступленне ў заходнім напрамку.



Нямецкія кулямётчыкі з чэшскім кулямётам ZB - 30 на пазіцыях каля аўтамабільнага моста. Гродна. Ліпень 1944г. Кадр з нямецкай кінахронікі.



Гродна. Занёманскі фарштат. Злева бачны ствол нямецкай 8,8-см гарматы



Зенітны аўтамат батальёна Рэйхсфюрар СС. Унізе бачны мост. Кадр з нямецкай кінахронікі.



Камандзір 2-га палп СС Г.Ангальт



Эмблема паліцыі



Афіцэры аднаго з паліцэйскіх палкоў. Беларусь.1944 г.



Паліцэйскія групы Готберга. Ліпень 1944г.




SdKfz 251 з 5-й танкавай дывізіі. Лета 1944 г.



Такой была цэнтральная плошча Гродна пасля вызвалення горада. 16 ліпеня 1944г



**Гродна. Цагляны завод**



**Захоплены савецкімі часткамі ў Парэчча эшалон нямецкіх T-IV. 12 ліпеня 1944 года.**



"Кацюша" БМ-13Н на базе амерыканскага аўтамабіля Студэбекер



Разлікі савецкіх 82-мм мінамётаў узору 1941 г. пад час баёў за Гродна. 16 ліпеня 1944 г.



Савецкая 122-мм гаўбіца ў Гродна. 16 ліпеня 1944 г.



Камандзір эскадрона 23-га Гв. кп к-н М.Ц.Аўчыннікаў.



Намеснік камандзіра 24 Гв.кп па палітчастцы м-р М.Ф.Выдайка. Загінуў у р-не Гродна



Камандзір мінамётнага ўзвода агітатар 24-га Гв. кп старшына Д.І.Вадзінскі.



**Нямецкія цягачы Sd Kfz 7 замаскіраваны галінамі. Раён Гродна. Ліпень 1944г.**



**СУ-76М. Ліпень 1944 г.**

# РАЗДЗЕЛ 4.

# СТАБІЛІЗАЦЫЯ ЛІНІІ ФРОНТУ НА Р. НЁМАН

## *а) Узмацненне нямецкай групоўкі на заходнім беразе р. Нёман*

Пераправа часцей Чырвонай арміі праз р. Нёман пачалася яшчэ да баёў у самім горадзе і ў многім з'яўлялася нечаканасцю для нямецкіх частак групы обергрупэнфюрэра К. фон Готберга, якія займалі пазіцыі на левым беразе Нёмана.

Нямецкая абарона па рацэ Нёман на поўнач ад Гродна выглядала наступным чынам. У раёне горада Друскенікі займаў пазіцыі, адступіўшы з правага берагу ракі 31-шы паліцэйскі полк СС (хутчэй за ўсё, уваходзіў у склад XXXIX-га тк). Лінію ўздоўж р. Нёман ад в. Дмісевічы да в. Плябанскія кантраляваў 3-ці батальён 17-га палп СС. 2-і батальён гэтага ж палка (13-га ліпеня і 14 – у першай палове дня) ўтрымліваў пазіцыі па ўсходнім беразе ад мястэчка Гожа да в. Астравок[207]. На левым беразе ракі Нёман на паўночны захад ад Гродна знаходзіўся 5-ы танкавы разведвальны батальён. Акрамя гэтых сіл, у раёне Гродна немцы мелі групу "Ангальт", якая займала пазіцыі на беразе ракі Нёман ад Занёманскага фарштата да в. Пагараны. Гэта група адступіла з горада пасля захопу яго савецкімі войскамі. У гэтым жа раёне займаў пазіцыі 1-ы зянітны дывізіён СС.

Нягледзячы на цяжкасці адступлення ў Беларусі, разгром групы армій, нямецкія салдаты не адчувалі сябе падаўленымі і дэмаралізаванымі. Настроі сярод афіцэраў паліцыі паказвае размова з імі жыхара адной з прынёманскіх вёсак: "Няўжо немцы будуць уцякаць?" – спытаў жыхар в. Пушкары. - "Не. У нас ёсць такая зброя, што мы пусцім рускіх толькі да мяжы (*Усходняй Прусіі* – Д.Л.), а за мяжу не пусцім. З гэтай зброяй мы будзем рускіх назад гнаць"[208]. Канешне, гаворка ішла пра цуда-зброю, на якую Гітлер ускладаў вялікія надзеі. Верагодна, гэту веру падтрымлівалі многія салдаты яго арміі.

Аднак настроі нямецкіх часцей на адыход толькі да мяжы Рэйха відавочны. Нямецкія салдаты былі ўпэўнены, што савецкае наступленне хутка спыніцца. Вельмі вялікія надзеі ўскладаліся на прыбыццё новых падмацаванняў.

Тым не менш, уздоўж левага берага ракі Нёман немцы мелі вельмі слабыя сілы і маглі забяспечыць імі толькі баявую ахову. Спыніць фарсіраванне ракі савецкімі падраздзяленнямі для 4-й арміі было невырашальнай задачай. Таму камандаванне групы "Цэнтр" загадала 13 ліпеня перакінуць у раён Гродна часці 5-й тд са складу сілаў XXXIX-га танкавага корпуса. Задачай гэтых падраздзяленняў было адбіццё спробаў фарсіраваць раку Нёман і ўтрымаць лінію фронта па гэтай воднай перашкодзе[209]. Дывізія павінна была сканцэнтравацца ў раёне мястэчка Сапоцкін і перашкодзіць савецкім войскам фарсіраваць раку на поўнач ад Гродна. Акрамя таго дывізія павінна была знішчыць ужо ўтвораныя савецкімі войскамі плацдармы. Першай у раён баявых дзеянняў прыбыла баявая група 5-й тд.

Баявая група 5-й тд:

> група "Фрыдрыха" (група названа па прозвішчу камандзіра 13-га тгп – к-на Г. Фрыдрыха):

1-шы батальён 13-га танкава-грэнадзёрскага палка са штабам;

1-шы дывізіён 116-га артпалка (на ўзбраенні знаходзіліся САУ "Hummel" і "Wespe");

некалькі танкаў T-IV з 31-га танкавага палка.

> група "Дрэвеса" (м-р Вільгельм Дрэвес камандаваў I/13):

1-шы батальён 14-га танкава-грэнадзёрскага палка (камандзір – к-н А. Іедтке);

3-ці дывізіён 116-га артпалка (на ўзбраенні гаўбіцы 10 – 15 см);

часткі 89-га сапёрнага танкавага батальёна[210].

Акрамя гэтага, г.-ф. В.Модэль прыняў рашэнне выкарыстоўваць у раёне Гродна 3-ю танкавую дывізію СС "Мёртвая галава". Яе ўжо пачалі перакідваць з Румыніі ў групу армій "Цэнтр" у якасці рэзерва. Аднак улічваючы цяжкае становішча падраздзяленняў 4-й арміі, г.-ф. В. Модэль загадаў накіраваць яе на фронт па рацэ Нёман. Гэтае падраздзяленне выкарыстоўвалася немцамі ў якасці асноўнай баявой адзінкі ў баях на паўночны захад і на захад ад Гродна. Разгледзім яе склад некалькі падрабязней.

3-я танкавая дывізія СС "Totenkopf" (у перакладзе – "Мёртвая галава") лічылася адной з лепшых дывізій нямецкай арміі. На працягу вясны – лета 1944 г. яна прайшла перафармаванне (у апошні раз на працягу вайны)[211] і налічвала 18191 чалавек (у некаторых крыніцах

прыводзіцца лічба ў 21 тыс чалавек[212]). На 1 ліпеня на ўзбраенні дывізіі знаходзілася:

> 1 танк Т-III (у штабе 3-га тп СС);

> 28 танкаў Т-IV;

> 31САУ StuG-III;

> 10 танкаў T-VI "Tiger" (яшчэ 5 цяжкіх танкаў знаходзілася ў рамонце);

> 41 бронетранспарцёр;

> 27 супрацьтанкавых гармат;

> 42 артылерыйскія гарматы (у т.л. 8 САУ "Wespe" і 6 САУ "Hummel")[213].

У арганізацыйным плане дывізія складалася з танкавага палка (двухбатальённага складу), двух танкава-грэнадзёрскіх палкоў СС – 5-га "Туле" і 6-га "Тэадор Эйке"[214] (па 3 батальёны ў кожным), 3-га артылерыйскага палка СС, 3-га разведвальнага танкавага батальёна, 3-га дывізіёна зніШчальнікаў танкаў, 3-га зенітнага батальёна і 3-га сапёрнага батальёна.

10 ліпеня 1944 г. пачалася перакідка 3-й тд СС з Румыніі ва Усходнюю Польшчу. Усяго для гэтай аперацыі немцы задзейнічалі 70 чыгуначных эшалонаў. Як бачна дывізія СС была цалкам матарызавана. Ударнай яе сілай з'яўляліся цяжкія і сярэднія танкі, а таксама штурмавыя гарматы. Наяўнасць у дывізіі роты цяжкіх танкаў "Tiger" яшчэ больш павялічвала яе моц. Вядомыя факты, калі рота танкаў "Tiger" стрымлівала наступленне цэлай дывізіі праціўніка. Праўда 3-я тд СС не ўдзельнічала ў баях у раёне Гродна ў поўным сваім складзе. Так адсутнічалі 1-шы танкавы батальён СС (на ўзбраенні танкі Т-V), 2-гі тгр батальён "Т" і інш. падраздзяленні. У выпадку фарсіравання ракі Нёман буйнымі савецкімі падраздзяленнямі перад немцамі зноў магла паўстаць праблема прарыву фронту. Галоўная задача 3-й тд СС такім чынам стаяла менавіта ва ўтрыманні лініі фронта па рацэ.

Такім чынам новае падраздзяленне СС было моцнай, цалкам укамплектаванай дывізіяй. На яе ўзбраенні стаялі лепшыя ўзоры баявой тэхнікі Германіі. Гэта быў вельмі небяспечны праціўнік для наступаючых часцей Чырвонай арміі. Дзякуючы апоры на такую вялікую раку як Нёман, 3-я тд СС была ў сілах стрымаць наступленне цэлай арміі.

### *б) Фарсіраванне р. Нёман Чырвонай арміяй*

Перад фарсіраваннем ракі падраздзяленнямі Чырвонай арміі была праведзена разведка мясцовасці на левым беразе Нёмана. Так

ў ноч на 14 ліпеня ў раён на захад ад Гродна была адпраўлена група з дзесяці чалавек з рацыяй (камандуючы – сяржант А.М. Кузняцоў) з мэтай удакладніць перакідку немцамі падмацаванняў у яшчэ ўтрымліваемы імі горад. Напэўна, разведвальная група была паслана камандаваннем арміі, таму што разведчыкі былі з 369-й сд са складу 121-га стралковага корпуса. Сама дывізія яшчэ была задзейснена на ліквідацыі "мінскага катла". Група А.М. Кузняцова фарсіравала раку Нёман у раёне сучаснага парку Румлёва з дапамогай мясцовых жыхароў. Абмінуўшы Занёманскі фартадт (левабярэжная частка горада), група заняла пазіцыю ў раёне в. Ласосна, дзе вяла назіранні за дарогай на мястэчка Сапоцкін. 16 ліпеня група атрымала загад прасоўвацца далей на захад[215].

Выйшлі на поўнач ад Гродна да ракі Нёман і злучэнні 31-й арміі 3-га Беларускага фронту. Войскі ўмацаваліся ўздоўж усходняга берага ракі ад ляснога масіва "Пышкі" да вёскі Куколі. Фарсіраванне ракі стралковымі падраздзяленнямі пачалося адразу ж. Так, 376-ты Мінскі сп і рухомы атрад (матарызаваны 2-гі батальён 673-га сп ст. л-та З.Дзюдзіна[216]) 220-й сд 31-й арміі ў ноч з 13 на 14 ліпеня фарсіраваў р. Нёман каля в. Беражаны[217]. Рухомым атрадам камандаваў палкоўнік М.Я. Радзіёнаў, намеснік камандзіра дывізіі. Ад в. Стрыеўка (каля м. Азёры) атрад выйшаў да Нёмана каля в. Куколі. Дзякуючы дадзеным авіяразведкі, камандванне 36-га корпуса ведала аб пераправе, якая знаходзілася тут. Адарону ад в. Зарыцы да м. Гожа трымаў 2-гі батальён 17-га паліцэйскага палка СС.

Паводле ўспамінаў У.Д. Святлова, атрад у 3 гадзіны ночы захапіў паром і пераправіўся на супрацьлеглы бераг Нёмана[218]. На заходнім беразе першымі занялі абарону рота аўтаматчыкаў з двума СТР і некалькімі мінамётамі. Першую групу салдат 673-га палка, што фарсіравалі раку, узначаліў парторг палка к-н К.А. Кошман. Раніцай абарону ўзмацніў супрацьтанкавы дывізіён.

У выніку выхаду да ракі савецкіх падраздзяленняў 2-гі батальён 17-га палп СС, пад камандваннем к-на Стрэкера, быў вымушаны ў сярэдзіне дня згарнуць свае пазіцыі на ўчастку ад в. Астравок да мястэчка Гожа. Ён пераправіўся на левы бераг ракі і адкаціўся яшчэ далей, пераследуемы савецкімі падраздзяленнямі 220-й сд і кавалерыйскага корпуса, што фарсіравалі раку.

У 15.00 14 ліпеня[219] ў раёне в. Куколі (на захад ад вёскі Зарыца, на беразе ракі) уплаў фарсіраваў раку Нёман полк савецкай 32-й кд 3-га Гв.кк. Пад прыкрыццём сваёй артылерыі, 65-ты кп захапіў плацдарм на супрацьлеглым беразе. За ім рушыў 86-ты кп. Баявыя ахоўванні немцаў (мабыць, гэта былі батальёны 17-га паліцэйскага палка СС) адступілі на поўнач раней. Кавалерысты захапілі першы плацдарм.

Вось як успамінаў аб гэтых падзеях ст. с-т супрацьтанкавага сабельнага ўзвода 121-га кп А.М. Клімаў: "У Гродзенскай аперацыі мы наступалі налева ад Гродна, раніцай, у конным строі павінны былі фарсіраваць Нёман. Падчас пераправы побач з канямі плылі, я, як на бераг выбраўся, у боты столькі вады набраў, потым толькі зразумеў, што і боты таксама трэба здымаць. Як пераправіліся, даведаліся, што немцы адступаюць. Каманда: "Па конях!" І мы ў атаку пайшлі. Так першы раз у жыцці трапіў я ў кавалерыйскую атаку. Я свайго першага немца не зарубіў, ён бег, як вар'ят, а я на імгненне замешкаўся, і рубануў па касцы. Ён упаў, у мяне клінок вывернуўся, так локаць потым два тыдні балеў. Пайшоў бы клінок управа – адрубіў бы нагу свайму каню. Вось такое глупства нарабіў. Наступнага ўжо дагнаў, прытрымаў каня і з перагібам адрубіў яму галаву, кроў хлынула. Трэцяга ўжо рубануў па плячы"[220]. Як відаць, немцы практычна не аказвалі супраціўлення і паспешна адступілі.

376-ты сп 220-й дывізіі замацаваўся на рубяжы в. Шэмбелеўцы – Беражаны разам з кавалерыстамі 32-й кд, а рухомы атрад 220-й сд – на вышыні 166.0 (на поўнач ад в. Баля-Касцельная)[221]. На працягу дня вёска Баля-Касцельная таксама была занята савецкімі войскамі. З гэтага плацдарма савецкіх войскаў на левым беразе р. Нёман на поўнач ад Гродна, павінна было пачацца далейшае наступленне на захад. Фарсіраванне Нёмана палкамі 220-й сд працягвалася ажно да 18 ліпеня.

Удзень 14 ліпеня ў раёне в. Куколі для кавалерыйскага корпуса была пабудавана пераправа праз р. Нёман. Кіраваў будаўніцтвам пераправы л-т І.А. Баянаў з сапёрнага эскадрона 86-га кп. Л-т І.А. Баянаў з 5 узводамі сапёраў за 2 гадзіны выканаў задачу, пастаўленую камандзірам палка м-рам Ф.І. Мановым. Такая аператыўнасць дазволіла хутка перакінуць падраздзяленні кавалерыйскага корпуса праз раку[222]. Побач з пераправай заняў агнявую пазіцыю 534-ы асобны дывізіён СПА. На працягу 14-17 ліпеня ён прыкрываў пераправу кавалерыстаў праз Нёман. Нямецкая авіяцыя пачала атакаваць пераправу з першага ж дня яе існавання. Напрацягу баёў па прыкрыццю пераправы дывізіён СПА страціў двух кулямётчыкаў забітымі[223].

Яшчэ ў ноч на левы бераг пераправіўся і 24-й Гв. кп 5-й Гв. кд. Камандзір 2-га артылерыйскага ўзвода 24-га Гв. кп Гв. л-т Іван Якушын узгадваў пра пераправу свайго палка праз Нёман: "Каля 40 бамбардзіроўшчыкаў атакавалі нашу калону падчас пераправы праз Нёман, а салдаты, якія ўцалелі пасля бамбардзіроўкі, прынеслі мне страшную навіну: адзін з маіх людзей, намеснік камандзіра ўзвода, быў забіты, калі ішоў наперад у другім эшалоне. Тым часам сапёры павінны былі шматразова рамантаваць пераправу, пакуль полк цал-

кам не выйшаў на другі бераг"[224]. Пры фарсіраванні ракі быў забіты і камандзір эскадрона 24-га Гв. кп Гв. к-н К.С. Мяшкоў. Дарэчы, нямецкая авіяцыя даволі паспяхова атакавала савецкія пераправы праз раку на працягу ўсіх баёў у раёне Гродна. Савецкая авіяцыя не здолела цалкам забяспечыць паветранае прыкрыццё сваіх войск.

Менавіта ў гэты час немцы нанеслі ўдар на правым беразе р. Нёман сіламі 5-га танкавага разведвальнага батальёна (аб гэтай атацы падрабязней пісалася вышэй). Атака была праведзена ўздоўж дарогі Гожа – Гродна. Такім чынам, ад сваіх тылоў былі адсечаны савецкія войскі, якія ўжо пераправіліся праз раку. Калі б нямецкія планы па перакідванні сілаў усёй 5-й тд па правым беразе Нёмана ў Гродна былі б рэалізаваны, палкі 32-й кд і 220-й сд былі б знішчаны, а тылы гэтых падраздзяленняў разбіты.

Наступны ўдар быў нанесены немцамі ўжо па савецкім плацдарме на левым беразе Нёмана. 14 ліпеня ў 14.15 камандаванне 4-й нямецкай арміі (штаб арміі размяшчаўся ў горадзе Ломжа, Польшча) аддала загад баявой групе 5-й танкавай дывізіі атакаваць савецкія войскі на левым беразе ракі. Батальёны танкавай дывізіі яшчэ не прыбылі на месца. Толькі ў другой палове дня ў раён в. Рацічы – Скрыннікі пачалі прыбываць салдаты і тэхніка 5-й тд.

Удар па плацдарме 32-й кд і 220-й сд нанесла баявая група к-на Фрыдрыха ў складзе 1-га батальёна 13-га тгр палка, узмоцненага танкамі[225]. Атака праводзілася ў накірунку в. Баля-Касцельная і кантралюючых мясцовасць вышынь, дзе занялі абарону савецкая кавалерыя і пяхота. Паводле інфармацыі нямецкага гісторыка В. Ваперсаля, у выніку гэтай атакі немцы адбілі вёску і некалькі вышынь на поўнач ад яе. Аднак дасягнуць сваёй мэты – скінуць савецкія часці ў Нёман – ім не ўдалося. Згодна аператыўным данясенням Генеральнага штаба Чырвонай арміі, плацдарм, захоплены падраздзяленнямі 31-й арміі і 3-га Гв. кк дасягаў вечарам 14 ліпеня 35 км (!) па фронту і 2-6 км у глыбіню[226].

Баявая група "Дрэвеса", якая рухалася ўслед за групай "Фрыдрыха", перайшла Аўгустоўскі канал і атакавала в. Войтаўцы (на поўнач ад Бале-Касцельнай), дзе замацаваліся падраздзяленні 220-й сд. Аднак выйсці да Нёмана яна таксама не здолела[227].

Астатнія сілы 5-й танкавай дывізіі (баявая група "Герцага"[228]) не паспелі падысці да раёна баёў. У гэты час Нёман фарсіравалі падраздзяленні 31-й арміі і ў раёне Друскенікі-Свентаянск (на поўнач ад Сапоцкіна). Група "Герцага" атакавала іх для ліквідацыі гэтага новага прарыву.

У той жа дзень, 14 ліпеня, працягвалі прыбываць эшалоны 3-й тд СС. Яны разгружаліся на чыгуначнай станцыі Сакулка (мястэчка Са-

кулка знаходзіцца ў Польшчы, на паўночны-захад ад Гродна). Пасля гэтага тэхніка і салдаты дывізіі адразу ж выступалі ў раён першапачатковага канцэнтравання. Камандзір 4-га дывізіёна 3-га ап СС гаўптштурмфюрар Грюнд успамінаў: "У Беластоку стала зразумела, што рускія атакуюць Гродна. Учора мы разгружаліся ў Кузніцы, апошняй (*чыгуначнай* – Д.Л.) станцыі перад старой рускай памежнай крэпасцю Гродна і зараз размяшчаемся ў Брузгах..."[229] У той жа дзень прыбыў і старшыня аператыўнага аддзела штаба дывізіі (згодна з нямецкай класіфікацыяй – Іа) оберштурмбанфюрар Эрых Эберхард. Менавіта гэты чалавек планаваў аперацыі падраздзяленняў "Мёртвай галавы" на працягу баёў у раёне Гродна. Часовае камандаванне падраздзяленнямі дывізіі прыняў камандзір 6-га палка СС штурмбанфюрар Карл Ульрых.

Прарыў 3-га Гв. кк у Гродна і фарсіраванне ракі на гэтым адрэзку разрывалі нямецкую лінію фронту паміж карпусамі 4-й нямецкай арміі (г.-а. Г. Вейдлінга і XXXIX-ым танкавым) і стваралі для савецкіх войскаў магчымасць глыбокага прарыву ў тыл нямецкай групоўцы. Аднак для правядзення маштабнай аперацыі па пашырэнні савецкага прарыва неабходна была добрая падрыхтоўка і забеспячэнне войск зброяй і палівам. Гэтага ў савецкіх падраздзяленнях на дадзены момант не хапала. 3-ці Гв.кк, галоўная ўдарная сіла ў раёне Гродна, быў сур'ёзна аслаблены ў папярэдніх баях. Адчуваўся востры недахоп бранятанкавых сродкаў, скончыліся боепрыпасы. Дывізіі 31-й арміі адставалі і не маглі забяспечыць надзейнага прыкрыцця дзеянням кавалерыйскага корпуса на плацдарме. Яшчэ больш адсталі правафлангавыя падраздзяленні 50-й арміі г.-л. І.В.Болдзіна. Тым больш, што ў арміі г.-л. І.В.Болдзіна фактычна не было бранявых сілаў, якія можна было б увесці ў прарыў.

Перад камандаваннем 2-га Беларускага фронту, куды быў перададзены 3-ці Гв. кк, паўстала дылема – працягваць наступленне на захад, ці забяспечыць надзейную пераправу праз Нёман войскам усёй 50-й арміі г.-л. І.В.Болдзіна, а пасля гэтага працягваць наступленне. Кожны з варыянтаў меў свае плюсы і мінусы. Хуткае наступленне кавалерыстаў магло прывесці да вялікага разрыву ў абароне 4-й нямецкай арміі. З іншага боку – корпус павінен быў дзейнічаць адзін, без прыкрыцця пяхоты. У другім варыянце – арганізацыя пераправы праз Нёман вымагала вялікіх сродкаў (патрэбны былі шматлікія сапёрныя часці) і часу: пераправа 50-й арміі і кавалерыйскага корпуса заняла б ад 4 да 10 дзён. За гэты час немцы паспелі б закрыць прарыў і сканцэнтраваць у паласе наступлення корпуса значныя рэзервы.

У выніку разважанняў быў прыняты прамежкавы варыянт. Так згодна загада камандуючага фронтам г.-п. Г.Ф.Захарава ад




**14 ліпеня 1944г. Савецкі плацдарм на левым беразе Нёмана. Першы ўдар нямецкай 5-й тд.**

15 ліпеня 3-ці Гв. кк да 16 ліпеня павінен быў фарсіраваць раку і пашырыць плацдарм на левым беразе Нёмана (сканцэнтравацца ў раёне в. Беражаны – Пушкары). Пасля гэтага ён пераходзіў у наступленне ў накірунку в. Каробчыцы (на поўдзень ад Гродна). Гэтым ударам корпус адразаў шляхі да адступлення нямецкай групе г.-а.Г. Вейдлінга, часткі якой абаранялася ў Гродна. Такім чынам, ствараліся ўмовы альбо да акружэння нямецкіх падраздзяленняў, якія абараняліся ў занёманскай частцы Гродна, альбо яны вымушаны былі б адступаць з горада. У любым з двух варыянтаў гэта дазваляла хутка вызваліць горад Гродна цалкам (у тым ліку і Занёманскі фарштат). Акрамя таго, сэнс загаду паказвае, што ў штабе 2-га Беларускага фронту вырашылі не рызыкаваць далёкімі прарывамі ў глыб нямецкай абароны і замацавацца на дасягнутых рубяжах. Пра з’яўленне ў тыле нямецкай 4-й арміі рэзэрва – 3-й тд СС – інфармацыі ў штабе 2-га БФ не было.

***15 ліпеня*** ў мястэчку Сакулка разгарнуўся штаб 3-й тд СС "Мёртвая галава". Тут жа занялі пазіцыі падраздзяленні 3-га зенітнага батальёна СС (8,8 см зенітныя гарматы), якія забяспечвалі разгрузку частак дывізіі. У першых пяці эшалонах прыбылі 2-гі і 3-ці батальёны 6-га тгр палка СС "Эйке", 3-ці танкавы разведвальны батальён СС, 1-ы і 2-гі матарызаваныя артылерыйскія дывізіёны 3-га артпалка СС (на ўзбраенні САУ "Wespe" і "Hummel")[230]. Адзначым, што, хаця становішча на паўночны захад ад Гродна складалася не на карысць немцаў, дывізія павінна была спачатку закончыць свае канцэнтраванне, а толькі пасля гэтага, паводле загаду са штаба групы армій, магло здзяйсняцца яе баявое прымяненне.

Першая задача, якая стаяла перад падраздзяленнямі "Мёртвай галавы" было забеспячэнне чыгункі і станцый, на якіх павінны былі разгрузіцца астатнія часці. Чыгуначная лінія Беласток – Гродна праходзіла праз станцыі Сакулка, Кузніца, Брузгі і Ласосна. Апошняя станцыя знаходзілася ўжо ў Занёманскім фарштаце. Разгрузка там была небяспечнай, т.я. савецкія войскі знаходзіліся вельмі блізка – на супрацьлеглым беразе Нёмана. Таму часці танкавай дывізіі разгружаліся ці на станцыі Брузгі, ці на станцыі Кузніца (у 15 і 20 км на поўдзень ад горада адпаведна). Так Камандзір 3-га артылерыйскага палка СС штандартэнфюрар Ф.Месерль успамінаў: "Толькі прыбыўшы, эшалон павінен адразу ж разгрузіцца на перагоне ў Брузгах. Мы разгортваемся і выступаем ва ўсходнім накірунку для забеспячэння чыгуначнай лініі Кузніца – Гродна, так як перадавыя савецкія атрады ўжо прасунуліся ўперад і на поўначы ад нас выйшлі да чыгуначнай лініі"[231]. 16-я сапёрная рота палка СС "Эйке" заняла пазіцыі ў м. Кузніца.

Згодна з загадам камандуючага 2-м БФ, галоўная задача, якая стаяла перад падраздзяленнямі 3-га Гв. кк і 50-й арміі заключалася ў нарошчванні сваіх сілаў на левым беразе Нёмана. 15 ліпеня для ўзмацнення груповак савецкіх войскаў, якія фарсіравалі Нёман, пачалося будаўніцтва пераправаў праз раку. Так 877-мы асобны карпусны сапёрны батальён (камандзір – Гв. м-р П.І.Івін) 36-га ск атрымаў задачу навесці праз раку каля в. Куколі мост для пераправы частак 220-й Аршанскай сд. Месца пераправы было выбрана не зусім удала – рака Нёман у раёне в. Куколі дасягала 100 м шырыні. У пантоннай роты не хапіла парка пантонаў. Было прынята рашэнне дабудаваць мост драўлянай эстакадай. Каля пераправы заняў пазіцыі лёгкі зянітны дывізіён. Практычна адразу ж з'явіліся нямецкія бамбардзіроўшчыкі. Першы налёт быў паспяхова адбіты – пераправа засталася цэлай, аднак зянітчыкі панеслі цяжкія страты. Наступны налёт разбурыў пераправу: адзін з пантонаў быў разбіты. Сапёры ўзнавілі перапра-

ву, нарасціўшы эстакаду. Аднак праз паўтары гадзіны зноў з'явіліся нямецкія самалёты. У час гэтага налёту выбухі бомбаў сарвалі адзін з пантонаў. Толькі дзеянні камандзіра 1-га аддзялення 877-га батальёна ст. с-та Пятра Паўлавіча Кажамякіна (ён даплыў да пантона і кінуў трос на зямлю) дазволілі выратаваць паром[232]. Аднак пераправа, верагодна, была знішчана ў наступны дзень, таму што пазней яна ўжо не згадваецца ў савецкіх данясеннях. Падчас варожай бамбёжкі загінуў камандзір сапёрнага ўзвода л-т В.С.Сцяпанаў. Паводле ўспамінаў жыхара в. Пушкары С.К.Тарасевіча, пераправу каля в. Куколі нямецкая авіяцыя знішчала тры разы[233].

Яшчэ ў ноч на 15 ліпеня да Гродна у складзе агульнавайсковай разведкі 31-й арміі быў пасланы ўзвод л-та С.Ф. Іванова (99-ы асобны пантантонны батальён) з мэтай вызначыць месца будучай пераправы падраздзяленняў арміі на левы бераг р. Нёман. Група трапіла ў горад, які яшчэ быў заняты немцамі. Сяргей Фадзеевіч Іваноў узгадваў: "Мы да Гродна падышлі 14-га чысла. Я ішоў у складзе разведкі. Батальён спыніўся каля Лесніцы, ёсць такая ў бок Грандзіч вёсачка на правым беразе ракі.... Я ішоў у складзе агульнавайсковай разведкі са сваім узводам з задачай – вызначыць, што за Нёман, яго хуткасць плыні, праверыць мініраванне берагоў, выбраць месца для фарсіравання. 14 ліпеня ў ноч мы выйшлі на месца сучаснага стадыёна, там было поле камней, кажуць, там раней былі нейкія могілкі (*на месцы стадыёна былі жыдоўскія могілкі* – Д. Л.). Трапілі пад кулямётны абстрэл... На Савецкай плошчы стаяла кірха, потым яе падарвалі (*т.зв. Фара Вітаўта – каталіцкі касцёл, знаходзіўся ў цэнтры горада* – Д.Л.)... І вось з гэтай кірхі кулямётнымі чэргамі нас паклала ўсіх на гэтых могілках. Потым мы спусціліся каля Новага маста, тады яго яшчэ не было, на бераг ракі Нёман. У мяне была карта. Прыкрываючыся палаткай, мы свяцілі ліхтарыкамі і вызначалі месца. Каб навесці пантонны мост даўжынёй 100 метраў, трэба было падвезці 100-120 машын (*на ўзбраенні батальёна былі Зіс-5, ГАЗ-АА* – Д.Л.). І вось ноччу я прайшоў 3 ці 4 км да Куколей і ўсюды бераг не дазваляў мне выйсці да ракі і вывесці такую колькасць машын. У Куколях была калісьці паромная грамадзянская пераправа. Мне пашчасціла сустрэць жыхара... Ранцава Франца Іосіфавіча... Ён даў нам драўляны човен. А тады прамер ракі быў просты – пры дапамозе шнура. Нас заўважылі з таго боку ... – усё ўзбярэжжа было занята немцамі. Шырыня аказалася 102 метра... Гэтым я вызначыў самае лепшае месца..."[234] У ноч з 15 на 16 ліпеня салдаты 99-га пантоннага батальёна м-ра У.У.Самгіна (батальён быў спецыяльна перакінуты пад Гродна з 5-й танкавай арміі) пабудавалі наплаўны 60-тонны мост для пераправы войскаў і тэхнікі ў раёне в. Куколі – Шэмбелеўцы[235] (каля кіламетра на поўнач ад пераправы кавалерыстаў). С.Ф. Іваноў узгадваў будаўніцтва перапра-

вы 99-м апб: “У 11 гадзін мы выйшлі… Немцы, канешне, заўважылі, адразу пайшлі ўверх ракеты… Міны выбухалі каля паромаў і ў паром траплялі. На маім пароме (я вадзіў паром у лінію маста, заўжды замыкаючым вадзіў) быў маёр Васільеў, наш нампаліт. Тры кулі яму трапілі ў грудзі, ён упаў на пароме, хлопцы кінуліся яму дапамагаць, але ў кожнага, хоць аўтамат за спінай, але рукі мацуюць балты… Калі да яго кінуліся, ён сказаў: “Сыночкі, пакіньце мяне, выконвайце свае абавязкі і выводзьце паром”… Дзесьці гадзіны праз 2-2,5, да гадзіны ночы, мы, нягледзячы на страты (разбіла адзін паром) навялі пераправу… Войскі ўжо чакалі, яны сканцэнтраваліся ў лесе… Побач з намі, крыху вышэй, наводзілі пантонны мост Аслікоўскага салдаты. Пантон быў на драўляных лодках – на 5-7 тон для пропуску кавалерыі і пяхоты. Размяшчаўся дзесьці за кіламетр ад нас. Адразу ж пайшлі танкі, артылерыя, прайшлі дзве іркуцкія роты… Разведкай было выяўлена, чаму такая тэрміновасць была…. З боку Адэльска, каб не даць фарсіраваць Нёман і узяць занёманскую частку горада, ішлі танкі. “Мёртвая галава” іх нават называлі…”[236]

За ноч і раніцу 16 ліпеня па пераправе 99-га пантоннага батальёна фарсіравалі раку Нёман падраздяленні 42-й Смаленскай Чырвонасцяжнай сд і танкавае злучэнне (невядома якому падраздзяленню належылі гэтыя танкі). Па ўспамінах л-та С.Ф.Іванова, каля 6 гадзін раніцы 16 ліпеня каля пераправы з’явіўся невядомы генерал. Ветэран узгадваў: “Згодна з умовамі працы, мы павінны былі засветла мост развесці і перайсці на паромныя пераправы – яны менш прыступныя. У 6 гадзін прыехаў генерал. Не ведаю, хто ён быў. Ён выклікаў камандзіра батальёна і загадаў: “Пантонны мост не разводзіць. Будзем фарсіраванне праводзіць засветла па мосце. Яшчэ войскаў вельмі многа. Я вас прыкрыю з паветра”. На беразе былі ўсталяваны зенітныя ўстаноўкі. Мы іх называлі “Маша, давай-давай”. У 6 гадзін раніцы з захаду прыляцела “рама” (*нямецкі разведчык-карэктыроўшчык FW-189* – Д.Л.). Пакружыла ў нашай зоне. Скінула адну бомбу і паляцела. Праз 20 хвілін, мабыць, з боку Беластока з'явіліся 48 “Юнкерсаў”. У паветры ніводнага нашага самалёта не аказалася. І яны бесперашкодна, заходзячы кругамі і пікіруючы, сталі скідваць бомбы. Я якраз быў каля каменданта пераправы, а ў мяне быў там акопчык. І вось бачна, як самалёт ідзе, ён пачынае пікіраваць і скідае бомбу. У гэты час бачна, як ад яго аддзяляецца гэта чорнае цела бомбы… Першыя бомбы трапілі ў бераг. Яшчэ адзін зайшоў, яшчэ і яшчэ… Бомба трапіла ў берагавую частку – пераправа адразу заглохла. Дзве бомбы трапілі ў сярэдзіну маста. Пантоны сталі залівацца вадою. Насціл паплыў, прагоны пайшлі на дно. Так была разбіта пераправа… Прайшло 20 або 30 хвілін, з’явіліся самалёты ў гэтай жа колькасці з боку Сол (*вёска на ўсходзе ад Гродна, зараз у рысе горада* – Д.Л.), па тры сама-

лёты на брэючым палёце, на вышыні 150-200 м, пачалі прачэсваць тэрыторыю. Яны скінулі ўвесь груз на нашы войскі, і на мост, і на нашых пантанёраў, якія выйшлі падабраць маёмасць. Гэтага налёту ніхто не чакаў. Думалі, што былі разбітыя і ўсё. А яны зрабілі такі варварскі налёт. Ніводнага самалёта нашага не было. Ад зянітак заставаліся толькі варонкі… У выніку такога налёту 74 чалавекі, мае таварышы, ляжаць у Грандзічах… Быў забіты камбат… Танкі былі перавернуты, вежы сарваны ад бомбаў. Гэта быў кашмар. Я вайну прайшоў у пяхоце і ў 45-ым годзе на Шпрэе сустрэўся з англічанамі. Я за гэтыя гады такой варварскай бамбёжкі войскаў не памятаю. Проста беспакарана і бязлітасна знішчылі тэхніку і людзей"[237]. Ад 99-га пантоннага батальёна засталася толькі аўтамабільная рота. Пасля гэтага батальён быў выведзены ў в. Парэчча. Старшы лейтэнант С.Ф. Іваноў за ўдзел у пераправе праз раку Нёман быў прадстаўлены да ордэна Чырвонай Зоркі.

У той жа час была спалена і пераправа кавалерыстаў вышэй па цячэнні ракі Нёман. Аб гэтым у сваіх успамінах пісаў камандзір мінамётнага ўзвода, агітатар 24-га Гв. кп старшына Д.І.Вадзінскі: "Некалькі разоў экіпажам "хейнкелей" (бамбардзіроўшчык Не-111 – Д.Л.) удавалася разбіць мост, але саперы тут жа, як толькі варожыя самалёты хаваліся за кромкаю лесу, пачыналі ўзнаўляць яго. І зноў па дашчатым насціле рухаліся эскадроны. Аднак удары варожых бамбардзіроўшчыкаў працягваліся. Гэта перашкодзіла поўнасцю пераправіць праз раку танкавыя падраздзяленні, цяжкую артылерыю корпуса"[238]. Л-т І.А. Баянаў узгадваў, што пасля знішчэння пераправы яго сапёры абсталявалі прыстань і 2 паромы, на якіх бесперапынна перакідвалі падмацаванні на плацдарм. На працягу двух сутак паромы перапраўлялі склад 32-й дывізіі і іншых падраздзяленняў корпуса. Дарэчы, лічылася, што да гэтага часу савецкая авіяцыя кантралявала паветраную прастору. Гродзенскі гісторык дацэнт У.А.Нядзелька прыводзіць наступныя лічбы, якія нібы пацвярджаюць гэта: на працягу 15 ліпеня толькі самалёты 1-й паветранай арміі здзейснілі 283 самалётавылеты у раён Гродна, у той час як немцы толькі 58[239]. Тым не менш, паветранае прыкрыццё савецкай авіяцыі, калі яно і было, дык было вельмі неэфектыўным. У той час як нямецкія ўдары дасягалі сваёй мэты.

Мяркуючы па ўсім, знішчэнне пераправы 99-га пантоннага батальёна не было выключэннем. На працягу ўсіх баёў на паўночны захад ад горада Гродна нямецкая авіяцыя ў светлы час сутак знішчала большасць пераправаў, якія прыходзілася ўзнаўляць ноччу, сіламі свежых сапёрных частак. М.Максімцаў адзначаў у сваёй кнізе, што ў выніку нямецкіх атак і штурмовак авіяцыяй **усе савецкія перапра-**

**вы былі знішчаны**[240]. Па ўспамінах жыхароў прынёманскіх вёсак, ад мястэчка Гожа да в. Пышкі, страты савецкіх частак былі вялізныя. Так І.Пушкевіч узгадвала, што ў раёне м. Каўбаскі савецкія войскі навялі пяць пераправаў, якія былі адначасова немцамі разбомблены: "Нёман салдатамі і машынамі пабітымі так запрудзіла, што ён іншым рэчышчам пайшоў. Усё чырвонае ад крыві было"[241]. Прыкладна тое ж самае адбылося ў Пышках. Са стратамі ў войсках, аднак, савецкае камандаванне лічылася слаба. Па наяўных дадзеных пераправы па рацэ Нёман знаходзіліся: у в. Пышкі, у раёне Крэйдавых Гор, у вёсках Беражаны, Куколі, магчыма, у раёне в. Каўбаскі, у раёне мястэчка Гожа і на поўнач ад яго – чатыры пераправы.

Акрамя таго, савецкія войскі фарсіравалі раку Нёман на поўнач ад мястэчка Гожа, у в. Пласкаўцы, збіўшы з пазіцый 3-і паліцэйскі батальён 17-га палп СС[242]. Гэтыя часці прасунуліся ў напрамку Селіванаўцы – Войтаўцы. Магчыма, паліцэйскіх адкінулі сілы 220-й Аршанскай сд, якая фарсіравала раку Нёман на поўнач ад мястэчка Гожа 15 ліпеня. 376-ы сп і рухомы атрад дывізіі, якія фарсіравалі раку на поўдзень, у раёне в. Беражаны, хутчэй за ўсё далучыліся да дывізіі.

Раніцай 15 ліпеня пачаліся ўпартыя баі за плацдарм, захоплены падраздзяленнямі 32-й кд і 220-й сд на левым беразе ракі Нёман. Каля поўдня савецкія часці распачалі атакі з мэтай пашырэння плацдарма ў паўднёвым напрамку – у накірунку вёсак Пушкары – Салаўі –– Адамавічы. Нямецкія паліцэйскія часці адышлі, даўшы магчымасць заняць савецкім войскам в. Адамавічы[243]. Дапамогу войскам у раёне горада ў гэты дзень забяспечвалі машыны 136-га Гв. шап. Імі, напрыклад, была праведзена паспяховая штурмоўка нямецкай тэхнікі на дарозе Пышкі – Пушкары. У ёй удзельнічалі дзве групы па 6 "Ілаў" м-ра Герасімава і старшага л-та Казенкова[244].

Такое паспяховае пашырэнне плацдарма савецкімі войскамі выклікала трывогу ў немцаў: узнікла пагроза выхаду савецкіх падраздзяленняў у тыл групе г.-арт. Г. Вейдлінга, якая займала пазіцыі на поўдзень ад Гродна. Са штаба карпуснoй групы патрабавалі неадкладна спыніць прасоўванне рускіх пры дапамозе частак 3-й тд СС. Аднак камандаванне 4-й арміі забараніла заўчаснае выкарыстанне гэтых сіл. Лічылася, што танкавая дывізія знаходзіцца ў рэзерве групы армій і можа выкарыстоўвацца толькі па спецыяльнаму загаду. У гэтым становішчы начальнік аператыўнага аддзела штаба 3-й танкавай дывізіі оберштурмбанфюрар Эрых Эберхард прыняў самастойнае рашэнне на выкарыстоўванне часткі сіл дывізіі для забеспячэння пазіцый карпусной групы. Па яго загаду 3-ці танкавы разведвальны батальён СС і 2-гі батальён 6-га тгр палка СС каля 16.00 15 ліпеня выступілі па дарозе Сакулка – Кузніца – Каўбасіно[245]. Гэтыя батальё-

ны дывізіі перакрылі дарогу з Гродна на захад у в. Ласосна і мост праз раку. Калі б савецкія войскі прарваліся на поўдзень ад в. Адамавічы, немцы ўтрымлівалі б лінію па рацэ Ласосна фронтам на захад. Аднačасова 3-ці танкавы разведвальны батальён СС павінен быў разведаць мясцовасць будучых баёў у раёне вёсак Падлабенне – Ласосна.

У гэты час немцы працягвалі баявыя дзеянні супраць савецкага плацдарма на левым беразе Нёмана сіламі 5-й тд. На дадзены момант толькі сілы баявой групы гэтай танкавай дывізіі маглі рэальна стрымліваць далейшае пашырэнне плацдарма савецкімі войскамі. У в. Скрыннікі разгарнуўся 5-ы танкавы разведвальны батальён для атакі савецкага плацдарма па фронце. Штаб дывізіі разам з камандзірам дывізіі ген. Дэкерам размяшчаўся ў в. Рацічы. Першапачаткова ён здзяйсняў кіраванне ўсімі часцямі дывізіі, у тым ліку і групай "Герцага", аднак ужо 15 ліпеня кіраванне падраздзяленнямі ў раёне горада Друскенікі было спынена.

У другой палове дня немцы нанеслі контрудар сіламі 5-й тд. Група к-на Фрыдрыха (1-ы батальён 13-га тгр палка і 1-ы дывізіён 116-га артпалка)[246] атакавала пазіцыі савецкіх падраздзяленняў у раёне вышыні 166.0 і на вышынях на поўнач ад в. Каўбаскі. У адбіцці нямецкіх атак прымыў удзел і 1679-ы атрылерыйска-мінамётны полк 32-й кд. Па ўспамінах камандзіра 1-га эскадрона 65-га кп 32-й кд ст. л-та І.Я.Паўлава, было адбіта да 15 нямецкіх атак. Выратавала становішча зводная знішчальна-супрацьтанкавая брыгада 3-га Гв. кк. Яна паспела фарсіраваць Нёман па пераправе кавалерыйскага корпуса яшчэ да таго, як тая была знішчана[247]. Своечасовы падыход зводнай знішчальна–супрацьтанкавай брыгады Гв. ппалк. Васіля Яфімавіча Каўтанюка, "якая заняла амаль кругавую супрацьтанкавую абарону"[248], дазволіў выстаяць і паспяхова адбіць усе атакі баявой групы 5-й тд. Падчас адной з атак савецкія кавалерысты пакінулі свае акопы і пачалі адступаць. Выратавалі становішча толькі гукі моцнай кананады, якія даносіліся з боку горада Гродна – у гэты час пачаўся штурм горада. Немцы, пачуўшы кананаду, таксама спынілі атакі і адступілі.

Другая група 5-й тд пад камандаваннем м-ра Дрэвеса (1-шы батальён 14-га тгр палка, 3-ці дывізіён 116-га артпалка і часці 89-га сапёрнага батальёна пры падтрымцы 6 StuG) атакавала паўночны плацдарм з раёна на ўсход ад мястэчка Сапоцкін у накірунку в. Войтаўцы. У 17.00 атакуючая група выйшла на лінію Войтаўцы – Плябаньске[249] і ўсталявала сувязь з адступаючым 3-ім батальёнам 17-га палп СС. Нягледзячы на паспяховае прымяненне сіл 5-й тд супраць савецкіх войскаў на паўночны захад ад Гродна, становішча складалася не на карысць немцаў. Раку Нёман фарсіравалі на шырокім адрэзку

падраздзяленні 3-га Беларускага фронту. Стваралася пагроза пашырэння плацдармаў савецкімі войскамі па рацэ Нёман ад горада Гродна да горада Меркіне. Паколькі плацдарм на поўнач ад Аўгустоўскага канала пашырыўся, камандзір 5-й тд ген. Дэкер рызыкаваў быць адрэзаным з баявымі групамі "Фрыдрых" і "Дрэвес" ў раёне мястэчка Сапоцкін. Баявая група нямецкай 5-й дывізіі атрымала загад спыніць атакі на гродзенскім накірунку і ноччу адступіць па дарозе Сапоцкін – Капчамесціс – Меркіне для злучэння з асноўнымі сіламі дывізіі. Гэтай жа ноччу падраздзяленні баявой групы 5-й тд павінны былі замяніцца прыбыўшымі падраздзяленнямі 3-й тд СС. У ноч на 16 ліпеня падраздзяленні 5-й тд пачалі адыход з пазіцый, якія займалі. Яны павінны былі перамясціцца на поўнач, у раён горада Друскенікі, дзе рака Нёман была таксама паспяхова фарсіравана савецкімі войскамі.

Такім чынам, немцы пачалі адводзіць свае войскі з плацдарма. 1-шы батальён 14-га тгр палка прабіваўся на поўнач ужо з боем праз занятую савецкімі салдатамі в. Лойкі[250]. Хутчэй за ўсё, ужо гэтай ноччу немцы ўвялі ў бой 3-ці танкавы разведвальны батальён СС – першае падраздзяленне з прыбыўшай 3-й тд СС, якое ўдзельнічала ў баях у раёне Гродна. Гэта вынікае з радыёграмы корпуснай групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга ў штаб 4-й арміі: "Разведвальны батальён тд СС "Мёртвая галава" прадухіліў далейшыя дзеянні праціўніка і сёння на паўночны захад ад Гродна адкінуў яго на усход"[251].

Няўдачнымі атакамі 5-й танкавай дывізіі 14-15 ліпеня заканчваюцца першыя спробы немцаў скінуць у раку падраздзяленні Чырвонай арміі, якія пераправіліся праз раку Нёман. У прыватнасці баі 15 ліпеня паказалі, што сілаў баявой групы нямецкай 5-й тд было недастаткова для таго, каб ліквідаваць савецкі плацдарм на левым беразе ракі. Савецкія падраздзяленні пратрымаліся. Немцы таксама прыкладалі намаганні для нарошчвання сваёй групоўкі на паўночны захад ад Гродна. Адвод немцамі сіл 5-й тд палегчыў становішча савецкім войскам на плацдарме – у ноч з 15 на 16 ліпеня яны змаглі адносна бесперашкодна перавозіць праз раку Нёман падмацаванні.

Акрамя таго, баі 14-15 ліпеня паказалі, што ўтрыманне плацдарма было, магчыма, толькі дзякуючы сілам 3-га Гв.кк. Палкі 32-й дывізіі і зводнай знішчальна-супрацьтанкавай брыгады вынеслі асноўны цяжар нямецкіх атак. Неабходна было, як мага хутчэй, перакідваць падмацаванні на плацдарм. Аднак кавалерыйскія палкі 6-й і, часткова 5-й Гв.кд яшчэ вялі баі за горад Гродна. Тым не менш, разумеючы складанасць сітуацыі, камандванне корпусам аператыўна накіроўвала на плацдарм усе свабодныя падраздзяленні.




**15 ліпеня 1944г. Савецкі плацдарм на левым беразе Нёмана. Другі ўдар нямецкай 5-й т.д.**

***16 ліпеня*** праз раку Нёман удалося перакінуць 17-ты і 22-гі Гв. кп 5-й Гв. кд у спешаным выглядзе (без коней)[252]. Такім чынам, групіроўка 3-га Гв. кк была павялічына. Праўда 6-я Гв. кд яшчэ была занята баямі ў горадзе.

У той жа дзень штаб групы армій "Цэнтр" аддаў нарэшце загад аб выкарыстанні 3-й танкавай дывізіі СС у складзе 4-й палявой арміі. У прыватнасці ў загадзе паведамлялася: "…тд СС падпарадкоўваецца 4-й арміі для неадкладнага выкарыстання ў раёне Гродна. Аб запланаванай аперацыі трэба паведаміць загад-

зя. Модэль"[253]. З раніцы 17 ліпеня сілы танкавай дывізіі павінны атакаваць савецкі плацдарм у фланг.

Раніцай 16 ліпеня фарсіраванне ракі Нёман пачаў савецкі 69-ы ск 50-й арміі. Стралковыя палкі і аператыўная група штаба 153-й сд (палк. А.А.Шчэннікаў) пераправіліся праз раку Нёман па пераправе за 6 км на поўнач ад горада[254] – хутчэй за ўсё, пераправа 3-га Гв. кк ці 99-га апіб. Яна праіснавала ўсяго некалькі гадзін і была знішчана нямецкай авіяцыяй хутка пасля пераправы асноўнай масы войскаў дывізіі. Больш за палову штаба, асноўная частка аўтатранспарту, артылерыя і склады боехарчавання дывізіі – засталіся на ўсходнім беразе. Наконт фарсіравання ракі 153-й сд маюцца розныя версіі і недакладнасці. Так камандзір 557-га сп м-р Ф.С.Фядотаў піша, што яго полк пераправіўся праз раку ў раёне Каложы і правей (у раёне сучаснага Новага маста ў Гродна), куды яны і выйшлі пасля штурму горада раніцай 16 чысла. Ён дастаткова падрабязна апісвае раку Нёман: моцны нямецкі агонь з супрацьлеглага берага, "...баржы, з якіх стралялі фашысцкія гарматы. Па Нёмане насіліся катэры, якія палівалі полк кулямётным агнём..."[255] Па яго словах, 557-мы сп тады ж, 16 ліпеня, фарсіраваў раку Нёман у гэтым жа месцы, захапіўшы плацдарм да паўтара кіламетра, а вечарам таго ж дня да яго далучыліся і астатнія палкі дывізіі. Аднак м-р Ф.С.Фядотаў памыляецца ў паказе месца фарсіравання ракі. Па-першае, гэтая інфармацыя супярэчыць успамінам С.М.Вернікава, які, як ужо згадвалася вышэй, адзначаў, што пераправа дывізіі знаходзілася за 6 км на поўнач ад Гродна. Па-другое, м-р Ф.С.Фядотаў піша, што далей, 17 ліпеня, дывізія вяла баі за в. Каўбаскі, якая знаходзіцца на паўночны захад ад горада, прычым дывізіі неабходна было б перамяшчацца туды па адзінай дарозе, якая праходзіла праз в. Ласосна, якую эсэсаўцы з 3-й тд СС перакрылі яшчэ вечарам 15 ліпеня, а прабіцца праз іх пазіцыі было б нялёгка[256]. Трэба меркаваць, 153-я сд *спрабавала* пераправіцца з раёна Каложы раніцай 16-га, але няўдала, пасля чаго перайшла ўздоўж ракі Нёман на поўнач, дзе і фарсіравала раку. На левым беразе дывізія замацавалася на рубяжы Шэмбелеўцы – лес на ўсход ад в. Баля-Касцельная[257]. Пачала фарсіраванне ракі Нёман і 42-я сд.

На досвітку 241-ы полк 95-й сд (палк. С.К. Арцем'еў) 81-га ск 50-й арміі пераправіўся праз раку Нёман на поўдзень ад 153-й дывізіі без падрыхтоўкі артылерыі і авіяцыі. Ён заняў плацдарм насупраць в. Адамавічы (у раёне сучаснай турбазы "Нёман")[258]. У сярэдзіне дня фарсіраваў раку Нёман з раёна Крэйдавых гор і 90-ы полк гэтай жа дывізіі, пашырыўшы плацдарм. Хутчэй за ўсё, менавіта гэтую пераправу апісаў у сваім дзённіку жыхар Гродна Я.Карпюк: "Роўна ў поўдзень нашыя часці пачалі абстрэльваць кулямётамі процілеглы

берег. Немцы прытаіліся і доўга не адказвалі. Але пасля абстралялі некалькі нашых чалавек, якія паспрабавалі на лодцы захапіць пантон, пакінуты імі каля таго берага. Кулямёты і аўтаматы застракаталі, так працягвалася да вечара. Мяне здзіўляла тое, што артылерыйскіх выстралаў не было чуваць. З другой паловы дня нашы часці пачалі пераправу падручнымі сродкамі. Пад прыкрыццём ружэйнага і кулямётнага агню салдаты, лежачы на бярвенях і ў лодках, бесперапынна страляючы, пераправуляліся на процілеглы бераг. 4 чалавекі загінулі. Захапіўшы 600 кв.м. берага, нашы байцы зрабілі перадмоставае ўмацаванне. Пасля пачалося навядзенне маста пад агнём непрыяцеля... гарматнага агню не было ні з нашага, ні з варожага боку"[259]. На працягу дня немцы зрабілі некалькі атак пяхотай, для таго каб скінуць палкі дывізіі ў раку Нёман, аднак поспехаў не дасягнулі.

У другой палове дня кавалерысты Гв. г.-л. М.С.Аслікоўскага пачалі наступаць з мэтай пашырыць плацдарм: зводная брыгада Гв. ппалк. В.Я.Каўтанюка – у напрамку в. Каўбаскі, 5-я Гв. кд – в. Баля-Касцельная і 32-я кд – вёскі Пушкары – Салаўі. Асаблівую пагрозу для немцаў уяўлялі атакі ў паўднёвым напрамку – в. Ласосна. У выпадку, калі б савецкія падраздзяленні выйшлі да ракі Ласасянка, яны маглі б адсечы нямецкія часці, якія дзейнічалі супраць савецкага плацдарма, ад частак, якія займалі Занёманскі фарштат. Таму ўтрыманне в. Ласосна было важнейшай задачай для немцаў. Памеры плацдарма савецкіх кавалерыстаў былі невялікія: 2 кіламетры па фронце і 1,5 км у глыбіню. Камандзір 2-й батарэі 178-га ап 5-й Гв. кд Гв. старшы л-т М.Г. Гарабчук, які апынуўся са сваёй батарэяй на плацдарме, узгадваў: "... прыйшлося нам (*займаць абарону* – Д.Л.) на гэтым абрэзкавым плацдарміку, які наскрозь прастрэльваўся кулямётным агнём, па ўсёй плошчы пакрываўся мінамётным агнём. Больш менш надзейным укрыццём мог стаць стромкі абрыў над самой ракой, але з усходам сонца і ён страціў значэнне сховішча, а галоўнае, адсюль нічога не было відаць. Нямецкія самалёты трывала завалодалі небам і бесперастанна бамбілі пераправу або іншыя аб'екты, якія былі даспадобы лётчыкам, кружылі над пераправаю, віселі над галавой, пакуль не прылятала на змену другая група"[260]. Пазіцыі батарэі (8 гармат), што размяшчалася каля берагу ракі Нёман, прыкрываў разлік зенітнага ДШК. Аднак адзін кулямёт не змог утрымаць атакі нямецкай авіяцыі. У час штурмоўкі пераправы ён быў знішчаны.

Мяркуючы па ўспамінах удзельнікаў апісаных падзей, савецкая авіяцыя не змагла дабіцца ўладарання ў паветры. Але гэта зусім не значыць, што яна бяздзейнічала. Паветраныя сілы, якія прыкрывалі наземныя войскі, вялі баі з нямецкай авіяцыяй па меры сваіх магчымасцей. Так на працягу баёў 15-24 ліпеня ў раёне Гродна паветранае

прыкрыццё ажыццяўляла 309-я знішчальная авіяцыйная дывізія. Напрыклад, днём 16 ліпеня паветранае прыкрыццё над плацдармам ажыццяўлялі знішчальнікі 162-га зап. У прыватнасці, чацвёрка Як-9 пад камандаваннем к-на У.Г. Шчогалева (камандзір эскадрыллі 162-га зап) перахапіла групу з дваццаці сямі Ju-87 пад прыкрыццём шасці FW-190. Дзякуючы дзеянням савецкіх знішчальнікаў, немцы не змаглі выканаць сваю задачу і страцілі адзін Ju-87 над вёскамі Навумавічы – Міцкевічы. Бамбардзіроўшчык быў збіты к-нам У.Г. Шчогалевым[261]. На наступны дзень, 17 ліпеня, на паўночны захад ад Гродна той жа к-н У.Г. Шчогалеў збіў знішчальнік FW-190. 21 ліпеня над м. Адэльск, на поўдзень ад Гродна капітан збіў яшчэ адзін Ju-87.

У той жа дзень, 16 ліпеня, падзяка Вярхоўнага Галоўнакамандавання была аб'яўлена авіяпалкам 290-й зад за баі ў раёне Гродна. Авіяпалкі базіраваліся на аэрадромах у раёне горада Ліда, таму самалёты мелі абмежаваныя магчымасці дзеянняў у раёне Гродна – не хапала гаручага. Большасць заданняў, якія выконваліся дывізіяй, датычыліся суправаджэння штурмавой і бамбардзіровачнай авіяцыі, якая наносіла ўдары па левым беразе ракі Нёман[262].

Аднак вернемся да падзей на плацдарме. Першапачаткова нямецкі агонь у паласе дывізій кавалерыйскага корпуса быў настолькі моцным, што кавалерыйскія часці, якія фарсіравалі раку Нёман, не маглі прасунуцца наперад. Наступленне 5-й Гв. кавалерыйскай дывізіі Гв. г.-м. М.С.Чапуркіна спынілася. Эскадроны 24-га Гв. кп заляглі ў выніку фланговага агню нямецкага кулямёта і мінамётнай батарэі, якія належылі, хутчэй за ўсё да 2-га батальёна 17-га паліцэйскага палка СС.

Да поўдня артылерыя 5-й Гв. кд не магла раскрыць сістэму нямецкага агню – моцны агонь не даваў магчымасці зрабіць гэта. Кавалерысты былі ў прамым сэнсе ўціснуты ў зямлю. Без падтрымкі сваёй артылерыі ўсе атакі не давалі ніякага выніку. Па словах Гв. ст. л-та М.Г.Гарабчука, "узнікла рэальная пагроза быць скінутымі ў раку". Начальнік артылерыі 24-га Гв. кп Гв. м-р Сонін загадаў абстраляць нямецкія пазіцыі з 45-мм гарматы з артылерыйскага ўзвода Гв. л-та І.Якушына з вышыні, занятай кавалерыстамі. Гв. л-т І. Якушын узгадваў: "Я паглядзеў на стромкі схіл вышыні, указанай маёрам, і адразу ж засумняваўся ў разумнасці гэтага рашэння. Затым я параіў майму камандзіру гарматы, сяржанту Паланевічу, каб ён знайшоў адпаведную агнявую пазіцыю каля падножжа схілу. Сам я тут жа вырашыў узабрацца наверх, каб упэўніцца, ці можна зацягнуць гармату на вяршыню. Аднак, чым вышэй я падымаўся, тым мацней і сканцэнтраваней станавіўся нямецкі агонь. Вакол свісталі кулі. Калі я падабраўся да лініі фронту, дзе нашы кавалерысты абменьваліся

агнём з ворагам, мяне раптам спыніў камандзір іх узвода. "Стой! Паварочвай! Далей ісці нельга!" – крычаў ён. На вяршыне схілу былі відаць целы нашых салдат. "Якога чорта ты прэшся ў гэтае пекла?! Жыццё табе не дарагое?!!" – крычаў ён на мяне. Я яму растлумачыў, што павінен усталяваць там сваю гармату. Імгненне здавалася, што ён жадае сказаць мне нешта нядобрае, але ён перадумаў і ўжо больш спакойна растлумачыў, што вяршыня ўзгорка праглядаецца немцамі, таму ён не можа забраць адтуль целы нашых людзей, і кожная такая спроба толькі павялічвае колькасць ахвяр. Я зразумеў, што нічога не здолею зрабіць і пачаў спускацца, а хутчэй скатвацца з узгорка, драпаючыся аб калючыя кусты. Унізе, каля падножжа ўзгорка, я знайшоў сваю гармату, падрыхтаваную да абстрэлу першай лініі нямецкіх акопаў, размешчаных пасярэдзіне процілеглага ўзгорка. Відаць, немцы, якія сканцэнтравалі сваю ўвагу на вяршыні, не заўважылі нашай зброі. Мы адкрылі агонь. Хутка да нас далучыліся брыгада мінамётаў і палкавая 76-мм гармата, якую ўдалося пераправіць праз Нёман. Наш сумесны агонь уціхамірыў немцаў, вымусіўшы іх пакінуць акопы"[263].

Ст. л-т М.Г.Гарабчук успамінаў, як ён карэктаваў агонь сваёй 76-мм гарматы, якую ўзгадваў лейтэнант Іван Якушын: "У асаблівасці нам перашкаджаў адзін кулямёт, з правага боку ад пераправы. Трохі разабраўшыся ў становішчы, вырашыў у першую чаргу заняцца гэтым кулямётам. Аблюбаваў наперадзе, у 400 метрах невялічкі пагорак з палоскаю жыта ў якасці назіральнага пункта,.. Толькі адпаўзлі ад абрыву метраў сто, як кулямёт прыцiснуў наз да зямлі... Ізноў папаўзлі, прыціскаючыся да зямлі-матухны так, што ад насоў заставаліся на бульбяным полі баразны. Спёка... Нарэшце, каля заветнай палоскі жыта. Некалькі хвілінаў ляжу нерухома, спрабую зразумець – выкрыў мяне праціўнік, ці не... Па гуку і ледзь заўважным ад стрэлаў пылу заўважыў кулямёт. Ён аказаўся трошкі лявей ад таго месца, якое я намеціў. Кулямёт вядзе агонь уздоўж нашых баявых парадкаў і па подступам да іх. Старанна, выкарыстоўваю карту і рыхтую дадзеныя для стральбы. Стрэл – узрыва не бачу... Яшчэ стрэл – ёсць, пералёт... карэктую ўзровень. Вельмі нізкая траекторыя, палёт снарада адчуваецца спіной. Так нядоўга і па свайму нп урэзаць. Тут мінамёт ці гаўбіца патрэбна. Страляе першая гармата. Наводчык першага – сяржант Салфетнікаў – лепшы наводчык у палку... Прашу перадаць яму: быць вельмі ўважлівым, асабліва да ўзроўню, падбіраць снарады адной вагі. Чатыры стрэлы – разрывы бачу, аднак ацаніць іх цяжка. Кулямёт маўчыць – падаўлены ці замоўк? Дзеля вернасці даю яшчэ чатыры снарады"[264]. Пасля гэтага гарматы ст. л-та М.Г.Гарабчука падавілі нямёцкую мінамётную батарэю. Невялікія паліцэйскія сілы II/17 палп СС адступілі, не прымаючы бою, прыкрываючы свае парадкі кулямётным агнём. Эскадроны 24-га палка прасунуліся

ўперад каля двух кіламетраў, дзе ізноў вымушаны былі спыніцца з-за агню нямецкага кулямёта. Як бачна, немцы не мелі на гэтым адрэзку значных сілаў. Аднак яны вельмі эфектыўна выкарыстоўвалі кулямёты, перашкаджаючы наступленню кавалерыйскага палка. 17-ы Гв. кп у той жа час выйшаў у раён в. Баля-Касцельная. У баях за вёску полк страціў 8 чалавек радавога і сяржанцкага складу[265] забітымі.

Прасоўваючыся наперад, кавалерысты 32-й кд (па нямецкіх дадзеных – узмоцненыя танкамі) занялі шэраг вышынь у в. Пышкі. Слабыя паліцэйскія батальёны адступілі. Па данясеннях з групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга, яе страты за час баёў дасягнулі 50% асабітага складу: "...Вялікія страты з-за недахопу супрацьтанкавай зброі ставяць пад сумненне паспяховую абарону па лініі Нёмана. Неабходна хуткая перакідка абяцаных падмацаванняў (1-га батальёна 34-га паліцэйскага палка і 4-га паліцэйскага палка СС) і мінімум адной танкавай роты ці адпаведна батарэі штурмавых гармат"[266]. Камандаванне карпусной групы разлічвала толькі на прыбыццё ўжо выступіўшых падмацаванняў: 1-га батальёна 34-га паліцэйскага стралковага палка і 4-га палп СС. Батальён 34-га палсп (камандзір м-р Алоіз Бартч) перакідваўся з горада Цехановец па загаду г.-м. паліцыі Хелвінга, камандуючага СС і паліцыяй у горадзе Беласток. Дарэчы, незадоўга да гэтых падзеяў, батальён прымаў удзел у ліквідацыі паўстання ў Беластоцкім гета. На ўзбраенні батальёна былі 4 цяжкія супрацьтанкавыя гарматы, 20 лёгкіх і 12 цяжкіх кулямётаў[267]. Пагрузіўшыся на 40 грузавікоў, батальён выехаў да месца баёў. Вечарам ён ужо вёў бai з савецкімі падраздзяленнямі ў раёне в. Салаўі, якія фарсіравалі раку Нёман.

Напружаныя бai разгарэліся ў раёне в. Каўбаскі. Першая атака савецкіх войскаў была адбіта эсэсаўцамі з 3-га танкавага разведвальнага батальёна СС. У 15.30 савецкая атака была паўторана. Наступаючыя войскі (немцы ацэньвалі сілы наступаючых у 200 салдат) змаглі заняць вёску і размешчаную непадалёк галоўную вышыню 165.7[268]. На працягу наступнай гадзіны савецкія падраздзяленні прасачыліся скрозь нямецкія пазіцыі па абодва бакі вышыні.

Падраздзяленні 5-й Гв. кд Гв. г.-м. М.С.Чапуркіна, якія наступалі ў заходнім накірунку, сутыкнуліся з падраздзяленнямі 3-й тд СС, што прыйшлі на дапамогу паліцэйскім падраздзяленням. 2-гі батальён 6-га тгр палка "Тэадор Эйке" пачаў наступленне з пазіцый каля дарогі Гродна – Сапоцкін, што праходзіла паралельна рацэ Нёман. У гэтай контратацы немцы дайшлі да вёсак Лойкі і Каўбаскі.

Адначасова 3-ці танкавы разведвальны батальён СС контратакаваў з паўночнага напрамку. Прасоўваючыся наперад, ён заняў вышыню 165.7[269]. Савецкія войскі вымушаны былі адступіць

у напрамку в. Монькаўцы, да ракі Нёман. 1/SS-Pz. AA 3 атакавала в. Белічаны. Заняўшы вёску і адбіўшы некалькі савецкіх контратак, немцы ўсталявалі сувязь з часцямі 3-га батальёна 17-га палп СС, якія знаходзіліся на поўдзень ад вёскі Плябанскія. Адыходзячы, часці нямецкай 5-й тд адціснулі асобныя групы савецкіх войскаў у раён в. Ятвезь і далей да Аўгустоўскага канала. У 19.30 савецкімі кавалерыстамі была паўторана атака галоўнай вышыні 165.7. Падтрыманая артылерыйскім агнём, атака скончылася паспяхова – вышыня была занята.

Такім чынам, плацдарм на левым беразе ракі Нёман быў пашыраны савецкімі войскамі за кошт заняцця в. Салаўі і вышыні 165.7. Далейшыя атакі ў паўднёвым накірунку былі спынены 1-ым батальёнам 34-га паліцэйскага палка, які контратакаваў з в. Ласосна[270]. Нягледзячы на неаднаразовыя нямецкія контратакі, савецкім войскам удалося захаваць плацдарм для перакідкі новых сіл на плацдарм.

Тым часам, ішлі ўпартыя баі за фарсіраванне ракі Нёман у межах горада. Раніцай у раёне чыгуначнага маста захапіў плацдарм 1-шы батальён 878-га сп 290-й сд. Яго першая рота пад камандаваннем парторга батальёна старшага л-та Машкова распачала баі за будынкі тытунёвай фабрыкі. Слабыя аховы нямецкіх 2-га і 22-га палп СС адышлі. Такім чынам, плацдарм у Занёманскім фарштаце на гэты момант дасягаў каля 1 кіламетра ў глыбіню. Для перакідвання савецкіх войскаў праз раку была наладжана лодачная пераправа. Аднак эфектыўна дзейнічаць яна не магла, паколькі знаходзілася пад бесперапынным нямецкім агнём з процілеглага берага.

Камандзір 878-га сп ппалк. М.Г.Хамулы пасля заняцця плацдарма тэрмінова загадаў пераправіць на другі бераг два ўзводы сапёраў, каб замініраваць танканебяспечныя подступы да плацдарма[271]. Камандзір 290-й дывізіі г.-м. І.Г.Гаспаран тым часам вырашыў пашырыць плацдарм за кошт пераправы праз раку на поўдзень ад чыгуначнага маста 885-га сп пад камандваннем ппалк. У.І.Шыпілава. Для дапамогі пераправе палкаппалк. М.Г. Хамулы накіраваў 2-гі батальён, які ўжо фарсіраваў раку Нёман, да месца меркаванай пераправы 885-га сп. Прасоўваючыся да ўказанага месца, батальён трапіў пад агонь немцаў і быў закіданы гранатамі. З высокага берага яны змаглі затрымаць выцягнутых у ланцужок савецкіх салдат, якія не мелі ніякага сховішча. Некаторы час батальён не мог прасоўвацца, "не меў магчымасці ні праскочыць уперад, ні павярнуць назад"[272]. Вызвалілі батальён з цяжкага становішча палкавыя разведчыкі пад камандаваннем камандзіра ўзвода пешай разведкі 878-га стралковага палка ст. л-та А.С. Маякіна. Ударыўшы па немцах з тылу гранатамі, разведчыкі ст. л-та А.С.Маякіна ўвялі іх у збянтэжанасць. У гэты час




**16 ліпеня 1944г. Савецкі плацдарм на левым беразе Нёмана**

2-і батальён змог атакаваць стромкі бераг і адкінуў нямецкія сілы. Часова сітуацыя на плацдарме была стабілізавана.

Для падтрымкі частак 2-га палп СС, які вёў цяжкія баі ў Занёманскім фарштаце, немцы выставілі батарэі 4-га дывізіёна 3-га артпалка СС[273]. З-за агню артылерыі СС прасоўванне савецкіх войскаў было спынена, а хутка войскі 290-й дывізіі былі адкінуты назад да ракі. 885-ы полк так і не быў перапраўлены. На жаль, на плацдарм 878-га сп так і не змаглі пераправіць дывізійную ці, хаця б, палкавую артылерыю. Прыкрыццё войскаў ажыццяўлялася з-за ракі,

што змяншала трапнасць і эфектыўнасць агню. У выніку, плацдарм значна скараціўся.

Баі 3-га Гв. кк і дывізій 50-й арміі праходзілі згодна з распрацаванымі раней планамі. Аднак у гэты момант яны былі карэнным чынам зменены. У 23.00 16 ліпеня 3-і Гв. кк быў арыентаваны маршалам Г.К. Жукавым[274] на ўзяцце Аўгустова тэрмінам не пазней за 19 ліпеня[275]. Калі па плану, распрацаванаму раней, 3-ці Гв. кк павінен быў удзельнічаць у баях за горад Беласток (значна на поўдзень) то зараз ён быў павернуты на 90 градусаў управа. Улічваючы тое, што пяхотныя часці 69-га і 81-га ск 50-й арміі г.-п. І.В.Болдзіна адставалі ад яго парадкаў, левы фланг Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскага заставаўся слаба прыкрытым. Згодна з гэтым загадам, падраздзяленні 3-га Гв. кк і 50-й арміі павінны былі ў максімальна магчымыя тэрміны выйсці да межаў Усходняй Прусіі, праўдзівей, да межаў уласна Германіі.

Адносна змены накірунка ўдару 3-га Гв. кк можна вылучыць дзве тэорыі. Нанясенне ўдару кавалерыйскім корпусам у накірунку Усходняй Прусіі дыктавалася хутчэй палітычнымі, а не ваеннымі здагадкамі. Хуткі прарыў савецкіх войскаў да тэрыторыі III Рэйха яшчэ летам 1944 года быў прывабнай мэтай для ваеннага і палітычнага кіраўніцтва Савецкага Саюза. Можна прывесці яшчэ адну версію змены накірунку ўдару 3-га Гв. кк маршалам Г.К.Жукавым якраз у гэты момант. Яшчэ 8 ліпеня 1944 года маршал Г.К.Жукаў звярнуўся да Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандавання з прапановай аб перакідцы адной танкавай арміі з 1-га Украінскага фронту, які меў лішак сіл і сродкаў, у групу франтоў А.М.Васілеўскага (1-шы Прыбалтыйскі і 3-ці Беларускі франты). Акрамя таго, 2-гі Беларускі фронт маршал Г.К.Жукаў прапанаваў узмацніць танкавай і агульнавайсковай арміяй, стралковым корпусам і некалькімі танкавымі і самаходна-артылерыйскімі палкамі з рэзерву Стаўкі. Гэтыя сілы ён планаваў выкарыстаць для ўдару па вельмі слаба абараняемай Усходняй Прусіі. Ідэя была адвергнута Стаўкай. У прыватнасці, сам маршал Г.К.Жукаў узгадваў, што на нарадзе І.В.Сталін адкінуў план маршала Г.К.Жукава, аддаўшы перавагу вызваленню Усходняй Польшчы[276]. Магчыма, ідэя змяніць напрамак удару 3-га Гв. кк і пераарыентацыя яго на ўсходне-прускі накірунак была спробай маршала ў нейкай ступені рэалізаваць свой план, а таксама разведаць нямецкую абарону ў гэтым напрамку. Аднак, калі ўдар вялікімі сродкамі мог бы прывесці да поспеху, наступленне аднаго кавалерыйскага корпуса нагадвала авантуру. Пра тое, што маршал Г.К.Жукаў не адмовіўся ад свайго плана, сведчыць наступнае: 19 ліпеня ён паслаў у Стаўку свае меркаванні, дзе зноў выказаўся за пераарыентацыю 2-га і 3-га Беларускіх франтоў на ўсходне-прускі

накірунак[277]. Наступленне 3-га Гв. кк на Аўгустоў у кантэксце гэтых прапаноў павінны былі б паслужыць дадатковым довадам.

Загадам 16 ліпеня 1944 года савецкія войскі на плацдарме распыляліся. Кавалерыйскі корпус яшчэ не скончыў фарсіравання ракі Нёман з-за налётаў нямецкай авіяцыі, але павінен быў хутка прасоўвацца наперад. Часткі ж 50-й арміі, толькі пачаўшы фарсіраванне ракі Нёман і не сканцэнтраваўшыся на плацдарме, павінны былі ажыццяўляць прыкрыццё 3-га Гв. кк і заканчваць баі за горад Гродна. З прычыны хуткіх тэмпаў наступлення адсталі тылы злучэнняў, савецкія падраздзяленні перапраўляліся без артылерыйскіх частак узмацнення. Мяркую, менавіта гэты загад маршала Г.К. Жукава і менавіта ў гэты момант прывёў пазней да затрымкі савецкага наступлення і ўпартым баям на плацдарме. Гэта, неапраўданае з ваеннага пункту погляду, рашэнне каштавала жыцця многім сотням савецкіх салдат.

Наступленне 3-га Гв. кк планавалася праводзіць у наступным парадку:

**Першы эшалон:**

> зводная знішчальная брыгада (144-ты Гв. знішчальна - супрацьтанкавы артполк, Гвардзейскі азстд, 64-ты і 3-ці асобныя Гв. мінамётныя дывізіёны) – Гв. ппалк. В.Я.Каўтанюк (камандзір 144-га Гв. зстап). У мінамётным дывізіёне налічвалася 12 – 122-мм мінамётаў, у артылерыйскім дывізіёне 3 эскадроны па 120 чалавек, 12 станкавых кулямётаў і 12 супрацьтанкавых гармат. Усе салдаты былі ўзброены пісталет-кулямётамі і перавозіліся на аўтамашынах[278].

→ 5-я Гв. кд;

**Другі эшалон:**

→ 6-я Гв. кд на 17 ліпеня на ўсходнім беразе ракі Нёман;

→ 32-я Смаленская кд[279].

Дывізіі г.-п. І.В.Болдзіна таксама аказвалі садзеянне кавалерыйскаму корпусу. Так у 3.15 ночы 17 ліпеня камандуючы арміяй аддаў загад сваім карпусам:

• да зыходу дня 69-ы ск павінен быў, скончыўшы фарсіраванне ракі Нёман, выйсці на рубеж лініі Мікашоўка – Ліпск;

• 81-шы ск павінен быў авалодаць левабярэжняй часткай Гродна і выйсці на лінію Ліпск – Дамброва-Беластоцкая.

Усе вышэйпералічаныя населеныя пункты знаходзіліся на адлегласці кіламетраў 30 ад пазіцый, якія былі заняты на момант выхаду загаду[280]. Такім чынам пяхота 50-й арміі павінна была

садзейнічаць кавалерыстам і палепшыць іх становішча.

Да раніцы ***17 ліпеня*** начальнік аператыўнага аддзела 3-й дывізіі СС оберштурмбанфюрэр Э. Эберхард паведаміў у штаб нямецкай 4-й арміі пра тое, што з прыбыўшых падраздзяленняў дывізіі была ўтворана баявая група. Яна атрымала назву "Кюн" (па прозвішчу камандзіра 3-га батальёна 6-га тгр палка СС "Тэадор Эйке" штурмбанфюрара Макса Кюна). Група, па сведчаннях нямецкага даследчыка В.Ваперсаля, складалася з наступных падраздзяленняў:

> 3-га батальёна 6-га тгр палка "Е";

> 3-га батальёна 5-га тгр палка "Т";

> 1-га дывізіёна 3-га артпалка СС (8 САУ "Wespe", САУ "Hummel" і 7 цяжкіх гаўбіц);

> 9-й роты 3-га танкавага палка СС – 10 танкаў T-VI "Tiger";

> узмацненне групы складалася з 16 штурмавых гармат[281].

Такім чынам баявая група была вельмі моцным праціўнікам. Абодва батальёны былі цалкам матарызаванымі – на аўтамабілях. Баявыя парадкі пехоты падтрымлівалі танкі, штурмавыя гарматы і самаходная артылерыя. Раніцай 17 ліпеня баявая група выступіла ў раён на поўдзень ад дарогі Ласосна – Баранавічы. На захад ад в. Ласосна рушыў 1-ы батальён 34-га палсп, які павінен быў дзейнічаць сумесна з баявой групай "Кюн". Каля поўдня да в. Баранавічы падышла з м. Кузніца 16-я сапёрная рота 5-га тгр палка СС "Туле". Па дадзеных нямецкай разведкі, буйныя савецкія сілы сканцэнтраваліся ў раёне в. Адамавічы. Гэта былі падраздзяленні 95-й стралковай дывізіі.

На досвітку ў в. Пышкі 4-ы батальён 1-й Гвардзейскай штурмавой інжынерна-сапёрнай брыгады Гв. палк. А.Ф. Везірава, прыдадзены 50-й арміі, пачаў будаваць пераправы для 95-й стралковай дывізіі. Па нямецкіх дадзеных, адна з пераправаў каля в. Пышкі была тросавай з паромам. Падраздзяленні 17-га палп СС, якія займалі абарону на гэтым адрэзку, былі надта слабымі для таго, каб стрымаць або ліквідаваць фарсіраванне ракі савецкімі падраздзяленнямі. Прыкрыццё наземных войск здзяйснялі знішчальнікі 162-га зап. Так штурман палка м-р В.М. Афонін збіў над в. Навумавічы нямецкі знішчальнік FW-190. Яшчэ адзін знішчальнік FW-190 ён збіў у групе на паўночны ўсход ад Гродна (хутчэй за ўсё разам з к-нам У.Г. Шчогалевым)[282].

Прасоўванне па левым беразе ракі Нёман у паласе 42-й стралковай дывізіі г.-м. А.І. Сліца[283] ў першай палове дня было ўдалым. Дывізія рушыла на поўнач ад 95-й сд. Раніцай 16-га ліпеня 42-я сд пераправілася праз раку Нёман у раёне в. Куколі[284]. На наступны дзень – 17 ліпеня – падраздзяленні 42-й сд спыніліся на лініі: 44-ты Верхнедняпроўскі сп –

в. Капланаўцы, 455-ты Верхнедняпроўскі сп – вышыня 214.0 на захад ад в. Скрыннікі, 200.1 на ўсход ад в. Канюхі. На гэтым рубяжы палкі дывізіі змянілі кавалерыстаў з кавалерыйскага корпуса Гв. г.-л. М.С.Аслікоўскага. 459-ты Верхнедняпроўскі сп ппалк. Казлова прасоўваўся другім эшалонам на поўдзень ад в. Баля–Касцельная. Тут жа размясціўся і штаб дывізіі. На працягу дня 44-ы Верхнедняпроўскі сп вёў баі за в. Лойкі. Роты 455-га Верхнедняпроўскага сп змаглі праравацца дастаткова далёка, перарэзаўшы дарогу Сапоцкін – Гродна[285]. 153-я сд 69-га ск перайшла ў наступленне на поўнач. Фарсіравалі раку Нёман і часці ўзмацнення 69-га ск – 4-я істабр і 2-гі Гв.ашісб. Такім чынам, раніцай 17 ліпеня савецкімі войскамі быў значна ўзмоцнены левы фланг цэнтральнага плацдарма.

Улічваючы магчымасць хуткага нарошчвання новых сіл савецкім бокам, іх атакі з плацдарма ў в. Пышкі ў напрамку в. Ласосна, выхад у паўднёвую частку горада, якая яшчэ ўтрымлівалася немцамі, оберштурмбанфюрар Э. Эберхард прыняў самастойнае рашэнне аб прымяненні баявой групы "Кюн". Група павінна была ўдарам уздоўж ракі Нёман у паўднёвым напрамку адрэзаць савецкія войскі ад ракі або скінуць іх у яе. Па рашэнні оберштурмбанфюрара Э. Эберхарда, ужо каля 7 гадзін раніцы 3-ці батальён 5-га тгр палка гаўптштурмфюрара П. Шцінена, узмоцнены некалькімі штурмавымі гарматамі, перайшоў у атаку[286]. Але яна прыпынілася. Войскі прайшлі з рубяжа атакі в. Ласосна – Баранавічы прыкладна адзін кіламетр у паўночным накірунку. Пасля чаго эсэсаўцы вымушаны былі спыніцца з прычыны моцнага артылерыйска-мінамётнага агню з процілеглага берага ракі Нёман, а таксама флангавага агню з боку в. Адамавічы. Падраздзяленні 95-й сд, якія паспелі ўжо пераправіцца на левы бераг ракі, у выніку нямецкіх атак часткова былі адкінуты назад за раку, а часткова адышлі на захад, у накірунку в. Адамавічы. Па ўспамінах мясцовых жыхароў, савецкая пераправа ў в. Пышкі была знішчана немцамі ў той жа дзень. Нямецкія назіральнікі, якія займалі пануючыя вышыні ў в. Ласосна, наводзілі свае самалёты і агонь артылерыі на пераправу. У "Журнале баявых дзеянняў" 50-й арміі на працягу дня было адзначана 96 налётаў нямецкай авіяцыі на пераправы праз раку Нёман[287].

У гэты час 3-ці батальён 6-га тгр палка СС атакаваў в. Адамавічы, а батальён 34-га палсп – размешчаную ў двух кіламетрах на поўнач в. Міцкевічы. Аднак атакі гэтых батальёнаў былі няўдалымі. Батальён 34-га палсп, не маючы цяжкага ўзбраення, не здолеў прасунуцца наперад з прычыны моцнага агню савецкай пяхоты. Складаючыся з добраахвотнікаў з акупіраваных тэрыторый, ён залёг пасля пачатку атакі і не змог яе працягваць[288].

У сярэдзіне дня аператыўны аддзел (Ia) штаба 3-й тд СС прыняў рашэнне ізноў атакаваць савецкія падраздзяленні на плацдарме. Галоўная мэта будучай атакі заставалася той жа – ліквідацыя савецкіх пераправаў праз раку Нёман амаль да ўзроўня в. Зарыца. Баявая група павінна была прасунуцца на адлегласць 9 км. У 14.45 пачаў атаку 3-ці батальён 5-га тгр палка СС. Прасоўваючыся ўздоўж ракі Нёман ад в. Пышкі, ён да 22.00 дасягнуў в. Пушкары[289]. Савецкіх салдат тут ужо не было. На левым флангу наступаў 3-ці батальён 6-га тгр палка СС "Е". Ён разбіў савецкія баявыя аховы ў раёне в. Адамавічы і падышоў да в. Міцкевічы, дзе з батальёнам 34-га палсп узяў гэтую вёску з боем.

Цяжкія баі разгарэліся за в. Навумавічы, дзе немцы прыпыніліся з прычыны напружанага агню супрацьтанкавых гармат, магчыма, падраздзяленняў 459-га Верхнедняпроўскага сп 42-й сд. Да штурму вёскі далучыўся падцягнуты з тылу 3-ці дывізіён знішчальнікаў танкаў СС. Пасля абыходу вёскі з поўначы і поўдня і цяжкіх рукапашных баёў савецкія войскі адышлі. У выніку гэтых атак немцы практычна ліквідавалі плацдарм 95-й сд у в. Пышкі і паставілі пад пагрозу становішча падраздзяленняў 42-й дывізіі г.-м. А.І.Сліца, якая знаходзілася на захад ад вёскі. У выпадку далейшага прасоўвання немцаў на поўнач гэтыя падраздзяленні былі б адрэзаны ад ракі. Аднак вынікі нямецкіх поспехаў былі недаўгавечнымі. Немцы не мелі дастатковых сіл для таго, каб кантраляваць усе занятыя пазіцыі або ствараць суцэльную лінію фронту. Таму позна вечарам і ноччу групы савецкіх салдат зноў занялі в. Адамавічы.

У ходзе баёў групы "Кюн" на працягу дня немцы страцілі падбітым адзін T-VI "Tiger" каля в. Адамавічы. У яго трапіў супрацьтанкавы снарад, у выніку чаго загінуў увесь экіпаж, акрамя радыста[290]. Праз 3 дні немцам удалося захапіць танк. Яны аблілі яго бензінам і спалілі.

Наступаючыя з пераправы ў в. Куколі батальёны 455-га Верхнедняпроўскага палка 42-й дывізіі ў другой палове дня сутыкнуліся з супраціўленнем немцаў у раёне в. Загараны, аднак пераадолелі яго і занялі вёску. Вечарам на гэтыя падраздзяленні выйшаў, працягваючы наступленне 3-ці батальён 6-га тгр палка СС "Е". 2-я рота 1-га батальёна 455-га сп адступіла з раёна на захад ад в. Навумавічы і заняла старыя фортавыя ўмацаванні ў в. Загараны. Савецкая пяхота была абстраляна нямецкімі штурмавымі гарматамі[291]. Пакінуўшы заслоны ў фартовага рова, немцы працягнулі наступленне і, абышоўшы ўмацаваную савецкую пяхоту, да змяркання занялі вышыні на захад ад в. Баля-Касцельная. Такім чынам, баявая група "Кюн" выйшла на лінію Пышкі – Салаўі – Пушкары – Баля-Касцельная. 44-ты Верхнедняпроўскі сп вымушаны быў да вечара адступіць з раёна на поўдзень ад в. Лойкі да пераправаў. Адступіў да пераправаў і 459-ты Верхнедняпроўскі сп ппалк. Казлова.

Фактычна пазіцыі захаваў толькі 455-ты сп[292]. Перад 42-й сд (455-ты стралковы полк і, магчыма, падраздзяленні 459-га сп) з'явілася пагроза акружэння. Але штабам дывізіі было прынята рашэнне змагацца ў такім становішчы, а для сувязі з дывізіяй на плацдарме каля ракі Нёман паслаць афіцэра.

Становішча немцаў у выніку атак у другой палове дня было нетрывалым. На захад ад іх уклінывання працягвалі заставацца часці 42-й дывізіі, якія з наступленнем цемры зноў занялі в. Міцкевічы і замацаваліся ў в. Навумавічы.

Іншая сітуацыя склалася на плацдарме ў раёне в. Баля-Касцельная – Каўбаскі. Тут ініцыятыву ўзялі кавалерысты Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскага: брыгада Гв. ппалк. В.Я. Каўтанюка і 5-я Гв. кд атакавалі эсэсаўцаў і, прарваўшы іх пазіцыі, прасунуліся на некалькі кіламетраў уперад, выбілі немцаў з в. Каўбаскі. 22-гі Гв. кп. вёў баі за в. Пушкары. На гэтым жа адрэзку, відаць, дзейнічала і савецкая 153-я сд, якая ў другой палове дня ўдзельнічала ў баях за в. Каўбаскі[293]. Нямецкія 2-ці батальён 6-га палка "Е" і 3-ці танкавы разведвальны батальён СС аказаліся ў цяжкім становішчы.

На поўнач ад дывізій кавалерыйскага корпуса фарсіравала раку Нёман савецкая 174-я дывізія 36-га ск 31-й арміі. Фарсіраванне ракі Нёман праходзіла на шырокім фронце. Першай на супрацьлеглы бераг пераправілася група пад камандваннем ст. л-та У. Ахмадуліна. Байцы занялі лінію акопаў і забяспечылі далейшае фарсіраванне ракі. Напрыклад, яе 508-мы сп фарсіраваў раку Нёман на поўнач ад в. Грандзічы ў в. Зарыца на пантонах і падручных сродках. 1-шы батальён панёс пры гэтым нязначныя страты, аднак у ротах да гэтага часу засталося менш паловы штатнага складу[294]. Парторг 3-га дывізіёна 598-га артпалка дывізіі І.З. Івашкін апісваў пераправу праз раку Нёман: "Праз паўгадзіны пасля атрымання задання мы з Львом Кантэрам *(намеснік па палітычнай частцы 3-га артылерыйскага дывізіёна. – Д.Л.)* стаялі на вялікім самаробным плыце, які зрабілі загадзя сапёры. У назначаны час на ваду бясшумна спусцілі маторную лодку. Упэўніўшыся ў надзейнасці мацавання троса, матарыст запусціў рухавік, і плыт павольна адчаліў ад берага. На шум, які выдавала наша лодка, праціўнік адразу адрэагаваў кулямётнай чаргой. А праз імгненне, зрабіўшы крутую дугу, асвяціла рачную гладзь нямецкая ракета. Лодка і плыт імкліва набіралі хуткасць, але раптам заглух матор. Нас падхапіла цячэннем і пачало адносіць убок; плыт, павольна разварочваючыся, паплыў да выгіну берага, туды, дзе знаходзіўся праціўнік. У паветра ўзляцела другая ракета, ударыла новая кулямётная чарга. Ад міны, што разарвалася побач, выстралілі ў твар пырскі вады, плыт калыхнула. Матарыст, спрабу-

ючы прымусіць лодку працаваць, сутаргава хапаўся за рычагі. Байцы пачалі правяраць зброю і боепрыпасы. Артылерысты сталі падцягваць да краю плыта тоўстыя дошкі і скрыні са снарадамі. Раптам матор чхнуў, затраскатаў і запрацаваў. Усе ўздыхнулі з палёгкай. Зрабіўшы мудрагелістую дугу, лодка ў патрэбным напрамку пацягнула плыт. Вар'яцкія трасіруючыя кулямётныя чэргі несліся ў наш бок з левага берага. Гучна ўзрываліся, падымаючы слупы вады, міны"[295]. Адразу пасля фарсіравання батальёны дывізіі былі атакаваны групай "Кюн". Дзве батарэі 598-га палка падтрымлівалі сваю пяхоту з-за ракі. У рашаючы момант, калі немцы прабіліся да берага і гатовыя былі скінуць дывізію ў Нёман, з'явіліся савецкія штурмавікі. Дзякуючы іх атакам немцы адступілі. Па ўспамінах І.З. Івашкіна немцы страцілі ў гэтай атацы 8 танкаў і самаходак! Адразу абмовімся, што нямецкія крыніцы не пацвержваюць гэтыя страты. 174-я дывізія пачала наступаць у накірунку Сапоцкіна. Яе батальёны прасунуліся наперад і абышлі фланг 2-га батальёна 6-га палка СС, які абараняўся ў раёне Каўбасак. Каб не трапіць у акружэнне, немцы вымушаны былі адыходзіць і тут. Ужо на досвітку наступнага дня часці 174-й дывізіі выйшлі да мястэчка Сапоцкін. Такім чынам на гэтым адрэзку савецкія войскі прарвалі нямецкі фронт і выйшлі на аператыўны прастор. Улічваючы гэты поспех, савецкае камандаванне прыняло рашэнне ўвесці ў прарыў 3-ці Гв.кк.

У той жа дзень фарсіравала раку і 153-я дывізія. Пачатак савецкіх атак апісаў адзін салдат роты 3-га танкавага разведвальнага батальёна СС: "Зранку рускія абстрэльваюць тэрыторыю. Глухія "птоп-птоп" рускіх мінамётаў змешваюцца з нервовым стукам рускага кулямёта. З групай Эрдмана, якая ляжыць на адлегласці 500 метраў мы маем толькі зрокавую сувязь. Раптоўна там у таварышаў адкрывае агонь MG-42 (*нямецкі кулямёт* – Д.Л.). Кароткія чэргі аўтаматычнага агню. Мы бачым бледна-шэрыя воблачкі ад разрываў ручных гранат і адначасова фігуры, якія імкліва рухаюцца ўперад ...Затым танец пачынаецца і ў нас! Круглыя шлемы, фігуры, якія падымаюцца і апускаюцца, з'яўляюцца як з-пад зямлі. У атакуючых рускіх іх пісталет-кулямёты ў руках каля пояса. Наш загараджальны агонь б'е па іх..."[296] 3-я рота разведвальнага батальёна адступіла на захад, але не змагла адарвацца ад савецкіх частак. У в. Беліčаны яна заняла абарону, паспрабаваўшы адбіць савецкія атакі. За вёску пачаліся цяжкія баі. Нямецкія крыніцы сведчаць пра вельмі вялікія страты разведвальнага батальёна[297]. Так 3-я рота батальёна страціла 9 чалавек толькі забітымі – больш чым за ўсе наступныя дні[298]. У штабе 3-й тд СС казалі нават аб знішчэнні разведвальнага батальёна на захад ад мястэчка Гожа. Не вытрымаўшы, эсэсаўцы батальёна пачалі адкатвацца далей на захад. Батальён адышоў на лінію Скрыннікі – Рацічы. 153-

я дывізія атрымала загад прасоўвацца да мястэчка Сапоцкін, якое знаходзілася за 12 км на паўночны захад.

Вечарам 17 ліпеня часці 153-й сд 69-га ск, развіваючы поспех 174-й сд, выйшлі на дзяржаўную мяжу СССР на захад ад мястэчка Сапоцкін (у раён пагранічнага слупа № 40-41)[299]. Дывізія спынілася на рубяжы в. Доргуньска – Воўкуш, апярэдзіўшы свайго суседа па 69-му корпусу – 42-ю сд, якая адбівала моцныя атакі групы "Кюн" на рубяжы в. Навумавічы – Загараны.

Такім чынам, левы фланг савецкай 153-й сд заставаўся адкрытым. Камандзір 557-га сп 153-й сд пісаў пра гэтыя падзеі: "Разведка данесла, што лявей ад нас, па накірунку да Гродна, прайшла армада фашысцкіх танкаў. Я перадаў гэтае паведамленне Шчэннікаву (*камандзір дывізіі. – Д.Л.*) і гадзіны праз тры даведаўся ад яго, што заўважаная разведчыкамі армада аказалася танкавай дывізіяй "Мёртвая галава", якая ў цяжкім баі здолела прарваць фронт на адрэзку 42-й стралковай дывізіі і сарвала далейшае фарсіраванне Нёмана"[300]. Нягледзячы на тое, што ў дывізіі, ды і ў корпусе Гв. г.-л. М.С.Аслікоўскага, ведалі пра гэтыя падзеі, не было зроблена ніякіх дзеянняў для таго, каб забяспечыць бяспеку тылоў і выключыць магчымасць прарыву немцаў да пераправы на раку Нёман. На нарадзе ў штабе дывізіі вечарам таго ж дня (размяшчалася ў савецкім ДАКе, пабудаваным у 1940-41 гадах) камандзір дывізіі, узгадваў м-р Ф.С. Фядотаў, заявіў наступнае: "Абставіны склаліся цяжкія: дывізія і кавалерыйскі корпус г.-л. М.С.Аслікоўскага адрэзаны праціўнікам ад асноўных сіл арміі і фронту. Далейшае наступленне часова спыняецца. Неабходна весці бай ў акружэнні. Мы займаем вельмі абмежаваную тэрыторыю. Магчымасці манеўру практычна зведзены да нуля. Тым не менш, неабходны перш за ўсё манеўр. Праціўніка трэба ўвесці ў зман адносна сапраўднай колькасці войскаў, што знаходзяцца на левым беразе... Абставіны пакажуць, як будзем дзейнічаць. Або да нас прарвуцца, або мы прарвёмся да сваіх. А цяпер адна задача: перамалоць ворага, не даць яму ўварвацца ў нашыя баявыя парадкі"[301]. Стала быць, камандзір дывізіі недаацаніў пагрозу выхаду да ракі Нёман 3-й тд СС або ж лічыў, што гэта пагроза будзе хутка ліквідавана.

Вечарам таго ж дня кавалерыйскі корпус Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскага здаў свае пазіцыі на плацдарме часцям 69-га ск 50-й арміі (42-й сд) і, выкарыстоўваючы поспех у прасоўванні 174-й сд 31-й арміі, накіраваў свае дывізіі правей у напрамку в. Лойкі – Галынка[302]. Зводная знішчальная брыгада Гв. ппалк. В.Я. Каўтанюка, якая наступала ў авангардзе кавалерыйскага корпуса, зноў сутыкнулася з ротай 3-га танкавага разведвальнага батальёна СС, якая адступала да мястэчка Сапоцкін у 22.00 за 7 км на поўдзень ад мястэчка. У сустрэчным баі




**17 ліпеня 1944г. Агульнае становішча на фронце ў раёне Гродна**

савецкія артылерысты адкінулі немцаў і занялі в. Галынку і в. Пралейкі. 2-гі батальён 6-га палка СС з в. Лойкі ўдарам на поўнач спрабаваў затрымаць кавалерыстаў, але таксама быў адкінуты і выбіты з вёскі. Вечарам у раёне в. Воўкуш кавалерысты выйшлі на дзяржаўную мяжу СССР 1941 года. Тут яны спілілі пагранічны слуп № 48 даваеннай савецкай мяжы і адаслалі яго ў Маскву ў якасці падарунка[303].

На поўдзень ад 69-га ск – у раёне Крэйдавых гор і рысе горада – займаў пазіцыі 81-шы ск г.-м. Ф.Д. Захарава. Корпус узмацнялі: 1321-шы зстап, 85-ты гап, 1444-ты сап, 4-ты ашісб і 3-ці батальён 144-й габр[304].

290-я дывізія г.-м. І.Г. Гаспарана ў гэты час вяла бai ў Занёманскай частцы Гродна. Адразу пасля заняцця горада, камандзір дывізіі аддаў загад дывізійнай 374-й разведроце фарсіраваць раку, правесці разведку і забяспечыць пераправу палкоў дывізіі. Камандзір роты к-н В.Г. Зубкоў на працягу 16 ліпеня арганізаваў назіранне за супрацьлеглым берагам. Пераправа была запланавана на 24.00. Рота фарсіравала раку пры дапамозе 13 надуўных 8-секцыйных нямецкіх лодак. Ахова паліцыі была падаўлена, пры гэтым былі захоплены некалькі "языкоў"[305]. З раніцы Нёман павінны былі фарсіраваць падраздзяленні 290-й дывізіі. За правядзенне гэтай аперацыі камандзір роты быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Да рэштак 878-га палка 290-й дывізіі, якія ўжо вёў цяжкія бai, раніцай 17 ліпеня далучыўся і пачаў фарсіраванне ракі Нёман з раёна каталіцкіх могілак 882-гі сп 290-й сд, але пераправа была сарвана моцным агнём 2-га палп СС. У 10 раніцы (па нямецкіх дадзеных, у 12.30) савецкія салдаты пачалі перапраўляцца па фермах узарванага чыгуначнага маста. Атацы папярэднічаў моцны савецкі артылерыйскі агонь. Па прызнанні немцаў, гэты абстрэл быў настолькі эфектыўным, што знішчыў паліцэйскія аховы на беразе, а таксама падцягнутыя з тылу да месца фарсіравання нямецкія рэзервы. Тым не менш, фарсіраванне не было лёгкім. Г. Арцем'еў, ветэран 882-га палка, узгадваў: "Трэба адзначыць, што на гэты адрэзак праціўнік вылучыў снайпераў. Варта ледзь падняць галаву, як касіла куля. Забітыя, параненыя перашкаджалі тым, хто поўз ззаду. Каб не быць доўгай мішэнню для ворага, асобныя з нас кулём скідваліся з берага"[306]. Першыя 20 байцоў (пад камандаваннем камандзіра 9-й роты ст. л-та Круцецкага і парторга с-та Саніна) на хаду ўступілі ў бой. Пасля пагібелі старэйшага лейтэнанта Круцецкага, Санін узначаліў атаку роты. Дзякуючы гэтай атацы, плацдарм уздоўж чыгуначнага палатна быў пашыраны на 150 метраў[307]. Да 16.00 на левым беразе змагаліся 2 батальёны 882-га сп, 878-га сп і ў раёне в. Солы 3-ці батальён 885-га сп. Тым не менш, становішча на гэтым адрэзку было вельмі няўстойлівым. Паслабленыя батальёны 290-й дывізіі г.-м. І.Г. Гаспарана неслі вялікія страты пры пераправе, адчувалі недахоп боепрыпасаў, былі пазбаўлены артылерыі (яе пераправіць не ўдавалася, і яна падтрымлівала свае войскі з-за ракі). У дывізіі да гэтага часу заставалася 0,6 боекамплекта патронаў на чалавека і 0,15 – 0,3 боекамплекта снарадаў і мінаў на ствол. Хлеба, крупаў і тлушчаў увогуле не было[308]. Штаб групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга загадаў падраздзяленням "Мёртвай галавы" спыніць атаку на плацдарме ў Занёманскім фарштаце. Разведку ў раёне занеманскай часткі горада праводзілі сілы 3-га дывізіёна знішчальнікаў танкаў СС (штаб у в. Калбасіно). Оберштурмфюрар

Мюлер успамінаў: “Мы натрапілі на яшчэ не знішчаную правую каляю чыгункі. Левая ўжо парушана. Адначасна мы сустракаем салдат (*маюцца на ўвазе нямецкія салдаты* – Д.Л.), якія хлынулі на захад. Некаторыя не маюць нават вінтовак”[309].

Для контратакі ўзмоцненых савецкіх войскаў на плацдарме немцамі была вылучана канвойная рота з 3-й тд СС дывізіі, узмоцненая чатырма штурмавымі гарматамі[310]. Разам з падраздзяленнямі 22-га палп СС яны контратакавалі батальёны 290-й сд. Нямецкія атакі працягваліся да 22.00 і прывялі да звужэння плацдарма (магчыма, савецкія салдаты ўтрымаліся толькі на самым беразе ракі). Немцы пішуць пра поўнае знішчэнне плацдарма ў Занёманскім фарштаце, што не з’яўляецца праўдападобным.

Камандзір аддзялення сувязі 882-га палка У.П.Шчарбак успамінаў: “У ноч, як звычайна ў такіх выпадках, немцы прадпрынялі контратаку і пацяснілі нас да ракі. Зразумела, перашкаджаў артагонь, але асабліва небяспечным было тое, што немцы актыўна выкарыстоўвалі гранаты. Калі я адступаў, то не паспеў дабегчы да берагу, немцы ўжо адрэзалі нас ад асноўных часцей. Так атрымалася, што каля разбітага маста мы засталіся ўтраіх – я, радзіст і камандзір узвода аўтаматчыкаў, мы схаваліся ва ўкрыцці, пад плітой узарванага маста. Уваход туды быў вельмі маленькі, мы з цяжкасцю залезлі туды, пасля чаго звязаліся са сваімі па рацыі і карэктавалі агонь артбатарэі палка. Афіцэр карэктаваў агонь, аднак не даваў каардынаты, а выклікаў яго на сябе. Справа ў тым, што мы сядзелі пад плітой, на ёй немцы ўстанавілі буйнакаліберны кулямёт, практычна нам на галаву, і стралялі ў бок маста па адступаючым. Аднак калі мы выклікалі агонь, пасля некалькіх залпаў стральба спынілася. Прабылі мы ў схованцы больш сутак, пакуль праз дзень раніцай нас не вызвалілі нашыя наступаючыя байцы”[311]. Толькі 18 ліпеня 882-ы сп 290-й дывізіі поўнасцю змог пераправіцца праз раку Нёман[312]. 878-ы сп і 3-ці батальён 885-га сп авалодалі вышынямі на паўднёвым беразе ракі.

Такім чынам, у выніку баёў 17 ліпеня намеціўся прарыў савецкіх войскаў па лініі Гожа – Сапоцкін у напрамку на захад. Поспех у прасоўванні 174-й сд і падраздзяленняў 3-га Гв. кк, якія напрыканцы дня выйшлі да даваеннай савецкай мяжы (каля 20 км на захад ад ракі Нёман), абазначаў рассячэнне нямецкай лініі фронту. Для савецкага камандавання на дадзены момант важнейшай задачай было максімальна хутка забяспечыць усім неабходным войскі,якія здолелі праравацца, падтрымаць іх авіяцыяй і пяхотнымі злучэннямі 50-й арміі. Для рэалізацыі гэтай задачы неабходна было надзейна прыкрыць пераправы праз раку Нёман, якія немцы рэгулярна разбуралі. Атакі  баявой групы 3-й тд СС з поўдня

ўздоўж ракі таксама выразна паказвалі, што эсэсаўцы ставілі сваёй мэтай адсячэнне савецкіх частак, якія фарсіравалі раку Нёман, ад іх тылоў. Становішча на паўднёвым флангу асноўнага плацдарма (раён в. Адамавічы – Навумавічы) савецкіх войскаў было няўстойлівым. Асобныя падраздзяленні 42-й Смаленскай і 95-й дывізій без сур'ёзнай падтрымкі артылерыі і авіяцыі вымушаны былі стрымліваць атакі эсэсаўскай групы "Кюн", прычым для 95-й сд гэтыя баі скончыліся, магчыма, стратай плацдарма ў раёне в. Пышкі. Падобная сітуацыя была і ў 290-й дывізіі г.-м. І.Г. Гаспарана ў Занёманскім фарштаце.

Вечарам 17 ліпеня г.-ф. В.Модэль прыняў рашэнне ***<u>выкарыстаць дывізію "Мёртвая галава" для адсячэння савецкіх войскаў на левым беразе ракі Нёман</u>*** каля горада Гродна. Наступленне дывізіі павінна было весціся з поўдня на поўнач. Такім чынам, ён практычна сцвярджае распрацоўкі штаба танкавай дывізіі, якія на працягу дня прыводзілі ў жыццё гэты план. Падраздзяленні "Мёртвай галавы" меркавалася сканцэнтраваць на вузкім адрэзку. Адначасова планавалася далучыць да ўдару з поўначы 5-ю танкавую дывізію, якая павінна была наступаць насустрач у накірунку Аўгустоўскага канала. У загадзе штаба 4-й арміі ў штаб корпуснай групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга паведамлялася, што танкавая дывізія павінна была атакаваць савецкае перадмоставае ўмацаванне на паўночны захад ад в. Грандзічы. Для гэтага дывізія "Мёртвая галава" уключалася ў склад корпуснай групы. Гэтай атакай нямецкія танкі павінны былі адсечы савецкія падраздзяленні (3-ці Гв. кк), што прарваліся да мястэчка Сапоцкін. Затым сілы танкавай дывізіі СС павінны былі злучыцца з 5-й тд. Для гэтага наносіўся ўдар у накірунку мястэчка Сапоцкін – в. Сонічы[313]. Для атакі 3-я тд СС вылучала са свайго складу наступныя сілы: 10 танкаў T-VI "Tiger", 26 штурмавых гармат, 18 супрацьтанкавых гармат калібру 7,5 см і дзве супрацьтанкавыя гарматы калібру 5 см.

Улічваючы паспяховае прасоўванне падраздзяленняў 3-га Гв. кк і 153-й сд, г.-п. І.В.Болдзін загадаў на працягу 18 ліпеня **<u>працягнуць наступленне</u>** і да зыходу дня выйсці на наступныя рубяжы:

- 69-ты ск – в. Мікашоўка, мястэчка Ліпск;
- 81-шы ск – мястэчка Ліпск, мястэчка Дамброва-Беластоцкая;
- 121-шы ск – в. Дамброва, в. Сламянка;
- 70-ты ск – в. Сламянка, мястэчка Сакулка[314].

Г.-п. І.В.Болдзін, па сутнасці, паўтарыў свой загад, аддадзены напярэданні і да гэтай пары невыкананы. Паслабленым дывізіям не пад сілу было ў такія кароткія тэрміны пераадолець супраціўленне немцаў, прарваць іх абарону і прасунуцца на 30 км. Арміі не хапа-

ла бранятанкавых сродкаў. Камандаваннем арміі не ўлічвалася нарошчванне немцамі сваіх сіл і магчымасць акружэння прарваўшыхся падраздзяленняў арміі і 3-га Гв. кк.

Нягледзячы на баі 17 ліпеня з нямецкімі танкамі і САУ, часці 3-га Гв. кк раніцай 18 ліпеня **працягнулі** пасяховае **прасоўванне наперад**, поўнасцю разлічваючы на стойкасць стралковых дывізій 50-й арміі ў сваім тыле. Пагроза акружэння корпуса не была ўлічана камандаваннем. Неабходна таксама адзначыць, што сам камандуючы корпусам Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскі ведаў пра верагодную пагрозу акружэння сваіх часцей. Мікалай Сяргеевіч добра ведаў гісторыю. У сваіх размовах са сваёй сястрой (яна служыла ў тым жа кавалерыйскім корпусе) ён узгадваў трагічны лёс рускай арміі ген. А.В. Самсонава, разбітай немцамі ў гэтых жа мясцінах у жніўні 1914 года. Тым не менш, ён не змог аспрэчыць загад, атрыманы ад маршала Г.К. Жукава.

### *в) Баі на левым беразе р. Нёман на поўнач ад Гродна*

Хуткі прарыў кавалерыйскага корпуса да горада Гродна, фарсіраванне Нёмана спрыялі развіццю ў савецкіх штабах эйфарыстычных настрояў. Хуткія тэмпы наступлення малявалі пасяховае заканчэнне вайны. Фактычна падраздзяленні Чырвонай арміі выйшлі да дзяржаўнай мяжы. Наперадзе была Польшча і Германія!

Раніцай **18 ліпеня** палкі 174-й сд узялі мястэчка Сапоцкін. Прывядзём успаміны І.З. Івашкіна, ветэрана дывізіі: “Населены пункт Сапоцкін немцы ператварылі ў моцны ўмацаваны вузел абароны. У праёмах вокнаў яны ўсталявалі кулямёты. У каменнай агароджы касцёла прарабілі амбразуры і ўсталявалі ў іх станковыя кулямёты, на асобных прысядзібных участках ўсталявалі мінныя палі”[315]. Разведчыкі дывізіі выйшлі ла мястэчка яшчэ вечарам 17 ліпеня. Аднак яны былі спынены нямецкім кулямётным і артылерыйскім агнём. На працягу ночы дывізія рыхтавалася да атакі. Гарматы 598-га палка распачалі абстрэл мястэчка прамой наводкай у 7.30. Праз паўгадзіна палкі дывізіі атакавалі населены пункт. Два нямецкіх кулямёта вялі агонь праз амбазуры каменнай агароджы касцёла. З цэнтра нямецкай абароны вяла агонь мінамётная батарэя. Пасля непрацяглага бою мястэчка было вызвалена.

Дывізіі кавалерыйскага корпуса наступалі на Захад. Да раніцы 18 ліпеня 6-я Гв. кд цалкам пераправілася праз раку Нёман. Разам з ёй фарсіраваў аку і 77-мы Гв. мінамётны полк (на ўзбраенні рэактыўныя ўстаноўкі “Кацюша”). Полк павінен быў падтрымліваць дывізіі корпуса ў наступленні. 351-шы дывізіён быў пыданы 5-й Гв. кд, 21-шы 6-й Гв. кд і 319-ты – 32-й кд. Такім чынам, галоўныя сілы корпуса скончылі фарсіраванне ракі.

Працягваючы ранейшы поспех 174-й сд, 6-я Гв. кд адразу пачалі наступаць у накірунку г. Аўгустоў праз в. Волкуш – Старажынцы. На працягу дня кавалерыйская дывізія выйшла да возера Сайна, якое знаходзіцца за 7 км на ўсход ад Аўгустова. На левым флангу, у накірунку г. Ліпск (праз в. Галынку – в. Капчаны – в. Кур'янку) рухалася 5-я Гв. кд Гв. г.-м. М.С.Чапуркіна. Супраціўленне часцям 5-й Гв. кд, якая наступала ў авангардзе, як і 153-й сд, якая прасоўвалася правей, практычна не аказвалася. Гв. л-т Іван Якушын, які служыў у 24-м Гв. кп, узгадваў: "Мы прасоўваліся ў накірунку Аўгустова, горада на мяжы Усходняй Прусіі... Полк усё яшчэ прасоўваўся наперад. На адпачынак часу не было. Коней мы кармілі ў калоне, падчас кароткіх прыпынкаў. Як толькі эскадроны спыняліся недалёка ад вады, кавалерысты хапалі брызентавыя вёдры і беглі па ваду для сваіх верхавых. Пасля таго як коні напіліся, ім на шыі вешалі торбы з аўсом. Мы прыслухоўваліся да загадаў афіцэраў і як толькі чулі "Шагам марш!", вёдры і торбы імгненна знікалі. Эскадроны рушылі ў дарогу"[316].

Настолькі хуткі выхад савецкіх войскаў да г. Аўгустоў быў вялікай нечаканасцю для немцаў. Фактычна, гэта быў вялікі прарыў у глыбокі тыл 4-й нямецкай арміі. У горадзе Аўгустоў немцы спешна арганізавалі абарону сіламі разрозненых частак, што тут знаходзіліся. Такім чынам была арганізавана 337-я дывізійная група. Згодна нямецкай інфармацыі яна была створана з 1-га і 2-га батальёнаў 260-й палкавой групы і 2-га батальёна 688-га грэнадзёрскага палка. Акрамя таго, у яе склад уваходзілі 13-я і 14-я роты карпуснай групы "G". Штаб складаўся са штаба 113-й дывізійнай групы. 17 ліпеня 1944 года 337-я баявая група заняла пазіцыі паміж азёрамі на ўсход ад горада Аўгустоў. У якасці падмацавання да групы былі далучаны яшчэ 4 батальёны (208-мы ландверны, 31-шы фузілерны, 286-ты рэзервны, 3-ці батальён 17-га палп СС). У якасці артылерыйскай падтрымкі група атрымала 808-мы артылерыйскі дывізіён[317]. Камандаваў гэтым злучэннем оберстлейтэнант Кнітэль. Менавіта сілы 337-й группы сустрэлі савецкія кавалерыйскія часці на падыходах да г. Аўгустоў.

Па інфармацыі савецкай разведкі, баявая група оберстлейтэнанта Кнітэля складалася толькі з чатырох рот, прычым у кожнай роце было толькі па 160-170 чалавек. Такім чынам, баявая група налічвала б толькі каля 700 чалавек. Акрамя таго, немцы мелі ў горадзе 4 батальёны без супрацьтанкавага ўзбраення. Па той жа інфармацыі, упраўленне імі здзяйсняў ген. Лінгман, што камандаваў тылавымі часцямі XXXIX-га танкавага корпуса.

Акрамя гэтага, немцы выкарыстоўвалі ў раёне Аўгустова і беларускія паліцэйскія батальёны пад камандаваннем нямецкіх

афіцэраў. Аб гэтым узгадваў кіраўнік Беларускай Краёвай Абароны Ф. Кушаль, які пісаў: "... прарыў у раёне Аўгустова быў стрыманы выключна беларускай паліцыяй"[318]. Праўда, Ф. Кушаль не сказаў, што ў той жа час адна з рот 13-га беларускага батальёна СД здалася падраздзяленням Арміі Краёвай (польскім нацыянальным партызанскім фарміраванням) у поўным складзе.

Пры падыходзе да Аўгустова разведка 6-й Гв. кд выявіла скапленне нямецкіх войскаў колькасцю да роты ў раёне в. Саснэк. Для іх абстрэлу былі выкарыстаны дзве устанокі гвардзейскіх мінамётаў з 21-га дывізіёна[319]. Пасля гэтага дывізія працягвала наступленне.

Менавіта ў гэты час з левага фланга 3-га Гв. кк (з раёна в. Ракавічы – Ліпск, г.зн. у тыле 5-й Гв. кд) з'явіліся значныя сілы немцаў, падтрыманыя бранятэхнікай. Магчыма, гэта было адно з падраздзяленняў 3-й тд СС "Мёртвая галава", што наступала ў паўночным накірунку. Хутчэй за ўсё – разведка 1-га батальёна 5-га тгр палка СС. Гв. г.-м. М.С. Чапуркін, які даведаўся пра гэта, прыпыніў наступленне дывізіі і развярнуў 22-гі Гв. кавалерыйскі полк Гв. м-ра У.П. Суханава на ўсход для контратакі. Атака немцаў была паспяхова адбіта. Полк зайшоў у фланг да немцаў, і ў выніку кароткага бою апошнія былі вымушаны адступіць. Немцы адышлі да в. Ракавічы. Праследуючы іх, у 07.30 перадавыя часці 5-й Гв. кд уварваліся ў горад Ліпск. У горадзе яны разбілі роту нямецкай пяхоты і транспартную калону[320]. У 9.30 раніцы г. Ліпск быў заняты савецкімі войскамі. Аднак у горадзе была пакінута толькі слабая заслона, якая кантралявала мост праз раку Бобр. Кавалерыйская дывізія працягвала наступленне на захад і да вечара выйшла да в. Бялобжэг каля Аўгустоўскага канала. Толькі тут кавалерысты сутыкнуліся з рашучым супраціўленнем 337-й дывізійнай групы.

Каля 11 гадзін раніцы ў штабе "Мёртвай галавы" атрымалі сведчанні пра тое, што савецкія войскі, прарваўшыся так далёка на захад, могуць працягнуць наступленне на поўдзень у накірунку Ліпска – Дамбровы-Беластоцкай. У прыватнасці, дадзеныя нямецкай авіяразведкі паведамлялі пра вялікую савецкую калону, што ішла да Ліпска. У яе складзе было 350 грузавікоў і падвод, 6 танкаў і артылерыя[321]. У гэтым выпадку нямецкая карпусная група обергрупэнфюрара К. фон Готберга, ужо ўцягнутая ў баі каля Нёмана, магла сутыкнуцца з небяспекай быць акружанай. У якасці адзінага сродку контратакі Ліпска аператыўны аддзел 3-й тд СС накіраваў 1-шы батальён 5-га тгр палка СС, які толькі што скончыў разгрузку з чыгуначных платформаў. Ён быў узмоцнены 15 штурмавымі гарматамі[322]. Гэта група павінна была заняць горад Ліпск і злучыцца з 3-ім танкавым разведвальным батальёнам СС, што абараняўся

каля в. Галынка. 1-шы батальён лічыўся немцамі найбольш слабым фарміраваннем дывізіі. Ён складаўся з рэкрутаў і не быў падрыхтаваны да цяжкіх баёў. Аднак батальён меў на ўзбраенні бронетранспарцёры, што значна павялічвала яго моц. Тым не менш, дзеянні немцаў былі запозненымі – Ліпск быў ужо заняты савецкай кавалерыяй.

Спробы савецкай 5-й Гв. кд прасунуцца на поўдзень за раку Бобр былі адбіты 1-ым батальёнам 5-га тгр палка СС "Туле", што падышоў сюды. Каля поўдня эсэсаўскі батальён контратакаваў савецкія часці, што ішлі з Ліпска ў паўднёвым накірунку. Паводле нямецкіх дадзеных, у гэтым баю яны захапілі адзін спраўны савецкі танк[323]. 17-ты Гв. кавалерыйскі полк працягваў наступленне ў заходнім накірунку і выйшаў да в. Ястшэмбна, дзе заняў пазіцыі і заставаўся на працягу паследуючых баёў (з 19 па 30 ліпеня 1944г.).

1-шы батальён палка "Туле" выйшаў да горада Ліпска з мэтай перарэзаць дарогу Гродна – Аўгустоў і акружыць кавалерыстаў. На паўднёвай ускраіне горада ў якасці баявой аховы быў выстаўлены толькі эскадрон 17-га Гв. Лідскага кп 5-й Гв. кд (агулам 12 чалавек!) і 6-я батарэя (4 гарматы) 174-га знішчальнага супрацьтанкавага артпалка[324].

Да падыходу нямецкіх падраздзяленняў кавалерысты паспелі эвакуіраваць насельніцтва з горада Ліпск ў бліжэйшыя вёскі. Ад камандуючага корпусам быў атрыманы загад знішчыць драўляны мост праз р. Бобр. Аднак у кавалерыстаў не было неабходнай для гэтага ўзрыўчаткі. На шчасце, для нешматлікіх абаронцаў Ліпска, у гэтым раёне знаходзіўся дывізіён рэактыўнай артылерыі корпуса. Ён заняў пазіцыі на ўскраіне в. Стары Рагожын (за 6-7 км на ўсход ад горада Ліпск). Залп "кацюшаў" накрыў калону 1-га батальёна СС, што рухаўся па дарозе да Ліпска, і прывёў да затрымкі нямецкай атакі[325]. Немцы былі вымушаны разгарнуць сваю артылерыю і пачаць абстрэл савецкіх пазіцый. Пасля гэтага эсэсаўскі батальён зноў перайшоў у атаку.

Як і чакалася, упарты бой разгарэўся каля маста праз р. Бобр на паўднёвай ускраіне горада. Кавалерысты змаглі падпаліць мост пры дапамозе бензіну перад самым падыходам да яго нямецкіх штурмавых гармат. У баі загінула альбо была паранена большасць кавалерыстаў з заслоны 17-га Гв. Лідскага кп. Заканчваліся і боепрыпасы. Камандзір батарэі л-т Аўраменка прыняў рашэнне вывесці з боя 2 гарматы і стварыць тылавую пазіцыю на поўнач ад Ліпска, на скрыжаванні дарог Аўгустоў – Гродна і Ліпск – Скеблева. 2 гарматы, што засталіся, павінны былі прыкрываць гэты манёўр. Асабліва вылучыўся ў гэтым баі камандзір гарматы ст. с-т М.С. Шавялёў. Застаўшыся з разлікам, ён прыкрываў змену пазіцыі сваёй батарэі. Калі немцы наблізіліся да гармат ушчыльную, артылерысты адбілі атаку аўтаматамі і ўрукапашную.




**18 ліпеня 1944г. Прарыў 3-га Гв.кк да г.Аўгустаў**

Для ўтрымання Ліпска камандуючы корпусам Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскі асабіста загадаў тэрмінова перакінуць 121-шы кавалерыйскі полк м-ра Барадай, які павінен быў заняць абарону на скрыжаванні дарог Аўгустоў – Гродна і Ліпск – Скеблева, а часткай сваіх сіл дапамагчы абаронцам горада. Адначасова быў аддадзены загад 24-му Гв. кп, што знаходзіўся каля Аўгустоўскага канала, згарнуць свае пазіцыі і спешна выступіць у раён Ліпска.

У гэты час у Ліпску на пазіцыях батарэі 174-га зстап неаднаразова ўзнікалі рукапашныя сутычкі. У выніку бою каля моста праз Бобр, што затрымаў немцаў, была створана другая лінія абароны. Ст. с-т М.С. Шавялёў атрымаў загад адводзіць свае гарматы з горада. Частка кавалерыстаў з адной гарматай адступілі. Немцы пачалі чарговую атаку. Ст. с-т М.С. Шавялёў адкрыў агонь з апошняй гарматы. Калі снарады скончыліся, артылерысты пусцілі ў ход стралковую зброю і гранаты. Паводле данясення ў штаб дывізіі, у гэтым баі гармата старшага сяржанта знішчыла некалькі дзесяткаў нямецкіх салдат, 2 бронетранспарцёры, 1 гармату і 2 кулямёты[326]. Тым не менш, немцы ўзялі горад Ліпск[327]. Аднак далейшае прасоўванне нямецкага батальёна 5-га палка было спынена кавалерыстамі 121-га кп на лініі Кур'янка – Астроў.

Да вечара 32-я кд выйшла да раёна в. Краснае – Выжарне (за 5 км на поўнач ад Ліпска). Кавалерыйская дывізія Гв. г.-м. П.П. Брыкеля за дзень выйшла да горада Аўгустова. Пры гэтым перадавыя эскадроны 23-га Гв. Падгайцаўскага кп Гв. палк. Бондара трапілі ў сам горад[328]. Часткай сваіх сіл дывізія заняла рубеж: воз. Сайнэк – воз. Сайно і заняла пераправу праз канал Чорны Брод. Камандзір узвода кулямётаў ДШК 6-й кд л-т Х. Гарэлік узгадваў: "...атрымаў заданне – разам з шабельным эскадронам Няўмоева заняць пераправу Чорны Брод. Няўмоеў паказаў мне на карце, як трэба рухацца, і сказаў, што ён накіроўваецца туды ж. Да вечара бамбёжкі прыціхлі, і я з узводам без прыгод пад'ехаў да маста (не памятаю, ці быў гэта мост праз Аўгустоўскі канал або праз нейкую рэчку). Нядоўга думаючы, развярнуў свае чатыры кулямёты і адкрыў агонь па населеным пункце на тым баку моста. Пасля некалькіх чэргаў у адказ агонь з таго боку спыніўся, і мы спакойна занялі вёску. Хутка пад'ехаў і шабельны эскадрон Няўмоева. Ён мяне пахваліў, і кожнае падраздзяленне занялося сваімі справамі на сваіх пазіцыях. А ноччу на нас напалі немцы. Перастрэлка перайшла ўрукапашную, і... немцы драпанулі. Раніцай, калі ўсё ўжо было ў парадку (населены пункт і пераправа ў нашых руках), нас адазвалі. Гэты рубеж павінна была заняць пяхота"[329]. 23-ці Гв. кп ноччу быў адведзены да. в. Выжарне, дзе заняў абарону.

Увечары, аднак, кавалерысты вымушаны былі адвесці частку сваіх сіл ад горада Аўгустоў. 24-ы Гв. кп дывізіі Гв. г.-м. М.С. Чапуркіна быў адведзены ў раён на ўсход ад Ліпска, каб, у выпадку выхаду немцаў у тыл корпуса, стварыць там абаронную лінію. У мястэчку Сапоцкін у якасці заслоны быў разгорнуты адзін полк 174-й сд[330]. Астатнія падраздзяленні стралковай дывізіі прасунуліся да сярэдзіны дня ў раён воз. Бражаны – Рыголь. Такім чынам, кавалерыйскі корпус знаходзіўся ў 40-50 км на захад ад Нёмана.

У гэты ж дзень 352-я сд 31-й арміі фарсіравала раку Нёман у раёне в. Мельнікі. Здзейсніўшы хуткі марш, яна заняла пазіцыі па паўночным беразе Аўгустоўскага канала ў раёне в. Сонічы.

Адначасова з гэтымі паспяховымі дзеяннямі савецкіх войск, што глыбока ўклініліся ў нямецкую абарону, вызначыўся контрудар 3-й тд СС "Мёртвая галава" ў тыле названых вышэй злучэнняў кавалерыйскага корпуса.

Раніцай 18 ліпеня на вуліцах мястэчка Сапоцкін з'явілася бранятэхніка 3-га танкавага разведвальнага батальёна СС. У мястэчка нямецкія танкі ўвайшлі без адзінага стрэлу: афіцэры савецкай 153-й сд, якія былі непадалёку ад населенага пункта, прынялі іх за сваіх, і толькі разглядзеўшы крыжы, зразумелі, што памыліліся. Вось як апісваў гэты момант перакладчык дывізіі С.М. Вернікаў: "Ледзь толькі ўзышло сонца, як мы ўсталявалі каля адной з амбразур ДАКа стэрэатрубу і пачалі аглядаць мясцовасць. Перад ДАКам – суцэльны масіў лесу. Ззаду можна было добра разгледзець Сапоцкін. З вышыні мы бачылі яго роўныя вуліцы. Усе з нецярпеннем чакалі ўзнаўлення пераправы і падыходу падмацаванняў з-за Нёмана. Таму, пабачыўшы, як на шырокую вуліцу Сапоцкіна адзін за адным паўзуць танкі, я радасна паведаміў: "Таварыш маёр, пераправа ўзноўлена, танкі на падыходзе, паглядзіце, яны ўжо ў Сапоцкіне!" Нарыжны прыпаў да акуляра стэрэатрубы і праз некалькі секунд, не адрываючыся ад яе, доўга і мудрагелiста вылаяўшыся, сказаў: "Дык танкі ж нямецкія! На іх крыжы!" Танкавая калона, якую я прыняў за нашыя рэзервы, аказалася гітлераўскай"[331]. Ветэран, аднак пымыляўся, называючы бронетранспарцёры разведвальнага батальёна танкамі. Акрамя таго, з'явіцца на досвтку ў Сапоцкіне яны таксама не маглі – да 9 раніцы мястэчка штурмавалі палкі 174-й дывізіі.

Супраць нямецкай бранятэхнікі разгарнуліся сілы 174-й Барысаўскай сд. Судзячы па ўспамінах ветэрана дывізіі І.З. Івашкіна, у баях артылерыя 598-га артылерыйскага палка здолела падбіць некалькі нямецкіх бронетранспарцёраў. Немцы былі выбіты з мястэчка Сапоцкін.

Часці 153-й дывізіі разгарнуліся фронтам да ракі Нёман. Пазіцыі дывізіі аказаліся расцягнутымі ўздоўж дарогі Сапоцкін – Ліпск па вёсках Пралейкі – Галынка – Рыгалаўка[332]. Камандны пунт дывізіі размясціўся за некалькі кіламетраў на ўсход ад Ліпска. На дапамогу дывізіі праз некаторы час змаглі прабіцца артылерыйскі полк і супрацьтанкавы знішчальны дывізіён. Яны пераправіліся праз Нёман на поўнач ад пераправы дывізіі, праз парадкі суседняга 36-га ск 31-й арміі (каля м. Гожа). Да раніцы 18 ліпеня 557-мы сп заняў пазіцыі на захад ад в. Перстунь на вышынях 138.0 і 198.6[333]. фронтам на паўднёвы ўсход, замініраваўшы 2 мосцікі праз раку. Паводле ўспамінаў камандзіра батальёна 557-га палка, першы бой адбыўся каля 7 гадзін раніцы і быў праведзены эфектыўна і па ўсіх правілах ваеннага мастацтва. "Да абодвух мастоў рваліся нямецкія танкі. Па раўніне, расцягнуўшыся на паўкіламетра па фронце, пайшла пяхота. У бінокль я бачыў галовы Сусева, Белкіна і сапёраў, што сядзелі ў прыкрыццях прыкладна за сто метраў ад ракі. Танкі ўвайшлі на абодва масты амаль адначасова. Але ўзрывы раздаліся спачатку на адным, потым на другім мосце. Тры танкі рухнулі разам з абломкамі пралётаў у раку. Астатнія затармазілі і сталі збівацца ў калону. Тут жа адкрыла беглы агонь палкавая артылерыя. Пакуль танкі разгортваліся, нашы пушкары знішчылі дзве машыны. Астатнія павярнулі і на хуткасці сышлі прэч. Варожая пяхота, што трапіла пад мінамётны, кулямётны і ружэйны агонь, адступіла на зыходныя пазіцыі"[334]. Пасля гэтага бою полк змяніў пазіцыі, што пазней рабіў неаднаразова, калі актыўна ўзаемадзейнічаў з кавалерыстамі Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскага.

У гэты дзень салдаты 153-й сд захапілі эсэсаўца з дывізіі "Мёртвая галава". Паводле ўспамінаў ваеннага перакладчыка са 153-й сд 69-га ск 50-й арміі С.М. Вернікава, палонны паведаміў, што іх падраздзяленне выехала з Румыніі "... 11 ліпеня і трое сутак імчаліся амаль без перапрынкаў з поўдня на поўнач..."[335]

Асноўны ўдар па савецкіх войсках быў нанесены сіламі баявой групы "Кюн" з раёна, што размяшчаўся на поўдзень ад в. Баля-Касцельная ў паўночным накірунку. Я.П. Елісееў піша аб ўдзеле ў гэтай атацы да 120 танкаў і САУ (!), што падтрымліваліся авіяцыяй і артылерыяй[336]. Гэтыя лічбы, безумоўна, з'яўляюцца перабольшанымі. Паводле нямецкіх дадзеных, група "Кюн" у той дзень была ўзмоцнена 10 сярэднімі танкамі T-IV, цяжкімі танкамі T-VI і 15 штурмавымі гарматамі[337]. Асноўная сіла нямецкага ўдару зноў прыйшлася па парадках 42-й Смаленскай сд г.-м. А.І. Сліца. Раніцай у наступленне на в. Адамавічы перайшлі 3-ці батальён 6-га тгр палка і 1-шы батальён 34-га палсп[338]. Яны ўвараваліся ў вёску пры падтрымцы некалькіх штурмавых гармат. Савецкія салдаты спрабавалі разгарнуцца ў лан-

цуг каля касцёла і контратакаваць, але спроба не ўдалася з прычыны моцнага агню немцаў. Счацвяроная савецкая зенітная ўстаноўка на аўтамабільным шасі не паспела нават адкрыць агонь і была знішчана гранатамі. Чырвонаармейцы адышлі ў накірунку в. Салаўі.

Баявая група "Кюн" (III/"Т" і III/"Е") павінна была праводзіць наступленне на поўнач. Батальён 5-га тгр палка СС затрымаўся. Ён павінен быў дачакацца паліцэйскіх падраздзяленняў з паліцэйскай групы, каб здаць свае пазіцыі. Такім чынам, атака была распачата 3-ім батальёнам палка "Эйке" (9-я, 10-я і 11-я роты СС). Ён атакаваў з лініі вёсак Адамавічы – Міцкевічы – Навумавічы на ўсход, да ракі. Заняўшы в. Баля-Сольная, немцы выйшлі да Нёмана. Савецкая пераправа 95-й сд, што знаходзілася тут, была блакіравана.

Часці 3-га дывізіён знішчальнікаў танкаў СС перайшлі ў наступленне ад в. Міцкевічы ў накірунку в. Баля-Касцельная, супраць пазіцый 42-й сд. Камандзір дывізіёна штурмбанфюрар А. Пітчэліс запісаў у асабістым дзённіку пра ўзятыя тут трафеі: "У 11.30 мясцовасць занята. Знішчана: 12 – 3,7 см супрацьтанкавых гармат, 2 – 7,62 см гарматы, 3 – 12,2 см гарматы, 7 кулямётаў, 11 супрацьтанкавых ружжаў…"[339] Камандны пункт батальёна быў перанесены з в.Баранавічы ў в.Капланаўцы (у 2-х км на захад ад Балі-Касцельнай).

Тым часам, баявая група "Кюн" працягвала атаку. У другой палове дня да яе далучаецца і III/"Т". Ён здаў свае пазіцыі 1-му батальёну 17-га палп СС і 1-му батальёну 34-га палсп. Падраздзяленні 42-й стралковай дывізіі ўпарта абараняліся. Гэта прызнавалі і немцы. У данясенні ў штаб 6-га трг палка СС (штаб у в. Скрынікі, 2 км на захад ад Балі-Касцельнай) адзначалася: "Становішча на паўночным усходзе змяняецца. Тут мы трапляем у сапраўдны ад"[340].

Для забеспячэння наступлення палка "Эйке" ў в. Караліно былі сканцэнтраваны абозныя часці і арганізаваны склад для боепрыпасаў. Падвоз боепрыпасаў ажыццяўляўся проста ў баявыя парадкі нямецкіх войск. Вадзіцель з роты забеспячэння ўспамінаў: "...Чым бліжэй мы набліжаемся да пярэдняга краю абароны, тым больш навокал глухога злобнага гарматнага грукату, які напаўняе паветра траскучым канцэртам стрэлаў... У траскатню разрываў савецкіх артылерыйскіх снарадаў, якімі рускія абстрэльваюць тэрыторыю, у глухія разрывы гранат, умешваюцца гукі выстралаў нашых супрацьтанкавых і батарэйных гармат. На сваіх падвозчыках мы імкнёмся як мага хутчэй папоўніць боезапас у палявой базе ў Навумавічах, калі залпавы агонь набліжаецца да яе вельмі блізка. Пад купай дрэў падцягнуты некалькі крытых транспартных павозак забеспячэння паліцыі. Як толькі мы набліжаемся, у кронах дрэў разрываецца граната. Вадзіцель паранены, два кані забіты. Мы спыняемся і спяшаем на дапамогу. Асцярож-

на мы паднімаем вадзіцеля з козлаў і кладзем яго на другую павозку. Паліцэйскія здаюцца нам трошкі бездапаможнымі. Коні толькі лёгка паранены, аднак цяга павозкі разарвана. Два салдаты трымаюць коней за аброці, пастукваюць ім па шыі, супакойваючы, у той час як іншы паліцэйскі завязвае вузлом новыя павады павозкі. Затым мы рухаемся далей і даязджаем да Навумавіч, дзе атрымоўваем загад ехаць да Балі-Касцельнай. З поўначы зноў чуваць шум бою. Там бальшавікі яшчэ сядзяць у былых бункерах ..."[341]

Бункеры, пра якія ўзгадваў нямецкі вадзіцель былі руінамі форта № 1 Гродзенскай крэпасці (в. Загараны, знаходзіцца за 2 км на поўнач ад в. Навумавічы). У выніку нямецкай атакі ў акружэнне трапілі часці 1-га і 2-га батальёнаў (камандзіры к-ны С.А. Бяляеў і М.І. Капанёў) 455-га Верхнедняпроўскага сп і прымкнуўшыя да іх іншыя падраздзяленні палка. Акрамя іх, у акружэнні аказалася і рота 1-й штурмавой інжынерна-сапёрнай брыгады. Іх супраціўленне на пазіцыях форта арганізаваў намеснік камандзіра 455-га палка па страявой падрыхтоўцы м-р М.У. Сідарэц[342]. Пра бai, якія вынеслі гэтыя салдаты, напісаў у тыя дні артыкул у газету "Правда" ваенны карэспандэнт Л. Талкуноў. Працытуем урывак з гэтага артыкула: "Быў выпадак, калі немцам удалося акружыць наш стралковы батальён. Маёр Сідарэц,які кіраваў боем, арганізаваў кругавую абарону ў сяле, якое ён за суткі да гэтага адбіў у ворага. Немцы, мяркуючы, што яны лёгка змогуць пакончыць з нашым гарнізонам, сканцэнтраваліся для атакі. Маёр Сідарэц старанна вызначыў плошчы абстрэлу і выклікаў па радыё агонь Гвардзейскіх мінамётаў. Залпы накрылі сотні эсэсаўцаў. Уцалелыя гітлераўцы адхлынулі назад, а праз некалькі гадзін яны былі прыцісн уты да ракі і знішчаны"[343]. Насамрэч усё было інакш.

Падраздзяленні групы "Кюн" (III/"T" і III/"E") пачалі атаку акружаных у другой палове дня 18 ліпеня. Папярэднічаў атацы налёт нямецкай авіяцыі. Паводле інфармацыі вайсковага даследчыка П. Маслава, нямецкую атаку падтрымлівала каля 10 танкаў і штурмавых гармат[344]. Агнём савецкай 45-мм артылерыі былі падбіты 2 штурмавыя гарматы. Дапамогу ў адбіцці атакі аказалі і мінамётчыкі мінамётнай роты 455-га палка пад камандваннем ст. л-та П.М. Верзанава. Напрыклад, камандзір мінамётнага разліку А.Ф. Жданаў высунуў мінамёт на адкрытую пазіцыю і забяспечыў агнём адбіццё атакі[345]. Аднак дастаткова хутка ў мінамётнай батарэі скончыліся міны. Мінамётчыкі далучыліся да пяхоты. Некалькі разоў акружаныя байцы пераходзілі ў контратакі.

Гісторык П. Маслаў пісаў, што ў агульнай атацы форта, якая была праведзена пад вечар, удзельнічала да 30-32 танкаў і штурмавых гар-

мат пры падтрымцы 1,5 палкоў пяхоты[346]. Д. Гаўрылін жа пісаў, што ў штурме форта ўдзельнічала да 8 нямецкіх танкаў і паліцэйскі батальён[347]. Атакі форта праводзіліся з поўдня, з боку в. Навумавічы, з захаду і паўночнага захаду. Спецыяльна для штурму ўмацаванняў немцы вылучылі 16-ю сапёрную роту СС з 6-га тгр палка СС. Прывядзём успаміны ўдзельніка атакі: "...Мы, сапёры з 1-га ўзвода пад камандаваннем унтэрштурмфюрара СС Якоба, павінны атакаваць умацаванні франтальна. Пад прыкрыццём мы прабіваемся да бункера. Радавы СС Мецке выявіў 10 рускіх, якія абараняліся перад бункерам. Мецке хаваецца ў жывой загарадзі, узводзіць і націскае на спуск свайго пісталет-кулямёта. Следам раздаецца чарга аўтаматычнага агню: некалькі рускіх падаюць мёртвымі ці параненымі на зямлю..."[348]

Атаку грэнадзёраў падтрымліваў 4-ты дывізіён 3-га артпалка СС[349]. Для абаронцаў становішча магло скончыцца паражэннем. Адзіная іх надзея была на дапамогу дывізіі. Таму м-р М.У. Сідарэц звязаўся па радыёстанцыі з камандзірам дывізіі г.-м. А.І.Сліцам. Выслухаўшы справаздачу, камандзір дывізіі загадаў палку ўтрымліваць занятыя пазіцыі[350]. Між тым нямецкі штурм працягваўся. Адзін з нямецкіх сапёраў, атакаваўшых форт №1, узгадваў: "Мы прабіваемся далей да бункераў. Аднак загараджальны агонь настолькі моцны, што мы вымушаны адысці назад. Атака павінна быць паўторана ў цемры..."[351]

Абаронцы форта практычна нічога не змаглі зрабіць з наступаючай нямецкай бранятэхнікай, паколькі мелі толькі некалькі 45-мм гармат. Праўда, ёсць інфармацыя, што акрамя 2 падбітых штурмавых гармат, у другой палове дня абаронцы падбілі яшчэ адзін танк. Так, Д. Гаўрылін пісаў, што с-на Булгач ва ўпор падбіў "Пантэру"[352]. Хутчэй за ўсё гэта быў не танк T-V "Пантэра", а T-IV, таму што батальён "Пантэр" 3-й тд СС увогуле не ўдзельнічаў у баях на захадзе ад Гродна. Супраць САУ StuG-40, што былі на ўзбраенні 3-й тд СС (верагодна, менавіта іх у айчыннай літаратуры, прысвечанай баям на захадзе Гродна, ветэраны называюць "Фердынандамі"), савецкія 45-мм пушкі і супрацьтанкавыя ружжы былі мала прыдатныя. Штурмавыя гарматы StuG-40, што падышлі практычна ўсутыч (да 300 метраў) да ўмацаванняў форта, толькі ледзь ад'ехалі пасля стральбы па іх з супрацьтанкавых ружжаў. Пасля гэтага самаходкі працягвалі абстрэл савецкіх салдат, якія абараняліся ў развалінах.

Удала дзейнічалі станкавыя кулямёты з узвода ст. л-та У. Сітнікава. Яны адсеклі нямецкую пяхоту ад танкаў. Абаронцы форта распачалі контратаку, уварваліся на камандны пункт 1-га ўзвода 16-й сапёрнай роты СС і знішчылі яго. Вечарам 2 атакуючыя батальёны групы "Кюн" змянілі 1-шы батальён 34-га палсп, які працягваў блакаду форта. Нямецкая баявая група ў гэты час працягвала наступленне

ў паўночным накірунку. Сярод акружаных было шмат раненых. Былі ранены камандзіры батальёнаў 455-га палка к-ны М.І. Капанёў і С.А. Бяляеў, намеснік камандзіра 2-га батальёна к-н М.І. Асебешвілі, камандзіры рот ст. л-ты А.Г. Капусцін і А.А. Шуціхін, л-ты Х.С. Хабаеў і інш[353]. У 5-й і 6-й ротах не засталося салдат і на поўны ўзвод. Вялікія страты панесла мінаметная рота палка. Акрамя таго было забіта 7 афіцэраў палка, у тым ліку камандзір роты ст.л-т І.В. Ніканаў, камандзір мінамётнай роты ст.л-т П.М. Верзанаў[354].

На працягу баёў м-р М.У. Сідарэц некалькі разоў адпраўляў параненых да ракі невялікімі групкамі. Такім чынам, з акружэння выйшла да 60 чалавек. Як бачна, поўнага акружэння форта не было. Савецкія падраздзяленні маглі адступіць да Нёмана ў першай палове дня. Аднак камандванне 42-й дывізіі спадзявалася працягваць наступленне, таму забараняла адыход да ракі 455-му палку.

Падчас аднаго са штурмаў форта, калі немцы ўжо ўскараскаліся на разваліны форта, м-р М.У. Сідарэц выклікаў па радыё агонь сваёй артылерыі з іншага берага Нёмана на сябе. Рашэнне адкрыць агонь па сваіх жа салдатах, што абараняліся на форце №1, аддаў сам камандуючы 50-й арміяй г.-п. І.В. Болдзін, які трымаў сітуацыю з 42-й дывізіяй на асабістым кантролі. Агонь савецкай артылерыі быў выніковым – немцы былі вымушаны адысці з пазіцыі.

Увечары на імправізаваным савеце камандзіраў 455-га палка было прынята рашэнне адступіць ноччу з форта і прабірацца да ракі, ў раён в. Шэмбелеўцы, дзе знаходзіўся плацдарм 42-й дывізіі. У ноч на 19 ліпеня калона ацалелых байцоў ціха выйшла з развалін умацаванняў і падышла да ракі. Аднак уначы часткі 455-га палка абмінулі свой плацдарм. Прыкрывала калону рота л-та М.Г. Падгурскага. Каля ракі Нёман салдат заўважылі немцы, пачаўся начны бой. Асноўная частка калоны, падтрыманая з ўсходняга берага ракі сваёй артылерыяй, усё ж здолела пераправіцца. Толькі роце л-та Мікалая Генрыхавіча Падгурскага не ўдалося фарсіраваць раку. Збіўшыся з накірунку, яны выйшлі да Нёмана не ў тым месцы. Каб не быць заўважанымі і знішчанымі на адкрытай прасторы, было прынята рашэнне вярнуцца ў форт. Наперадзе ў іх быў яшчэ дзень баёў. У час начнога бою у палон трапіў л-т Філіпаў. Немцы прывезлі яго ў в. Загараны, дзе пасля допыту расстралялі[355].

У баях 17-18 ліпеня 42-я Смаленская сд страціла 1034 чалавекі забітымі, раненымі і зніклымі без звестак. Калі ўлічыць, што на 15 ліпеня ў дывізіі налічвалася 5089 чалавек, то страты дывізіі за гэтыя два дні склалі пятую частку. 455-ты полк, акружаны ў в. Загараны, страціў трэць свайго складу: 66 чалавек забітымі, 178 зніклымі без звестак і 89 параненымі[356]. Бачна, што страты дывізіі былі значнымі.

Акрамя гэтага, дывізія страціла: вінтовак – 295, пісталет-кулямётаў – 251, ручных кулямётаў Дзегцярова – 38, станкавых кулямётаў – 11, СТР – 25, мінамётаў 82-мм – 25, 45-мм пушкі – 10, 76-мм пушкі – 8[357].

Пасля баёў на пазіцыях форта № 1, баявая група "Кюн" працягвала наступленне ўздоўж ракі. 3-ці батальён 6-га тгр палка "Эйке", які наступаў уздоўж ракі Нёман, выйшаў да савецкай пераправы каля в. Куколі. Радавы батальёна СС Вальтэр Дэрынг узгадваў: "Нам дадзены загад адкінуць рускіх уздоўж берагавой лініі і ўрукапашную ўзяць разбітую ваенную пераправу праз Мемель (*рака Нёман* – Д.Л.) каля Куколей. Наша рота наступае на левым флангу. З іншага берага Мемеля, каб спыніць наша прасоўванне, рускія страляюць з усёй наяўнай у іх зброі. Адкрываюць па нас агонь і з вышынь злева. І ўсё ж мы бесперапынна прасоўваемся наперад і не заўважаем, як заходзім у тупік. Маленькія групы ворага, якія з'яўляюцца паміж складкамі мясцовасці, спрабуюць загарадзіць нам шлях. Яны знікаюць так жа нечакана, як і з'уляюцца, ледзь толькі ў іх пасылаецца некалькі чэргаў з пісталетаў-кулямётаў.

Аднак больш за варожыя групы нам шкодзяць мінамёты рускіх і варожыя батарэі, што накрываюць нас з таго боку ракі. Асабліва мы праклінаем мінамёты. Яны страляюць дакладна ў мішэнь. Як паказвае карта, мы падыходзім да Беражан… У некалькіх дамах вёскі… рускія ўмацаваліся і хочуць затрымаць нас. Гэта працягваецца нядоўга, мы выкурваем іванаў. Далей мы прасоўваемся па абодва бакі палявой дарогі, якая вядзе да наступнай вёскі Шэмбелеўцы. Наша надзея на тое, што мы здолеем захапіць рускіх знянацку і дасягнуць мэты нашага наступлення – мастовага ўмацавання – знікае. Ужо пры падыходзе да вёскі па нас адкрываецца моцны абарончы агонь. Мы хаваемся. Раптам нам здаецца, што ўсё сціхае. Затым з'яўляюцца нашыя штурмавыя гарматы і танкі! Яны рухаюцца з вышынь і ўрываюцца ў вёску з захаду, ламаюць сваімі гусеніцамі платы. Супраць іх няма ніякіх сродкаў. Некалькі дамоў разбураны пападаннем 7,5-см гранат са штурмавых гарматаў. Цяпер мы падцягваемся і атакуем вёску. Руская пяхота адступае да бліжэйшага моста праз Нёман. У той момант некалькі Т-34 высоўваюцца з поўначы вёскі. Нашы танкі і штурмавыя гарматы бяруць іх на сябе. Мы пераследуем адступаючых рускіх. Каля перадмаставога ўмацавання 11-я рота ўжо б'ецца з імі. На мосце тоўпяцца бальшавікі, якія хочуць выратавацца на размешчаным на рацэ востраве. Аднак камісары і афіцэры накіроўваюць іх назад. Пачынаецца рукапашная бойка з ужываннем ручных гранат і пісталет-кулямётаў. З іншага берага Мемеля рускія дзіка страляюць. Раптоўна каля маста з'уляецца некалькі штурмавых гармат і накрываюць Іванаў. Мы бяром мост штурмам. Контратака рускіх захлынаецца

на мосце пад нашым загараджальным агнём. Нашы штурмавыя гарматы расстрэльваюць мост. На гэтым мосце, мы спадзяемся, рускія больш не пераправяцца праз раку…"[358] Тут гаворка ішла хутчэй за ўсё пра пераправу кавалерыстаў, арганізаваную л-там І.А.Баянавым. Паводле яго ўспамінаў, калі немцы 18 ліпеня падышлі да пераправы, усе сапёры занялі абарону. Яны пратрымаліся на сваіх пазіцыях і нават захапілі нямецкі станкавы кулямёт, страціўшы пры гэтым 2 чалавекі паранenымі. Страты немцаў былі ацэнены ў 40 чалавек. За арганізацыю пераправы і яе абарону л-т І.А. Баянаў быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені[359]. Як бачна, пра захоп немцамі пераправы л-т І.А.Баянаў нічога не ўзгадваў.

3-ці батальён палка "Туле" гаўптштурмфюрара Паўля Шцінена заняў пазіцыі ўздоўж ракі ад в. Баля-Сольная да вышыні на захадзе ад в. Зарыца. 3-ці батальён палка "Эйке" працягнуў атаку далей на поўнач і да вечара дасягнуў лініі Скаўронкі – Войтаўцы[360]. Акрамя таго, немцы захапілі в. Лойкі, Каўбаскі і Шынкаўцы. Цікава, што за паўтары гадзіны да захопу в. Лойкі немцамі, тут размяшчаўся штаб 3-га Гв.кк. Цяжкія танкі "Tiger" з 9-й роты занялі пазіцыі каля в. Каўбаскі. Падчас баёў выйшаў са строю рухавік аднаго з танкаў. Пры яго эвакуацыі, пападанне са сваёй жа гарматы (належала 1-му батальёну 34-га палсп) атрымаў танк камандзіра роты[361]. Камандзір роты гаўптштурмфюрар Ганс Фішар, які прыняў камандаванне ротай у папярэдні дзень, загінуў[362]. Танк быў эвакуіраваны. З наступленнем ночы, батальёны баявой групы "Кюн" вымушаны былі вяртацца на зыходныя пазіцыі, з якіх яны распачалі атакі раніцай. Гэта тлумачылася тым, што 42-я і 95-я сд вярталі свае плацдармы на левым беразе Нёмана, у тыле баявой групы.

Пасля няўдалай атакі мястэчка Сапоцкін раніцай, 3-ці танкавы разведвальны батальён СС штурмбанфюрара Ліна Масары заняў пазіцыі, на якія адышоў яшчэ ў выніку адступлення ад ракі Нёман 17 ліпеня. На лініі в. Скрыннікі – Рацічы (па абодва бакі дарогі на Сапоцкін) немцы адбілі некалькі атак савецкіх частак з боку мястэчка Сапоцкін. 3-я рота батальёна, у прыватнасці, зноў адбівала моцныя савецкія атакі ў раёне в. Рацічы.

Да 22.00 часці 3-й тд СС выйшлі да Нёмана, заняўшы раён вёсак Лойкі – Баля-Касцельная – Каўбаскі – Войтаўцы. Пры гэтым былі змятыя парадкі савецкай 42-й сд (пазіцыі каля в. Капланаўцы – Навумавічы), прычым 44-ты Верхнедняпроўскі і частка 459-га палкоў нават адступілі на ўсходні бераг Нёмана. Адбылося гэта таму, што наступаючыя часці дывізіі сутыкнуліся з атакуючымі нямецкімі танкамі, не змаглі замацавацца і не мелі неабходнай колькасці супрацьтанкавых сродкаў. Не выклівае сумнення, што ўсяго гэтага можна было

пазбегнуць, калі б была арганізавана разведка мясцовасці. Дывізія тым не менш працягвала ўтрымліваць невялікі плацдарм каля в. Шэмбелеўцы (хутчэй за ўсё, пасля таго як эсэсаўцы з III/Е працягнулі наступленне на поўнач, савецкія войскі зноў пераправіліся на левы бераг па пераправе каля в. Куколі).

18 ліпеня над плацдармам дзейнічалі штурмавікі Іл-2 са складу 230-й авіяцыйнай дывізіі. Палкі дывізіі перабазіраваліся ў раён м. Скідзель. Супрацьпаветраную абарону на аэрадроме заняў 1550-ы ап СПА. У прыватнасці 2-я эскадрылля 43-га Гв. шап л-та Г.С. Шупіка знішчыла ў гэты дзень на левым беразе Нёмана калону немцаў. "Генерал Гецман (*камандзір дывізіі* – Д.Л.) выклікаў на камандны пункт штурмана эскадрыллі Г.С. Шупіка і даў яму карту, на якой сінімі авaламі былі абведзены месцы засяроджвання сілаў "Мертвай галавы". Генерал загадаў Г.С. Шупіку павесці групу штурмавікоў на выкананне гэтага адказнага задання"[363]. Заданне было выканана.

Працягваліся нямецкія атакі ў занёманскай частцы горада Гродна. Часці 290-й сд 81-га ск трымалі тут вузкі плацдарм уздоўж ракі. Гэтыя войскі падтрымліваліся артылерыяй з-за Нёмана. Палкі дывізіі цалкам пераправіліся праз раку, аднак іх забеспячэнне засталося праблематычным. Пераправу праз Нёман апісаў ветэран 878-га сп М.І. Вяснянцаў: "Становішча 878-га стралковага палка стала крытычным. Толькі дэсант на левым фланзе мог замацаваць нашы пазіцыі… Нарэшце, пачулі каманду: "Наперад!" Без шуму паднялі наш плыт і – бягом да ракі. Раптам у тыле немцаў нешта завухкала, на вадзе разарваліся першыя міны. Мы былі далёка ад берагу, калі ўдарылі кулямёты. Агонь вёўся непрыцэльны, але даволі шчыльны. Побач разарвалася вялікая міна… Мы прыкладалі ўсе намаганні, каб прыблізіцца да варожага берага. Неспадзявана ногі дакрануліся да зямлі. Бераг. Побач байцы дэсантнага атрада выцягвалі на бераг плыты, рэчмяшкі, кулямёты"[364]. У выніку атакі атрада пад камандаваннем л-та Ялохіна савецкія байцы занялі дзве лініі нямецкіх траншэй уздоўж берага ракі. Дывізіі не ўдавалася пабудаваць пераправы з-за нямецкага агню. У гэтых баях загінуў камсорг роты, памочнік камандзіра 1-га батальёна 878-га сп ст. с-т М.Ц. Курбатаў. Пра абставіны яго смерці дакладна нічога не вядома. Міхаіл Курбатаў пераправіўся праз Нёман у раёне чыгуначнага маста (на месцы сучаснага завода карданных валаў) адным з першых. Адбіваючы атаку, ён, па адной з версій, быў смяротна паранены, па другой – падарваў сябе гранатай.

Увечары нямецкая групоўка на захадзе ад Гродна была ўзмоцнена. З тэрыторыі акупаванай Польшчы прыбыў 4-ты паліцэйскі полк СС. Камандваў палком оберштурмбанфюрар Вальтэр Данц. Ён тут жа

быў накіраваны ў в. Ласосна і далей – да в. Баля-Сольная. У раён горада Аўгустова з Галандыі ў якасці чарговай “пажарнай каманды” тэрмінова пачалося перакідванне 19-й танкавай дывізіі[365]. Яна павінна была перашкодзіць магчымаму ўзяццю горада Аўгустоў савецкімі войскамі.

Дзеянні баявой групы СС “Кюн” не прывялі да чаканых немцамі вынікаў: 3-я тд СС не здолела злучыцца з 5-й тд XXXIX-га тк, што вяла баі на поўначы ад Аўгустоўскага канала. Г.-ф. В. Модэль надаваў першаснае значэнне ліквідацыі разрыву лініі фронту, утворанага прарывам 3-га Гв.кк. Таму ў наступным загадзе корпуснай групе обергрупэнфюрара К. фон Готберга ставілася задача – ачысціць раён на захад ад Нёмана ад савецкіх войск, спыніць новыя спробы фарсіравання ракі і працягваць атакі на поўнач, ажно да Аўгустоўскага канала.

У выніку нямецкай контратакі 18 ліпеня 3-ці Гв. кк страціў сувязь з дывізіямі 50-й арміі, што дзейнічалі на поўдні і на ўсходзе ад яго. Толькі з поўначы захавалася лакцявая сувязь са 174-й сд (займала пазіцыі па Аўгустоўскаму каналу), а ў раёне Сапоцкіна ўзаемадзеянне са 153-й сд. Алена Аслікоўская, сястра камандзіра корпуса, узгадвала, што ўжо праз дзве гадзіны пасля пачатку атакі немцы “начыста адрэзалі корпус ад астатніх злучэнняў фронту”[366]. Паводле ўспамінаў Гв. л-та І. Якушына, што служыў ў 24-м Гв. кп, у другой палове дня 18 ліпеня корпус быў акружаны[367].

У выніку дзённых баёў войскі 50-й арміі, паводле матэрыялаў “Журнала баявых дзеянняў”, страцілі 122 чалавекі забітымі і 192 чалавекі параненымі. Страты немцаў ацэньваліся ў 800 забітых чалавек, 16 падбітых альбо спаленых танкаў[368].

Камандуючы 50-й арміі г.-п. І.В. Болдзін у той жа дзень прыняў запозненыя меры ўзмацнення свайго 69-га ск. Да ракі Нёман, на плацдарм, які яшчэ ўтрымліваўся 69-м ск, была падцягнута з рэзерву 330-я Магілёўская ордэна Чырвонага сцяга сд палк. У.А. Гусева (1109-ты, 1111-ты, 1113-ты сп і 890-ты ап). Распараджэннем камандуючага фронтам у рэзерв арміі з 49-й арміі перадавалася 324-я сд Верхнедняпроўская (1091-шы, 1093-ці, 1095-ты сп і 887-мы ап) якой камандваў палк. І.К. Казак. Дывізія была сфарміравана ў Мардовіі ў канцы 1941 года. Яе падраздзяленні канцэнтраваліся ў раёне в. Путрышкі. Акрамя таго, у склад найбольш аслабленага 69-га ск перадаваліся часці ўзмацнення: 42-я армейская знішчальна-супрацьтанкавая брыгада, 89-ы Гвардзейскі мінамётны полк (у складзе двух дывізіёнаў “Кацюш”) – камандзір ппалк. А.А. Волкаў.

Тады ж сітуацыяй у раёне Гродна зацікавіўся і маршал Г.К. Жукаў[369]. Увечары 18 ліпеня ён аддаў распраджэнне камандаванню 3-га кк разгануць баявыя парадкі корпуса ў накірунку мястэчка Са-

кулка і да канца 19 ліпеня авалодаць в. Весялова, Дамброва, Ячна. Наступленне ў накірунку Аўгустова прызнавалася другараднай задачай, выконваць яе даручалася часцям 69-га ск (полк 153-й сд), якія пераважна яшчэ знаходзіліся на ўсходнім беразе Нёмана. Такім чынам, маршал Г.К. Жукаў фактычна ***адмяніў свой жа загад ад 16 ліпеня і вярнуў корпус да выканання першапачатковага плана,*** распрацаванага фронтам. Праўда, цяпер корпус ужо моцна завяз у баях і згубіў эфект нечаканасці для немцаў, дасягнуты хуткім прарывам на левым беразе Нёмана. У адпаведнасці з загадам, аддадзеным 18 ліпеня ў 23.50 камандуючым фронтам, 69-ты ск у складзе 153-й (2 палкі), 330-й і 42-й сд павінен быў перайсці ў наступленне ў накірунку мястэчка Новы Двор (на паўднёвы захад ад горада Гродна). Да канца дня яны павінны былі прасунуцца на 5-7 км і заняць лінію в. Кур'янка – Рыгалаўка – Багатыры Польныя[370].

***19 ліпеня*** на левым беразе Нёмана працягваліся цяжкія баі. 69-ты ск у адпаведнасці з загадам, аддадзеным напярэдадні, а 9.00 гадзіне перайшоў у наступленне. З раёна в. Шэмбелеўцы (размяшчалася на левым беразе Нёмана, насупраць в. Куколі) часці 42-й Смаленскай сд атакавалі ў паўднёвым накірунку. Аднак парадкі савецкай пяхоты не былі ўзмоцнены ні танкамі, на САУ. Гэтыя атакі прыйшліся па пазіцыях 3-га батальёна 5-га тгр палка СС. Баявыя парадкі батальёна падтрымлівалі 10 танкаў T-IV. Батальён адбіў слабыя атакі 42-й дывізіі і, у сваю чаргу, сам падрыхтаваўся контратакаваць.

Акружаныя злучэнні 50-й арміі не гублялі надзеі на злучэнне са сваімі галоўнымі сіламі. Аднак загад камандуючага 2-ім БФ наадварот арыентаваў дывізіі на нанясенне раздзельных удараў па пазіцыях 3-й тд СС. У штабе 153-й дывізіі не ведалі аб становішчы на плацдарме. Таму дывізія не падтрымала атакі 42-й дывізіі. Раніцай савецкая 153-я сд, што займала пазіцыі на ўсходнім захадзе і на поўдні мястэчка Сапоцкін (в. Кур'янаўка – Камісарава – на ўсход ад в. Гінавічы – на поўнач ад в. Рацічы), выслала разведку ў накірунку Нёмана, каб даведацца пра сітуацыю на плацдарме. Сувязі са сваімі часцямі, што займалі абарону ў раёне в. Шадзінцы (за 3-4 км на ўсход ад пазіцый 153-й сд) яна, хутчэй за ўсё, не мела. У сутыкненні з эсэсаўскай разведкай у палон трапілі два салдаты "Мёртвай галавы". Акрамя гэтага, быў захоплены спраўны "швімваген"[371], які прыгналі разведчыкі на камандны пункт 557-га палка[372]. Такім чынам, у дывізіі быў здабыты першы баявы трафей эсэсаўскай дывізіі.

Не дасягнулі поспехаў і атакі 95-й дывізіі. На поўнач ад в. Пышкі ноччу падраздзяленні дывізіі зноў фарсіравалі раку Нёман. Адкінуўшы 1-шы батальён 34-га палсп, яны прасунуліся ў заходнім накірунку і выйшлі да в. Адамавічы. Аднак сілы дывізіі, якія

дзейнічалі на плацдарме, былі занадта слабымі каб утрымаць дасягнуты поспех. Акрамя таго, пяхотныя падраздзяленні не акопваліся, не мелі падтрымкі дывізійнай і армейскай артылерыі. Пашырэнне савецкага плацдарма ў тыле злучэнняў 3-й тд СС выклікала іх неадкладную контратаку сіламі 1-га батальёна палка "Эйке"[373]. Сумесна з батальёнам 34-га палсп яны раніцай адцяснілі чырвонаармейцаў назад да Нёмана і блакіравалі перадмаставое ўмацаванне 95-й дывізіі.

Баявая група "Кюн" дывізіі "Мёртвая галава" перайшла ў далейшае наступленне ўздоўж ракі (на правым флангу дзейнічаў III/"Е", на левым – III/"Т"). Такім чынам атакі праводзіліся згодна з папярэднімі планамі і пераследавалі мэту ліквідацыі ўсіх савецкіх плацдармаў на левым беразе Нёмана. Пры наступленні на поўнач баявая група 3-й тд СС атакавала падраздзяленні савецкай 42-й сд. Пасля атак, якія былі праведзены раніцай, палкі дывізіі зноў перайшлі да абароны. Рэшткі 455-га, 44-ты і 459-ты сп утрымлівалі плацдарм на левым беразе Нёмана ў раёне в. Шэмбелеўцы. Нямецкія танкі, што ўзмацнялі 3-ці батальён 6-га тгр палка СС, выйшлі на камандны пункт 455-га палка каля самай пераправы. Савецкія часці, што засталіся тут, пачалі спешна адступаць за раку Нёман. Усё гэта суправаджалася агнём нямецкіх танкаў і САУ, што стаялі на левым беразе ракі[374]. Магчыма, была знішчана, ці пашкоджана пераправа праз раку, якую будаваў 4-ты ашісб Гв. ппалк. Белаконь. У гэтых баях батальён страціў 3 чалавекі забітымі[375]. Паводле інфармацыі, што прыводзіць Д. Гаўрылін, камандзір дывізіі г.-м. Антон Іванавіч Сліц вымушаны быў данесці камандзіру 69-га ск г.-м. М.М. Мультану, што часці 455-га і 44-га Верхнедняпроўскага сп 42-й сд павінны пакінуць плацдарм. Камандзір корпуса адказаў, што не будзе дакладаць г.-п. І.В. Болдзіну аб несанкцыянаваным адступленні, але толькі з той умовай, што дывізіія верне свой плацдарм да вечара[376]. У дывізіі сабралі ўсіх тылавікоў, аб'ядналі групы салдат, якія адступілі з-за Нёмана, і зноў падрыхтаваліся да фарсіравання. Зенітныя гарматы падцягнулі да самага берага на прамую наводку і адкрылі агонь па немцах, прымусіўшы іх адысці. Пасля таго па супрацьлеглым беразе далі некалькі залпаў рэактыўнымі снарадамі "кацюшы". Ачысціўшы бераг, часткі дывізіі пераправіліся і вярнулі плацдарм каля в. Куколі. Аднак гэтая атака была праведзена ўжо ў другой палове дня, калі баявая група "Кюн" вяла баі ў раёне в. Белыя Балоты – Плябанске. Уздоўж ракі пазіцыі займалі толькі паліцэйскія баявыя дазоры. Таму паўторнае фарсіраванне ракі скончылася паспяхова. Аднак плацдарм, заняты дывізіяй быў невялікім.

Працягваючы наступленне, 3-ці батальён 5-га тгр полка СС атакаваў в. Каўбаскі пры падтрымцы 14 штурмавых гармат. Вёска была занята.

Да канца дня баявая група “Кюн” пры падтрымцы танкаў і штурмавых гармат выйшла ў паўночна ўсходні раён ад в. Белічаны (в. Белыя Балоты – Плябанскіе), паставіўшы пад пагрозу пераправы каля мястэчка Гожа. Трэба адзначыць, што менавіта ў раёне Гожы знаходзіліся ў гэты час галоўныя пераправы 50-й арміі і 36-га корпуса 31-й арміі. Да вечара III/“Т” пераадолеў упартае супраціўленне савецкіх войск каля в. Плябанске. Паводле нямецкіх дадзеных, усе савецкія пераправы насупраць мястэчка Гожа былі заблакіраваны. Аднак цалкам выключыць магчымасці фарсіравання Нёмана савецкімі сіламі эсэсаўцам не ўдалося. 3-ці батальён 6-га тгр палка СС заняў абарону ад Нёмана да в. Войтаўцы, фронтам на поўнач.

Баі групы “Кюн” за савецкія пераправы характарызаваліся напружанасцю і незвычайным накалам. Успаміны мясцовых жыхароў С.Тарасевіча і І.Пушкевіч малююць апакаліптычную карціну баёў у раёне вёсак Беражаны – Шэмбелеўцы – Каўбаскі. Маладыя лясочкі былі быццам брытвай зрэзаны залпамі “кацюш” і нямецкімі бомбамі. Гінула шмат немцаў і савецкіх салдат. Так званы “Крупін роў” пераходзіў з рук у рукі пяць разоў. На гары пад назвай “Бохан” савецкія “кацюшы” накрылі нямецкую пазіцыю. Пасля заканчэння баёў мясцовыя жыхары хавалі загінулых у вялікіх агульных магілах разам з забітай свойскай жывёлай: часу разбірацца не было, стаяла 30-градусная спякота, была сур’ёзная небяспека ўзнікнення эпідэміі. Жыта на некаторых палях прыйшлося спаліць, жаць было немагчыма: праз кожныя два метры траплялісяадарваныя чалавечыя канечнасці і вантробы[377].

І тым не менш немцы не ліквідавалі савецкія плацдармы на левым беразе Нёмана. Вялікую ролю ва ўтрыманні гэтых пазіцый слабымі падраздзяленнямі 42-й сд г.-м. А.І. Сліца адыграў 4-ты асобны знішчальна-супрацьтанкавы дывізіён к-на А.І. Абразцова. Ён заняў абарону каля вышыні 166.0, якая знаходзілася на захадзе ад в. Шэмбелеўцы. Менавіта ім прыйшлося вынесці асноўную частку баёў з нямецкімі танкамі. Варта дадаць, што раніцай ад акружаных на форце № 1 рот 42-й дывізіі на камандны пункт 455-га палка прабіўся камандзір мінамётнай роты ст. лейт. А.А. Шуціхін. Ён паведаміў камандванню пра сітуацыю, у якой апынуліся акружаныя. Але пасля ўсіх падзей гэтага дня ў дывізіі не было сіл на тое, каб злучыцца з акружанымі байцамі л-та М.Г. Падгурскага. Паўстала пытанне аб існаванні самой дывізіі. Да канца дня дывізія займала пазіцыі: 1 км на паўднёвы ўсход ад в. Каўбаскі – Шэмбелеўцы – гай на паўднёвы захад ад Беражанаў.

Акрамя атакі баявой групы “Кюн”, немцы пачалі падрыхтоўку атакі мястэчка Сапоцкін. Мэтай атакі быў удар па акружаным злу-

чэнням 50-й арміі і 3-га Гв.кк. Акрамя таго, падраздзяленні 3-й тд СС павінны былі злучыцца з 5-й тд. Такім чынам лінія фронту групы армій была б узноўлена.

Мястэчка Сапоцкін было самым вялікім населеным пунктам на левым беразе Нёмана. Да 1941 года тут жыло каля 4 тысяч чалавек. Для абодвух ваюючых бакоў мястэчка мела вялікае значэнне. Менавіта праз яго праходзілі дарогі з Гродна ў накірунку Аўгустова і мястэчка Капцёва (сучасны Капчамесціс), гарадоў Ліпск і Беласток. Кантроль над мястэчкам Сапоцкін, т.ч., даў бы немцам магчымасць хутка перакідваць войскі ўздоўж лініі фронту.

У раёне в. Рацічы (на поўдзень ад Сапоцкіна) заняў пазіцыі 3-ці танкавы разведвальны батальён СС пад камандваннем штурмбанфюрара Ліна Масары. На ўзмацненні батальёна былі 4 штурмавыя гарматы. Акрамя гэтага, для падтрымкі атакі яму была дадзена 1-я батарэя 1-га дывізіёна 3-га артпалка СС (6 САУ “Wespe”), а таксама 9 танкаў “Tiger” з 9-й роты 3-го тп СС. З усходняга накірунку, ад в. Каўбаскі падышоў 2-гі батальён палка “Эйке”[378]. Такім чынам немцы задзейнічалі для атакі мястэчка даволі значныя бранятанкавыя сродкі: бронетранспарцёры SdKfz 250/251, StuG III, САУ “Wespe” і цяжкія танкі T-VI.

Абарону мястэчка займалі часці 153-й і, верагодна, 174-й дывізій. На поўнач ад мястэчка абараняліся асобныя падраздзяленні 220-й сд. Каля 8 гадзін раніцы 19 ліпеня пачалася атака м. Сапоцкін. Галоўныя атакі праводзіліся немцамі з поўдня. Разведавальны батальён СС разам з танкамі атакаваў сваім правым крылом у накірунку Сапоцкіна з поўдня, а левым – па лініі в. Галынка – Перстунь супраць пазіцый 153-й сд. Аслабленыя папярэднімі баямі, палкі дывізіі вымушаны былі адысці. Да 10 гадзін раніцы правае крыло эсэсаўскага батальёна выйшла на подступы да мястэчка – на 1 км на поўдзень ад яго.

Астатнія часці батальёна СС і часткі ўзмацнення атакавалі ў паўночна-заходнім накірунку. Атакі в. Галынка васьмю T-IV не далі выніку: эсэсаўцы не змаглі яе ўзяць[379]. Атакі ж в. Перстунь былі больш удалымі. Немцы прараваліся да дарогі Сапоцкін – Ліпск і перарэзалі яе. Падчас адной з атак танк “Tiger” з 9-й роты, які дзейнічаў разам з 3-м разведвальным батальёнам СС, неабачліва падышоў да савецкіх пазіцый без аховы сваёй пяхоты. Савецкімі артылерыстамі ўдалося яго абезрухоміць некалькімі ўдалымі стрэламі. Экіпаж танка паспрабаваў схавацца, але быў захоплены ў палон і расстраляны[380]. Пазней немцам пашчасціла вярнуць танк.

На яшчэ не прыкрыты савецкімі войскамі ўчастак в. Шынкаўцы – Сапоцкін падышлі I/“E” і II/ “E”. Атаку пяхоты падтрымлівалі 3 штурмавыя гарматы. У выніку атакі немцы зянялі в. Васілевічы. Савецкія

падраздзяленні, што абараняліся тут, былі вымушаны адступіць. Баі на подступах да мястэчка працягваліся ўвесь дзень. Толькі пад вечар немцы здолелі прыступіць да штурма самога населенага пункта.

Для атакі Сапоцкіна была арганізавана баявая група штурмбанфюрара СС А. Пітчэліса (камандзір 3-га дывізіёна знішчальнікаў танкаў СС) у складзе:

> 2-й і 3-й рот 3-га танказнішчальнага дывізіёна СС;

> 3-га танкавага разведвальнага батальёна СС;

> 1-га батальёна 6-го тгр палка “Е”;

> танкаў 2-га батальона 3-га тп СС[381].

Атака Сапоцкіна пачалася каля 7 гадзін вечара. Батальён 6-га палка “Е” падышоў да населенага пункта з паўднёвага ўсходу. Адначасова на паўднёва-заходнюю ўскраіну ўвараваліся часці разведвальнага батальёна СС. Падраздзяленні 153-й сд вялі цяжкія стрымліваючыя баі, аднак сілы былі няроўнымі –сказвалася перавага немцаў у тэхніцы. У гэтых баях вылучыўся разлік 76-мм гарматы с-та Я. Няплюхіна. Паводле савецкіх дадзеных, у баі 19 ліпеня ён падбіў 4 танкі і 1 САУ[382]. Каля поўначы немцы ўвараваліся ў мястэчка Сапоцкін. Савецкія войскі былі вымушаны адступаць на поўнач. Немцы ацэньвалі страты савецкіх войск у 340 чалавек. Таксама штурмбанфюрар А. Пітчэліс дакладваў у штаб 3-й тд СС аб захопленых трафеях: 7 – 7,62 см гармат, 6 – 4,7 см супрацьтанкавых гармат, 2 мінамёты, 9 супрацьтанкавых ружжаў.

Немцы, заняўшы мястэчка, адразу ж перакрылі дарогу ў накірунку в. Сонічы (у бок Аўгустоўскага канала), каб перашкодзіць магчымым савецкім атакам з поўначы. Тут заняла пазіцыі 14-я зенітная рота палка “Эйке”.

Камандаванне 3-га Гв. кк у такіх складаных умовах дзейнічала дастаткова аператыўна і правільна. Галоўнай задачай, што стаяла перад корпусам, было забеспячэнне трывалага перыметра абароны вакол практычна абкружаных войск. Асаблівая ўвага надавалася нямецкай пагрозе з поўдня, з боку Ліпска. Некалькі паляпшала становішча корпуса тое, што забалочаныя берагі ракі Бобр прыкравалі гэты накірунак і не дазвалялі немцам аткаваць на шырокім фронце. Праз р. Бобр былі толькі дзве пераправы: масты ў г. Ліпску і ў в. Ястшэмбне І. Кантралюючы гэтыя два масты, можна было не асцерагацца за паўднёвы накірунак. 5-я Гв. кд пакінула толькі заслоны з боку Аўгустова. Асноўныя сілы яна адвяла да Ліпска. Разгарнуўшы іх на мяжы в. Валкоўня – Ястшэмбна – Астроў фронтам на поўдзень. 17-ты Гв. кп заставаўся на пазіцыях у раёне в. Ястшэмбна І і ІІ. 32-я Смаленская кд заняла пазіцыі ў раёне вышыні 137,4, а часткай сіл 86-га кп – раён горада Ліпска. 6-я кд, таксама пакінуўшы заслоны каля




**19 ліпеня 1944г. Савецкі плацдарм на левым беразе Нёмана**

Аўгустова, адступіла на ўсход. На працягу дня 23-ці Гв.кп вёў баі ў р-не в. Выжарне. У гэтых баях былі забіты 14 кавалерыстаў[383]. На баявых пазіцыях каля Аўгустова заставаліся і дывізіёны рэактыўнай артылерыі (21-шы і 351-шы). У выніку абстрэла горада былі падпалены склады з боепрыпасамі і рассеяны нямецкія часці. Ужо пачаў сказвацца недахоп паліва і боепрыпасаў для аўтамабіляў. Таму гвардзейскія мінамёты былі абмежаваны ў манёўры.

19 ліпеня разгарэліся рашучыя баі за г. Ліпск. 1-шы батальён 5-га палка СС "Туле" пасля заняцця горада атрымаў загад наступаць на поўнач. Аднак гэтыя атакі былі спынены падраздяленнямі 3-га Гв. кк па лініі Кур'янка – Астроў (што, дарэчы, прызналі і немцы). Батальён

быў вымушаны заняць абарону на поўнач ад Ліпска. У другой палове дня 6-я Гв. Кд сумесна з 86-ым кп 32-й кд выбіла немцаў з горада. Немцы адкаціліся на поўдзень і арганізавалі абарону па р. Бобр, захоўваючы кантроль над мастом праз раку[384].

Савецкім камандваннем рабіліся спробы ўзмацніць плацдарм у Занёманскім фарштаце і поўнасцю заняць горад Гродна. Для гэтага салдаты 290-й сд г.-м. І.Г. Гаспарана спрабавалі фарсіраваць раку Нёман па фермах узарванага чыгуначнага маста. У той жа дзень роты 878-га палка, якія абараняліся на левым беразе Нёмана ў фарштаце, пачалі атаку з мэтай заняць чыгуначную станцыю Ласосна. Савецкія войскі атакавалі ўздоўж чыгуначнага палатна ў паўднёвым накірунку. У выніку гэтай атакі яны захапілі раён гарадскіх прадмесцяў каля Уладзімірскай царквы (зараз у межах горада).

Для контратакі немцы прыцягнулі 3-ці дывізіён 3-га артпалка СС і часці 3-га сапёрнага батальёна СС (2-я і 3-я роты)[385], што выступілі з раёна в. Калбасіно. На гэтым накірунку ім удалося стрымаць савецкія атакі. У ноч на 20 ліпеня немцы падарвалі фермы чыгуначнага маста, каб выключыць далейшае ўзмацненне савецкіх частак на гэтым плацдарме.

Баі 19 ліпеня паказалі, што падраздзяленням 50-й арміі і 3-га Гв. кк не хапала ўласных сіл для таго, каб узяць ініцыятыву ў свае рукі. Атакі 69-га ск, пачатыя раніцай не далі ніякіх вынікаў. Дывізіям 69-га ск так і не ўдалося злучыцца. 3-ці Гв. кк таксама працягваў заставацца ў акружэнні. Войскі дзейнічалі без узаемадзеяння паміж сабой. Нямецкія пазіцыі атакавалі толькі слабыя палкі 42-й і 95-й сд. У той жа час 153-я дывізія і 3-ці Гв. кк не атакавалі насустрач, таму што не ведалі пра планы штаба 50-й арміі. Немцы дасягнулі значных поспехаў, узяўшы мястэчка Сапоцкін. Баявая група "Кюн" таксама дзейнічала даволі ўдала. Яна знішчыла плацдармы 95-й і 42-й дывізій. Аднак немцам проста не хапала сіл для кантролю левага берага Нёмана. Таму пасля таго як баявая група працягвала наступленне на поўнач, савецкія падраздзяленні зноў вярталі свае плацдармы. Паліцэйскія батальёны не былі ў стане перашкодзіць ім у гэтым.

Зыходзячы з вынікаў баёў 19 ліпеня, г.-п. І.В. Болдзін вырашыў не прадпрымаць ***20 ліпеня*** рашучых дзеянняў і прывесці злучэнні арміі ў парадак. Наступленне ён планаваў пачаць 21 ліпеня. Аднак гэтыя планы камандуючага не былі рэалізаваны. Арміі не далі перадышкі. Штаб 2-га Беларускага фронту загадаў працягнуць атакі і ў наступны дзень. Ужо ў 3.20 ночы 20 ліпеня г.-п. І.В. Болдзін аддаў загад:

- *69-ты ск павінен перайсці ў наступленне з двух накірункаў: 153-я сд – з раёна на паўночным усходзе ад Ліпска на ўсход у накірунку в. Навумавічы, а 330-я сд –*

*з поўначы ў паўднёвым напрамку, таксама ў накірунку в. Навумавічы для злучэння са 153-й сд;*

- *95-я сд 81-га ск павінна перайсці ў наступленне злева ад 69-га корпуса. У выніку часці 3-й тд СС з падраздзяленнямі ўзмацнення павінны трапіць у акружэнне ў раёне Лойкі – Сапоцкін;*
- *90-я сд 81-га ск – да канца дня павінна авалодаць усёй Занёманскай часткай горада Гродна*[386].

42-я сд у адпаведнасці з загадам павінна была сваімі актыўнымі дзеяннямі дапамагчы 330-й сд, якой належыла фарсіраваць Нёман. На працягу начы ўсе дывізіі павінны былі правесці разведку нямецкіх сіл, што знаходзіліся перад іхнімі баявымі парадкамі. 324-я сд была паднята па трывозе, тэрмінова сканцэнтравалася ў раёне Гожа – Пальніца і таксама падрыхтавалася да фарсіравання Нёмана.

Тым часам у 50-ю армію працягвалася перакідка падмацаванняў і частак узмацнення. Так, арміі былі дадзены: 1-шы і 2-гі дывізіёны 144-й пабр, 1699-ты кап, 1484-ты зянітны ап (знаходзіўся на маршы і хутка павінен быў падысці), 1902-гі сап, 23-я Гв. атбр і 233-ці атп[387]. Застаецца толькі адзначыць, што ўсе гэтыя меры павінны былі быць праведзены штабам 50-й арміі яшчэ некалькі дзён таму. Гэта дазволіла б пазбегнуць вялікіх стратаў у дывізіях і прадухіліць нямецкі контрудар сіламі 3-й тд СС.

Немцы, пасля напруджаных баёў 16 – 19 ліпеня, маглі падвесці вынік дзеянню сваіх падраздзяленняў. На 20 ліпеня, паводле паведамленняў штаба 3-й тд СС, у яе падраздзяленнях налічвалася: 17 танкаў T-IV, 9 танкаў T-VI (ёсць інфармацыя, што 9-я цяжкая рота 3-га тп СС страціла 19 ліпеня 5 танкаў T-VI “Tiger”; такім чынам колькасць спраўных машын раўнялася толькі 4 танкам[388]), 36 StuG, а таксама 17 супрацьтанкавых гармат, 38 гаўбіц у 3-ім артылерыйскім палку СС.

За час баёў з прычыны баявых пашкоджанняў альбо паломак патрабавалі рамонта 3 T-IV, 1 T-VI “Tiger” і 8 штурмавых гармат[389]. Акрамя таго, у рамонце знаходзіліся: 8 T-IV і 3 штурмавыя гарматы.

Нямецкая абарона на плацдарме раніцай 20 ліпеня выглядала наступным чынам: у Занёманскім фарштаце абарону трымалі рэшткі 22-га і 2-га палп СС. 1-шы батальён 17 паліцэйскага палка СС кантраляваў бераг ракі ў раёне вёсак Ласосна – Пышкі. Далей на поўнач размяшчаўся 1-шы батальён 34-га паліцэйскага стралковага палка. У раёне в. Баля-Сольная – Беражаня абараняўся 1-ы батальён 4-га палп СС (яшчэ два батальёны знаходзіліся ў рэзерве). Да в. Белыя Балоты па цячэнні Нёмана размяшчаўся 2-гі батальён 6-га палка СС.

Страты ў паліцэйскіх палках групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга былі настолькі вялікія, што для немцаў усур'ёз паўстала пытанне пра тое, ці змогуць яны вытрымаць новыя атакі савецкіх сіл. У ранішнім данясенні ў штаб 4-й арміі начальнік штаба групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга безапеляцыйна паведамляў: "... пазіцыі па абодва бакі Гродна без перакідкі новых сіл утрымаць немагчыма..."[390]

20 ліпеня немцы вырашылі скончыць з савецкімі байцамі, што засталіся ў акружэнні на форце у в. Загараны. Л-ты Мікалай Генрыхавіч Падгурскі і камандзір мінамётнага ўзвода Андрэй Іванавіч Шыпееў ізноў арганізавалі абарону. Аднак цяпер яна была ўжо малаэфектыўнай. Радыёстанцыя была выведзена са строю, скончыўся недатыкальны запас, скончваліся боепрыпасы. Малая колькасць салдат не дазваляла заняць перыметр абароны форта. Тым не менш, байцы змагаліся да апошняга.

Для штурму ўмацаванняў немцамі зноў была прыцягнута 16-я рота сапёраў СС. Сухія і лаканічныя ўспаміны ветэранаў СС, што прыводзіць нямецкі даследчык В. Ваперсаль, паказваюць нам апошнія гадзіны абароны ўмацаванняў форта савецкімі салдамі: "Мы падкатваем бочкі з бензінам (прыкладна 2000 л) да доўгатэрміновых умацаванняў, выліваем іх змесціва ў трохпавярховую пабудову бункера і падпальваем яго. Мы спадзяёмся, што агнём прымусім рускіх здацца ў палон. Аднак гэтага недастаткова! Толькі некалькі чырвонаармейцаў здаюцца, астатнія трымаюцца. Як толькі мы аказваемся ў сярэдзіне, зноў грымяць стрэлы. Тут дапамагаюць толькі ручныя гранаты. Я бяру некалькі і кідаю іх уніз: пасля выбуху я чую хрыпы і енкі. Хайнц Б., ...Ібальд, Шрэдар і Баер спяшаюцца мне на дапамогу. Мы вызваляем верхні паверх. Але далей справа не ідзе. Вонкі з бункера! Мы запасаемся толавымі шашкамі, каб выкурваць бункер далей... Рускія апамяталіся ад першага шоку і занялі абарону. Цяпер нам ужо цяжка трапіць у бункер зноў. Наша добрая і жорсткая падрыхтоўка служыць нам добрую службу. Мы спускаемся на самы ніжні паверх і кідаем некалькі шашак. Такім жа чынам мы аглядаем сярэдні паверх і выходзім зноў на паветра. Аднак рускі гарнізон не здаецца. Гэта ўпартыя і жорсткія хлопцы. Мы ўваходзім яшчэ раз у бункер і просім абаронцаў здацца, палонны Іван перакладае. У адказ рускія застрэлілі свайго таварыша. Баі вакол умацаванняў бункера разгараюцца зноў..."[391]

Паводле нямецкіх дадзеных, штурм умаванняў форта №1 скончыўся да двух гадзін дня: "...Мы захапілі 15 мінамётаў і некалькі супрацьтанкавых пушак. 40 забітых і прыкладна 30 параненых – гэта страты ворага..." – адзначаюць удзельнікі ўзяцця фарта[392].

Толькі 8 салдат з гэтай апошняй групы абаронцаў здолелі вырвацца з форта. Да падыходу савецкіх чатсак іх хаваў жыхар вёскі Салаўі Б.П. Якуцэвіч. Застаўшыяся на форце л-ты М.Г. Падгурскі і А.І. Шыпееў застрэліліся, выбраўшы смерць замест ганебнага палона. Абодва яны пакінулі паслясмяротныя запіскі. Л-т М.Г. Падгурскі напісаў у ёй (асаблівасці правапісу захаваны):

*"Тварышы*
*Хто знойдзе нас*
*нежывымі дык ведайце*
*што мы загінулі сумленна*
*як належыць байцам*
*Чырвонай арміі*
*Абараняючы гонар і*
*незалежнасць нашай радз...*
*СМЕРЦЬ нямецкім*
*акупантам!*
*адпомсціце за нас Тава...*
*л-т Падгурскі"*[393].

Л-т Андрэй Іванавіч Шыпееў напісаў алоўкам на вокладцы "Баявога статута пяхоты РСЧА":

*"Шорцы ворагу жывымі не здаюцца.Няхай у Шорыі даведаюцца, як умеюць змагацца і паміраць афіцэры-шорцы!"*[394]

Акрамя гэтых афіцэраў у форце загінуў камандзір роты л-т М.А. Мірашнічэнка, Гэтым скончылася гераічная абарона форта №1. На месцы гэтых баёў зараз стаіць манумент, прысвечаны загінулым салдатам і афіцэрам 42-й сд, якія да канца выканалі свой абавязак перад сумленнем і Радзімай і паказалі цуды гераізму.

А зараз разгледзім, як праходзілі баявыя дзеянні ў раёне м. Сапоцкіне. Група штурмбанфюрара А. Пітчэліса, якая напярэдадні паспяхова правяла атаку м. Сапоцкін, з раніцы спрабавала прасунуцца далей на поўнач да Аўгустоўскага канала. Гэтыя атакі павінны былі прывесці да злучэння з 5-й тд. Група нанесла ўдар уздоўж дарогі ў накірунку в. Сонічы. Немцы занялі фальварак Асочнікі, аднак іх прасоўванне па лясной дарозе ў паўночным накірунку сутыкнулася з супраціўленнем савецкіх войск, што набірала сілу (падраздзяленні савецкіх 220-й і 174-й сд). Да 14.00 немцы выйшлі да в. Новікі – Сонічы.

У другой палове дня 3-ці танкавы разведвальны батальён СС (група штурмбанфюрара А. Пітчэліса), узмоцнены штурмавымі гарматамі, нанёс удар па пазіцыям падраздзяленняў 153-й сд на паўднёвы захад ад Сапоцкіна. Паводле ўспамінаў ваеннага перакладчыка з 153-й сд С.М. Вернікава, 20 ліпеня на плацдарме працягваліся моцныя нямецкія атакі. На дарозе, што вяла ў накірунку Ліпска, было падбіта 10 з 30 нямецкіх танкаў, якія атакавалі савецкія пазіцыі (колькасць атакаваўшых і падбітых танкаў, канечне ж, значна перабольша-

на). Астатнія танкі павярнулі назад. Экіпажы двух з іх былі захоплены ў палон[395]. Аднак ў той жа дзень часці 153-й сд і 210-га інжынерна-сапёрнага батальёна адступілі пад ударамі немцаў, пакінуўшы вёскі Доргунь, Пралейкі, Галынку і Рыгалаўку[396]. Кола вакол акружаных падраздзяленняў звузілася. Далейшае наступленне немцаў спынілі прыдадзеныя 153-й дывізіі 141-шы і 144-ты знішчальна-супрацьтанкавыя палкі 4-й знішчальна-супрацьтанкавай брыгады. Да канца дня дывізія займала пазіцыі: Ліпск – Дулькаўшчына – Сёлка – Ліхасельцы – на захад ад в. Галынкі, расцягнуўшы баявыя парадкі ўздоўж дарогі Гродна – Аўгустоў фронтам на поўдзень і на ўсход. Такім чынам, наступленне 153-й дывізіі ў накірунку в. Навумавічы было сарвана нямецкімі атакамі, ды і сіл у дывізіі для яго не было.

Насустрач групе штурмбанфюрара А. Пітчэліса рваліся танкі 5-й тд. Стварылася рэальная пагроза поўнага акружэння частак 3-га Гв.кк, 153-й і 174-й сд[397]. 5-я нямецкая тд, паводле савецкіх дадзеных, праводзіла атаку сіламі да 2 палкоў, якія падтрымліваліся танкамі. Безумоўна, гэтыя дадзеныя не адпавядаюць рэчаіснасці. 5-я тд не магла вылучыць для атакі Сапоцкіна амаль ўсе свае сілы – дывізія складалася толькі з 3-х палкоў. Атаку праводзіла два батальёны пры падтрымцы танкаў.

Савецкімі войскамі баі вяліся ў надзвычай цяжкіх умовах. 174-я сд знаходзілася ў пушчы на поўначы ад Аўгустоўскага канала. Яе палкі спрабавалі контратакаваць падраздзяленні 5-й тд. Яны перайшлі дарогу в. Францкі – Становіско і сутыкнуліся з баявой групай немцаў (2-гі батальён 13-га тгп, 1-шы батальён 14-га тгп і частка 1-га батальёна 31-га тп). У сустрэчным баі немцы адкінулі савецкія часці на 5 км ў раён ф. Хеленова – в. Дворчыско. Немцы страцілі пры гэтым два сярэдніх танка T-V "Panther"[398]. Пасля гэтага нямецкае наступленне працягвалася далей. У выніку нямецкіх удараў з паўночна-заходняга накірунку яны выйшлі да в. Калеты (на адлегласць 3 км ад яе). Такім чынам, калідор паміж дзвюма нямецкімі атакуючымі дывізіямі (3-й тд СС і 5-й тд) звузіўся да 6-7 км. 86-ты танкавы сапёрны батальён 5-й тд выйшаў да Аўгустоўскага канала ў раёне в. Мікашоўка (у 18 км на паўночны захад ад Сапоцкіна). Гэтым немцы перарэзалі дарогу, якая вяла ўздоўж Аўгустоўскага канала – асноўны шлях камунікацыі савецкіх падраздзяленняў.

Абарончыя баі за в. Калеты вёў 660-ты артылерыйскі полк 220-й сд. Сама вёска была добра ўмацавана акопамі і хадамі камунікацыі (нават падземнымі). Выбіўшы немцаў, тут замацаваліся савецкія артылерысты. У першай жа атацы 5-й тд у накірунку в. Калеты ўдзельнічалі 3 нямецкія танкі. Яны наступалі ў вёску з-за ракі Шляміца. Танкі павінны былі прайсці па драўляным мосціку праз раку, які абаронцы не паспелі ўзарваць. Убачыўшы гэта, пад мост

кінуўся баец Калатушкін і змог пашкодзіць яго апору. Мост абваліўся, ледзь толькі на яго ўехаў нямецкі танк[399]. За гэты час разгарнулася для адкрыцця агню батарэя ст. л-та Г. Скварцова. Трапным агнём батарэя падбіла танкі. На наступны дзень Скварцоў падбіў 1 САУ[400]. Артылерысты ўтрымалі вёску, не даўшы немцам злучыцца. Тут застаўся толькі невялікі калідор, што злучаў часці 3-га Гв. кк і тылы 50-й арміі.

Для ўзмацнення паўночнага фронту камандаванне 3-га Гв. кк адразу ж перакінула сюды 6-ю кд, што разгарнулася па Аўгустоўскім канале ў раёне в. Мікашоўка. Так 23-ці Гв. кп заняў абарону каля самай вёскі. На працягу 21-26 ліпеня ён вёў баі на гэтым рубяжы. 25-ты Гв. Апшэронскі полк таксама прыкрываў адзіную дарогу, што звязвала кавалерыйскі корпус з пераправамі. Дарога прастрэльвалася немцамі з абодвух бакоў (і 86-ым танкавым сапёрным батальёнам 5-й тд, і падраздзяленнямі 3-й тд СС). 3-ці Гв. кк усё так жа заставаўся ў акружэнні паміж гарадамі Аўгустоў – Ліпск – м. Сапоцкін.

Сувязі з пяхотнымі падраздзяленнямі 50-й арміі на плацдарме ў акружаных дывізіях кавалерыі не было. Так для наладжвання сувязі са штабам 50-й арміі камандванне кавалерыйскім корпусам накіравала 20 ліпеня да ракі Нёман афіцэра сувязі 6-й Гв. кд л-та Джанду Чамаева. Выкарыстаўшы бронеаўтамабіль, група лейтэнанта прарвалася да р. Нёман. Л-т Д. Чамаеў замаскіраваў машыну на беразе і пераплыў раку. Пакет з дакументамі быў дастаўлены ў штаб 50-й арміі. Пры вяртанні ў штаб кавалерыйскага корпуса лейтэнант быў паранены.

Наогул сітуацыя ў акружаным кавалерыйскім корпусе заставалася вельмі складанай. Уяўленне аб ёй даюць успаміны М.П. Брыкель, лейтэнанта медыцынскай службы 3-га медыцынскага санітарнага эскадрона 6-й кд: “Крыху супакойвала тое, што раён акружэння быў вялікі і не прастрэльваўся наскрозь. У нас раненых было шмат, колькасць іх з кожным днём расла. Эвакуіраваць няма куды – вазілі з сабой. Наш санэскадрон пераўтварыўся ў шпіталь на колах. Прааперыраваных, “цяжкіх” стараліся адпраўляць самалётам, які прарываўся па начах з харчаваннем і боепрыпасамі. (*У якасці сувязі з “Вялікай зямлёй” выкарыстоўваўся часовы лясны аэрадром, на які сядалі самалёты У-2* – Д.Л.) Пасадачную пляцоўку старанна ахоўвалі, але часам прасочваліся нямецкія аўтаматчыкі. Не хапала харчавання, паліва, боепрыпасаў. Елі лясныя ягады: чарніцы, брусніцы – тут іх было багата. Усе хадзілі з чорнымі ротамі ад чарніцаў”[401]. Можна толькі здзіўляцца мужнасці дзяўчат, якія ў неверагодна цяжкіх умовах выконвалі свой абавязак.

Асабліва не хапала боепрыпасаў. У 3-ім Гв. кк да гэтага моманту заставалася да 0,5-0,13 боекамплекта і паліва[402]. Падвоз боепрыпасаў

быў магчымы альбо шляхам абыхода Сапоцкіна з поўначы (па дарозе ўздоўж канала), альбо па паветры. Савецкія артылерысты знайшлі арыгінальны выхад з гэтага становішча. Яны папаўнялі боезапас снарадаў, знойдзеных у савецкіх ДАК-ах, якія былі пабудаваны тут яшчэ ў 1940-41 гг[403]. Аднак гэта было толькі часовым выйсцем і не магло вырашыць праблемы недахопу боеприпасаў.

З поўдня немцы атакавалі пазіцыі 24-га Гв. кп (Гв. ппалк. П.Ф. Ткаленка) 5-й Гв. кд каля в. Ястшэмбны І. Тут 19 ліпеня, узнавіўшы чыгуначны мост, яны фарсіравалі раку Бобр і размясціліся каля паўднёвай ускраіны вёскі. З раніцы 20 ліпеня пачаліся нямецкія атакі. Кавалерысты сустрэлі іх агнём. Камандзір мінамётнага ўзвода агітатар 24 Гв. кп старшына Д.І. Вадзінскі ўзгадваў гэты бой: "Нарэшце, немцы наблізіліся да запаветнай мяжы, першы ланцуг пераходзіць на бег. 2-я батарэя старшага лейтэнанта Гарабчука адкрывае агонь чэргамі па восем снарадаў. Тэмп агню гранічны: не менш за 15 стрэлаў з адной гарматы. Снарады кладуцца дакладна па цэлі. Усё поле пакрывалася разрывамі. А тэлефаністы толькі паўтараюць: "Агонь! Агонь!" Добра вядуць агонь палкавыя артылерысты і мінамётчыкі. І вось варожыя ланцугі перамяшаліся, замітусіліся па полі, пабеглі назад. А артылерысты і мінамётчыкі суправаджаюць іх бег агнём да самага сяла. У той дзень атакі праціўніка паўтараліся сем разоў"[404]. Становішча ў палку было вельмі сур'ёзным: не хапала боепрыпасаў, страты дасягалі паловы асабістага складу. Фактычна 2-я артылерыйская батарэя была адзіным агнявым сродкам кавалерыйскага палка. Тым не менш, на працягу двух дзён 24-ты Гв. кп адбіваў атакі на гэтым рубяжы. Артылерысты 2-й батарэі не страцілі ні аднаго чалавека пад час трохдзённых баёў.

У ноч на 20 ліпеня падраздзяленні 121-га кп атакавалі баявую ахову 1-га батальёна 5-га тгр СС палка па лініі р. Бобр. Высунутыя наперад нямецкія дазоры былі цалкам знішчаныя моцным артылерыйскім агнём кавалерыі. Развіваючы атаку, кавалерысты 3-га Гв. кк захапілі мост праз раку на поўдзень ад Ліпска. Немцы контратакавалі і зноў змаглі выйсці да ракі, дзе былі спынены артылерыйскім агнём савецкіх частак[405]. Іх надзеі вярнуць Ліпск цалкам праваліліся.

З заходняга кірунку, ад Аўгустова, перайшла ў наступленне нямецкая 337-я баявая група. Кавалерысты Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскага пакінулі прадмесці горада і адступілі ўздоўж канала на ўсход. Нямецкая група заняла в. Ястшэмбна ІІ. З раёна г. Аўгустова немцы нанеслі ўдар сіламі баявой групы 19-й тд. Баявая група Бейера з'яўлялася найбольш укамплектаванай часткай танкавай дывізіі. Яна была перакінута ў г. Аўгустоў з г. Арыса (сучасны горад Ожыш на




**20 ліпеня 1944г. Плацдарм на левым беразе Нёмана. Атака нямецкай 5-й тд**

паўночным усходзе Польшчы за 60 км на захад ад Аўгустова) яшчэ 19 ліпеня і сканцэнтравалася ў якасці рэзерва для нанясення контрудару ў заходнім накірунку. Да раніцы 20 ліпеня ў складзе баявой групы былі гатовы да выкарыстання:

> 2/Pz. AA 19 (3 бронеаўтамабілі і 28 бронетранспарцёраў SdKfz 250, 251) – к-н Фэўхцінгер

> 8-я рота 27-га тп (11 Т-IV).

Наконт колькасці танкаў у складзе баявой групы Бейера ёсць іншае меркаванне. Так, балгарскі гісторык К. Невенкін лічыць, што ў складзе баявой групы на той момант было 38 Т-IV,[406] а Р. Хінцэ – 12 Т-IV[407]. Акрамя гэтага, у раёне Аўгустова сканцэнтраваўся 20-ы разведвальны танкавы батальён капітана фон Ханікена з 20-й тд, перакінуты сюды па чыгунцы з Германіі. Батальён з'яўляўся мабільным рэзервам групы армій "Цэнтр". Гэтае падраздзяленне не ўдзельнічала ў баях на Беларусі пад час аперацыі "Баграціён"[408]. Усе вайсковыя злучэнні ў раёне Аўгустова падпарадкоўваліся 337-й баявой групе (польскі даследчык Роберт Урублеўскі называе яе "групай г.-м. Лінгмана")[409].

Г.-ф. В.Модэль аддаў загад аб ужыванні 19-й тд для ачышчэння ад савецкіх войскаў тэрыторыі паміж гарадамі Аўгустоў і Гродна. Першую атаку баявая група дывізіі павінна была нанесці ў накірунку Ліпска, уздоўж дарогі Аўгустоў – Гродна. Нямецкая атака праводзілася проста па дарозе, бо навакольная мясцовасць не спрыяла ўжыванню танкаў і іншай бранятэхнікі. Навакольныя балоцістыя тэрыторыі не давалі ніякай магчымасці для манёўра ні аднаму з бакоў. Надвор'е спрыяла нямецкай атацы – быў ясны і цёплы дзень.

Першае сутыкненне баявой групы з савецкімі падраздзяленнямі адбылося каля р. Лебядзянка. Нямецкі даследчык Рольф Хіцэ сцвярджае, што з'яўленне нямецкіх танкаў выклікала паніку ў савецкіх падраздзяленнях. Сутыкнуўшыся з атакуючымі нямецкімі танкамі, савецкія войскі (верагодна, падраздзяленні 3-га Гв. кк) былі адкінуты. Іх спробы разгарнуцца і заняць абарону былі немагчымы з-за багны, якая акружала дарогу. Паводле інфармацыі нямецкіх крыніц, пад час гэтай атакі група 19-й тд таксама разграміла і скінула ў балота савецкае артылерыйскае падраздзяленне ў раёне в. Грушкі[410]. Баявая група ўсё ж была спынена ў гэтым раёне і не дайшла да Ліпска. Прыведзеная ў кнігах Рольфа Хінцэ інфармацыя пра атаку баявой групай 19-й тд горада Ліпск, заняцця яго, а таксама нават Занёманскага фарштата ў горадзе Гродна (!) ў другой палове дня 20 ліпеня і захопе там да 180 савецкіх танкаў[411] не адпавядае рэчаіснасці і з'яўляецца плодам фантазіі аўтара. Частка сіл 2-й роты PzAA 19 правяла разведку дарогі з Аўгустова ў паўночна ўсходнім накірунку. Дарога не была занята савецкімі войскамі.

Па распараджэнні штаба групы армій "Цэнтр" у 22.00 баявая група Бейера перадавался ў падпарадкаванне 4-й нямецкай арміі. У камандаванне апошняй з 19 ліпеня ўступіў г.-пех. Ф. Хосбах. Камандванне арміі змяніла задачу баявой групе Бейера. Увечары група атрымала загад выйсці з бою і пачаць перадыслакацыю праз горад Асавец, мястэчка Дамброва Беластоцкая ў раён на паўднёвы захад ад Ліпска. Разам з 20-м танкавым разведвальным батальёнам група павінна была ўзмацніць падраздзяленні обергрупэнфюрара К. фон Готберга і чакаць тут прыбыцця астаніх падраздзяленняў 19-й тд[412].

Толькі ў другой палове дня ініцыятыву на плацдарме перахапілі савецкія войскі. Згодна з загадам перайшлі ў наступленне дывізіі 69-га ск 50-й арміі г.-п. І.В. Болдзіна. Наступленне павінна было пачацца каля 10 гадзін раніцы. Аднак пачалося пазней. Затрымка з атакай тлумачыцца супраціўленнем немцаў на левым беразе. Я.П. Елісееў піша пра атакі групы "Ангальт" (4-га, 17-га палп СС і 34-га палсп) пры падтрымцы 3-й сд СС – больш за 80 танкаў і САУ[413]. Магчыма таксама, што затрымка атакі была звязана з фарсіраваннем Нёмана 330-й сд. Паводле нямецкіх дадзеных, яно пачалося толькі каля 13.00. Дывізія рыхтавалася да пераправы яшчэ 19 ліпеня. Яе падраздзяленні панеслі страты ў раёне в. Зарыца. Толькі пасля адбіцця нямецкіх атак, 330-я сд распачала фарсіраванне Нёмана ў раёне на поўнач ад м. Гожа.

Згодна нямецкім дакумантам, у гэты час фарсіраванне ракі прадпрымалася на шырокім фронце ад в. Пышкі да в. Каўбаскі (падраздзяленні 81-га і 69-га ск). Адзін з нямецкіх салдат узгадваў фарсіраванне Нёмана савецкімі войскамі на гэтым участку: "У раёне на захад ад ракі быў адкрыты забойчы агонь. Падобна, што сілуэты надломленых ствалоў і расстраляныя дамы стаяць у дрыжачым зарыве разрываў гранат. Асобна гараць хлявы і стагі сена. Над усім гэтым бушуе злавесны гул бітвы, паветра і зямля ўздыгваюць. Паступова рускія пераносяць артылерыйскі агонь у наш глыбокі тыл. Для нас гэта быў знак да павышанай увагі. Назіральнік адразу ж паведамляе: "…вораг перапраўляецца і атакуе..!" Адразу ж пачынаюць грукатаць кулямёты, якія размешчаны злева і справа ад нас. Я аддаю майму радысту Карлу … загад: "Адразу агонь па Берце (*умоўная назва арыенціра – Д.Л.*): праціўнік атакуе…" Карл паўтарае адзін раз, два. Нарэшце, на супрацьлеглым канцы провада зразумелі. Там раздаецца: "Агонь!" І вось ўжо нашы гранаты ляцяць над намі. Агонь вядзецца дасканала. Цяпер Іваны перапраўляюцца праз раку злева ад нас. Я гляджу на карту. Новы загад: "Агонь па Эмілю – 200 м – паведміць пра гатоўнасць!". Карл крычыць мне: "Якаў гатовы да адкрыцця агню! Агонь!" І зноў свісцяць нашыя гранаты. Залпы паўтараюцца некалькі разоў… Затым варожая артылерыя зноў абстрэльвае нашу тэрыто-

рыю. Гэта добры знак – значыць, Саветы адвядуць назад сваю пяхоту, калі гэта яшчэ магчыма. Мы чуем ад паліцэйскіх, што на ўсходнім беразе ляжаць 13 расстраляных намі надуўных лодак"[414].

Разам з 330-й і падраздзяленнямі 42-й сд уступілі ў бой шматлікія часці ўзмацнення артылерыі і сапёраў. Так у бой былі ўведзены:

> 4-я знішчальна супрацьтанкавая асобная брыгада (без 141-га і 144-га зстап)

> 81-шы і 85-ты гаўбічныя артылерыйскія палкі (на ўзбраенні 122-мм гаўбіцы)

> 544-ты і 481-шы мінамётныя палкі,

> 89-ты, 100-ты Гвардзейскія мінамётныя палкі (на ўзбраенні рэактыўныя ўстаноўкі БМ-13)

> 1-шы дывізіён 5-й зстабр,

> 1-шы дывізіён 144-й гаўбічнай артылерыйскай брыгады

> 1444-ты сап

> 2-гі і 6-ты Гв. ашісб[415].

Такой канцэнтрацыі артылерыі на плацдарме яшчэ не было. На жаль, усе гэтыя часці не ўдалося пераправіць своечасова і сканцэнтраваць на галоўных накірунках наступлення савецкіх войск. Пераправа іх на левы бераг Нёмана здзяйснялася на працягу ўсяго дня, адпаведна і ў бой яны ўводзіліся па чарзе, што зніжала эфектыўнасць іх выкарыстання.

Апоўдні па пазіцыях 1-га батальёна 4-га палп СС на поўнач ад в. Пышкі (хутчэй за ўсё, з пераправы каля в. Куколі) нанеслі ўдар савецкія часці 42-й сд. Згодна нямецкай інфармацыі ў атацы ўдзельнічала да 1500 чалавек. Іх падтрымлівалі 7 танкаў (хутчэй за ўсё гэта былі СУ-76 са 1444-га сап). Яны праравалі баявыя парадкі паліцыі, працягнулі наступленне ў накірунку в. Баля-Касцельная і занялі вышыні 166.0 і 167.0 на паўночны ўсход і на поўнач ад вёскі.

Адначасова моцныя ўдары савецкіх сіл былі нанесены батальёнамі 330-й сд з поўначы ў накірунку в. Васарабы (заходняя ўскраіна в. Лойкі). Перад атакай палкі займалі пазіцыі ўздоўж дарогі па вёсках Шынкаўцы – Белічаны – Белыя Балоты. Аднак дывізія пераправілася праз Нёман без артылерыйскага ўзмацнення і дастатковай колькасці супрацьтанкавых сродкаў. Таму першыя яе атакі не мелі поспеху. Супраціўленне немцаў ўдалося пераадолець толькі пасля падыходу 81-га і 85-га Гвардзейскіх гаўбічных артылерыйскіх палкоў.

330-я дывізія, згодна загаду камандуючага фронтам, павінна была заняць пазіцыі на паўночны-захад ад в. Беражаны (у раёне в. Навасады – знаходзіцца на поўдні ад Сапоцкіна) і нанесці ўдар у на-

прамку в. Багатыры Польныя. Аднак пасля пераправы праз Нёман палкі дывізіі ўступілі ў бой на поўнач ад в. Каўбаскі[416]. Такім чынам, загад камандуючага выкананы не быў і запланаваны ўдар дывізіі па прарыву да акружаных падраздзяленняў арміі сарваўся.

Падраздзяленні 330-й сд, а таксама мінамётныя часці ўзмацнення і 1902-гі сап (?) у 16.00 гадзін паўтарылі атакі на фронце шырынёй 17 км[417]. У выніку гэтых атак савецкім войскам удалося дасягнуць поспехаў. Нямецкая лінія абароны 3-га батальёна 6-га тгр палка СС была прарвана ў раёне в. Войтаўцы[418]. Пры гэтым каля вышыні 165.7, якая знаходзілася на поўдзень ад в. Белыя Балоты, была акружана 11-я рота батальёна СС. Палкі 330-й сд, прасоўваліся наперад і выйшлі на лінію: вышыня 165,7 – на поўнач ад в. Лойкі – Васарабы. Як відаць, падцягнутыя часці ўзмацнення, а таксама ўвод у бой новых сіл адыгралі сваю станоўчую ролю.

Прарыў нямецкай лініі фронту мог прывесці да злучэння савецкіх частак на плацдарме з дывізіямі, акужанымі ў трохкутніку Сапоцкін – Ліпск – Аўгустоў. У гэтай сітуацыі немцы былі вымушаны тэрмінова атакаваць часці 330-й сд, якія прарвалі фронт. Існаванне прарываў прымусіла б немцаў адступаць.

Для контратакі была прыцягнута баявая група штурмбанфюрара А. Пітчэліса (без SS-Pz. AA 3 і I/“E”). Яна выступіла з раёна мястэчка Сапоцкін. Спачатку яна павінна была вызваліць акружаную 11-ю роту СС. Пасля таго, як нямецкія падраздзяленні занялі пазіцыі – атака пачалася. З раёна в. Баля-Касцельная наступаў 3-ці батальён “Эйке”, яго падтрымліваў 2-гі батальён таго ж палка. Нямецкую атаку прынялі на сябе часці 330-й дывізіі. Баі вылучаліся асаблівай напружанасцю. Толькі ўвечары група штурмбанфюрара А. Пітчэліса прарвалася да в. Каўбаскі і вызваліла акружаную роту.

У раёне баёў, паводле нямецкіх дадзеных, былі знішчаны адзін Т-34, 8 – 76,2 см, 6 – 4,7 см гармат, 2 мінамёты і 3 супрацьтанкавых ружжы і да 230 салдат. Выклікае сумненні падбіты немцамі савецкі танк. Паводле архіўных дакумантаў танкаў у гэты час на плацдарме не было. Паводле падліку колькасці загінуўшых, афіцыйна пазначаных савецкім бокам як пахаваныя, толькі 330-я дывізія страціла 11 афіцэраў і 71 салдат і сяржант забітымі, з іх 31 чалавек са 1111-га палка[419]. Немцы прымусілі адступіць 330-ю сд на поўнач. У канцы дня дывізія ўтрымлівала раён вёсак Шадзінцы – Васілевічы. Тым часам, камандванне 50-й арміі працягвала нарошчваць сваю групоўку на плацдарме. На поўнач ад мястэчка Гожа (у раёне в. Плябанскія, Лукавіца) пераправіліся праз Нёман два стралковыя палкі 324-й сд. Яны занялі пазіцыі ў раёне в. Войтаўцы – Васілевічы фронтам на поўдзень.

Вельмі цяжкія баі ўвесь дзень вяліся за вышыні 166.0 і 167. Савецкія войскі неаднаразова атакавалі, аднак прарваць нямецкую абарону не змаглі. Да вечара часці 42-й Смаленскай сд засталіся на тых жа пазіцыях: вышыня 166.0 – заходні ўзлесак на ўсход ад Балі-Касцельнай – выключаючы Балю-Сольную.

Спробы наступлення 81-га ск (пазіцыі на поўдзень ад 69-га ск) таксама не былі паспяховымі. Савецкія сілы 95-й сд, узмоцненыя 1321-ым зстап развівалі атакі ў накірунку в. Адамавічы. Першапачаткова яны здолелі збіць з пазіцый 1-шы батальён 34-га палсп. Аднак далейшае развіццё атакі было няўдалым. Вось як апісвае яго мл. с-т 241-га сп 95-й сд А.Я.Німцовіч: “Мы падняліся і рушылі ланцугом па пшанічным полі. Ніякай артпадрыхтоўкі не было. Пастралялі крыху нашыя мінамёты, і ўсё. Мы ішлі, наперадзе паказалася вёсачка (*в. Адамавічы* – Д.Л.), у правым баку ад яе касцёл. Атрымалася так, што на цэнтральную дарогу вёскі мы выйшлі толькі траіх, ды і ў наступленні ўдзельнічала толькі не больш за 15 чалавек, якія засталіся жывымі. На пустыннай вуліцы нас сустрэў стары паляк: “Там за вёскай нямецкія панцэрнікі” – сказаў ён. Сапраўды, калі мы падышлі да ўскрайку, фашысты адкрылі агонь. У гэтай перастрэлцы разрыўная куля трапіла мне ў правую нагу. Нямецкія танкі пачалі выходзіць з лесу. Мае таварышы дапамаглі перавязаць мне рану, і мы пачалі адыходзіць”[420]. Сам мл. с-т А.Я.Німцовіч не змог адступіць. Яго схаваў у пуні да прыходу савецкіх войск жыхар вёскі Баляслаў Пятровіч Таўрэль[421].

Контратаку ў накірунку в. Адамавічы супраць падраздзяленняў 95-й сд у гэты час нанёс 3-ці батальён 5-га палка “Туле”. Паводле ўспамінаў жыхароў вёскі, абарона немцаў была арганізавана наступным чынам. На вышыні каля вёскі заняў пазіцыю нямецкі кулямётчык, яшчэ адзін немец заняў пазіцыі пры ўваходзе ў вёску. Тут жа, каля дарогі, за дрэвамі, стаяў нямецкі танк. Яшчэ два танка знаходзіліся ў ляску, метраў за 500 ад вёскі. У самой вёсцы немцаў больш не было. Савецкіх салдат, што рухаліся ад Нёмана, адразу ж накрывалі агнём, не даючы падысці. Падчас аднаго са штурмаў, вёска была абстраляна савецкімі “кацюшамі” з супрацьлеглага берага Нёмана. З 72 дамоў уцалела толькі 9. Але немцам гэты абстрэл ніякай шкоды не прынёс. Такім становішча справаў было аж да вызвалення вёскі.

Да канца дня 95-я сд займала плацдарм у 5 км па фронце і ў 2 км у глыбіню (ад в. Баля-Сольная – выключаючы яе – в. Галаўнічы).

Для ўзмацнення пазіцый 81-га ск з 290-й сд (яна ўтрымлівала плацдарм у занёманскай частцы горада) камандаванне вырашыла перакінуць у раён в. Пышкі 882-гі сп. У планах яго меркавалася ўвесці ў бой на плацдарм, які трымала 95-я сд.

Працягвалася будаўніцтва пераправаў праз раку. У раёне мястэчка Гожа будавалі пераправы: 216-ты, 217-ты і 218-ты інжынерныя батальёны 50-й інжынерна-сапёрнай брыгады і 122-гі асобны матарызаваны пантонна-маставы батальён за 1 км на поўдзень ад Гожы. У раёне в. Бераржаны будаваў пераправу 89-ы асобны пмб. Сюды ж падвялі і 1-ю Гвардзейскую асобную штурмавую інжынерна-сапёрную брыгаду. Камандаванне арміі вырашыла кінуць яе ў бой. Так 6-ты батальён хутчэй за ўсё ўдзельнічаў у баях у раёне в. Каўбаскі. А 4-ты і 5-ты батальёны – займаліся нарыхтоўкай лесаматэрыялу ў раёне 3,5 км на поўнач ад горада Гродна[422].

Для прыкрыцця пазіцый 69-га і 81-га ск, пераправаў праз Нёман, была разгорнута 47-я зенітна-артылерыйская дывізія РГК (1585-ты, 1586-ты, 1591-шы зенітна-артылерыйскія палкі). У наступныя дні 1585-ты полк заняў пазіцыі ў раёне вышыні 166.0. Астатнія два палкі абаранялі паветраную прастору ў раёне в. Грандзічы – Зарыца[423]. З рэзерву падцягваўся і 1484-ы зенітна-артылерыйскі полк. Пры слабасці сваёй авіяцыі гэтыя меры трэба было праводзіць некалькі дзён таму. Аднак камандванне арміі і фронту не разлічвала на ўпартыя баі.

Групу нямецкіх танкаў у раёне 6 км на паўночны захад ад Гродна атакавала група з 6 штурмавікоў Іл-2 са складу 198-га шап. Былі праведзены тры штурмоўкі. Савецкія штурмавікі былі атакаваны нямецкімі знішчальнікамі FW- 190, аднак стратаў не панеслі.

Першы дзень наступлення, такім чынам, не скончыўся ліквідацыяй контрудара 3-й тд СС. Дзеянні 330-й сд, тым не менш прывялі да прарыву нямецкай абароны на поўначы і, нават, да акружэння адной роты 3-га батальёна 6-га тгр палка СС. Калі б наступленне дывізіі было падтрымана іншымі падраздзяленнямі, танкамі і авіяцыяй – пазіцыі нямецкай танкавай дывізіі былі б разгромленыя. Хутчэй за ўсё ўдалося б злучыцца і з 3-ім Гв. кк. Немцы здолелі закрыць прарыў і вызваліць з акружэння сваю роту. Аднак ліквідаваць уламанне савецкіх палкоў на поўначы яны былі не ў сілах.

Камандванне 50-й арміі і 330-й дывізіі не ўлічыла папярдніх сваіх памылак якія адбыліся 18 ліпеня: ізноў у прамы бой супраць танкавых частак кідалася пяхота без дастатковай артылерыйскай і авіяцыйнай падтрымкі. Акрамя таго, савецкія войскі, якія дзейнічалі на плацдарме былі пазбаўлены сувязі са штабам арміі (!), дрэнна кіраваліся. Гаворка ідзе пра дзеянні 330-й дывізіі. Замест удара ў накірунку в. Багатыры Польныя, палкі, чамусьці, распачалі наступленне ў раён вёсак Каўбаскі – Шадзінцы. Камандуючы арміяй нават не ведаў аб змене накірунку ўдара.

Нягледзячы на цяжкія баі за фарсіраванне ракі, на працягу 18-20 ліпеня камандаванне 50-й арміі і 2-га Беларускага фронта так і не




**20 ліпеня 1944г. Плацдарм на левым беразе Нёмана. Дывізіі 50-й арміі**

знайшло магчымасці падвезці паліва сваім танкавым падраздзяленням. Таму ў мястэчку Скідзель, за 30 км ад Гродна, увесь гэты час без паліва прастаяла 23-я Гв. атбр. У тым жа становішчы знаходзіўся ў в. Сялец (20 км ад Гродна) 233-й атп палк. Л.С.Тулоўскага. Таксама без паліва прастаялі 1099-ы карпусны ап у горадзе Шчучын, 144-я артылерыйская брыгада[424]. Паліва і боепрыпасы падвозіліся ў 50-ю армію на транспартных самалётах са складоў каля г. Крычава (!)[425]. Безумоўна, гэтай колькасці паліва было недастаткова. Зноў жа сказвалася дрэнная арганізаванасць тылоў у час наступлення армій.

На наступны дзень савецкія войскі павінны былі працягваць атакі нямецкай групоўкі. У адпаведнасці з загадам камандуючага арміяй (загад быў аддадзены 20 ліпеня 1944 года ў 23.30) 153-я сд, сувязь з якой падтрымлівалася толькі па радыё, была падпарадкавана камандаванню 3-га Гв.кк. Дывізія зноў павінна была наступаць у накірунку в. Навумавічы. 324-я сд мела наступаць ёй на сустрач, у накірунку лініі в. Рацічы – Лойкі.

***21 ліпеня*** баі на плацдарме працягваіся з тым жа напружаннем, што і ў папярэдні дзень. Задачы дывізій 69-га ск і 81-га ск, што дзейнічалі на заходнім беразе Нёмана, не змяніліся. Як і раней, планавалася ўдарамі з захаду і ўсходу акружыць нямецкія войскі, што дзейнічалі ў раёне

Сапоцкіна. Каб усталяваць сувязь з 69-м ск 3-й Гв. кк павінен быў усімі сіламі атакаваць ва ўсходнім накірунку. Атакі савецкіх войск павінны былі пачацца з 9 гадзін раніцы 21 ліпеня. Улічваючы станоўчыя вынікі папярэдняга дня, а таксама слабасць нямецкіх паліцэйскіх падраздзяленняў, камандаванне 50-й арміі вырашыла нанесці галоўны ўдар сіламі 330-й і 324-й сд на цэнтральным плацдарме.

Да плацдарма каля в. Пышкі немцы сцягнулі падраздзяленні 4-га палп СС[426]. III/"Т" і I/17 палп, ужо знаходзіліся на лініі в. Ласосна – Міцкевічы – Навумавічы[427]. Спробы наступлення 95-й сд поспехам не скончыліся. З раніцы падраздзяленні дывізіі атакавалі в. Адамавічы і ўварваліся на яе ўсходнюю ўскраіну. У контратацы 3-ці батальён палка "Туле" адкінуў іх з вёскі да ракі.

З усходам сонца пачаліся моцныя атакі савецкіх падраздзяленняў 330-й і 324-й сд з раёна, што знаходзіўся на захад ад м. Гожа. Гэтыя атакі былі падтрыманы агнём шматлікай артылерыі, сцягнутай у гэты раён, а таксама актыўнымі дзеяннямі савецкай авіяцыяй. Удар па нямецкіх танках быў нанесены 9 групамі бамбардзіроўшчыкаў па 7-9 самалётаў 3-га бамбардзіровачнага авіякорпуса. Найбольш эфектыўнымі былі дзеянні трох дзевятак Пе-2 з 96-га Гв. бап (301-я бад) пад кіраўніцтвам Героя Савецкага Саюза Гв. м-ра А.П.Смірнова. Дзве дзевяткі бамбардзіравалі цэль з гарызантальнага палёту і адна – з пікіравання. Паводле ацэнкі Галоўнага маршала авіяцыі А.А.Новікава, бамбардзіроўшчыкі дзейнічалі выдатна[428]. Штурмоўку нямецкіх войск праводзілі і штурмавікі Іл-2 са 103-га Гв. і 198-га шап. Так была атакавана нямецкая калона, якая рухалася з м. Новы Двор у накірунку в. Караліно. Атаку праводзілі машыны 103-га Гв. шап. Пры атацы быў падбіты штурмавік Іл-2 старшыны У.П.Ліхадзеда. У раёне в. Пракаповічы (10 км на паўднёвы захад ад Гродна) нямецкай зенітнай артылерыяй быў збіты Іл-2 камандзіра эскадрыллі 198-га шап к-на А.І. Сямёнава[429].

Сілы 330-й і 324-й дывізій 50-й арміі пачалі наступаць у паўднёва-заходнім накірунку ад в. Белыя Балоты ў накірунку мястэчка Сапоцкін. Баявая ахова 1-га батальёна палка "Эйке" была адкінута, а нямецкія пазіцыі савецкая пяхота абышла з поўначы. Гэтым атакам камандаванне корпуснай групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга нічога не здолела супрацьпаставіць. Апоўдні атакай у накірунку в. Селіванаўцы савецкія войскі стварылі пагрозу акружэння нямецкага батальёна, які абараняўся ў в. Войтаўцы. Адзіная дарога да Сапокіна была перакрыта для немцаў савецкім артылерыйскім агнём. Батальён аказаўся ў агнявым мяшку. Увечары ў выніку контратакі немцаў сіламі 2-га батальёна 6-га тгр палка СС, паўночны ўчастак фронта каля в. Белыя Балоты быў стабілізаваны.

Да раніцы 21 ліпеня часці 42-й Смаленскай сд і 4-га асобнага знічальна-супрацьтанкавага дывізіёна змаглі цалкам ачысціць ад немцаў ключавую ў гэтым раёне вышыню 166.0 і пачаць наступленне ў накірунку да в. Баля-Касцельная[430]. У данясенні групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга ў штаб арміі паведамлялася: "… асабліва жорсткія баі ў раёне пункта 166.0 на паўночны захад ад Балі-Касцельнай. Усю ноч адзначаліся актыўныя дзеянні (*савецкай* – Д.Л.) авіяцыі…"[431] Апоўдні для атакі вышыні немцы прыцягнулі 3-ці батальён палка "Эйке", узмоцнены штурмавымі гарматамі. У выніку контратакі з прыцягненнем нямецкай авіяцыі савецкія часці былі выбіты з вышыні і адступілі да Нёмана. Аднак 10-я рота 6-га тгр палка панесла пры гэтым вялікія страты. У далейшых баях гэтага дня вышыня ізноў неаднаразова пераходзіла з рук у рукі.

Тым не менш, чатыры савецкія пераправы, што функцыянавалі ў мястэчку Гожа[432] дазвалялі перакідваць на плацдарм усё новыя і новыя сілы. Група́ўка савецкіх войск павялічвалася. Аднак да зыходу дня ў выніку дзейнасці нямецкай авіяцыі пераправы каля Гожы былі разбураны на 70%[433]. Пераправы ж у тыле 69-га ск (раён в. Бержаны – Куколі), хутчэй за ўсё, не функцыянавалі ці функцыянавалі не цалкам. Да таго часу, верагодна, адносіцца будаўніцтва 33-й асобнай матарызаванай інжынернай брыгадай падводных пераправаў на ўчастку в. Беражаны – Куколі. Такія пераправы знаходзіліся ў вадзе і былі слаба заўважны з паветра. Камандзір брыгады м-р Лебядзеў, у мінулым інжынер Масэнерга, змог арганізаваць будаўніцтва пераправаў за два дні[434]. Праўда, у гэты ж дзень пераправа, якая была пабудавана 143-м асобным мотаінжынерным батальёнам 33-й асобнай мінж. бр была знішчана. Загінуў камандзір 1-й роты к-н С.С. Фёдараў і 19 байцоў.

Таксама савецкія войскі сталі будаваць на рацэ Нёман фальшывыя пераправы. У дапамогу 50-й арміі былі накіраваны ўсе інжынерныя і сапёрныя падраздзяленні фронта. У штаб к г.-п. І.В.Болдзіну для арганізацыі будаўнічых работ прыехаў начальнік інжынерных войск фронту Благаславаў.

Адзін з палкоў 330-й сд спрабаваў наступаць ў раёне в. Монькаўцы (на поўдзень ад в. Белыя Балоты). Аднак гэтыя атакі не далі савецкім войскам станоўчых вынікаў. Тут контратакавалі падраздзяленні 3-га дывізіёна знішчальнікаў танкаў і 2-га батальёна 6-га тгр палка СС. Яны адцяснілі савецкія войскі да ракі.

Я.П. Елісееў гаворыць пра наступную колькасць нямецкай групоўкі, якая дзейнічала супраць войск 69-га савецкага корпуса: 3-я тд СС (30-35 танкаў і САУ, астатнія дзейнічалі на другіх накірунках), 3 паліцэйскія палкі групы "Ангальт"[435]. Таксама ў атаках

супраць падраздзяленняў 42-й і 95-й сд (на фронце Лойкі – Адамавічы) удзельнічаў перакінуты з Германіі 33-ці пяхотны батальён СС.

Цяжкія баі ў гэты дзень разгарэліся ў раёне на паўднёвы захад ад м. Сапоцкін. 3-ці танкавы раздведвальны батальён СС штурмбанфюрара Ліна Масары аказаўся ў вельмі цяжкім становішчы. Савецкай акружанай групоўкай 3-га Гв. кк былі прадпрынятыя некалькі атак з раёна в. Маркаўцы (на паўднёвы захад ад Сапоцкіна) у накірунку в. Баленента з мэтай адкінуць нямецкі разведвальны батальён. Раніцай 5-я Гв. кд і 153-я сд перайшлі ў наступленне ва ўсходнім накірунку і вярнулі адбітыя немцамі в. Доргунь і Баленента. 351-шы дывізіён рэактыўнай артылерыі, які падтрымліваў 5-ю Гв. кавалерыйскую дывізію ў 15.00 адкрыў агонь па мястэку Сапоцкін[436]. У выніку гэтых атак немцы адышлі да дарогі Ліпск – Сапоцкін. Паводле нямецкай інфармацыі, у раёне на поўдзень ад мястэчка іх лінія фронта развалілася амаль цалкам. Асобныя падраздзяленні былі вымушаны заняць кругавую абарону і весці цяжкія баі (напрыклад, 3-я рота разведвальнага батальёна СС у в. Крэсуўка). 174-я сд і палкі 5-й Гв. кд зноў занялі м. Сапоцкін. 352-я сд па ўказанні штаба 31-й арміі здала свае пазіцыі па Аўгустоўскім канале і перадыслацыравалася на пазіцыі ў некалькіх кіламетрах на поўнач.

У выніку атак, што наносіліся з усходу (з раёна в. Радзівілкі – на паўночны ўсход ад Сапоцкіна), апоўдні сіламі 324-й сд, узнікла небяспека акружэння разведвальнага батальёна СС. Пасля адступлення з раёна Доргунь – Баленента батальён знаходзіўся ў раёне на захад ад Сапоцкіна. Савецкія ж войскі занялі в. Васілевічы[437]. Развіваючы атаку ў паўднёва-заходнім накірунку, яны выйшлі да в. Навасады – Валавічоўцы, дзе імі была перарэзана дарога Гродна – Сапоцкін. Страта гэтай дарогі фактычна азначала страту для немцаў асноўнай камунікацыі на кірунку атак па злучэнню з 5-й тд. Толькі 5 км аддзяляла палкі 324-й і 153-й дывізій! Абедзве савецкія групоўкі маглі злучыцца ў раёне в. Валачоўцы – Доргунь. У гэтым выпадку яны адрэзалі б 3-ці танкавы разведвацельны батальён СС.

Аднак далейшае наступленне савецкіх войск, якое пачалося каля 14.00, было накіравана ўжо на поўдзень – у накірунку в. Скрыннікі. Менавіта тут, камандванне 324-й сд дапусціла памылку. Накірунак атакі быў зменены з заходняга на паўднёвы. Наступаючыя савецкія роты сутыкнуліся з падраздзяленнямі 3-га танказнішчальнага дывізіёна СС, узмоцненага 7 штурмавымі гарматамі. Зноў савецкая пяхота трапіла пад атаку нямецкай бранятэхнікі! Пасля сустрэчнага бою савецкія часці былі вымушаны адступіць[438]. Паводле інфармацыі

В.Ваперсаля, у гэтым баі савецкія падраздзяленні страцілі: 4 – 7,62 см гармат, 8 – 3,7 см супрацьтанкавых пушак, 15 супрацьтанкавых ружжаў і 15 транспартных сродкаў. 15 чырвонаармейцаў, і т. л. адзін афіцэр, былі ўзяты ў палон. Страты немцаў склалі толькі 10 лёгкапараненых!

Каб дапамагчы савецкай пяхоце па Валавічоўцам, дзе знаходзіўся нямецкі дывізіён СС адкрыла агонь батарэя "Кацюш" к-на Кузняцова з 351-га дывізіёна. У выніку гэтага абстрэла былі падбіты 8 нямецкіх бронетранспарцёраў і зянітная гармата[439]. Аднак немцы працягвалі наступаць. Іх штурмавыя гарматы, тым часам, атакавалі ў накірунку в. Перстунь, дзе абараняўся 557-ы сп 153-й сд. Дывізія, паводле словаў камандзіра палка Ф.С.Фядотава, аказалася "пад пагрозай разгрому": "У нас ужо не засталося ніводнай міны, ніводнага снарада. Былі толькі ручныя гранаты і патроны. І вораг, быццам ведаючы пра гэта, кінуў на полк танкі. Фашысцкія машыны ішлі па дарозе і вялі бесперапынны агонь, за імі на грузавіках рухалася мотапяхота, а на полі разгортваліся пяхотныя падраздзяленні. Як удалося Фірсаву здабыць дзве аўтамашыны са снарадамі, не ведаю. Але ён іх даставіў артылерыстам у апошні момант. Мы атрымалі магчымасць адкрыць агонь. Аднак сваімі сіламі мы ўсё роўна не далі б рады. Дапамог камандуючы артылерыяй дывізіі палк. Жылін. Здолеў Іван Дзмітрыевіч і снарады зберагчы, і на абстаноўку зрэагаваць, і агонь арганізаваць. Усю магутнасць дывізійных гармат накіраваў Жылін на нямецкія танкі, якія імчаліся па дарозе Сапоцкін – Галынка. І такой моцы ўдар атрамаўся, што дарога перад танкамі і пад імі ў прамым сэнсе слова на дыбкі ўстала. Два танкі запылалі адразу, астатнія быццам спатыкнуліся, спыніліся. Па іх працягвалі біць дывізійныя і палкавыя артылерысты. Фашысцкія машыны былі знішчаны. Натхнёныя гэтай перамогай батальёны адкрылі дружны агонь па мотапяхоце і пяхоце праціўніка, прымусілі яе залегчы, а потым і адысці"[440].

Толькі з наступленнем цемры немцы змаглі адкінуць савецкія часці ў заходнім накірунку. Дарога Гродна – Сапоцкін – асноўны шлях нямецкай камунікацыі – была вольная. Для ўмацавання сваіх сіл у раён баёў былі перакінуты з фронта на рацэ Бобр 20-ты танкавы разведвальны батальён і 1-шы батальён 5-га тгр палка СС[441].

Паспяхова дзейнічала ў гэты дзень частка савецкай 290-й сд г.-м. І.Г.Гаспарана. Яе 882-гі сп, перакінуты раней у раён в. Пышкі, фарсіраваў Нёман на ўзроўні в. Міёла і пачаў наступаць у накірунку в. Трычы[442]. Полк пашырыў плацдарм і адбіў нямецкія атакі без вялікіх для сябе стратаў

Такім чынам, напружаныя баі 21 ліпеня не прынеслі перамогі савецкім войскам. Так, Я.П.Елісееў адзначаў: "...дасягнуць

становчых вынікаў яны не змаглі і панеслі пры гэтым страты ў людзях"[443]. Аднак баі гэтага дня прадэманстравалі бясспрэчны факт: пазіцыі групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга і 3-й тд СС трымаліся з апошніх сваіх сілаў. Толькі ўводзячы апошнія рэзервы і здымаючы войскі з іншых накірункаў, ім удалося утрымаць фронт. На жаль, савецкім войскам не хапала механізаваных сродкаў, неабходнай колькасці боепрыпасаў і паліва для падтрымання сваіх атак. Менавіта слабое тэхнічнае аснашчэнне прывяло да няўдалага завяршэння атак 20 і 21 ліпеня. Дрэнна дзейнічала сувязь. Не было і ўзаемадзеяння паміж падраздзяленнямі. Кожная дывізія паасобку праводзіла атакі. У той жа дзень у раёне Сапоцкіна бавая ахова 351-га дывізіёна затрымала і ўзяла ў палон групу салдат з 70 чалавек (па нацыянальнасці беларусы і палякі) з цяжкім узбраеннем[444]. Верагодна гэта было адно з падраздзяленняў Арміі Краёвай. Імі заняўся аддзел контрразведкі 5-й Гв. кд.

На працягу дня працягваліся нямецкія атакі з поўначы, з кірунку в. Калеты. Іх прыняла на сябе 174-я сд 31-й арміі. Удары былі адбіты і немцы практычна не змаглі прасунуцца на поўдзень і заставаліся на лініі в. Рыголь – Калеты. Паміж 5-й тд і 3-й дывізіяй СС "Мёртвая галава" па-ранейшаму ззяў разрыў.

Баявая група 19-й тд, што прыбыла ў Дамброву Беластоцкую ўлівалася ў склад нямецкай 4-й арміі. Яна павінна была скончыць канцэнтраванне ў другой палове дня[445]. У баявой групе дывізіі паранейшаму адчуваўся недахоп артылерыі і пяхоты. Рашэнне аб яе ўводзе ў бой на паўднёвым накірунку прыняў г.-пех. Ф.Хосбах. Г.-ф. В. Модэль адобрыў гэтае рашэнне. Баявая група павінна была ва ўзаемадзеянні з групай "Готберг" нанесці ўдар праз горад Ліпск у накірунку Аўгустова, а ў перспектыве – злучыцца з 5-й тд, што дзейнічала на поўначы ад Аўгустоўскага канала. Аднак пазней нямецкія планы былі зменены: баявая група 19-я тд павінна была сумесна з групай обергрупэнфюрара К. фон Готберга ударам з раёна Багатыры-Лясныя – Багатыры-Польныя ў заходнім накірунку выйсці да Сапоцкіна і ўзнавіць лінію фронта ў раёне Ліпск – Асочнікі. У падпарадкаванне баявой групе 19-й дывізіі перадаваўся 20-ты танкавы разведвальны батальён, што ахоўваў даліну раку Бобр у раёне горада Ліпск. Пры гэтым удары савецкія часці павінны былі быць адкінуты і прыціснуты да ракі Чорная Ганча[446]. Корпусная група обергрупэнфюрара К. фон Готберга атрымала загад падрыхтаваць два масты для танкаў 19-й тд праз рэчкі Нурка і Прыпілія ў раёне на захад ад в. Навасёлкі.

З Аўгустова рабіла спробы прасунуцца на ўсход 337-я баявая група оберстлейтэнанта Кнітэля. Да вечара яна зноў заняла в. Ястшэмбна II.




21 ліпеня 1944г. Плацдарм на левым беразе Нёмана

Эскадроны 17-га Гв. кп адышлі. Частка яе сілаў атакавала 6-ю кд, якая адбіла тры нямецкія атакі і таксама была вымушана адысці. З прычыны таго, што ні ў савецкіх, ні ў нямецкіх войсках не было адзінай лініі фронту, група немцаў колькасцю да 70 чалавек прарвалася да штаба 3-га Гв. кк і аэрадрома – адзінага сродка сувязі корпуса з "Вялікай зямлёй". Штаб размяшчаўся ў в. Грушкі. Гэтая група ў 20 гадзін сутыкнулася з баявой аховай 21-га дывізіёна рэактыўнай артылерыі. Пасля хуткацечнага бою прарыў быў ліквідаваны. Для папаўнення боепрыпасаў і паліва для корпуса ноччу была арганізавана іх дастаўка авіяцыяй. Так для машын 77-га Гв. мінамётнага палка камандваннем 3-га Гв. кк было выдзелена 800 кг бензіна[447]. Яшчэ дзве тоны бензіна і снарады былі дастаўлены ў полк праз камунікацыі 36-га стралковага корпуса 31-й арміі.

Гэты дзень стаў момантам найбольшага напружвання сілаў абодвух бакоў. Паводле нямецкай інфармацыі, за суткі 3-я тд СС страціла падбітымі 3 танка T-IV і 3 StuG[448]. Адзін T-IV быў падбіты ў баях 20-21 ліпеня ў раёне Сапоцкіна. Немцы яго кінулі, і танк дастаўся савецкім войскам[449]. За час баёў, пачынаючы з 16 ліпеня, нямецкая дывізія страціла забітымі і параненымі больш за 1000 чалавек. 9-я цяжкая рота T-VI налічвала толькі 2 спраўныя танкі. Агулам, на плацдарме адчувалася перавага савецкіх сілаў, якія увесь час узмацнялі свой ціск на нямецкія войскі. Менавіта ім належала ініцыятыва вядзення баявых дзеянняў. З дапамогай прыцягнення новых сіл яны змаглі дабіцца пэўных поспехаў. Улічваючы тое, што немцы прыцягвалі да баёў часці 19-й тд, можна было чакаць узмацнення баёў у наступныя дні. Цікава адзначыць, што вечарам гэтага дня германскае камандванне абвесціла па радыё аб знішчэнні кавалерыйскага корпуса ў наступных словах: "прарваўшаяся да Аўгустова банда Аслікоўскага цалкам знішчана"[450].

Разам з тым, усведамляючы бесперспектыўнасць баёў на Нёмане, у гэты дзень камандаванне нямецкай 4-й арміі аддало загад аб падрыхтоўцы новай абарончай лініі у тыле сваіх войск. Гаворка ідзе пра так званую лінію "Ласка", што праходзіла за 2 кіламетры на ўсход ад мястэчка Сакулка уздоўж чыгуначнай лініі ў накірунку м. Кузніца.

Для вырашэння сітуацыі з 50-й арміяй у ноч на ***22 ліпеня*** ў штаб 50-й арміі прыехаў маршал Г.К. Жукаў[451]. Член Ваеннай рады 2-га Беларускага Фронта г.-л. Л.З. Мехліс прыбыў у штаб г.-п. І.В. Болдзіна яшчэ раней. Аднак ён не змог знайсці выхад з цяжкага становішча, што склалася ў арміі. Ацаніўшы абстаноўку, маршал Г.К. Жукаў у сваёй справаздачы ў Генеральны Штаб, у прыватнасці, адзначаў, што войскі 50-й арміі уступілі ў бой з нямецкай танкавай групай сходу, без якой-небудзь падрыхтоўкі, не маючы неабходнай колькасці артылерыі і боепрыпасаў. Ён пісаў, што ўласных сілаў для прасоўвання ў пала-

се 50-й арміі не хапае. Гэтым маршал Г.К. Жукаў фактычна прызнаў, што немцы змаглі прыпыніць наступленне арміі і кавалерыйскага корпуса Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскага ўдарам адной танкавай дывізіі і некалькіх паліцэйскіх палкоў.

Для выпраўлення такога стана рэчаў меркавалася папоўніць армію палівам і боепрыпасамі і 23 ліпеня зноў перайсці ў наступленне сіламі 324-й, 330-й сд 69-га ск (займалі фронт ад в. Валавічоўцы да в. Каўбаскі) агульным накірункам на поўдзень. Да іх далучалася 307-я Навазыбкаўская Чырвонасцяжная сд (1019-ты, 1021-шы,1023-ці сп, 837-мы ап) г.-м. В.М. Далматава. Гэтае падраздзяленне было сфарміравана ў Іванаўскай вобласці. Дывізія фарсіравала раку па пераправах ў м. Гожа. Пра фарсіраванне Нёмана дывізіяй камандуючы фронтам адзначаў: "Пераправа была арганізавана дрэнна. Яна не была прыкрыта з паветра і праціўнік яе разбамбіў"[452]. Такім чынам урокі папярэдніх баёў не навучылі савецкае камандванне клапаціцца аб сваіх пераправах. Праўда, знішчальнікі 309-й зад вялі баі над плацдармам. У прыватнасці патруляванне ажыццяўлялі знішчальнікі Ла-5 49-га зап. Так к-н І.К. Кліманаў збіў у раёне Гродна (раён в. Плябанаўцы, недалёка ад м. Гожа) FW-190[453].

З мяжы Перстунь – Галынка насустрач дывізіям 69-га ск у наступленне павінны былі перайсці часці 153-й сд і 3-га Гв. кк. На чацвёрты дзень баёў да 153-й дывізіі змаглі падысці падмацаванні. Заняцце 174-й сд м. Сапоцкін спрыяла гэтаму. Варта дадаць, што часці 324-й і 153-й сд павінны былі злучыцца ў працэсе наступлення. Значна патрапаная 42-я Смаленская сд перадавалася ў склад 81-га ск і не магла ўдзельнічаць у будучым наступленні. Гэта ж тычылася і 95-й сд. Такім чынам, наступленне планавалася падраздзяленнямі чатырох дывізій і кавалерыйскага корпуса. Падраздзяленні 3-й тд СС знаходзіліся фактычна ў мяшку, бо савецкія часці з трох бакоў ахаплівалі іх. Аднак спробы акружыць нямецкія сілы ў раёне в. Васарабы – Міцкевічы не прадпрымаліся. Відаць, камандаванне арміі і фронта ўжо не верыла ў поспех такога мерапрыемства. Цяпер войскі мусілі проста выштурхоўваць немцаў.

З раніцы 22 ліпеня пачаліся атакі савецкіх сіл па фронце паміж в. Адамавічы і Навумавічы. Толькі з падыходам двух T-IV, якія ўзмацнілі нямецкія пазіцыі паліцыі, гэтыя атакі былі адбіты[454]. Атакі у кірунку в. Навумавічы, што абараняліся 3-ім батальёнам 5-га тгр палка СС, працягваліся да абеда. У другой палове дня немцы былі вымушаны прыцягнуць на гэты ўчастак фронта апошні свой рэзерв – 3-ці сапёрны батальён СС з в. Караліно. Толькі з наступленнем прыцемкаў яны змаглі стабілізаваць становішча.



**Баі на левым беразе Нёмана ў раёне Гродна ў ліпені 1944 г. Савецкая вайсковая карта**

Працягваліся цяжкія баі за вышыню 166.0. Падраздзяленні 3-га танказнішчальнага дывізіёна СС пачалі атакі частак 42-й сд з 7.30 раніцы і працягвалі іх да 18 гадзін. Аднак заняць вышыню немцы так і не змаглі. Прыкрыццё войск і адбіццё нямецкіх атак здзяйсняла савецкая артылерыя. Так, 81-шы гап вёў абстрэл наступаючых нямецкіх падраздзяленняў з-за Нёмана, маючы сваіх карэктыроўшчыкаў на левым беразе. Пад час чарговай нямецкай атакі 2-гі дывізіён страціў сувязь з левым берагам. Для ўзнаўлення карэктыроўкі агню і магчымых устраненняў абрыву на плацдарм быў пасланы камандзір аддзялення разведкі палка ст. с-т М.А.Гакель. Пры выкананні задання ён загінуў. Пасмяротна яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза[455].

Не апошнюю ролю ў абароне вышыні адыграла савецкая штурмавая авіяцыя. Паводле нямецкіх успамінаў, савецкія штурмавікі: "... аткавалі з малых вышынь, прачэсвалі сваім бартавым ўзбраеннем ямы і ўкрыцці, засыпалі асколачнымі бомбамі пазіцыі грэнадзёраў СС і падіцэйскіх салдат"[456]. Немцы паведамлялі аб пяці збітых імі савецкіх самалётах. Увечары 3-ці дывізіён знішчальнікаў танкаў СС, згодна з загадам камандвання групы обергрупэнфюрара К. фон




22 ліпеня 1944г. Плацдарм на левым беразе Нёмана

Готберга, быў выведзены з бою і адведзены ў мястэчка Новы Двор у якасці дывізійнага рэзерву. Ён павінен быў прыкрываць адыход сілаў дывізіі на новую абарончую лінію.

На астатнім фронце немцы контратакавалі, імкнучыся ліквідаваць савецкія прарывы мінулага дня. Так, 3-ці танкавы разведвальны батальён СС, наступаў з раёна в. Валавічоўцы – Навасады на захад. Ён адкінуў часці 153-й сд ад трасы Сапоцкін – Гродна да в. Доргунь. У другой палове дня ў раёне в. Перстунь падраздзяленні 153-й сд контратакавалі эсэсаўцаў, але былі адбіты. Немцы выкарысталі гарматы 3-га дывізіёна 3-га артпалка СС, схаваныя ў стагах сена[457]. Такая маскіроўка выкарыстоўвалася ад савецкай авіяцыі.

Апоўдні немцы закрылі прарыў на паўночным участку (в. Белыя Балоты – на паўднёвы усход ад Сапоцкіна). Пад час дзённых баёў падраздзяленні 3-й тд СС страцілі 2 танка T-IV. Не маючы магчымасці іх эвакуіраваць, экіпажы ўзарвалі баявыя машыны і адступілі[458]. Наогул, нямецкія танкісты стараліся не пакідаць сваю баявую тэхніку арміі праціўніка, нават калі яна была моцна пашкоджана. Вельмі аператыўна працавалі спецыяльныя эвакуатары, якія забіралі пашкоджаны танк у тыл. Пры адсутнасці такой мажлівасці танкі і САУ абавязкова знішчаліся экіпажам.

Працягваліся нямецкія атакі і з іншых накірункаў. Так 337-я баявая група атакавала з захаду. Яе падраздзяленні наступалі ў накірунку г. Ліпск з паўночнага захаду. Баі з часцямі 3-га Гв. кк ішлі ў раёне в. Ястшэмбна I і II. Зноў асноўны іх цяжар выпаў на кавалерыстаў 17-га Гв. кп.

Акрамя таго, немцы працягвалі атакаваць і сіламі 5-й тд з поўначы – у раёне Аўгустоўскага канала. 23-ці Гв. кп 6-й Гв. кд вёў баі за в. Мікашоўка. Страты палка за дзень склалі 4 кавалерысты забітымі[459].

Да 17 гадзін 16-я сапёрная рота СС дывізіі "Мёртвая галава" скончыла наводку маста каля в. Ягінты (на захад ад мястэчка Новы Двор) для 19-й тд. Ранкам першыя падраздзяленні дывізіі падышлі да мястэчка Дамброва-Беластоцкая. Удзень прыбылі артылерыйскія і танкавыя часці. Аднак акурат перад атакай у штабе дывізіі атрымалі тэрміновы загад г.-ф. В. Модэля. Згодна яму атака адмянялася. 19-я тд павінна была тэрмінова разгарнуцца на поўдзень і атакаваць м. Кузніца, куды прарваліся савецкія танкі 49-й арміі[460]. Такое паспешнае змяненне нямецкіх планаў было выклікана сур'ёзнасцю становішча – фронт на поўдзень ад Гродна быў прарваны буйнымі сіламі савецкіх войск. У выпадку іх далейшага прасоўвання з м. Кузніца ў заходнім і паўночна-заходнім накірунку ўся групоўка карпусной групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга, у т.л. і 3-я тд "Мёртвая галава", аказаліся б у акружэнні. Увечары ўсе падраздзяленні групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга, атрымалі загад аб падрыхтоўцы да адыходу на лінію "Ласка".

Камандаванне 3-й тд СС "Мёртвая галава" атрымала загад ад г.-ф. В. Модэля на паступовы адвод частак дывізіі ў раён горада Седлец (горад у Польшчы, на захад ад Беластока). Гэты загад быў выкліканы прарывам савецкіх частак на фронце. У выніку беспарадкавага адступлення падраздзяленняў корпуснай групы г.-арт. Г. Вейдлінга паміж ёй і групай обергрупэнфюрара К. фон Готберга ўтварыўся разрыў. Для яго ліквідацыі немцы былі вымушаны тэрмінова змяняць свае планы. 19-я тд перадавалася корпусу г.-арт. Г. Вейдлінга. 2-гі палп СС, што займаў пазіцыі ў Занёманскім фарштаце, таксама быў вымушаны адыходзіць да в. Калбасіно.

Такім чынам, цяжкія баі на плацдарме цягнуліся цэлы тыдзень і скончыліся нарэшце паспяхова для савецкіх войск. Прарыў нямецкага фронта ў накірунку м. Кузніца пераблытаў нямецкія планы, сарваў атаку 19-й тд і прымусіў камандаванне 4-й арміі да падрыхтоўкі загада аб адыходзе ўсіх падраздзяленняў на захад ад Гродна. На плацдарме, у зоне дзеянняў 50-й арміі, значных поспехаў не было. Група 69-га ск (307-я, 324-я і 330-я дывізіі) не перайшла ў наступленне. Магчыма, падраздзяленні рыхтаваліся да будучых баёў.

***23 ліпеня*** а 8.00 пачалося наступленне 50-й арміі. Акрамя яе, з мяжы ракі Свіслач пачалі наступаць злучэнні 49-й і 3-й армій у накірунку Беластока.

Раніцай перайшлі ў наступленне акружаныя часці 3-га Гв. кавалерыйскага корпуса і 153-й дывізіі. 557-ы сп 153-й сд пачаў наступленне ў накірунку в. Багатыры-Польныя[461]. Аднак прасунуцца ён не здолеў. Без бою полк увайшоў у вёску толькі на досвітку наступнага дня, калі немцы адступілі. Фронт 3-га танкавага разведвальнага батальёна СС быў прарваны у в. Рыгалаўка. Падраздзяленні 3-га Гв. кк прарваліся ў накірунку в. Рагожын (цяпер на тэрыторыі Польшчы), адкідваючы саслабелыя роты батальёна. Узмоцненая разведка вялася кавалерыстамі ў накірунку в. Рагажынец.

Насустрач гэтым савецкім войскам а 8.00 раніцы ўдарылі з плацдарма астатнія падраздзяленні 50-й арміі. Паводле інфармацыі Я.П. Елісеева, раніцай 23 ліпеня першымі ў наступленне перайшлі ўзмоцненыя роты, выдзеленыя ад кожнай дывізіі для выяўлення нямецкага агню і разведкі іх абароны. Астатнія падраздзяленні далучыліся пазней. Ля в. Адамавічы ў першай палове дня групамі па 200-300 чалавек атакавала пазіцыі 4-га палсп СС 95-я сд[462]. Увечары пры атаках на в. Адамавічы – Навумавічы падраздзяленні 330-й сд падтрымлівала бранятэхніка (па нямецкіх дадзеных – танкі, аднак хутчэй за ўсё гэта былі САУ). Часці 3-га батальёна 5-га тгр палка СС утрымлівалі свае пазіцыі у в. Навумавічы да 23.00, прыкрываючы з фронту адыход астатніх частак 3-й тд СС.

Савецкія атакі 324-й (з раёна в. Валавічоўцы – Васілевічы) і 307-й сд (з раёна Васілевічы – Войтаўцы)[463], што падтрымліваліся 1434-ым і 1444-ым сап з поўначы, у першай палове дня яшчэ стрымлівалі немцы з 1-га батальёна палка "Эйке". Аднак ў другой палове дня атакі прынеслі поспеху і савецкія роты прарваліся да в. Скрыннікі[464]. Пры гэтым нямецкі батальён аказаўся пад пагрозай абкружэння, і паводле загаду адступіў на пазіцыю "Ласка".

У выніку прарываў лініі фронту 4-й арміі на рубяжы ракі Свіслач, на поўдзень ад Гродна, і наступлення савецкіх войск – у нямецкіх штабах панаваў хаос. Сітуацыю ў той момант цудоўна ілюструе фраза з кнігі В. Ваперсаля "Soldaten, Kämpfer, Kameraden": "Камандаванне корпуса (*маецца на ўвазе корпус г.-а. Г. Вейдлінга. – Д.Л.)* і арміі сапраўды не функцыянуе ... загады часткова не зразумелыя, часткові спазняюцца, часткова супярэчаць адзін аднаму. Вядуцца спрэчкі паміж адказнымі камандзірамі на асобных участках аб стане войск, што вядуць баі. Уся адказанасць ускладаецца не толькі на кепскую сувязь, але і на "памылкі слыху"[465]. Пры ўсім гэтым, батальёны 3-й тд СС і паліцэйскіх палкоў утрымлівалі фронт і планамерна адыходзілі.

У другой палове 23 ліпеня нямецкая лінія фронту на захад ад Гродна выглядала наступным чынам: ад вышыні 144.0 на поўдзень ад в. Гнойніца (цяпер раён горада – Вішнявец) да в. Ласосна займалі пазіцыі рэшткі 2-га паліцэйскага палка СС. Да яго прымыкалі з поўначы часці 3-га танкавага сапёрнага батальёна СС (штаб знаходзіўся ў в. Баранавічы). На вышынях на ўсход ад в. Адамавічы – Навумавічы займалі пазіцыі рэшткі I/34 паліцэйскага стралковага палка, 17-га паліцэйскага палка СС (без III батальёна), часці 4-га паліцэйскага палка СС і III/»T». Ад раёна на захад ад в. Загараны і аж да вышынь у ранёне в. Капланаўцы – Скрыннікі праходзіў фронт III/»E». II/»E» быў сабраны ў якасці рэзэрва дывізіі каля в. Канюхі. Выступ фронта каля в. Капланаўцы да маёнтка Шламкаўшчызна, што на паўднёвым усходзе ад в. Гінавічы, займаў I/»E» і часці I/»T». Заходні адрэзак фронта на ўсход ад крыніцы Мядзведзіца – в. Ліхасельцы – усход Сіёлка – Рыгалаўка да рэчкі Панарліца абараняў 3-ці танкавы разведвальны батальён СС. Сілы паліцыі размяшчаліся ўдоўж участка ракі Бобр на паўднёвым беразе да в. Рагажынец і далей да горада Ліпск[466].

Да канца дня 324-я сд 69-га ск усталявала локцявую сувязь з часцямі 153-й сд і 3-га Гв. кк. Савецкія войскі прасунуліся на 10-12 км на паўднёвы захад і выйшлі на лінію в. Галынка – Навумавічы – Адамавічы. Пры гэтым былі вызвалены 27 населеных пунктаў. Нямецкае ўкліньванне ў пазіцыі савецкіх войск было ліквідавана. Фактычна 3-ці Гв. кк аб'яднаўся з 50-й арміяй. Да 20.00 дывізіі 69-га ск

займалі наступныя пазіцыі: 324-я сд в. Рацічы – перакрыжванне дарог за 1,2 км на поўнач ад вышыні 214.0; 307-я сд – Скрынкі – Баля-Касцельная; 330-я сд – Загараны – цэнтр в. Навумавічы[467].

81-шы ск да зыходу дня авалодаў трыма населенымі пунктамі. 42-я сд выйшла на мяжу в. Міцкевічы – Пушкары. 95-я сд, што дзейнічала на яе левым флангу, замацавалася на заходняй ускраіне Салаўі – Адамавічы. У Занёманскім фарштаце пазіцыі 290-й сд знаходзіліся за 300 м на паўднёвы ўсход ад чыгуначнага маста. Савецкія атакі пачаліся супраць 2-га палп СС. Паліцэйскія роты былі не ў сілах іх стрымаць і пачалі адступаць. Вечарам, каб спыніць наступленне савецкіх войск у заходнім накірунку, з Балі-Касцельнай быў перакінуты на лінію р. Ласосны (ад в. Караліно да в. Ласона) 3-ці батальён палка "Эйке"[468]. Ён стрымаў наступленне батальёнаў 290-й дывізіі і дазволіў паліцэйскім ротам спакойна адысці. Сам ён пачаў адступленне на лінію "Ласка" толькі ў 01.00 24 ліпеня. У выніку баёў 290-я сд г.-м. І.Г. Гаспарана цалкам заняла Занёманскі фарштат і выйшла на паўночна-заходнюю лінію ад в. Солы. Горад Гродна быў вызвалены канчаткова!

Негледзячы на гэтыя поспехі, трэба было працягваць працу па пабудове пераправаў праз Нёман. Шматлікія інжынерныя часці 50-й арміі напружана працавалі. Так 3-ці, 4-ты і 5-ты батальёны 1-й Гв. ашісбр, а таксама 87-ы апмб будавалі свайны мост праз раку. 216-ты і 217-ты інжынерна-будаўнічыя батальёны (50-й іббр) да 16 гадзін 23 ліпеня скончылі будоўлю маста ў раёне Гожы. 89-ы апмб абслугоўваў 9-тонны пантонны мост у раёне в. Беражаны. Акрамя гэтага, на рацэ Нёман функцыянавалі тры паромы, якія абслугоўвалі 122-гі апмб (16-тонны і 9-тонны і раёне Гожы і 9-тонны ў раёне в. Беражаны). 47-я зенітная дывізія РГК прыкрывала баявыя парадкі 69-га ск. Адзін полк дывізіі прыкрываў пераправы ў раёне Гожы[469].

***24 ліпеня*** карпусная група г.-арт. Г.Вейдлінга, якая працягвала адкатавацца на захад, зноў страціла сувязь з падраздзяленнямі обергрупэнфюрара К. фон Готберга. Ноччу ў разрыў фронта каля в. Сакулка прарваліся савецкія падраздзяленні. Да раніцы лінія фронту праходзіла па вёсках Караліно – Трычы – Навасёлкі – Ягінты – Харашоўцы – Рагажынец – Ястшэмбна І і ІІ.

У выніку баёў з 14-24 ліпеня падраздзяленні групы обрг-га К. фон Готберга панеслі вялікія страты. Так, 6 паліцэйскіх палкоў былі аб'яднаны у паліцэйскую брыгаду "Ангальт". Паводле рашэння камандавання 4-й арміі яна магла больш прыцягвацца да баявых дзеянняў. Са складу 3-й тд СС у падпарадкаванне карпусной групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга выдзяляліся 4 батальёны[470]. Астатнія часці дывізіі былі перададзены ў суседнюю групу г.-арт. Г. Вейдлінга для выпраўлення цяжкага становішча. Да таго ж, у штабе групы обергру-

пэнфюрара К. фон Готберга атрымалі загад ад начальніка штаба групы армій "Цэнтр" г.-л. Крэбса аб вывадзе 3-й тд СС са складу 4-й арміі і яе перакідцы ў 2-ю армію пад горад Седліца, дзе склалася крытычная сітуацыя. У выніку гэтага рашэння камандаванне 4-й арміі вырашыла пачаць адступленне з 25 на 26 ліпеня на новую скарочаную абарончую лінію "Куніца" па рацэ Сідра. Тады ж падраздзяленні 3-й тд СС павінны былі быць выведзены са складу арміі.

З 7 гадзін раніцы савецкія падраздзяленні 50-й арміі працягвалі атакі. У адпаведнасці з загадам г.-п. І.В. Болдзіна 69-й ск павінен быў да зыходу дня выйсці на лінію Ліпск – Вяселава, а перадавымі атрадамі да в. Ястшэмбна – Дамарады. 324-я сд пасля заняцця горада Ліпск павінна была застацца ў гэтым раёне і дзейнічаць у другім эшэлоне корпуса. Корпус быў узмоцнены 369-й сд, якая фарсіравала Нёмана і далучылася да астатніх падраздзяленняў. 81-шы ск да заходу дня павінен быў выйсці перадавымі атрадамі да в. Сухаволя. 42-я сд таксама заставалася ў раёне Пракаповічы – Трычы. Дывізія павінна была чакаць папаўнення[471]. Яе прымяненне забаранялася без асабістага загаду камандуючага арміяй. Гэты факт казаў пра цяжкія страты, што панесла дывізія ў баях на плацдарме.

Супраць пазіцый 3-га батальёна 6-га тгр палка СС каля в. Караліно савецкімі войскамі была прадпрынята атака сілаю да батальёна, пры падтрымцы гаўбіц і гармат. У выніку гэтай атакі вёска была занята, а немцы адступілі на левы бераг рэчкі Татарка. Тут наступала 290-я сд, якая заняла пазіцыі па лініі в. Тарусічы –Чэхаўшчызна – Каробчыцы (выключаючы)[472]. Да вечара палкі дывізіі працягвалі наступаць. Так 878-мы сп заняў вышыню 235 за пяць кіламетраў на захад ад в.Бакуны[473]. На правым флангу 290-й дывізіі наступалі падраздзяленні 95-й дывізіі.

Таксама былі атакаваны пазіцыі 1-га батальёна 34-га палсп каля в. Навасёлкі. Каля 600 салдат 330-й сд занялі вёску і пераправіліся праз раку Прыпілія. Не маючы сілаў для контратакі, немцы пакінулі вёску. Развіваючы атаку, савецкія войскі занялі в. Рагачы і бліжэйшыя вышыні 193.9 і 185. Адным палком 330-я сд атакавала в. Ягінты. На гэтым участку стварыліся перспектывы для глыбокага прарыва ў накірунку в. Новы Двор і шашы да в. Дамброва Беластоцкая. Каб не дапусціць гэтага, немцы ў спешцы сцягнулі да в. Новы Двор бліжэйшыя падраздзяленні 3-й тд СС – 3-ці сапёрны батальён СС і 3-ці дывізіён знішчальнікаў танкаў СС, узмоцнены танкамі і штурмавымі гарматамі[474]. У другой палове дня сюды ж прыбыла і 16-я рота 6-га тгр палка СС. Баі на паўночны ўсход ад в. Новы Двор працягваліся ўвесь дзень. У выніку атакі нямецкіх танкаў эсэсаўцы збілі савецкія часці з вышынь каля в. Рагачы, але цалкам ачысціць бераг рэчкі ад савецкіх падраздзяленняў не змаглі. 6 савецкіх




24 ліпеня 1944г. Адступленне нямецкай групоўкі

танкаў падышлі на паўночны бераг і прыкрылі сваю пяхоту агнём[475]. Некалькі савецкіх атак у накірунку в. Ягінты былі адбіты з вялікімі стратамі для атакуючых. Немцы замаскіравалі свае танкі і САУ у хлявах. Застаючыся незаўважнымі яны расстрэльвалі савецкую пяхоту. Толькі пасля таго як вёска была абстраляна рэактыўнымі мінамётамі "Кацюша", немцы вымушаны былі адступіць. Скончыліся баі не на карысць немцаў. 1-шы батальён 34-га палсп быў цалкам разбіты. Вялікія страты панёс і батальён 17-га палп. А 24.00 немцы былі вымушаны адтупіць далей на поўдзень.

Атака 307-й сд в. Рагожын, пры падтрымцы танкаў, прывяла да адводу лініі абароны 1-га батальёна 5-га тгр палка. Пазіцыі суседняга 1-га батальёна 6-га тгр палка былі прарваны, і савецкія часці выйшлі да ракі Дубасна. У контратацы немцы ўжылі 5 танкаў "Tiger", якія адкінулі часці 307-й сд. Аднак і рота цяжкіх танкаў панесла страты – у выніку баёў адзін танк быў пашкоджаны.

324-я сд выйшла да горада Ліпск і забяспечыла левы фланг 3-га Гв. кк. На працягу дня яна атакавала падраздзяленні 17-га палп СС каля в. Рагожын Стары.

Кавалерыйскі корпус Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскага пасля гэтага зноў быў арыентаваны ў накірунку Аўгустова. Напружаныя баі праходзілі ў раёне вёсак Ястшэмбна. Па загаду камандзіра 32-й кавалерыйскай дывізіі г.-м. І.П. Калюжнага 319-ты дывізіён рэактыўнай артылерыі абстраляў нямецкія пазіцыі чатырмя залпамі[476]. Гэта прывяло да змяншэння нямецкага кулямётнага агню.

153-я сд раніцай заняла в. Багатыры-Лясныя. А 14.00 яе 557-мы полк злучыўся з савецкімі падраздзяленнямі 50-й арміі, падышоўшымі ад ракі Нёман. У той жа дзень дывізія была выведзена на поўнач ад кавалерыйскага корпуса (у раёне в. Рыголь), дзе прыкрывала яго правы фланг (557-мы сп заняў пазіцыі ад в. Чорны Брод на поўдзень, маючы суседа справа 508-мы сп 174-й сд).[477]

Варта адзначыць, што ва ўпартых баях на плацдарме пасільную дапамогу працягвалі аказваць савецкія штурмавікі. Асобныя самалёты вылятаалі для штурмоўкі нямецкіх войск да 5-6 разоў на дзень.Так, на штурмоўкі нямецкіх войск вылятаалі "Ілы" 43-га Ваўкавыскага шап маёра Е.І. Селіванава. У баях за горад Гродна ўдзельнічаў знакаміты лётчык – штурмавік (пазней – двойчы ГСС, маршал авіяцыі СССР) камандзір эскадрыллі 198-га шап к-н А.М. Яфімаў. 24 ліпеня, пры штурмоўцы частак 3-й тд СС, ён быў збіты. Капітан А.М. Яфімаў узгадваў: "Задача – нанесці ўдар па нямецкай танкавай калоне, што высоўвалася да нашага плацдарма на Нёмане. Знайшлі дывізію хутка. Калі танкі ідуць, ад іх пыл слупом падымаецца да нябёс. Добры ўдар нанеслі. Усіх не перамалацілі, аднак затрымалі іх прасоўванне. Але

з трох падгруп усіх вядучых збілі, у тым ліку і мяне"[478]. Яму ўдалося выцягнуць сваю машыну, і ён ўпаў у размяшчэнні савецкіх частак. Экіпажы ж яшчэ 2-х збітых у гэтым выляце "Ілаў" загінулі, прычым ст. л-т. А. Сямёнаў накіраваў самалёт у скапленне танкаў. Пры штурмоўцы нямецкіх пазіцый быў збіты Іл-2 са складу 7-га Гв. шап. Пілот штурмавіка Гв. сяржант П.Ф. Шэрвін і стралок загінулі. Самалёт упаў у 500 м на захад ад в. Скрыннікі[479].

Штурмавікі Іл-2 103-га авіяпалка 20 ліпеня перабазаваліся на аэрадром за 30 км на ўсход ад Гродна. Яны выкарыстоўвалі аэрадром у Скідзеле (аэрадром быў пабудаваны яшчэ да вайны для 120-га зап). Паводле ўспамінаў І.А. Ліцвіна, мясцовага жыхара, які ў 1944 годзе дапамагаў ў абслугоўванні штурмавікоў, на аэрадроме размяшчаліся дзве эскадрыллі самалётаў па 8 адзінак у кожнай. Кожны вечар штурмавікі вылятаталі на заданне. За час прыбывання на скідзельскім аэрадроме полк страціў дзве машыны – адзін штурмавік быў збіты над плацдармам за ракой Нёман на захад ад Гродна, другі над Беластокам[480]. Верагодна, той, што загінуў над плацдармам, быў машынай ст-ны У.П. Ліхадзеда і паветранага стралка сяржанта У.П. Бабічава, збітых нямецкай зенітнай артылерыяй над в. Новы Двор 21 ліпеня[481]. Акрамя гэтых злучэнняў, у баях за Гродна ўдзельнічалі штурмавікі 62-га шап.

У в.Чарлёны дзейнічаў палявы аэрадром 162-га зап, які быў узброены знішчальнікамі Як-7 і Як-9. Камандзір экадрыллі к-н У.Г. Шчогалеў (16 збітых самалётаў) неаднаразова вылятаў на прыкрыццё сваіх войск. 29 ліпеня ён быў збіты на паўднёвы-захад ад Гродна. Лётчык выскачыў з парашутам, аднак ударыўся аб стабілізатар свайго самалёта. Пасмяротна яму нададзена званне Героя Савецкага Саюза[482]. 24 ліпеня падчас прыкрыцця сваіх войск на захад ад Гродна быў збіты іншы лётчык 162-га зап – л-т А.І. Талпенка. 26 ліпеня, пасля патрулявання над лініяй фронту, загінуў пры заходзе на пасадку камандзір звяна л-т І.В. Сілка.

У той жа дзень нямецкая авіяцыя здзейсніла налёты на пераправы праз Нёман. Так у 19.30 група да 20 самалётаў бамбіла пераправы ў м. Гожа і в. Беражаны. А 19.40 група з 12 нямецкіх самалётаў бамбіла пераправу каля в. Беражаны[483].

Апоўначы з 24 на ***25 ліпеня*** корпусная група обергрупэнфюрара К. фон Готберга адступіла на захад, на абарончую лінію "Куніца" (уздоўж ракі Сідра). Прыкрываў адыход 3-ці дывізіён знішчальнікаў танкаў СС які загадзя заняў пазіцыі ўздоўж ракі каля в. Дамброва. У 3 гадзіны ночы 16-я сапёрная рота 6-га тгр палка, знішчаючы за сабой усё, што можа быць выкарыстана для ваенных мэтаў, апошняя адышла з в. Беляны ў паўднёвым накірунку.

Паўднёвы фланг пазіцыі “Куніца” занялі паліцэйскія палкі. Так група якая складалася з 2-га палп СС (палкоўнік паліцыі Харынг), рэштак 22-га палп СС і батальёна жандармерыі размясцілася ад в. Ячна да в. Сідэрка (абедзве паміж Новым Дваром і Дамбровай). 1-шы і 2-гі батальёны 17-га палп СС занялі абарону ўздоўж ракі паміж в. Герасімовічы – Востраў. Для ўзмацнення 17-га палка ў раёне Герасімовічаў размясціўся 3-ці батальён 6-га палка СС. Паўночны фланг (на поўдзень ад Ліпска) абарону заняў 1-шы батальён 5-га палка СС[484].

25 ліпеня са штаба групы армій ізноў прыйшоў загад аб адпраўцы ўсіх падраздзяленняў 3-й тд СС у раён г. Седліцэ. 4-я нямецкая армія не магла больш утрымліваць часці танкавай дывізіі. На працягу дня некаторыя батальёны пачалі сваю перадыслакацыю (рота сярэдніх танкаў T-IV, 1-шы батальён 6-га палка СС і разведвальны батальён СС).

Савецкія падраздзяленні, тым часам, наступалі ўслед за немцамі. 330-я сд выйшла да в. Грушкі, якая знаходзілася за 10 км на паўночны захад ад Ліпска. Пры далейшым прасоўванні моцныя баі завязаліся за вёскі Ястшэмбна I і II. Падраздзяленні 337-й баявой групы і 4-га палп СС, што абараняліся тут, не вытрымалі і адступілі[485]. Згодна нямецкіх справаздач савецкія войскі падтрымлівалі танкі. Да месца прарыву былі перакінуты сапёры з 3-га батальёна СС з трыма штурмавымі гарматамі, якія, аднак, не змянілі сітуацыю на карысць немцаў. Акрамя таго, немцы падрыхтавалі да контрудара 20-ты танкавы разведвальны батальён і 3-ю батарэю двізіёна знішчальнікаў танкаў СС.

324-я сд тым часам заняла г. Ліпск і рыхтравалася да фарсіравання р. Сідра. 307-я сд выйшла да р. Сідра на ўчастку в. Рагажынец – Хільмоны (на поўдзень ад горада)[486]. У другой палове дня ўзмоцненаная разведгрупа дывізіі фарсіравала раку і спрабавала заняць в. Герасімовічы. Грэнадзёры з 3-га батальёна СС адбілі атаку і прымусілі савецкія войскі адступіць за раку. З левага фланга 307-й дывізіі, да р. Сідра выйшлі 95-я і 290-я сд 81-га корпуса. У гэты ж дзень 42-я Смаленская сд, на долю якой выпалі самыя цяжкія баі, была выведзена са складу арміі на даўкамплектаванне.

Савецкая авіяцыя працягвала патруляванне над левым берагам Нёмана. У паветраных баях у раёне на ўсход ад Аўгустова к-н І.К. Кліманаў з 49-га зап збіў два нямецкія знішчальнікі FW-190[487]. Камандзір эскадрыллі к-н В.М. Каламоец з таго ж палка збіў 25 ліпеня яшчэ адзін FW-190 у раёне в.Штабін.

Падараздзяленні 6-й кд 3-га Гв. кк выйшлі да в. Чырвоны Луг. Першай сюды ўваравалася танкавая рота 198-га тп (танкі Т-34) пад камандаваннем ст. тэхніка-лейтэнанта М.А. Фірсава. Дзякуючы хуткім дзеянням танкістаў, у вёсцы было разгромлена нямецкае па-




**25 ліпеня 1944г. Далейшае адступленне немцаў. Пазіцыя Куніца**

драздзяленне, што размясцілася тут на адпачынак[488]. Дарэчы, праз 3 дні – 28 ліпеня той жа ст. тэхнік-лейтэнант М.А. Фірсаў выкарыстаў захоплены ў папярэднім баі нямецкі танк T-VI для ўзяцця в. Парны Бруд. За гэтыя дзеянні камандзір танкавай роты быў прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза.

23-ці Гв. кп 6-га Гв. кд працягваў займаць абарону па Аўгустоўскаму каналу (в. Мікашоўка – Чорны Брод) да 27 ліпеня. Нямецкія атакі з гэтага накірунку працягваліся.

У раёне в. Пышкі мост праз Нёман пачалі будаваць 216-ты і 217-ты ісб (50-й ісбр). Таксама тут дзейнічаў і 16-тонны мост, які абслугоўвалі 87-мы апмб. 89-ты апмб абслугоўваў 9-тонны мост у раёне в. Куколі. 122-гі апмб абслугоўваў паромныя пераправы ў раёне в. Куколі (16-тонную) і в. Пышкі (таксама 16-тонную)[489].

Ноччу немцы пачалі выводзіць астатнія падраздзяленні 3-й тд СС "Мёртвая галава" у тыл для перакідкі ў 2-ю армію.

Фактычна на працягу 24-25 ліпеня камандаванне эсэсаўскай танкавай дывізіі адводзіла свае падраздзяленні з раёна баявых дзеянняў.

Да таго моманту нямецкаму камандаванню групы армій стала зразумела, што наяўнымі сіламі яно не можа ўтрымаць фронт які ўвесь час атакавалі савецкія войскі. Сілаў танкавай дывізіі было занадта мала для таго, каб "затыкаць дзіркі" у абароне групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга, скінуць савецкія войскі ў Нёман, спыніць іх новыя спробы стварыць плацдарм і адначасова знішчыць 3-ці Гв. кк Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскага.

50-я армія г.-п. І.В. Болдзіна так і не здолела стварыць дастаткова небяспечную сітуацыю для немцаў, што ўтрымлівалі свае пазіцыі практычна без зменаў на працягу шасці дзён. Назіралася выштурхванне немцаў, без імкнення іх абысці і акружыць. Аднак дывізіі 50-й арміі зрабілі галоўнае – не дапусцілі ліквідацыі свайго плацдарма і пратрымаліся да падыходу падмацаванняў. Адну з галоўных роляў у баях на левым беразе Нёмана адыграў кавалерыйскі корпус Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскага. Менавіта ён, прарваўшыся ў нямецкі тыл, змог утрымаць свае пазіцыі, прыцягваючы да сябе пры гэтым значныя нямецкія сілы. Гэтымі падзеямі заканчваюцца баі за плацдарм на левым беразе Нёмана.

Які ж вынік можна зрабіць на выснове баёў на левым беразе Нёмана на паўночны-захад ад Гродна. Па-першае: немцы спынілі наступленне войск 2-га Беларускага фронта па цячэнню ракі Нёман амаль на два тыдня. Па-другое – фронт 4-й арміі быў стабілізаваны і ўзноўлены пасля разгрому ў раёне Мінска. Па-трэцяе – прарыва ва Усходнюю Прусію летам 1944 года не адбылося. Як адзначыў ваенны гісторык і камандуючы 4-й арміяй г.-і. Курт фон Ціпельскірх: "Прарыў праціўніка праз Нёман, у выніку якога рускія падышлі да Аўгустова, здаваўся спачатку вельмі грозным, але затым быў спынены контратакамі ў фланг, распачатымі некалькімі танкавымі дывізіямі 4-й арміі. Прадпрыняты затым контрудар адкінуў рускія войскі назад да Нёмана"[490]. Такім чынам, на думку камандуючага 4-й арміяй, нямецкі контрудар 3-й тд СС выканаў сваю мэту.



**Камандзір 3-га Гв.кк ген. М.С.Аслікоўскі.**



**Камандзір 5-й Гв. кд генерал-маёр М.С.Чапуркін**



**Камандзір 6-й Гв.кд ген. П.П.Брыкель**



**Парторг 24-га Гв кп к-н Астроўскі і камандзір мін.батарэі 24-га Гв. кп к-н Плюта. Лета 1944 г.**



**Палявая друкарня газеты "Коннагвардзеец" 3-га Гв. кк**



**Камандзір 2-й баратэі 178-га Гв. Конна-арт. палка Гв. ст. л-т М.Г. Гарабчук**



**Лейтэнант медслужбы 6-й Гв. кд М. П. Быкель**



**Камандзір кулямётнага ўзвода ДШК 6-й Гв. кд л-т Х.Гарэлік**



**Генерал М.С.Аслікоўскі - другі злева, каля пагранічнага слупа на старой дзяржаўнай мяжы на захад ад Гродна. Воўкуш, ліпень 1944 г.**



**Фарсіраванне Нёмана адным з савецкіх падраздзяленняў. Ліпень 1944 г.**



**Маёр У.У.Самгін, камандзір 99-га пантоннага батальёна**



**С.Ф.Іваноў побач з адным са сваіх пантонаў, які быў падняты са дна Нёмана ў 1970-я гг.**



**Аперацыя Баграціён. Байцы АШІСбр размініруюць дарогу. Калона Студэбекераў можа ехаць спакойна**



**Штурмавікі ці "ракі" 1-й Гв. інжынерна штурмавой брыгады. Лета 1944г.**



**Камандзір 1-й Гв. АШІСбр палкоўнік Везіраў і афіцэры падраздзялення.**



**Палкоўнік А.І.Сліц, камандзір 42-й сд**



**Лейтэнант М.Г.Падгурскі, камандзір 2-й роты 455-га сп 42-й сд**



**Намеснік камандзіра 455-га палка 42-й сд маёр М.У.Сідарэц**



**Камандзір 290-й сд генерал-маёр І.Г.Гаспаран**



**Мл. с-т 241-га сп 95-й сд А.Е.Німцовіч трапіў у акружэнне на плацдарме на захад ад Гродна. Яго схавалі мясцовыя жыхары**



Начальнік аператыўнага адзела 3-й тд СС оберштурмбанфюрар Э.Эберхард



Оберштурмбанфюрар Э.Хаўслер, камандзір 5-га тгр палка СС



Штурмбанфюрар К.Ульрых, камандзір 6-га тгр палка СС



Штурмбанфюрар Л.Массары, камандзір 3-га разведвацельнага батальёна СС.



Эмблема 3-й тд "Мёртвая галава"



В.Матэрн, камандзір 7-й роты 3-га тп СС



Штурмбанфюрар А.Пітчэліс камандзір 3-га батальёна знішчальнікаў танкаў СС.



**StuG-40 Ausf. G з 3-й тд СС. Лабавое браніраванне ўзмоцнена дадатковымі плітамі. Барта прыкрыты супрацькумулятыўнымі шчытамі. Ліпень 1944 г.**



**Sd. Kfz. 11 з 13-й роты 5-га тгр палка СС буксіруе цяжкую пяхотную гармату s.I.G. 33. Ліпень 1944 г.**



**Падраздзяленне 3-й тд СС у наступленні – Schwimmwagen тып 166 і StuG. Раён Дамбровы Беластоцкай. Ліпень 1944 г.**



**Цяжкі танк Т-VI з 9-й роты 3-га тп СС. Ліпень 1944г. Танк замаскіраваны галлём**



**САУ Hummel са 116-га артылерыйскага палка 5-й тд. Лета 1944 г.**



**Тактычнае абазначэнне 5-й тд.**



**САУ Grille Ausf.H са складу 5-й тд. Лета 1944 г.**



**Новы Т-IV падбіты пад Кузніцай. На танку завадская афарбоўка. Ззаду знішчаныя савецкія Т-34. Ліпень 1944 г.**



**Тактычнае абазначэнне 19-й тд**



**Разлік 150-мм гаўбіцы s.F.H. 18 займае пазіцыі. Раён Гродна. Ліпень 1944 г.**



**Форт №1. Месца напружаных баёў 455-га сп 42-й сд у ліпені 1944 г.**




**Танк T-IV Ausf. J і бранятранспарцёр SdKfz-251-3 з 19-й тд. Лета 1944 г.**

# РАЗДЗЕЛ 5.

# БАІ НА СВІСЛАЦКІМ ФРОНЦЕ

Адначасова з баямі на плацдарме на левым беразе Нёмана, упартыя баі праходзілі на поўдзень ад Гродна, па цячэнні ракі Свіслач. Трэба адзначыць, што лінія фронта, якая ўсталявалася па плыні ракі Нёман у раёне г.Гродна, працягвалася на поўдзень уздоўж Свіслачы. Рака з'яўляецца прытокам Нёмана. Непадалёку ад вусця ракі Свіслач знаходзіцца вёска з аднайменнай назвай (не блытаць з горадам Свіслач у сучаснай Гродзенская вобласці). Нямецкія пазіцыі ўздоўж ракі перашкаджалі савецкаму наступленню ў накірунку г. Беласток.

Савецкія падраздзяленні 50-й арміі ў ходзе Беластоцкай франтавой аперацыі павінны былі авалодаць цэнтрам вобласці горадам Беласток. 4 снежня 1939 г., пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР. Для гэтага левафлангавым карпусам 50-й арміі трэба было фарсіраваць раку Нёман у раёне на поўдзень ад м.Скідзель і працягваць далейшае наступленне па яе левым беразе.

Па загаду камандуючага 50-й арміяй г.-л. І.В.Болдзіна ад 12 ліпеня 1944 г. 70-ты (64-я і 199-я сд) і 121-шы (139-я і 238-я сд) ск павінны былі наступаць па левым беразе ракі Нёман і да 13 ліпеня выйсці на мяжу вёсак Малахавічы – Капцёўка – Індура (усе населеныя пункты на паўднёвы-усход ад Гродна) і фарсіраваць раку Свіслач[491]. Сусед 50-й арміі злева – 3-я савецкая армія ген. А.В. Гарбатава – па загаду камандуючага фронтам ад 9 ліпеня павінна была да канца 12 ліпеня таксама выйсці на ўсходні бераг ракі Свіслач. Такім чынам, галоўнымі "героямі" гэтай главы будуць два левафлангавых стралковых корпуса 50-й арміі. 139-я сд трэцяга фарміравання была ўтворана ў канцы 1941 года. Дывізія больш чым на 70% складалася з чувашэй. 238-я дывізія другога фарміравання была арганізавана летам 1942 года ў Арзамасе. У сваім складзе налічвала 19% асуджаных і 0,87% быўшых у палоне. 64-я і 199-я дывізіі таксама былі знішчаны ў пачатку вайны і фарміраванне іх адбылося ў другі раз.

Па загаду камандвання 50-й арміі (17.15 ад 13.07.1944 года) 70-ты ск г.-м. В.Г. Цярэнцьева[492] ва ўзаемадзеянні з 4-й зстабр павінен быў фарсіраваць раку Нёман на ўчастку вёскі Міневічы – м. Лунна і наступаць у паўднёва-заходнім напрамку ў накірунку мястэчка Вялікая Бераставіца. Гэтым манеўрам камандаванне арміі спадзявалася акружыць ваўкавыскую групоўку немцаў, якая адыходзіла ў заходнім напрамку пад націскам савецкай 3-й арміі. На чале наступаючых падраздзяленняў корпуса павінен быў прасоўвацца рухомы атрад.

Раніцай **14 ліпеня** 1944 г. падраздзяленні 40-га ск генерала В.С.Кузняцова з 3-й арміі ў выніку непрацяглых баёў занялі горад Ваўкавыск[493]. Аднак часці 3-й арміі не змаглі адразу ж фарсіраваць невялікую р.Рось. Немцы, выкарысталі яе для затрымкі савецкага наступлення. Сіламі 12-й тд, а таксама часткамі 367-й пяхотнай і 28-й легкапяхотнай дывізій яны запаволілі рух савецкіх дывізій ажно да 16 ліпеня[494]. Такім чынам, выхад падраздзяленняў 3-й арміі да р. Свіслач зацягваўся.

Галоўную ролю ў арганізацыі нямецкай абароны на захад ад Ваўкавыска адыгрывала 12-я тд (камандзір генерал Э. фон Бодэнхаўзэн). Дывізія была значна аслаблена на працягу папярэдніх баёў. Аднак бранятэхніка, якая яшчэ засталася ў яе падраздзяленнях выкарыстоўвалася для стрымання савецкіх войск. На 10 ліпеня 1944 г., паводле савецкай інфармацыі, у 12-й танкавай дывізіі было 25 танкаў і 35 САУ[495]. Паводле нямецкай інфармацыі, на 12 ліпеня 1944 г. у дывізіі знаходзілася: 1 танк T-IV, 6 САУ "Wespe", 15 гармат (10 – лёгкіх, 3 цяжкіх і 2 – супрацьтанкавыя)[496]. Поўнасцю ўкамплектаваны разведвальны батальён дывізіі дзейнічаў асобна, у складзе карпуснай групы г.-арт. Г. Вейдлінга ў раёне Гродна.

У адрозненні ад падраздзяленняў 3-й арміі, якія спыніліся на рубяжы ракі Рось, часці савецкай 50-й арміі наступалі па правым беразе Нёмана. Такім чынам ім удалося вырвацца наперад. Перад імі дзейнічала карпусная група г.-арт. Г. Вейдлінга, якая ўваходзіла ў склад 4-й нямецкай арміі. 121-шы і 122-гі грэнадзёрскія палкі 50-й пд займалі пазіцыі па правым беразе ракі Нёман па вёсках Каўшова – Котра – Гушчыцы – Юрэвічы. 123-ці гп 50-й дывізіі пераправіўся на левы бераг Нёмана і забяспечыў абарону баявой аховай па цячэнню ракі ад вёскі Дубна да вёскі Каўшова[497].

Яшчэ 13 ліпеня дывізіі 70-га ск г.-м. В.Г. Цярэнцьева 50-й арміі падышлі да ракі Нёман на адрэзку мястэчка Лунна – вёска Каўшова. Першай да ракі падышла 64-я Магілёўская сд г.-м. Ц.К. Шкрылева. Перад падраздзяленнямі дывізіі стаяла задача хутка фарсіраваць Нёман і стварыць плацдарм для 70-га корпуса. Так, у 16 гадзін 440-ы сп 64-й сд пасля непрацяглага бою заняў вёску Каўшова. Немцы,

не ўступаючы ва ўпартыя баі, адышлі. 433-ці сп дывізіі заняў лясны масіў на паўночным беразе ракі Нёман насупраць мястэчка Лунна. 451-ы сп, знаходзячыся ў другім эшалоне дывізіі, сканцэнтраваўся на поўдні ад в. Лаўна[498]. Заняўшы плацдарм на паўднёвым беразе, 1-шы батальён 433-га сп ў 19.00 фарсіраваў раку на ўсход ад мястэчка Лунна.

Ноччу з 13 на 14 ліпеня групы 2-га стралковага батальёна 433-га сп 64-й сд, падышлі да ракі Нёман і фарсіравалі яго каля Лунна. Як ужо адзначалася вышэй у ваколіцах мястэчка абарону заняў 123-ці грэнадзёрскі полк пад кіраўніцтвам палк. Г. Гізэна. Нешматлікія нямецкія войскі вымушаны былі расцягнуць свае пазіцыі ўздоўж берага. У мястэчку забяспечваў абарону 1-шы батальён 123-га палка, узмоцнены 9-й батарэяй 150-га артылерыйскага палка 50-й пд[499]. Першая спроба фарсіраваць раку Нёман савецкімі войскамі была няўдалай – батальён 64-й дывізіі быў разгромлены[500]. Паводле інфармацыі М. Дзелянкоўскага, батальёну 433-га сп было загадана захапіць мост праз раку Нёман, які знаходзіўся ў мястэчку Лунна. Распачаўшы атаку, рота батальёна імгненна апынулася на мосце. Аднак немцы ўзарвалі мост разам з савецкімі салдатамі. Тады камандзір батальёна загадаў фарсіраваць раку ў раёне мястэчка падручнымі сродкамі. Узводы с-таў Паўлава і Палякова фарсіравалі раку Нёман і захапілі плацдарм на супрацьлеглым беразе. У выніку нямецкіх контратак абодва ўзводы былі знішчаны[501].

Трэцяя спроба фарсіравання ракі ў раёне мястэчка Лунна аказалася больш удалай. Група камандзіраў узводаў л-таў С.З. Сухіна і П.Я. Жолудзя з шасці чалавек (ст. с-т С.М. Калінін, рад. І.І. Асінны, М.С. Майдан, А.П. Нічапурэнка, Т.І. Салапенка, І.Г. Шарамет) захапіла на левым беразе ракі Нёман плацдарм каля 50 м у глыбіню і па фронце на ўсход ад мястэчка. Да гэтага часу невядома, колькі чалавек прымала ўдзел у гэтай аперацыі. Паводле інфармацыі лунненскага краязнаўцы М.У. Сімака, пераправу распачалі два ўзводы 433-га сп. Аднак да супрацьлеглага берагу змаглі дабрацца толькі 8 чалавек. Група фарсіравала раку Нёман у 14 гадзін дня, на вачах у немцаў. Каб пераплыць раку, байцы прывязалі абмундзіраванне да галоваў. І як толькі па іх адкрыўся агонь, кожны кінуў вопратку і нырнуў у ваду. Такім чынам, савецкія салдаты пераплылі раку. Трое з групы былі параненыя каля самага берага. Група л-таў С.З. Сухіна і П.Я. Жолудзя заняла плацдарм на нізкім балоцістым адрэзку, дзе немцы не чакалі з'яўлення савецкіх частак. Кінуўшыся ў атаку, л-т С.З. Сухін, М.С. Майдан і А.П. Нічапурэнка захапілі нямецкі кулямёт. Абкапаўшыся, група заняла пазіцыі. Падчас баёў групе л-та С.З. Сухіна пашчасціла захапіць яшчэ адзін нямецкі кулямёт. Па інфармацыі, прыведзенай

ў савецкай літаратуры, і па ўспамінах л-та С.З. Сухіна, група пратрымалася цэлыя суткі, адбіўшы "12 нямецкіх атак, больш за 150 фашыстаў было забіта, каля 300 паранена"[502]. У гэтых баях загінуў кулямётчык І.Г. Шарамет. Усе астатнія байцы былі параненыя. Сваімі дзеяннямі група адцягвала ўвагу немцаў ад месца пераправы праз раку Нёман. Ужо раніцай 14 ліпеня падраздзяленні 433-га палка фарсіравалі раку і далучыліся да групы л-та С.З. Сухіна. Удзельнікам аперацыі было прысвоена званне Герояў Савецкага Саюза. Аднак ўзнагароджана гэтым званнем было толькі 7 чалавек. Л-ту П.Я. Жолудзю не была прысвоена гэтая ўзнагарода, ён увогуле не значыўся сярод удзельнікаў фарсіравання ракі Нёман. Яшчэ, пачынаючы з 1965 года, адзін з удзельнікаў пераправы – С.М. Калінін некалькі разоў пісаў у Палітупраўленне Беларускай ваеннай акругі з нагоды ўзнагароджання лейтэнанта П.Я. Жолудзь, аднак яго лісты засталіся без адказу. Па інфармацыі лунненскага гісторыка і краязнаўцы М.У. Сімака, лейтэнант П.Я. Жолудзь, беларус па нацыянальнасці, прыбыў у дывізію незадоўга да аперацыі адразу пасля заканчэння курсаў камандавання. Ён загінуў у тым жа 1944 годзе. Аднак яго імя наогул было выкрэслена са спісаў удзельнікаў фарсіравання ракі Нёман. Толькі шмат пазней – праз 20 гадоў пасля вайны, С.М. Калінін, прыехаўшы ў мястэчка Лунна, на юбілей вызвалення населенага пункта ўспомніў аб сваім камандзіры ўзвода. Аж да сённяшняга дня ва ўсёй літаратуры, прысвечанай баям за мястэчка Лунна, згадваюцца толькі 7 чалавек. Чаму быў "забыты" лейтэнант П.Я. Жолудзь застаецца невядомым[503].

Да раніцы наступнага дня ўсе падраздзяленні 70-га ск г.-м. В.Г. Цярэнцьева павінны былі фарсіраваць раку Нёман і працягваць наступленне на паўднёвым беразе. Аднак хуткае і паспяховае прасоўванне 64-й дывізіі, якое не было, аднак падтрымана астатнімі падраздзяленнямі корпуса, паставіла яе ў вельмі цяжкае становішча.

Выхад савецкай дывізіі да мястэчка Лунна і в.Каўшова адкрываў магчымасць фарсіраваць Нёман адразу ў двух месцах. Камандзір 64-й Магілёўскай дывізіі г.-м. Ц.К. Шкрылёў планаваў пачаць фарсіраванне Нёмана ў в. Каўшова двума астатнімі палкамі дывізіі, аднак баі наступнага дня сарвалі яго планы.

Фарсіраванне Нёмана ў Каўшова давала магчымасць савецкім часцям адразу ж адсячы нямецкі 123-ці гп 50-й пд, які яшчэ ўтрымліваў мястэчка Лунна. Акрамя таго, заняцце вёскі Каўшова, магло б прывесці да акружэння нямецкіх 121-га і 122-га гп 50-й пд.

14 ліпеня, улічваючы фарсіраванне Нёмана на ўсход ад м. Лунна часцямі Чырвонай арміі, камандзір 50-й пд г.-м. Г. Хаўс вырашыў: па-першае, атакаваць невялікі пакуль савецкі плацдарм сіламі 123-га

гп сваёй дывізіі; па-другое, пачаць перакідванне сіл 121-га і 122-га палкоў на паўднёвы бераг Нёмана, каб выключыць магчымасць іх адсячы савецкімі войскамі. З 7.00 раніцы немцы ажыццяўлялі моцныя атакі па двух батальёнах 433-га сп 64-й сд, якія ўтрымлівалі плацдарм на паўднёвым беразе Нёмана на ўсход ад Лунна. За дзень 433-ім палком было адбіта пяць нямецкіх атак, якія здзяйсняліся пры падтрымцы адной мінамётнай, адной артылерыйскай батарэямі і трох САУ[504].

Вельмі моцныя атакі немцы пачалі прадпрымаць за ўтрыманне вёскі Каўшова з поўначы на пазіцыі 440-га сп ппалк. Юроўскага. У выніку гэтых атак камандзір 64-й сд г.-м. Ц.К. Шкрылёў загадаў адыходзіць абодвум сваім палкам на ўсход да месца фарсіравання Нёмана батальёнамі 433-га сп у раён в. Княжаводцы. У ноч на 15 ліпеня сіламі гэтых палкоў былі здзейснены спробы пераправіць на паўднёвы бераг падмацаванне батальёнам 433-га сп, якія вялі баі за мястэчка Лунна. Гэтыя спробы, безумоўна, скончыліся беспаспяхова.

Камандзір 64-й дывізіі загадаў фарсіраваць Нёман яшчэ больш на ўсход – у в. Дубна. Пасля фарсіравання ракі яны павінны былі абысці Лунна з паўднёвага ўсхода і ўзяць яго. У в. Дубна фарсіравалі раку палкі 199-й сд, якія занялі пазіцыі каля в. Касілы – Тупічаны і якія працягнулі баі ўжо на паўднёвым беразе Нёмана.

Часці групы г.-л. Г.Флёрке увечары 14 ліпеня арганізавалі абарону перадмостнага ўмацавання ў в. Коматава. Пераправа, якая знаходзілася побач з вёскай, адыгрывала галоўную ролю ў адступленні нямецкіх войскаў на левы бераг Нёмана. Увечары група палк. Г.Трэптава (1-шы батальён 101-га гп, 2-гі батальён 1065-га гп, 2-гі батальён 1068-га гп) адступіла да в. Коматава і заняла абарончыя пазіцыі за 3,5 км на ўсход ад вёскі, абараняючы пераправу астатніх падраздзяленняў дывізійнай групы праз раку.

Раніцай 14 ліпеня ў раён в. Пузавічы (2 км на поўдзень ад мястэчка Скідзель) выйшлі перадавыя падраздзяленні 139-й Чырвонасцяжнай Раслаўльскай стралковай дывізіі г.-м. І.К. Кірылава (718-ы, 609-ы і 364-ы сп). Палкі дывізіі вялі дастаткова цяжкія баі ўсю першую палову дня. Ветэран тых баёў У.І.Плотнікаў узгадваў: “На правым флангу ў асабліва цяжкіх умовах вяла бой група л-та Пятра Фадзеева. Байцы мужна біліся з перавышаючымі ў некалькі разоў сіламі ворага. Усе яны, за выключэннем радавога Елізарава, загінулі”[505]. Адціснуўшы падраздзяленні 718-га сп палк. Семенчука, немцы акружылі роту старэйшага л-та Аверына. Апынуўшыся ў вогненным мяшку, рота страціла сувязь з палком. На працягу дня рота адбіла 11 атак немцаў. Сабраўшы сілы, часці дывізіі атакавалі немцаў, вызвалілі роту Аверына і выйшлі на мяжу вёсак Плавы – Каўшова.

**15 ліпеня** пазіцыі правага фланга карпуснай групы г.-арт. Г. Вейдлінга працягнуліся ад мястэчка Воўпа і далей па рацэ Нёман да в. Мазанава. На гэтым адрэзку (па левым беразе) і заняла абарону ўсімі сваімі палкамі нямецкая 50-я пд[506]. На правым беразе Нёмана, ад перадмастнога ўмацавання ў в. Коматава да в. Жытомля, абаранялася баявая група г.-л. Г. Флёрке[507]. Такім чынам, пазіцыі карпуснай групы (50-й пд і групы г.-л. Г. Флёрке) раздзяляліся ракой, што з'яўлялася значнай цяжкасцю для нямецкай абароны і камандавання. Асноўныя пераправы групы г.-арт. Г. Вейдлінга, якія знаходзіліся ў вёсках Коматава і Мігава, не маглі цалкам ліквідаваць праблемы, звязанай з пераброскай рэзерваў з аднаго фланга на другі.

Да 6.00 гадзін раніцы 451-шы сп ппалк. Стрэльнікава пераправіўся праз Нёман на левы бераг, выйшаў да вёскі Бабры і пачаў рухацца ўздоўж ракі да мястэчка Лунна, атакаваўшы яго з паўднёвага ўсходу. За ім накіраваўся 440-вы сп дывізіі[508]. Батальёны 433-га сп (сумесна з палкамі 199-й сд) ппалк. Мяншова пачалі баі за мястэчка, атакуючы яго з усходу. Дывізіі 70-га ск г.-м. В.Г. Цярэнцьева ў гэтых баях падтрымлівалі 27-я знішчальна-супрацьтанкавая брыгада, 85-ты Гв. гаўбічны артылерыйскі полк, 4-ты асобны штурмавы інжынерна-сапёрны батальён 1-й Гвардзейскай брыгады[509]. Немцы сіламі 123-га грэнадзёрскага палка здзейснілі контратакі па плацдарме 70-га корпуса ў в. Падбараны, Улазы, Гледневічы, якія не мелі поспеху. Мястэчка Лунна было цалкам вызвалена ад немцаў. У баях за населены пункт 433-ці полк страціў забітымі 58 чалавек радавога складу[510]. Жыхарка в. Залескі (у 2 км на поўдзень ад мястэчка) Зінаіда Глод успамінала: "... над намі з'явіўся савецкі самалёт. Адтуль па радыё казалі: "Увага! Увага! Грамадзяне, сёння нашымі войскамі вызвалілі Рось, Воўпа, Лунна..." Усе вельмі ўзрадаваліся, выбеглі. Па шашы, балоце, лесу ішлі нашыя. Усе салдаты былі абарваныя, разутыя, новымі былі толькі пагоны. Есці ніхто з іх нічога не прасіў. Наступалі яны хутка, увесь час бегам. Казалі што гэта "штрафнікі""[511].

На працягу дня ў выніку атак войскаў 70-га ск г.-м. В.Г. Цярэнцьева нямецкая 50-я пд павінна была "планамерна адводзіць" (як сказана ў нямецкіх крыніцах) свой правы фланг на адрэзак в. Астрова – Лунна. Моцныя контратакі былі прадпрыняты немцамі ў раёне вёсак Мазанава – Падбараны, каб стрымаць савецкія войскі, якія фарсіравалі Нёман і на гэтым адрэзку.

Да ракі Нёман ў в. Коўшава падышоў перадавы 609-ты стралковы полк 139-й сд. Ён атрымаў загад фарсіраваць раку. Падчас падрыхтоўкі да фарсіравання ў тыл палка выйшлі нямецкія падраздзяленні групы г.-л. Г. Флёрке, якія прарываліся да ракі. Камандзір 609-га палка ппалк. В.І. Грышаеў загадаў развярнуць на ўсход роту снайпераў

і аўтаматчыкаў. Група немцаў была разбіта. Такім чынам, пераправа праз Нёман ажыццяўлялася ва ўмовах выхаду з акружэння нямецкіх частак, якія атакавалі савецкія падраздзяленні ў тыл.

Першымі са 139-й сд на супрацьлеглы (левы) бераг пераправілася група пад камандаваннем с-та М.М. Логінава (162-я асобная разведвацельная рота) ў складзе трох чалавек. Група схапіла "языка" і такім чынам даведалася пра сістэму аховы і агню немцаў. У 14.00 атрад добраахвотнікаў з 609-га сп у складзе сямі чалавек (пад камандаваннем камандзіра ўзвода 3-й роты л-та М.І. Баброва)[512] захапіў плацдарм у раёне вёсак Міневічы – Багатырэвічы. Немцы адразу ж контратакавалі плацдарм, але былі адбіты савецкім артылерыйскім агнём з супрацьлеглага берагу. Да гэтага моманту атрад ужо быў узмоцнены перадавым падраздзяленнем 1-га батальёна пад камандаваннем к-на В.В. Фаціна. За ім фарсіраваў раку і ўвесь полк. У мястэчку Лунна тым часам пашырыўся плацдарм 70-га ск (64-я і 199-я сд), які ў поўным складзе пераправіўся праз раку.

Усе падраздзяленні нямецкай 50-й дывізіі, якія не ўтрымалі лініі ракі Нёман і не спынілі савецкія войскі, пачалі адступленне на захад, да ракі Свіслач. Яны здолелі адарвацца ад савецкіх частак, якія праследвалі іх. Аднак ужо ўвечары таго ж дня немцы зноў былі вымушаны адступаць на захад. У выніку выхаду да Нёмана і фарсіравання яго ў раёне в. Каўшова савецкімі падраздзяленнямі, а таксама моцных атак па адыходзячым палкам нямецкай дывізіі ў раёне на поўнач ад вёсак Дубраўляны, Хамічі і Мартынаўцы камандзір 50-й пд г.-м. Г. Хаўс загадаў сваім палкам адыходзіць на рубеж р. Свіслач. Ён непакоіўся, што падраздзяленні 121-га ск г.-м. Д.І. Смірнова з 50-й арміі г.-л. І.В. Болдзіна змогуць заняць даліну ракі Свіслач раней за яго падраздзяленні. Тады 50-я нямецкая дывізія была б адсечана з захаду ад групы г.-арт. Г. Вейдлінга. Адступленне немцаў ад мястэчка Лунна прыкрывалі сілы 1-га батальёна 123-га грэнадзёрскага палка. У выніку баёў за мястэчка нямецкі батальён панёс вялікія страты. 9-я батарэя 150-га артылерыйскага палка была знішчана. Дарэчы, у баях у раёне м. Лунна прапаў без вестак камандзір 122-га грэнадзёрскага палка м-р Хеінрых Гласмашэрс[513].

У выніку баёў савецкія войскі і выйшлі на лінію: вышыня 149,8 – Жылічы (64-я сд), в. Машталеры – Астрова (199-я сд). Дарогу Лунна – Свіслач у в. Жылічы перакрыў батальён 123-га гп. На некаторы час ён затрымаў наступаючыя савецкія войскі, аднак, хутка вымушаны быў адыходзіць далей.

Рубеж р. Свіслач, дзе мусіла праходзіць новая нямецкая лінія абароны, быў умацаваны немцамі загадзя з мэтаю стабілізавання лініі

фронту. Ён павінен быў з'яўляцца працягам нямецкай абароны па р. Нёман. Рака Свіслач (дасягала 10-15 метраў у шырыню) была адзінай перашкодай на шляху савецкіх войскаў. Яе забалочаныя берагі давалі магчымасць спыніць на нейкі час часці 50-й арміі, якія рваліся на захад а 4-й гадзіне раніцы. Уздоўж левага берагу ракі былі адкрыты 3-4 лініі акопаў. Акрамя таго, былі падрыхтаваны артылерыйскія пазіцыі.

Вялікім поспехам падраздзяленняў 121-га ск 50-й арміі быў выхад да нямецкага перадмостнага ўмацавання ў в. Коматава, куды паспешліва адступалі пасля цяжкіх баёў за в. Жытомля часткі баявой групы г.-л. Г. Флёрке. Каля 18.00 савецкія войскі атакавалі нямецкае перадмостнае ўмацаванне 1065-га і 1068-га грэнадзёрскіх палкоў. У выпадку прарыву савецкіх войскаў да Нёмана і пераправе ўзнікла пагроза адсячэння групы г.-л. Г. Флёрке і акружэння яе. Нямецкія падраздзяленні групы ппалк. Г.-М. Фрычэ (1069-ты грэнадзёрскі полк і рэшткі 11-га палка) былі вымушаны пачаць паспешлівую пераправу на левы бераг. Савецкія атакі аднак не мелі поспеху. Тым не менш, савецкі артылерыйскі абстрэл пашкодзіў нямецкую пераправу. Рамонт пераправы пачаўся а 4-й гадзіны раніцы 16 ліпеня. Уся рака (аж да в. Коматава) вышэй па цячэнні ўжо кантралявалася савецкімі войскамі. Да канца дня падраздзяленні групы г.-арт. Г.Вейдлінга ўтрымлівалі толькі вузкую палоску па Нёмане ад в. Коматава да в. Жылічы (у 10 км на паўднёвы ўсход ад г. Гродна, не блытаць з аднайменнай вёскай на захад ад м. Лунна) – Шчэцінава, дзе яны судатыкаліся з 2-м палп СС групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга[514].

У 24.00 г.-л. І.В. Болдзін загадаў 121-му і 70-му ск да канца 16 ліпеня выйсці на рубеж вёсак Бакуны – Кузніца – Шымакі (8 км на поўдзень), а таксама быць гатовым нанесці ўдар па Занёманскім фарштаце ў паўднёвай частцы Гродна[515].

**16 ліпеня** для немцаў сітуацыя на фронце па рацэ Свіслач значна пагоршылася Адступаючы сюды напярэдадні 50-я пд не паспела як належыць замацавацца. Пазіцыі дывізіі выглядалі наступным чынам: 123-ці гп – у раёне в. Белева – Лаша, а 122-гі гп – на левым флангу ў раёне в. Агароднікі – Дарашэвічы. 121-ы полк дывізіі яшчэ не фарсіраваў Нёман і знаходзіўся на правым беразе ракі. Фронт дывізіі распрасціраўся на 15 км. Слабым месцам нямецкай абароны было тое, што дывізія не мела сувязі са сваім суседам справа. Тут г.-м. Г. Хаўс сканцэнтраваў свае рэзервы: 150-ы дывізіён знішчальнікаў танкаў і 13-ю роту пяхотных гарматаў 123-га гп. Аднак, паводле інфармацыі якую прыводзіць нямецкі гісторык Р. Хінцэ, многія салдаты роты былі ўзброеныя толькі пісталетамі[516]. Абарону ўздоўж берага Нёмана заняў 783-ці сапёрны батальён маёра Эйса і 1069-ты гп ппалк. Г.




**16 ліпеня 1944г. Становішча групы Вейдлінга. Немецкая вайсковая карта**

Фрычэ. Яшчэ далей па цячэнні ракі пазіцыі ўтрымліваў 2-гі палп СС. Гэтыя падраздзяленні павінны былі перашкаджаць фарсіраванню Нёмана савецкімі часцямі ў тыле 50-й дывізіі. Дзеля стрымання савецкіх падраздзяленняў, было вырашана выкарыстаць 12-ты танкавы разведвальны батальён пад камандаваннем м-ра Г. Энгелійна. Ён павінен быў адкінуць савецкія войскі за раку Свіслач і ўсталяваць сувязь з суседам справа – 12-й тд 2-й арміі, што абаранялася ў раёне в. Магіляны. Прамежак паміж вёскамі Канюхі – Пракаповічы (на поўдзень ад Індуры) не быў заняты нямецкімі падраздзяленнямі нагул. Гэты ўчастак павінен быў заняць 121-ы гп палк. В.Неўмана, які, як адзначалася вышэй, знаходзіўся на правым беразе Нёмана.

Яшчэ ў ноч на 16 ліпеня PzAA 12 выйшаў у раён на паўднёвы ўсход ад Гродна. На працягу ночы была праведзена разведка мясцовасці ў раёне будучых баёў. Дадзеныя разведкі паказалі, што ў раёне в. Мігава – Кавальцы чутны гукі шматлікай савецкай тэхнікі, магчыма танкаў. Аднак пераправа праз Нёман яшчэ не пачыналася. Гэтая інфармацыя адносілася да 238-й сд 121-га ск. Дывізія яшчэ не фарсіравала раку і знаходзілася на правым беразе ракі ў раёне в. Коматава, дзе вяла баі са 121-ым гп.

Пасля выканання гэтай задачы, 12-ты танкавы разведвальны батальён да 12 гадзін дня заняў пазіцыі на паўднёвы-усход ад м.Індура. Такім чынам, лінія фронту паміж 4-й і 2-й нямецкімі арміямі была ўзноўлена. Штаб батальёна размясціўся ў в.Жытарудзь (2 км на поўдзень ад Індуры). Роты батальёна злучыліся з баявой групай 59-га тгп, якая ўваходзіла ў склад 12-й тд (пазіцыі ў раёне в. Ярмолічы – Ёдкавічы, на паўднёвы ўсход ад Індуры)[517]. Група складалася з: аднаго танка T-IV, чатырох супрацьтанкавых гарматаў і 500 салдат.

Як жа развіваліся на працягу дня атакі наступаючых савецкіх дывізій 50-й арміі? На працягу дня напружаныя баі вяліся за нямецкае перадмостнае ўмацаванне ў в. Коматава. У гэтым раёне наступалі палкі 238-й дывізіі. Атакай з поўначы часці дывізіі захапілі нямецкае перадмостнае ўмацаванне ў в. Мігава. Цяпер у распараджэнні карпусной групы засталіся толькі паромы ў в. Коматава. Пасля рамонту пантоннага моста ў Коматава, аднавілася пераправа частак 121-га гп праз раку. Цягам дня савецкая артылерыя двойчы ізноў разбівала нямецкую пераправу, але немцы аднаўлялі яе[518]. Так для аднаўлення гэтай пераправы, па загаду камандзіра групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга з мястэчка Саколка была адпраўлена рота з 3-га сапёрнага батальёна СС са складу дывізіі "Мёртвая галава". Ноччу немцы цалкам эвакуявалі свае войскі на левы бераг ракі Нёман, вывезлі і ўсе цяжкае ўзбраенне. Раніцай 17 ліпеня часці групы г.-л. Г. Флёрке знішчылі пантоны і пераправу праз раку. Такім чынам, нягледзячы на атакі савецкіх падраздзяленняў, пагрозу акружэння, немцы паспяхова скончылі сваё адступленне праз раку.

139-я Раслаўльская сд цалкам фарсіравала Нёман, прычым 718-ым і 364-ым палкамі на поўнач ад вусця Свіслачы. 609-ты сп ппалк. В.І. Грышаева вёў наступленне па левым беразе Нёмана ў напрамку в.Квасоўка. На працягу дня палкі дывізіі выйшлі да ракі Свіслач і часткова фарсіравалі яе (609-ты сп). Падраздзяленні вялі баі ў раёне вёсак Сухая Даліна – Дзекалавічы – Дарашэвічы – Гарны[519].

Акрамя таго, савецкія часці атакавалі батальёны карпусной групы на поўдні, у месцы сутыку з падраздзяленнямі 2-й арміі. Так, палкі 199-й сд (паводле інфармацыі немцаў, узброеныя танкамі) збілі нямецкія заслоны PzAA 12 на ўсход ад в. Рагачы і каля 13.00 занялі вёску. Такім чынам рака Свіслач была фарсіравана. Баявая ахова групы палкоўніка Р. Дэмэ (59-ты тгп) узарвала мост праз Свіслач у в. Ярмолічы і адышла за раку. Тым часам падраздзяленні 199-й сд працягвалі атаку ў напрамку в. Луцкаўляны (у 1 км на ўсход ад в. Пракаповічы). Працяг савецкіх контратак быў вельмі небяспечны для немцаў. У выпадку, калі б ён быў развіты савецкімі

войскамі, абарона правага флангу нямецкай 4-й і левага флангу 2-й армій ставіліся б пад пытанне. Савецкаму камандванню трэба было як мага хутчэй накіраваць у месца прарыва матарызаваныя сродкі. Аднак гэтага зроблена не было.

Для контратакі батальёнаў 199-й дывізіі камандваннем 50-й дывізіі быў высланы 150-ты супрацьтанкавы дывізіён. Дывізіён складаўся са штаба і 1-й батарэі, пад камандваннем м-ра З.Кюра. Акрамя таго, сюды была накіравана і 13-я рота 123-га гп. Падтрымлівалі атаку бронетранспарцёры 12-га танкавага батальёна. Дарэчы, за бai ў раёне горада Гродна камандзір батальёна маёр Г. Энгелійн атрымаў Жалезны крыж[520].

Аднак нямецкая контратака скончылася беспаспяхова. Палкі 199-й дывізіі былі падтрыманы залпамі рэактыўнай артылерыі ("Кацюшаў") і гаўбіц. Немцы вымушы былі адступіць. 619-ты стралковы полк заняў в. Луцкаўляны. Залпы "Кацюшаў" накрылі пазіцыі 150-га супрацьтанкавага дывізіёна каля в. Пракаповічы. Немцы вымушаны былі адступіць і пакінуць пылаючую вёску. Аднак да вечара яна не была занята савецкай пяхотай. Каля 20 гадзін вечара немцы зноў контратакавалі сіламі PzAA 12. Савецкая пяхота адступіла з вышыні 156 у бок в. Луцкаўляны. Акрамя таго, немцы занялі таксама в. Бабароўнікі і Рагачы, значна пацясніўшы савецкія батальёны. Такім чынам палкі 199-й дывізіі да канца дня вялі бai на рубяжы р. Свіслач. Іх прарыў праз нямецкую абарону быў фактычна ліквідаваны.

Да 12.00 да ракі Свіслач падышла савецкая 64-я сд. Яна адразу ж фарсіравала раку на адрэзку в. Свіслач – Меліцэвічы і пачала наступленне да в. Рудавіца. Да канца дня часці 70-га ск г.-м. В.Г. Цярэнцьева з падраздзяленнямі ўзмацнення вялі бai на лініі: в. Лікаўка – Агароднікі (64-я сд).

У 16.00 16 ліпеня камандуючы 2-ім Беларускім фронтам аддаў падначаленым яму войскам наступны загад: левафлангавым корпусам 50-й арміі да зыходу 17 ліпеня трэба было заняць мястэчка Дамброва-Беластоцкая і Саколка. 3-я армія, якая дзейнічала на поўдзень ад 50-й савецкай арміі, да таго ж тэрміну павінна была фарсіраваць раку Свіслач і заняць лінію в. Адэльск – Крынкі[521]. Аднак войскі 3-й арміі толькі 17 ліпеня выйшлі да ракі Свіслач, не паспеўшы як трэба падрыхтавацца да фарсіравання ракі і працягнуць наступленне.

На **17 ліпеня** нямецкая лінія абароны карпусной групы г.-арт. Г. Вейдлінга па рацэ Свіслач выглядала наступным чынам:

Баявая група г.-л. Г. Флёрке (з гэтага дня яна зноў называлася 14-й пяхотнай матарызаванай дывізіяй) займала пазіцыі:

> на левым флангу група ппалк. Г.-М.Фрычэ (1-шы і 2-гі батальёны, 13-я і 14-я роты 1069-га гп) - ад в. Жылічы да в. Жукевічы;

> на правым флангу група палк. Г.Трэптава (2-гі батальён 1065-га і 2-гі батальён 1068-м гп, 13-я і 14-я роты 1065-га палка) - ад в. Жукевічы да в. Дарашэвічы[522]

> на поўдзень ад групы палк. Г.Трэптава (ад в. Дарашэвічы да в. Канюхі) знаходзіліся пазіцыі 50-й пд[523]

> сутык з 12-й тд 2-й арміяй забяспечваў PzAA 12 (м-р Г. Эгелійн).

Найбольш актыўна на працягу дня дзейнічалі палкі 139-й Чырвонасцяжнай Раслаўльскай сд. Яны вялі бой на адрэзку ад р.Нёман да м.Свіслач. 17 ліпеня батальёны 718-га сп выйшлі да в.Жукевічы (10 км на паўночны захад ад м.Свіслач). 364-ты сп заняў пазіцыі на поўнач ад м.Свіслач у раёне вёсак Пагараны – Агароднікі. Два батальёны 609-га сп выйшлі да ракі Свіслач і замацаваліся ў мястэчку Свіслач. Працягваючы наступленне, батальёны палка занялі в.Агароднікі (у 2 км на захад ад мястэчка). На працягу дня асабліва цяжкія баі вёў менавіта 609-ты сп. Наступаючы на левым фланге, ён вытрымаў некалькі нямецкіх контратак (па савецкай інфармацыі да 15).

Дзве роты 1-га батальёна 718-га сп занялі в. Дарашэвічы. Такім чынам, плацдарм на левым беразе Нёмана быў павялічаны. Аднак савецкія роты былі адразу атакаваны ў фланг нямецкімі танкамі і САУ[524] і акружаны. У выніку праведзенай пасля гэтага невялікай савецкай артпадрыхтоўкі і наступлення войскаў на поўдзень ад в. Дзекалавічы, 1-шы батальён 609-га сп 139-й сп, якім камандаваў к-н В.В.Фацін, прарваў абарону 122-га грэнадзерскага палка і выйшаў да в. Пагараны (на паўднёвы ўсход ад в. Квасоўка). У вёсцы, дарэчы, знаходзіўся штаб нямецкага 150-га артпалка.

Каля поўдня немцы кінулі ў контратаку сапёраў і 150-ты дывізіён знішчальнікаў танкаў 50-й дывізіі. Пры падтрымцы САУ (па савецкай інфармацыі, аднак верагодна гэта былі бронетранспарцёры) яны атакавалі в. Пагараны і выбілі адтуль 2-гі батальён 609-га сп. К-н В.В. Фацін, прапусціўшы нямецкія бронетранспарцёры, падняў 1-шы стралковы батальён у атаку. Да атакі далучыўся і 2-гі батальён. Вёска Пагараны была зноў занята савецкай пяхотай. У баях 609-ты полк страціў 21 салдата і сяржанта забітымі[525].

Немцы паўтарылі атакі яшчэ некалькі разоў. Да вечара яны канчаткова занялі вёску[526]. Прарыў савецкіх войск, такім чынам, удалося спыніць. Падраздзяленні нямецкай 50-й пд контратакавалі савецкія войскі якія прасунуліся напярэдадні ў раёне в. Пракаповічы. У выніку гэтых атак савецкі плацдарм на заходнім беразе ракі Свіслач скараціўся. На наступны дзень, раніцай, падчас адбіцця чарговай ня-

мецкай контратакі к-н В.В.Фацін быў забіты. Пасмяротна яму было прысвоена званне ГСС.

64-я дывізія 70-га ск на працягу ўсяго дня адбівала нямецкія атакі сілай каля батальёна, падтрыманыя САУ і танкамі (?), але прасунуцца наперад не змагла. Дывізія выйшла да ракі Свіслач у раёне на поўдзень ад Квасоўкі. 433-ці полк вёў баі за вёску Пагараны Ніжнія.

Моцныя нямецкія атакі вытрымала 199-я сд. Пасля прарыву ў папярэдні дзень, камандванне 12-й тд выслала моцную баявую групу м-ра Г.Нёске – ад'ютанта дывізіі. У групу ўваходзілі знішчальнікі танкаў Jagtpanzer IV з 2-га супрацьтанкавага дывізіёна[527]. Групу падтрымліваў PzAA 12. Гэтая бранявая група з раніцы 17 ліпеня распачала атакі пазіцый 199-й стралковай дывізіі. У выніку атакі знішчальнікаў танкаў і бронетранспарцёраў да 9.50 гадзінаў раніцы ўсе падраздзяленні 199-й дывізіі адступілі за раку Свіслач. На працягу дня разведвальны танкавы батальён займаў пазіцыі ў раёне в. Пракаповічы. Ён прыкрываў батальёны 121-га гп, якія займалі пазіцыі, замыкаючы лінію фронту.

Тым часам перадавыя часці дывізій 3-й арміі таксама наступалі на захад. У выніку гэтага былі захоплены плацдармы на левым беразе ракі Свіслач у раёнах вёсак Козлы, Канюхі і Одла, на поўдзень ад мястэчка Індура (323-я сд 35-га ск). Далейшае прасоўванне савецкіх падраздзяленняў былі спынены атакай групы м-ра Г.Нёске. На поўнач ад в. Малая Бераставіца, да ракі Свіслач выйшла 250-я сд 3-й арміі. Такім чынам на фронт па Свіслачы падыходзілі новыя савецкія падраздзяленні. Немцы не мелі тут моцных злучэнняў. Аднак камандванне карпусной групы спадзявалася спыніць наступленне карпусоў 50-й арміі. Для гэтага на 18 ліпеня было запланавана правесці некалькі атак.

**18 ліпеня** група г.-арт. Г. Вейдлінга распачала некалькі моцных контратак супраць палкоў 139-й сд. З раніцы сюды быў накіраваны 12-ты танкавы разведвальны батальён м-ра Г.Энгелійна. Атакі 1-га батальёна м-ра К.Вінклера са 101-га гп групы г.-л. Г.Флёрке падтрымлівалі да 20-25 бронетранспарцёраў і рота 1057-га супрацьтанкавага дывізіёна з рубяжа вёсак Каўпакі – Баяры. Як бачна, моцная нямецкая атака праводзілася з прыцягненнем значнай колькасці бранятэхнікі.

Для ўмацавання савецкіх часцей на гэтым накірунку (на захад ад м.Свіслач) камандваннем корпуса быў разгорнуты 105-ты Гв. азстап. Разгарэўся напружаны артылерыйскі бой. Пры адбіцці нямецкіх атак 2-я батарэя палка панесла страты. Быў забіты камандзір батарэі і 5 артылерыстаў[528]. 609-ты стралковы полк зноў аказаўся ў эпіцэнтры баёў. Полк страціў 25 чалавек забітымі. Негледзячы на выкарыстанне немцамі бранятэхнікі, пазіцыі 139-й дывізіі не былі

прарваны. У выніку нямецкіх атак палкі вымушаны былі адысці на ўсход да ракі Свіслач. Новая мяжа абароны праходзіла праз в. Агароднікі – Рагачы[529]. Паводле савецкіх архіўных крыніц, немцы панеслі ў гэтых атаках вялікія страты. У прыватнасці, былі падбіты 8 бронетранспарцёраў[530].

У 18.10 сіламі 139-й дывізіі была арганізавана контратака нямецкіх пазіцый 122-га гп у раёне фальварка Квасоўка. Гэтыя атакі былі адбіты толькі дзякуючы бранявым сілам PzAA 12. Жорсткія баі прывялі да таго, што нямецкі грэнадзёрскі полк фактычна перастаў існаваць[531]! Загінуў камандзір палка (у раёне м. Лунна), камандзіры 1-га і 2-га батальёнаў. На пасаду камандуючага быў прызначаны камандзір 150-га супрацьтанкавага дывізёна дывізіі м-р Зігфрыд Кюр, які яшчэ не прыбыў у падраздзяленне. Рэшткі палка знаходзіліся ў раёне в. Квасоўка – Пагараны.

70-ы стралковы корпус які знаходзіўся на левым флангу арміі таксама быў атакаваны немцамі. Не вытрымаўшы моцных нямецкіх атак, савецкія часці былі вымушаны адступіць на 2-4 км у раён в. Сухая Даліна. 199-я сд заставалася на рацэ Свіслач.

Г.-п. І.В. Болдзін загадаў узмацніць карпусы, якія вядуць баі па рацэ Свіслач. Для гэтага 238-я сд, якая знаходзілася ў армейскім рэзерве ў раёне в. Коматава павінна была высунуцца на лінію фронта. Дывізія павінна была фарсіраваць раку і ўзмацніць 139-ю сд, заняўшы пазіцыі в. Дзекалавічы – Агароднікі.

Гэты дзень скончыўся нядачай для камандвання 4-й арміі. У раёне в. Ласосна (у некалькіх км на захад ад Гродна, зараз у межах горада) пацярпеў аварыю штабны самалёт камандуючага 4-й арміяй. Г.-і. Курт фон Ціпельскірх быў цяжка паранены. Камандаванне арміяй пераняў г.-арт. Гельмут Вейдлінг (да 21 ліпеня), які заставаўся ў штабе корпуса ў в.Бакуны (у 12 км на поўдзень ад Гродна). У камандванне карпуснай групай часова ўступіў г.-л. Густаў Флёрке[532].

Такім чынам, баі 16-18 ліпеня 1944 г. па фронту р.Свіслач паказалі савецкаму камандаванню ўстойлівасць нямецкай абароны. Дзякуючы наяўнасці моцнага рэзерва ў выглядзе групы м-ра Г. Нёске і 12-га танкавага разведвальнага батальёна, пазіцыі карпусной групы ўдавалася ўтрымліваць. Сілы якія меліся ў распараджэнні 50-й савецкай арміі не здолелі прарваць нямецкую абарону. Усе савецкія атакі натыкаліся на нямецкія контратакі. У той жа час, некаторыя нямецкія палкі трымаліся з апошніх сілаў (122-гі гп).

Безвыніковасць баёў на фронце на поўдзень ад горада Гродна, прымусіла камандаванне 2-ім Беларускім фронтам прыняць рашэнне ўвесці ў бой 49-ю армію. Падраздзяленні арміі вызваліліся пасля ліквідацыі “Мінскага катла”. Яна павінна была ўліцца ў наступленне на стыку 50-й і 3-й савецкіх армій. 20 ліпеня гэтая армія (у складзе

шасці дывізій і сродкаў узмацнення) павінна была прарваць нямецкую абарону на адрэзку в. Агароднікі – Рагачы[533]. Дарэчы ў складзе арміі дзейнічала і 148-я асобная армейская штрафная рота.

У выпадку прарыву нямецкага фронту злучэнні 49-й арміі выйшлі б у тыл нямецкай групе обергрупэнфюрара К. фон Готберга і 3-й тд СС, якія вялі баі на паўночны захад ад Гродна. Зыходзячы з гэтага 70-ты корпус арміі г.-п. І.В.Болдзіна перадаваўся ў склад 49-й арміі. 121-шы ск г.-м. Д.І. Смірнова з раніцы 19 ліпеня павінен быў перайсці ў наступленне ў заходнім напрамку і выйсці да в. Каўпакі і Горніца.

**19 ліпеня** перайшлі ў наступленне палкі 139-й сд. У раёне в. Пагараны (знаходзіцца каля в. Квасоўка) падраздзяленні 122-га грэнадзёрскага палка пачалі адступаць. Немцы спрабавалі контратакаваць 1-ым батальёнам 101-га палка, аднак былі адбіты. Вёска Пагараны была абстраляна савецкай рэактыўнай артылерыяй. Салдаты 122-га нямецкага палка запанікавалі! Батальён 718-га палка 139-й дывізіі заняў в. Пагараны і працягваў наступленне ў накірунку в. Хліставічы – Гарны. У 10.50 немцы пачалі абстрэл раёна прарыву. Ён працягваўся да 12 гадзін. Пасля гэтага контратаку распачалі бронетранспарцёры PzAA 12, падтрыманыя батарэяй супрацьтанкавых гарматаў з 1057-га дывізіёна. Да 14.30, у выніку котратакі, немцы ліквідавалі прарыў і спыніліся на лініі: в.Дарашэвічы – вышыня 144 – Пагараны – Лікоўка – Лаша.

У другой палове дня ў 122-гі полк прыбыў новы камандуючы м-р Зігфрыд Кюр. Акрамя таго ў полк уліваліся і падмацаванні. Згодна загаду па 50-й дывізіі была арганізавана палкавая група “Кюр” Яна павінна была ўзмацніць 122-гі полк. Група складалася з наступных падраздзяленняў:

> рэшткі 122-га гп

> частка PzAA 12

> рота 150-га сапёрнага батальёна

> рота 150-га фузілернага батальёна

> 1-шы батальён 101-га гп

> 2-я батарэя 185-й цяжкай брыгады штурмавых гарматаў (2 StuG III, 4 StugH 42).

У 18.00 група м-ра З. Кюра пачала атаку. Атацы папярэднічалі 10-хвілінная артылерыйская падрыхтоўка і налёт авіяцыі – да 10 нямецкіх бамбардзіроўшчыкаў штурмавалі мясцовасць у ваколіцах Квасоўкі. У выніку атакі падраздзяленні 139-й стралковай дывізіі адступілі. Немцы занялі в. Дарашэвічы. Наступныя атакі групы “Кюр” былі прадпрынятыя супраць в.Пагараны. Пры атацы вёскі савецкай артылерыяй была падбіта штурмавая гармата StugH 42. Згод-

на інфармацыі з савецкіх крыніцаў, атака была праведзена нямецкай пяхотай колькасцю да 250 чалавек пры падтрымцы трох танкаў і двух САУ (як бачна танкаў тут не было).

Тым часам нямецкая атака захлынулася. Падтрымку савецкіх пяхотных часцей ажыццяўлялі гарматы 150-га азстап. Менавіта дзякуючы трапнаму агню савецкай артылерыі нямецкая атака была адбіта. Гарматы гэтага палка, хутчэй за ўсё, падбілі і нямецкую штурмавую гармату. Баі ў раёне в. Пагараны ішлі і з наступленнем ночы. Да 23.00 атакі супраць савецкай дывізіі паўтараліся яшчэ 6 разоў[534]. У гэтых баях 609-ты полк Раслаўльскай дывізіі панёс адчувальныя страты – 35 чалавек забітымі (страты па дывізіі склалі 65 чалавек радавога складу забітымі). На працягу дня 238-я дывізія была кінута на ўмацаванне пазіцый 139-й дывізіі ў раёне в. Пагараны – Дарашэвічы. З дапамогай новых падраздзяленняў савецкія часці зноў занялі в.Дарашэвічы. У гэтых баях савецкія падраздзяленні падтрымлівалі танкі. Так немцы паведамілі аб знішчэнні двух савецкіх танкаў.

Акрамя 139-й дывізіі, зрабілі спробу наступлення падраздзяленні 70-га корпуса (64-я і 199-я сд). Гэтыя атакі, аднак, таксама скончыліся безпаспяхова. Атакуючыя батальёны напаткалі моцны нямецкі артылерыйскі агонь. Да абстрэлу далучылася і нямецкая авіяцыя. Будучы атакаванымі з паветра, яны вярнуліся на зыходныя пазіцыі.

Поспехам завяршылася атака нямецкіх пазіцый дывізіямі 3-й арміі, якія дзейнічалі на поўдзень ад 50-й арміі. У выніку прарыву фронта нямецкай 2-й арміі і паспяховага наступлення карпусоў арміі генерала А.В. Гарбатава фактычна быў вырашаны лёс нямецкага фронту на рацэ Свіслач. Савецкія войскі прарваліся да Белавежскай пушчы. Гэта стварала пагрозу праваму флангу нямецкай лініі абароны і патрабала адводу войскаў у заходнім накірунку. З мэтай развіцця гэтага поспеху 3-й арміі, падраздзяленні 49-й арміі павінны былі перайсці ў наступленне 21 ліпеня.

Наступленне 49-й арміі ген. І.Ц. Грышына планавалася правесці раніцай 21 ліпеня на вузкім участку фронта, у раёне вёсак Агароднікі – Рагачы. Удар наносілі тры дывізіі (380-я, 64-я і 385-я сд). Да канца дня яны павінны былі дасягнуць Сакулкі і заняць пазіцыі на поўнач ад мястэчка[535]. Акрамя гэтых сіл, камандуючы фронтам падпарадкаваў наступаючай групоўцы франтавы рухомы атрад пад камандаваннем палк. У.Ф. Котава. Галоўнай сілай атрада была 42-я асобная танкавая брыгада.

> 42-я Гвардзейская Чырвонасцяжная Смаленская асобная танкавая брыгада – камандзір Гв. палк. В.Ф.Котаў, начальнік штаба – Гв. м-р Лукін

> 1ш-ы Гв. танкавы батальён (Гв. м-р С.Д. Пракапец)

> 2-гі Гв. танкавы батальён

> 2-гі Гв. мотастралковы кулямётны батальён (Гв. м-р Пятроў)

> зенітна-кулямётная рота.

У ліпені 1944г. брыгада – налічвала ў сваім складзе 47 танкаў, у тым ліку: 8 танкаў КВ, 21 Т-34 і 18 "Valentine-IV". Акрамя танкавай брыгады ў склад рухомага атрада ўваходзілі:

> 290-ты Гвардзейскі знішчальна-супрацьтанкавы полк;

> 6-ты Гв. асобны штурмавы інжынерна-сапёрны батальён (камандзір Гв. м-р Харламаў);

> два матарызаваныя батальёны[536].

Штурмавы батальён 1-й Гв. ашісбр павінен быў прарваць фронт і разварваць атаку. Батальён быў перададзены з 50-й арміі, дзе ён вёў баі на плацдарме на левым беразе р.Нёман.

**20 ліпеня** падраздзяленні 121-га ск і 70-га ск паўтарылі спробы прарваць нямецкую абарону. У 10.45 у наступленне на фронце Дарашэвічы – Агароднікі – Пагараны перайшлі падраздзяленні 139-й і 238-й сд. Наступленне праводзілася па чатырох накірунках. Нямецкі 1-шы батальён 101-га гп вымушаны быў адступіць, аднак захаваў лінію фронта. Праз дзве гадзіны савецкія атакі былі паўтораны. Пяхотныя падраздзяленні падтрымліваліся самаходнымі артылерыйскімі ўстаноўкамі (магчыма са складу 1434-га САП, на ўзбраенні якога стаялі СУ-85). Аднак ізноў усе савецкія атакі былі адбіты немцамі[537]. 364-ты сп ппалк. М.П. Пятрова наступаў у раёне в. Дзекалавічы. У атаках полк страціў 27 чалавек забітымі. У 14.55 савецкія атакі былі прадпрынятыя ў накірунку в. Пагараны. Група "Кюр" утрымала вёску, аднак страціла сувязь з 1-ым батальёнам 101-га гп. Праз разрыў лініі фронту савецкія падраздзяленні пачалі наступаць у накірунку в. Хліставічы. Штаб 50-й пд звярнуўся да штаба карпусной групы з просьбай арганізаваць контратаку сіламі 12-га танкавага разведвальнага батальёна.

12-ты танкавы разведвальны батальён, па загаду камандавання карпусной групы, у ноч на 20 ліпеня быў выведзены ў рэзерв у в. Навасёлкі (8 км на захад ад Квасоўкі). За час баёў батальён панёс адчувальныя страты ў тэхніцы. Так у падраздзяленнях батальёна засталіся толькі штаб, дзве разведвальныя групы (па 5 бронетранспарцёраў, узброеных 2 см гарматай) і артылерыйскае аддзяленне (2 бронетранспарцёры з 7,5 см гарматамі)[538]. Вельмі мала засталося і амуніцыі. Так для гармат было толькі 23 снарады. Большасць бронетранспарцёраў выходзіла са строю не ў выніку баявых дзеянняў, а з-за паломак. Роты батальёна часта здзяйснялі




**20 ліпеня 1944г. Агульнае становішча на фронце па рацэ Свіслач**

шматкіламетровыя маршы. Шмат машын былі непрыгоднымі для выкарыстання з-за адсутнасці пакрышак на калёсы. У 1057-ым армейскім супрацьтанкавым дывізіёне (штаб, 2-я і 3-я батарэі) знаходзілася толькі 9 супрацьтанкавых гарматаў Pak-40.

Атрымаўшы загад штаба корпуса, м-р Г. Энгелійн накіраваў да месца прарыва разведвальную групу. Яна павінна была стрымаць савецкія падраздзяленні. Аднак савецкія падраздзяленні, хутчэй за ўсё, адступілі. Працытуем данясенне разведвальнага батальёна:

“17.55. Хліставічы непрыяцелем не занятыя, ніякіх уласных падраздзяленняў. На вышыні 146 нашыя супрацьтанкавыя гарматы.

18.25. Вышыня 163 занята ў 18.15.

18.45. Разведвальная група ў 1000 м на ўсход ад вышыні 146. Не атрымала аніводнага стрэла.

19.20. Занята заграджальная пазіцыя. Аніякіх дзеянняў праціўніка.

20.00. У раёне разведкі праціўніка няма. На вышыні 146 уласныя супрацьтанкавыя гарматы, як левае крыло 122-га гп. Правае крыло

101-га гп у 1 км на паўднёвы ўсход ад Хліставіч. Спрабую іх злучыць. Становішча 122-га гп нязначна змянілася. Энгелійн"[539].

Такім чынам, наступленне савецкіх дывізій скончылася беспаспяхова. Негледзячы на тое, што нямецкая абарона была прарвана, у стралковых палкоў 139-й дывізіі не хапала сілаў для вялікага наступлення. Нямецкая абарона зноў вытрымала. У наступны дзень наступленне савецкіх войскаў павінна было паўтарыцца з прыцягненнем дадатковых сродкаў. Так для паўтарэння атакі 121-му ск надаваліся падраздзяленні ўзмацнення: 16-ты Гв. гап, 105-ты зстап, 1434-ты сап, 3-ці Гв. асобны штурмавы інжынерна-сапёрны батальён[540].

У 5.00 **21 ліпеня** пачалася артылерыйская падрыхтоўка, якая папярэднічала наступленню 49-й арміі. Да лініі фронту былі падцягнуты шматлікія артылерыйскія падраздзяленні. Артылерыйскі агонь вёўся па загаддзя выверaных цэлях. У 6.30 раніцы ўдарная групоўка 49-й арміі (380-я і 385-я дывізіі, а таксама 42-я Гв. атбр) пачала наступленне на фронце в. Баброўнікі – Лаша – Квасоўка. Анак праведзеная артылерыйская падрыхтоўка не дазволіла падавіць артылерыю немцаў. У выніку наступаючыя савецкія часці былі сустрэты моцным нямецкім заградкальным агнём і не здолелі прарваць пазіцыі нямецкай 50-й пд. Я.П. Елісееў піша, што яшчэ адной прычынай няўдалай спробы першага наступлення было тое, што "наступаючыя часці былі малакалькаснымі"[541]. Гэта дзіўна, таму што ў наступленні ўдзельнічалі падраздзяленні двух дывізій, частак узмацнення і танкавай брыгады. Нават улічваючы тое, што гэтыя часці панеслі страты ў папярэдніх баях, наступленне супраць адной нямецкай дывізіі на 8-км фронце пры падтрымцы танкаў не магло не даць вырашальнай перавагі ў сілах. Ген. І.Ц. Грышын аддаў загад паўтарыць атаку ў 14.00. У дапамогу наступаючым войскам былі адпраўлены афіцэры штаба і прадстаўнікі палітаддзела 49-й арміі.

У выніку паўторнай атакі наступаючыя савецкія войскі здолелі разарваць абарончую лінію 50-й пд. Так 122-гі гп (= група "Кюр") ізноў страціў сувязь з батальёнам 101-га палка. Былі раз'яднаны таксама 123-ці і 122-гі гп. У адбіцці атак прымалі ўдзел апошнія бронетранспарцёры 12-га танкавага разведвальнага батальёна. Дзякуючы яго дзеянням лінію фронта была ўзноўлена[542]. За дзень, тым не менш, дывізіі 49-й арміі прасунуліся на 5 км і завязалі баі на подступах да мястэчка Індура. У паласе наступлення 139-й і 238-й сд не назіралася такога поспеху. 139-я дывізія працягвала займаць пазіцыі в. Пагараны – Дарашэвічы (2 км на ўсход ад в. Квасоўка). Такім чынам вынікамі наступлення 49-й арміі было прасоўванне ў глыбіню толькі да 5 км. Вырашальны прарыў нямецкай лініі фронта ўздоўж р. Свіслач дасягнуты не быў.




21 ліпеня 1944г. Агульнае становішча на фронце па рацэ Свіслач

Увечары 21 ліпеня штаб групы армій "Цэнтр" аддаў загад корпуснай групе г.-арт. Г. Вейдлінга аб адступленні. Паводле загаду, група павінна была адвесці свае падраздзяленні на лінію: вышыня 241.7 (4 км на захад ад в. Адэльск) – Старая Дубавая – Путна – Саламянка – Сенклічы – Кашэўнікі[543]. Такім чынам, немцы адводзілі падраздзяленні г.-арт. Г. Вейдлінга на 15 км у заходнім накірунку. Мястэчка Індура было астаўлена немцамі. 12-ты танкавы разведвальны батальён (налічваў толькі 14 бронетранспарцёраў) раніцай 22 ліпеня павінен быў далучыцца да 12-й тд.

21 ліпеня ў 23.00 па загаду камандуючага фронтам г.-п. Г.Ф. Захарава са складу 50-й арміі 121-шы ск і 70-ты ск са сродкамі ўзмацнення перадаваўся ў склад 49-й арміі. Такім чынам, у падпарадкаванні г.-п. І.В. Болдзіна заставаліся толькі карпусы, якія вялі баі ці на плацдарме на захад ад горада Гродна, ці ў Занеманскім фарштаце. Гэта дазваляла засяродзіць усе сілы і ўвагу непасрэдна на накіраванні ўдару супраць 3-й тд СС "Мёртвая галава". Праўда, гэта рашэнне камандуючага фронтам спазнілася і не было такім актуальным, як некалькі дзён раней.

У ноч на **22 ліпеня** група г.-арт. Г.Вейдлінга адступіла. Аднак савецкія войскі не далі немцам адарвацца і заняць новыя пазіцыі. 50-я пд і група г.-л. Г.Флёрке мусілі адступаць з баямі. Адступленне 14-й пмд прыкрываў спецыяльна выдзелены атрад, які складаўся з узвода сапёраў, узмоцненых кулямётным узводам (2 цяжкія кулямёты), двума мінамётнымі групамі і батарэяй супрацьтанкавых гармат. Дзякуючы дзеянню гэтага атрада, адступленне дывізіі праходзіла ў лягчэйшых умовах, чым адступленне 50-й дывізіі.

Да раніцы 22 ліпеня нямецкія сілы занялі новыя пазіцыі, якія былі вызначаны камандаваннем загаддзя. Гэта аднак не выратавала становішча карпусной групы г.-арт. Г. Вейдлінга. Савецкія дывізіі 49-й арміі працягвалі наступаць. Раніцай 22 ліпеня фронт нямецкай 50-й пд у раёне в. Старая Дубавая (паміж в. Путна і Адэльск) быў прарваны франтавым рухомым атрадам пры падтрымцы танкаў. Шырыня прарыва склала 6 км!

Удар нанесла 42-я Гв. атбр уздоўж дарогі Індура – Старая Дубавая – Кузніца ў паўночна-заходнім накірунку. Атаку танкавых батальёнаў падтрымліваў 2-гі Гв. мотастралковы кулямётны батальён брыгады, а таксама штурмавыя групы 6-га Гв. ашісб. У выніку танкавай атакі на пазіцыі 123-га гп, нямецкі полк быў адкінуты на 8-10 км на захад у раён в. Падліпкі – Новадзел. Магчыма, што 42-я Гвардзейская асобная танкавая брыгада ўпершыню была выкарыстана камандаваннем менавіта ў гэтым баі. Па архіўнай інфармацыі, у баях гэтага дня брыгада страціла 31 салдата і сяржанта і 4 афіцэры забітымі.




22 ліпеня 1944г. Агульнае становішча на фронце па рацэ Свіслач

Сярод забітых былі: начальнік палітаддзела брыгады Гв. ппалк. І.В. Мядзведзеў, намеснік начальніка палітаддзела – Гв. м-р А.А. Волкаў, камандзір 1-га танкавага батальёна Гв. м-р С.Д. Пракапец[544]. Некалькі танкаў Т-34 былі падбіты.

На працягу дня атака працягвалася. Савецкія танкі 42-й Гв. Смаленскай тбр і часці 385-й сд (1262-гі сп) уварваліся ў м. Кузніца (у 15 км на паўднёвым-захадзе ад Гродна). На працягу дня яны паспяхова адбілі некалькі нямецкіх контратак.

Савецкая атака была сапраўды вельмі рэзультатыўнай. Фактычна нямецкія падраздзяленні ў накірунку атакі былі знішчаны. Паводле паведамлення начальніка штаба групы г.-арт. Г. Вейдлінга а 7.20 раніцы 22 ліпеня: "... палкі разбіты і маюць толькі нязначныя сілы ..."[545] Разбітая 50-я пд адступіла на паўднёвы захад ад м. Кузніца, дзе нямецкія афіцэры спрабавалі сабраць рэшткі палкоў. На поўдзень ад прарыву ў раёне в. Адэльск працягваць займаць абарону 12-ты танкавы разведвальны батальён м-ра Г. Энгелійна.

Да 10.50 гадзін 22 ліпеня толькі 122-гі грэнадзёрскі полк (= група "Кюн") 50-й пд яшчэ ўтрымліваў перадавую лінію абароны. 123-ці і 121-шы гп, якія знаходзіліся на поўдні ад яго ў раёне прарыву, былі цалкам разбітыя і адступілі. Палкі 14-й пмд таксама вымушаны былі адступаць, аднак рабілі гэта планамерна.

Такі нечаканы для немцаў савецкі прарыў мог выклікаць сур'ёзныя наступствы. Напрыклад, калі наступленне працягнулася б у напрамку мястэчак Сакулка і Новы Двор, немцам магло пагражаць адсячэнне падраздзяленняў 3-й тд СС "Мёртвая галава" і 19-й тд. Г.-ф. В. Модэль, які прыбыў на камандны пункт 4-й нямецкай арміі, пагадзіўся вывесці з падпарадкавання корпуснай групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга 19-ю тд і тэрмінова выкарыстаць яе для ўрэгулявання становішча на фронце групы г.-арт. Г. Вейдлінга. У загадзе па 4-й арміі гаварылася: "... 19-я тд неадкладна падпарадкоўваецца корпусу Вейдлінга. Яшчэ сёння неабходна арганізаваць атаку савецкіх войскаў, якія прарваліся да Кузніцы. Корпус Вейдлінга павінен выкарыстаць усе свае сілы для таго, каб адкінуць часці Чырвонай арміі ў напрамку Старай Дубавой і аднавіць адзіны фронт па лініі Новікі – Падліпкі – Дойлідкі – Каменка – Гібулічы – вышыня 170, 3 км на паўночны ўсход ад Гібуліч..."[546] Фактычна гэты загад ставіў сваёй мэтай стабілізаваць лінію фронта, якая прыкрывала Занёманскі фарштат г. Гродна, які яшчэ ўтрымлівалі нямецкія войскі. Згодна з гэтым загадам войскі карпуснай групы г.-арт. Г. Вейдлінга павінны былі заняць лінію абароны, якая праходзіла ў 3-5 км на захад ад лініі, намечанай у загадзе штаба групы армій "Цэнтр" 21 ліпеня 1944 года.

Корпус г.-арт. Г. Вейдлінга спрабаваў з рэшткамі абодвух палкоў 50-й дывізіі і ўсімі часцямі 14-й пмд (група г.-л. Г.Флёрке), якія меліся ў яго падпарадкаванні, закрыць савецкі прарыў на ўсход і поўдзень ад м. Кузніца. Рэшткі 50-й нямецкай дывізіі адступілі ў раён на поўдзень ад вёскі Кузніца (в. Новадзел), дзе яны спрабавалі заняць абарону і прывесці сябе ў парадак.

Таксама перайшлі ў наступленне 121-шы і 70-ты стралковыя корпусы. Палкі 139-й сд выйшлі да вёсак Каменка – Малая Альшанка. Лінія фронту на гэтым участку фронта праходзіла ад в. Радзевічы – Путна (у 7 км на ўсход ад м. Кузніца) да Занёманскага фарштата і ўтрымліваліся падраздзяленнямі групы г.-л. Г. Флёрке (рэшткі 101-га грэнадзёрскага палка, 1065-ты і 1069-ты палкі).

Падраздзяленні савецкай 49-й арміі, выкарыстоўваючы прарыў 42-й Гв. Смаленскай тбр, паспяхова прасоўваліся наперад і напрыканцы дня выйшлі на мяжу ўсходней Вялікая Альшанка – Кузніца – захад ад в. Адэльск[547]. У раёне хутара Новадзел (10 км на паўднёвы ўсход ад Кузніцы) пазіцыі заняў 484-ты і 486-ты мінамётныя палкі 19-й асобнай Сівашскай мінамётнай брыгады РГК, якія ўзмацнялі баявыя парадкі пяхоты[548]. Такім чынам у выніку прарыва і наступлення на працягу 22 ліпеня савецкія войскі прашлі 10 км у заходнім накірунку. Палкі нямецкай 50-й пд былі адкінуты на працягу дня на 15-20 км.

У раёне м. Кузніца немцы спынілі савецкае наступленне. На працягу 22-24 ліпеня тут ішлі напруджаныя баі. Увечары рэшткі нямецкіх палкоў 50-й пд арганізавалі абарону на лініі: в. Новадзел – калонія Ласосна – лес на ўсход ад Кундзіна – Пуцілкі – Малавічы Дольныя (усе населеныя пункты на поўдні ад м. Кузніца).

Савецкія войскі перарэзалі чыгунку і дарогу Сакулка – Кузніца ў некалькіх месцах. Найвялікшыя страты панеслі два палка 50-й пд. 14-я пяхотная матарызаваная дывізія захавала свае падраздзяленні. Яе абарона прарвана не была. На працягу дня яна адбіла некалькі атак[549], аднак вымушана была адступіць, каб не дапусціць разрыву фронта.

Раніцай **23 ліпеня** савецкія войскі 49-й арміі працягнулі свае атакі. Надвор'е змянілася. Пачаліся кароткачасовыя дажджы. Яны прывялі да таго, што частка дарог, асабліва грунтовых, размокла і з цяжкасцю пераадольвалася тэхнікай.

Прасоўванне савецкіх падраздзяленняў 380-й і 385-й сд на правым крыле групы г.-арт. Г. Вейдлінга (на поўдзень ад м. Кузніца) з апошніх сілаў стрымліваў 121-шы гп палк. В. Неўмана. Левым крылом (14-я пмд) група трохі адкінула савецкія войскі ў напрамку в. Ласосна.

У прыватнасці ўпарты характар насілі баі ў раёне вёсак Каменка – Малая Альшанка – Гібулічы, куды выйшлі палкі 139-й стралковай дывізіі. Палкі дывізіі атрымалі загад абысці Занёманскі фарштат з поўдня і працягваць наступленне ў накірунку м. Кузніца. Па ўспамінах камсамольскага арганізатара стралковага батальёна 718-га сп 139-й сд А. Бычкоўскага, немцы выкарыстоўвалі аб'екты Гродзенскай крэпасці, якія знаходзіліся ў гэтых мясцінах[550]. Так 718-ты полк вёў бай ў раёне Альшанкі, дзе захаваліся элементы форта № VII і прамежкавыя ўмацаванні. Наступленне дывізіі затармазілася, сутыкнуўшыся з нямецкай абаронай. У раёне в. Каробчыцы нямецкія карэктыроўшчыкі ўмела наводзілі свой артылерыйскі агонь па савецкай пяхоце. Камандзір 718-га сп палкоўнік Семянчук загадаў знішчыць нямецкіх карактыроўшчыкаў і разведаць размяшчэнне нямецкіх войск. Заданне было выканана разведчыкам Л.С. Хадановічам. За паспяховае выкананне загада ён быў узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені[551]. Палкі 64-й сд на працягу дня вялі баі на поўнач ад Кузніцы.

На поўдзень ад прарыву нямецкага фронту падраздзяленні 2-й арміі адыходзілі да в. Новікі і Малавічы Дольныя (на захад ад Адэльска). 12-я тд займала пазіцыі за 2 км на захад ад мястэчка Сакулка.

Такім чынам становішча на фронце на поўдзень ад Гродна складалася на карысць савецкіх войск. Ударная групоўка 49-й арміі павінна была развіваць сваю атаку з раёна м. Кузніца. Аднак немцы ўжо падрыхтавалі сілы, каб спыніць гэта ўдалае савецкае наступленне. Яшчэ напярэдадні (22 ліпеня) згодна загаду г.-ф. В. Модэля ў раён на паўночны захад ад м. Кузніца падышла баявая група 19-й тд. Група "Сталброк" (па прозвішчу камандзіра) складалася з часткі 74-га тгр палка (без 1-га батальёна) і 10 штурмавых гармат, якія належылі 19-му дывізіёну знішчальнікаў танкаў, 1-й сапёрнай роты, 1-й роты разведвальнага батальёна[552]. Польскі даследчык Р. Урублеўскі гаворыць, што ў 19-й дывізіі было ў гэты час 15 танкаў Pz-IV, 7 зенітных танкаў FlakPz-IV, 12 (75-мм) супрацьтанкавых гармат, батарэя САУ "Hummel" і дзве батарэі САУ "Wespe"[553]. Пасля невялікай падрыхтоўкі група прыступіла да контрудару ў напрамку Кузніцы. Мэтай атакі была ліквідацыя савецкага прарыву 49-й арміі і аднаўленне лініі фронту паміж нямецкімі 2-й і 4-й палявымі арміямі.

Нямецкая атака пачалася ў 5.00 раніцы 23 ліпеня пад прыкрыццём моцнага дажджу. Атака вялася немцамі з раёна в. Мішкенікі (у 5 км на ўсход ад м. Кузніца) ў паўднёва-заходнім накірунку – на в. Падліпкі – вышыню 236 (за 1 км на паўднёвы захад ад м. Кузніца). Савецкія падраздзяленні, якія прарвалі нямецкую лінію фрон-

ту напярэдадні, утварылі выступ у заходнім накірунку. Менавіта яго немцы і жадалі ліквідаваць танкавым ударам. Савецкія сілы у Кузніцы аказаліся б акружанымі. Вышыню 236 абараняў 6-ты Гв. ашысб Гв. м-ра Харламава. "Панцырнай пяхоце" трэба было адбіваць нямецкую танкавую атаку. Ужо а 5.30 немцы занялі вышыню 236, а ў 6.15 раніцы – в. Падліпкі. Сапёры-штурмавікі адступілі. Страты батальёна склалі толькі 8 байцоў забітымі[554].

Далей нямецкія атакі працягнуліся ў напрамку вёсак Новадзел – Цыпрынова[555]. Але да поўдню поспеху немцы тут не мелі. Падчас гэтай атакі група 19-й тд панесла сур'ёзныя страты ў бранятэхніцы. Танкі трапілі пад савецкі зянітны агонь. Падраздзяленні савецкага 2012-га зенітнага артпалка 49-й зенітнай артылерыйскай дывізіі, якія займалі абарону на поўдзень ад м. Кузніца, згодна нямецкай інфармацыі выкарыстоўвалі пры адбіцці нямецкіх танкавых атак 85-мм зенітныя гарматы. Згодна данясенням артылерыйскага палка, разлік зенітнай гарматы с-та І.С. Фурсенкі на працягу гэтага дня падбіў да 5 нямецкіх танкаў. Пасмяротна яму было прысвоена званне ГСС[556]. Нямецкае камандаванне вырашыла спыніць атакі баявой групы 19-й тд на поўдзень ад м. Кузніца. На 14.30 г.-арт. Г. Вейдлінг прызначыў атаку самой вёскі сіламі ўсіх падраздзяленняў. Было прынята рашэнне атакаваць вёску з трох бакоў:

- → 19-я тд павінна была атакаваць з занятых раней пазіцый;
- → падраздзяленні 50-й пяхотнай дывізіі – з паўднёвага-захаду;
- → падраздзяленні групы г.-л. Г.Флёрке – з поўначы.

Перад атакай мястэчка павінна была прайсці пяціхвілінная артпадрыхтоўка. Падтрымку наступаючых нямецкіх войскаў, акрамя танкаў 19-й тд, павінны былі ажыццяўляць самаходкі StuH-42 са 185-й цяжкай брыгады штурмавых гармат[557].

Нямецкая атака пачалася згодна плану. У наступленне перайшлі 4 роты грэнадзёраў 74-га палка пры падтрымцы танкаў. Пачалі наступаць 14-я рота фузілёраў групы г.-л. Г. Флёрке, якую падтрымлівала 1-я батарэя брыгады штурмавых гармат, а таксама часці 632-га сапёрнага батальёна. Савецкі рухомы атрад 49-й арміі адбіў нямецкія атакі пры дапамозе танкаў 42-й Гв. Смаленскай тбр (немцы ўзгадваюць аб 7 савецкіх танках якія ўдзельнічалі ў баю). Дарэчы страты брыгады ў гэтых баях склалі 5 чалавек забітымі[558]. Наземным часткам актыўна дапамагала савецкая авіяцыя, якая замінала прасоўванню нямецкіх рэзэрваў у тыле. У выніку моцнага дажджу дарогі сталі цяжкапраходнымі для тэхнікі. Па савецкай інфармацыі атака вёскі праводзілася з двух накірункаў – з поўначы і з усходу групамі па 10 і 50 танкаў адпаведна, пры падтрымцы пяхоты[559]. Толькі каля 20 гадзін вечара немцы ўсё ж здолелі

уварвацца на паўночную ўскраіну вёскі. Познім вечарам савецкія войскі пакінулі Кузніцу і адступілі.

Гэты поспех дорага каштаваў немцам. Згодна савецкай інфармацыі, немцы страцілі пры штурме вёскі 29 танкаў і САУ (8 былі знішчаны цалкам і 21 падбіты)[560]. Гэтыя дадзеныя завышаныя. Паводле нямецкіх данясенняў, у дывізіі было знішчана 7 танкаў T-IV[561]. Яшчэ 7 T-IV былі падбітыя. Такім чынам, на хаду ў дывізіі застаўся толькі 1 танк! Каля Кузніцы немцы захапілі ці знішчылі 30 савецкіх супрацьтанкавых гармат і адзін танк. Узяцце Кузніцы, такім чынам, цалкам можна лічыць Піравай перамогай немцаў. Аднак вынікам атакі для немцаў была стабілізацыя лініі фронта і ліквідацыя прарыву савецкай 49-й арміі.




**23 ліпеня 1944г. Баі ў раёне м. Кузніца**

Атакамі ў раёне м. Кузніца становішча корпуснай групы было ўмацавана. У 21.30 23 ліпеня г.-арт. Г. Вейдлінг пачынаў адводзіць свае войскі на новую лінію абароны – "Ласка". Для ўзмацнення парадкаў групы г.-арт. Г. Вейдлінга з 3-й тд СС была выдзелена ў другой палове дня група гаўптштурмфюрара Штынена ў складзе 3-га батальёна 5-га тгр палка СС і батарэяй САУ "Hummel" з 3-га дывізіёна 3-га артпалка СС. Для ўзмацнення групы ёй былі дадзены 6 танкаў Т-IV[562].

Уначы корпус г.-арт. Г. Вейдлінга пачаў адступаць на пазіцыю "Ласка". Гэта лінія абароны праходзіла ўздоўж чыгункі Сакулка – Кузніца – Гродна. У выніку адвода нямецкіх войскаў у заходнім накірунку ўтварыўся разрыў з правафлангавай нямецкай 12-й тд прыкладна за 2 км на захад ад мястэчка Сакулка. Сувязь з LV корпусам 2-й арміяй не была ўсталявана. Грунтуючыся на нямецкіх дакументах, Р. Урублеўскі сцвярджае, што гэты прарыў стаў магчымым з-за памылковага нанясення на штабныя мапы лініі размежаванняў паміж 2-й і 4-й арміямі[563]. Раніцай 24 ліпеня 19-я тд заняла пазіцыі ў раёне м. Кузніца і ў самой вёсцы. Абарону мястэчка ажыццяўляў 1057-мы супрацьтанкавы дывізіён к-на Дахмена. На ўзбраенні ён меў 10 гармат Pak-40[564].

Новы дзень пачаўся з савецкіх атак. У 05.45 раніцы **24 ліпеня** савецкія часці атакавалі правае крыло 50-й пд на пазіцыі "Ласка". Пяхота 343-й сд 49-й арміі у суправаджэнні танкаў 42-й тбр, заняла мястэчка Сакулка. 2-гі танкавы батальён страціў пры гэтым некалькі танкаў Т-34. Атаку падтрымліваў 487-мы мінамётны полк. Пасля адбіцця шматлікіх атак і ў выніку высокіх страт 121-ы гп 50-й пд павінен быў адвесці свае сілы да чыгуначнай лініі. Для ліквідацыі гэтага прарыву да групы маёра Зігфрыда Кюра далучаўся 2-гі батальён палка "Эйке", які знаходзіўся ў гэтым раёне.

Падцягнутая ноччу ў в. Сакаляны баявая група СС "Экерт" (II./"E") здзейсніла контратаку на Сакулку. Роты батальёна атакавалі па дарозе з в. Красняны ў накірунку мястэчка. Каля 8.00 гадзін раніцы, паводле інфармацыі нямецкага даследчыка В. Ваперсаля, эсэсаўцы дасягнулі ўскраіны м. Сакулка. Пасля кароткага бою яны ўварваліся ў населены пункт[565]. Баі з савецкімі салдатамі, якія ўмацаваліся ў хатах, працягваліся некалькі гадзін. У 15.00 савецкія часці вымушаны былі пакінуць мястэчка. У далейшай контратацы праз чыгуначную лінію ў напрамку на поўдзень баявая група СС закрыла разрыў з 12-й тд. У гэтым баі цяжкае раненне атрымаў камандзір групы м-р З. Кюр – ён быў паранены ў галаву і пазбавіўся мовы[566].

Пасля начнога адыходу на новую лінію абароны, 14-я пмд заняла пазіцыі на поўнач ад м. Кузніца па лініі в. Бакуны – Нямейшы – Каробчыцы – поўдзень ад в. Караліно[567] уздоўж рэчышча ракі Ласасянка. Група палк. Г. Трэптава заняла пазіцыі на правым флангу, група




**25 ліпеня 1944г. Пазіцыя Куніца. Нямецкая вайсковая карта**

ппалк. Г.-М. Фрычэ – на левым. Баявыя дазоры, якія падтрымліваў 4-ты дывізіён 14-га артпалка і 2-я батарэея 185-й цяжкай брыгады штурмавых гармат, займалі пазіцыі па рацэ Ласасянка.

Савецкія войскі здзяйснялі атакі па абодва бакі возера на поўнач ад в. Каробчыцы (цяпер – воз. Юбілейнае). Баявая ахова немцаў у сярэдзіне дня адышла на асноўную лінію абароны.

У другой палове дня савецкія войскі здзейснілі атаку ў раёне Кузніцы сілаю да роты салдат, выпрабоўваючы нямецкую абарону. Поспеху гэтая атака не прынесла. Працягваліся цяжкія баі на поўдзень ад Кузніцы. 484-ты мінамётны полк страціў 8 чалавек салдацкага складу забітымі[568].

У выніку цяжкага становішча групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга ў 23.00 група г.-арт. Г. Вейдлінга вымушана была працягнуць адступленне на пазіцыю "Куніца". Пры адступленні 14-ты сапёрны батальён знішчыў чыгуначны мост праз раку Ласасянку ў раёне в. Бакуны. Група адышла на захад на 18 кіламетраў. Нямецкія войскі канчаткова заставілі ваколіцы Гродна.

Гэтымі падзеямі можна скончыць даследаванне баявых дзеянняў на Свіслацкім адрэзку фронту ў ліпені 1944 года.

Напрыканцы варта адзначыць, што свіслацкі фронт павінен быў

бы граць у аператыўным сэнсе для савецкіх войскаў нашмат большую ролю, чым фронт на захадзе і паўночным захадзе ад Гродна. Менавіта ад падзей на свіслацкім фронце залежала становішча ў корпуснай групе обергрупэнфюрара К. фон Готберга. Улічваючы тое, што на гэтым адрэзку абаранялася моцна аслабленая ў папярэдніх баях група г.-арт. Г. Вейдлінга, якая не мела такога моцнага рэзерву, як 3-я тд СС "Мёртвая галава", савецкае камандаванне магло б раней нанесці моцны ўдар на дадзеным адрэзку, маючы ў перспектыве акружэнне корпуснай групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга. З прарывам фронту групы г.-арт. Г. Вейдлінга немцы былі вымушаны адвесці сваё войскі і з фронту па рацэ Нёман на поўнач ад Гродна, і ачысціць Занёманскі фарштат. На жаль, свіслацкі фронт так і заставаўся другарадным ў вачах камандавання.

Тактычнае абазначэнне 50-й пяхотнай дывізіі





Г.Гізэн, камандзір 123-га гп



3. Кюр, камандзір 150-га дывізіёна знішчальнікаў танкаў



Падпалкоўнік Г.-М.Фрычэ, камандзір 11-га грэнадзерскага палка



8,8-см зенітная гармата на пазіцыях па р.Свіслач – Гродна. Ліпень 1944 г.



StuH 42 са 185-й цяжкай брыгады самаходных гармат. Лета 1944 г. , раён Гродна



Адступленне пяхоты 4-й арміі летам 1944 г. Раён Гродна



Транспартная павозка нямецкай арміі



**Генерал І.Ц.Грышын. Камандуючы 49-й арміяй**



**Генерал Ц.К.Шкрылёў, камандзір 64-й сд**



**Генерал Г.Ф.Захараў камандуючы 2 БФ**



**Салдаты на адпачынку. 49-я армія. Лета 1944 года**



**Афіцэры 718-га сп 139-й сд.1944 г.**



**Лейтэнант С.З.Сухін - камандваў групай, якая фарсіравала Нёман каля м.Лунна і забяспечыла пераправу дывізіі**



**С.З. Сухін крайні справа на месцы фарсіравання Нёмана. Побач маць і сястра І.Г.Шарамета, які загінуў у тым баі**



**Штурмавік Іл-2. Адыгрываў адну з галоўных роляў у падтрымцы сваёй пяхоты.**



**Ju-87. 10-я супрацьтанкавая эскадрылія SG 1.Аэрадром м. Дубна. Ліпень 1944 г.**

# РАЗДЗЕЛ 6

# ВЫНІКІ

Апошні раздзел кнігі прысвечаны падсумаванню баявых дзеянняў у раёне Гродна з 14 па 24 ліпеня 1944 года. У раздзеле зроблены аналіз асабовага складу і стратаў як нямецкіх, так і савецкіх войскаў у баях, параўноўваюцца сілы і магчымасці абодвух бакоў.

Трэба адразу сказаць, што пісаць гэты раздзел было вельмі цяжка. Дадзеныя па характарыстыцы, асначанасці савецкіх войскаў фактычна наогул адсутнічаюць у публікацыях і літаратуры. Таму выкарыстоўваўся выключна архіўны матэр'ял. Шмат часу спатрэбілася для падліку колькасці загінуўшых савецкіх салдат і афіцэраў. Аказалася, што гэтыя лічбы дасюль таксама не апублікаваныя. Па крупіцах збіралася інфармацыя аб стратах савецкай і нямецкай бранятэхнікі.

На працягу ўпартых баёў у раёне горада Гродна Чырвоная армія выйшла пераможцам. Аднак якім коштам была дасягнута гэтая перамога? Якімі сіламі валодалі савецкія войскі і Вермахт і якія страты панеслі абодва бакі за два тыдні ўпартых баёў? Паспрабуем адказаць на гэтыя і іншыя пытанні.

### *Войскі Чырвонай арміі на плацдарме на захад ад Гродна*

#### *Колькасны склад*

Праводзячы параўнанне абодвух ваюючых бакоў, трэба, найперш, параўнаць колькасны склад супрацьстаяўшых груповак. Адносна колькаснага складу савецкіх войскаў, што ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях на захад ад Гродна (3-ці Гв. кк і 50-я армія), ёсць толькі няпоўная інфармацыя.

Паводле штату савецкая стралковая дывізія павінна была налічваць 9 484 чалавекі. За тры тыдні баёў асабовы склад дывізій 50-й арміі скараціўся ў два разы. Так, ваенны гісторык Я.П. Елісееў, у сваёй кнізе, прыводзіць наступныя дадзеныя: колькасны склад стралковых дывізій да ліпеня 1944 года скараціўся ў сярэднім да 5,5 тыс. чалавек. Лічба гэта, безумоўна, адносная і магла вар'іравацца

ў большы ці меншы бок. Напрыклад, у 64-й Магілёўскай налічвалася 4 452 чалавекі[569], а ў 307-й сд – 6 866 чалавек[570]. У стралковых ротах заставалася ў сярэднім да 40-50 чалавек. Напрыклад, у 878-м сп 290-й сд на момант баёў за горад Гродна ў некаторых ротах 3-га батальёна (7-я і 9-я роты) засталося па 35-40 чалавек. Увечары 17 ліпеня са складу 9-й роты, якая цэлы дзень утрымлівала плацдарм каля чыгуначнага маста, засталося толькі 8 чалавек[571]. У некаторых падраздзяленнях страты былі яшчэ большыя і асабовы склад батальёна быў раўны роце. Так за тры дні баёў на левым беразе Нёмана ў складзе 1-га батальёна 241-га сп 95-й сд налічвалася толькі 25-30 чалавек.

Такім чынам да пачатку баёў у раёне Гродна 50-я армія г.-л. І.В. Болдзіна (у складзе 42-й, 153-й, 95-й, 290-й, 64-й, 238-й, 199-й і 139-й стралковых дывізій) налічвала каля 40 тыс. чалавек. Архіўныя дадзеныя падцвержваюць гэтую лічбу – колькасць войскаў 50-й арміі ў сярэдзіне ліпеня дасягала 35 768 чалавек[572]. На плацдарме на захад ад Гродна дзейнічалі толькі 2 карпусы 50-й арміі – 69-ты ск і 81-шы ск, а гэта 20 426 чалавек.

Адносна колькасці 3-га Гв. кк на момант баёў у Гродна дадзеных увогуле пакуль знайсці не ўдалося. Па прыблізных разліках колькасць кавалерыйскага корпуса на той момант магла дасягаць 18-20 тыс. чалавек.

Калі ўлічваць, што акрамя дывізій 50-й арміі на плацдарме вялі баі дывізіі 31-й арміі (174-я і 220-я сд), а таксама тры дывізіі 3-га Гв. кк, склад савецкай групоўкі на плацдарме мог дасягаць 50 тысяч чалавек.

У працэсе баёў колькасць савецкіх войскаў на плацдарме расла. Да іх далучыліся 307-я, 324-я і 330-я сд, а таксама часці ўзмацнення. Так, толькі інжынерныя падраздзяленні налічвалі да 8 батальёнаў. Акрамя таго, дывізіі 50-й арміі на плацдарме падтрымлівалі 2 самаходна-артылерыйскія палкі, 2 гаўбічныя палкі, 3 мінамётныя палкі, 2 знішчальна-супрацьтанкавыя палкі. Не варта забывацца і пра зенітныя падраздзяленні (47-я дывізія РГК). Яны забяспечвалі прыкрыццё пераправаў праз раку Нёман. Такім чынам, нават па вельмі прыблізных ацэнках, колькасць савецкіх войскаў на плацдарме на захад ад Гродна на 22-25 ліпеня, а гэта значыць на завяршальным этапе баёў, магла дасягаць 70-75 тысяч чалавек.

### *Бранятэхніка*

Цяпер паспрабуем высветліць, якой колькасцю бранятэхнікі валодалі савецкія войскі. Танкавыя і механізаваныя сілы 2-га Беларускага фронту налічвалі ўсяго 154 танкі і САУ, з якіх 84 патрабавалі рамонту. На 6 ліпеня ў 50-й арміі налічвалася толькі 15 танкаў і 58 самаходных установак[573]. Да пачатку баёў за горад (12-14 ліпеня) усе бранятанкавыя сілы арміі былі зведзены ў 2 палкі самаходнай артылерыіі:

1444-ы (14 СУ-76) і 1434-ы (4 СУ-85). Астатнія падраздзяленні згубілі сваю тэхніку і былі выведзены ў рэзерв і ў баях не ўдзельнічалі. 1444-ы полк дзейнічаў на плацдарме на левым беразе Нёмана, 1434-ы – на Свіслацкім фронце. Такім чынам, бачна, што ўзмацняючыя армію бранятанкавыя сілы былі проста мізэрнымі (толькі 18 САУ). Да таго ж, самаходныя ўстаноўкі СУ-76 зусім не былі грознай зброяй і весці бой з нямецкімі танкамі, асабліва цяжкімі, маглі толькі вельмі асцярожна і без вялікіх шансаў на перамогу. Акрамя таго, у баях на захад ад Гродна прымалі ўдзел бранятанкавыя сілы 3-га Гв. кк: 104-ы, 198-ы і 207-ы танкавыя палкі (напр.: на 14 ліпеня ў складзе 198-га тп налічвалася 3 танкі і 2 САУ)[574]. Ёсць яшчэ адзін цікавы факт пра танкі, што выкарыстоўваліся ў 3-м Гв. кк. Так, падчас атакі станцыі Парэчча падраздзяленнямі 6-й Гв. кд выкарыстоўваўся трафейны нямецкі танк T-V "Panter", які ўвёў ў зман немцаў і дапамог ў захопе станцыі.

### *Арыенціроўка на мясцовасці, сувязь і разведка*

Пад час баёў за горад Гродна ў войсках 50-й арміі распаўсюджваліся дадзеныя авіаразведкі. Распаўсюджваліся сярод афіцэраў і планы горада. Штурму горада папярэднічала праца некалькіх савецкіх разведгрупаў. Аднак дакладнай інфармацыі аб нямецкіх сілах, займаўшых горад, камандванне 2-м БФ фронтам не мела. Так з'яўленне на подступах да горада часцей 5-га і 12-га танкавых разведвальных батальёнаў было поўнай нечаканасцю для савецкіх палкоў.

Яшчэ ў больш горшым стане была пастаўлена разведка і сувязь, а таксама арыенціроўка савецкіх войск на мясцовасці на левым беразе Нёмана. Наступаўшыя ў заходнім накірунку савецкія падраздзяленні вельмі дрэнна арыентаваліся. Прывядзём словы камандзіра батальёна 508-га сп 174-й сд 31-й аміі ст. л-та М.К. Глазунова: "...у ноч, без карты, па зусім невядомай мясцовасці. Дадзены толькі накірунак... локцевай сувязі з суседзямі няма, абстаноўка да канца незразумелая... Палкавая разведка дзейнічае агідна, яе проста не бачна, не кажучы пра дывізійную"[575].

Нажаль, такі стан рэчаў не быў выключэннем і для 50-й арміі. Яшчэ 14 ліпеня 1944 года г.-л. І.В. Болдзін, заклапочаны тым, што войскі рухаюцца наперад практычна ўсляпую, не ведаюць нямецкія сілы, выдаў загад наступнага зместу:

1. Неадкладна актывізаваць усе віды разведкі частак і злучэнняў.
2. Кожнай сд першай лініі ставіць наперад сябе на галоўным накірунку разведатрад у складзе 35-40 разведчыкаў з 2 гарматамі ПТО, групай сапёраў і хімікаў.
3. Атрадам дзейнічаць на аддаленасці 10-12 км ад галоўных сіл, маю-

чы задачу: смела пранікаць на шляхі адыходу праціўніка, граміць штабы, захопліваць палонных і дакументы, выяўляць наяўнасць гатовых рубяжоў абароны, склад сіл, намеры праціўніка і галоўны накірунак адыходу.

4. Кожнаму сп мець не менш за 2 пастаянна дзеючыя разведгрупы па 12-14 чалавек, якія выкарыстоўваліся наперадзе і на флангах на дыстанцыі 4-6 км.

5. Камандзірам сд і сп асабіста ставіць задачы разведатрадам і разведгрупам і кантраляваць іх выкананне"[576].

На жаль, і пасля гэтага загаду дзейнасць разведкі не заўсёды знаходзілася на належным узроўні. Успомніць хаця б наступленне 42-й Смаленскай ці 95-й сд на плацдарме, калі з'яўленне нямецкіх танкаў стала поўнай нечаканасцю для савецкіх салдат.

Сувязь у войсках, паміж штабамі і падраздзяленнямі таксама пакідала жадаць лепшага. Калі ж савецкія падраздзяленні 2-га БФ трапілі ў акружэнне, то сувязь з імі наогул была страчана. З акружанымі падраздзяленнямі 3-га Гв. кк і 153-й сд сувязь падтрымлівалася пры дапамозе авіяцыі. Так, камандзір палка 153-й дывізіі м-р Ф.С. Фядотаў узгадваў: "З другой паловы дня 18 ліпеня сталі з'яўляцца нашы самалёты. Звёны знішчальнікаў праносіліся над размяшчэннем дывізіі і корпуса Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскага, скідвалі вымпелы з загадамі камандавання арміі і фронту, агнём пушак і кулямётаў рассейвалі сканцэнтраванні гітлераўцаў". Акрамя таго, з кавалерыйскага корпуса пасылаліся і сувязныя. Падтрымлівала сувязь і карпусная эскадрылля. Аднак усе гэтыя дзеянні не забяспечвалі войскі надзейнай і трывалай сувяззю.

Паўстае пытанне – чаму ж нельга было падтрымліваць сувязь па радыё? Адказ вельмі просты – арганізацыя перамоваў знаходзілася ў катастрафічным стане! У падцверджанне гэтага прывядзем цікавы дакумент – "Баявое распараджэнне камандуючага войскамі 2-га Беларускага фронту № 0037/оп аб недаліках у працы штабоў і мерапрыемствах па іх ліквідацыі (25.7.44г.)". У прыватнасці ў ім адзначалася: "Радыёсувязь штабы выкарыстоўваюць незадавальняюча. Данясенні па радыё прадстаўляюцца з лішнімі падрабязнасцямі. Камандзіры ўсіх ступеняў радыёстанцый пры сабе не трымаюць. Дапускаюцца перамовы па радыё адкрытым тэкстам (штабы 49-й і 50-й армій). Пытаннямі скрытага кіравання войскамі штабы займаюцца дрэнна, выкарыстоўваюць прымітыўнымі перамоўнымі табліцамі, прымітыўнай кадзіроўкай, што вядзе да перахопу праціўнікам аператыўных распараджэнняў"[577]. У барацьбе з лепшымі нямецкімі падраздзяленнямі такая пастаноўка працы у штабах 50-й арміі была проста недапушчальнай. Як бачна з прыведзеных вы-

шэй вытрымак кіраванне войскамі па радыёсувязі ў 50-й арміі было пастаўлена вельмі дрэнна. Як вынік – войскі арміі штораз аказваліся кінутымі самі па сабе, а памылкі і недахопы штабоў выпраўляліся за кошт крыві байцоў. У той жа час г.-п. Г.Ф. Захараў адзначаў добрую працу штаба 3-га Гв. кк, які знаходзіўся пад час баёў на плацдарме ў больш цяжкім становішчы. Акрамя гэтага батарэі для радыёстанцый 50-й арміі не былі наладаваны – сілкавання для іх ужо 15 ліпеня было толькі на 3-4 дні! Таму работа радыястанцый 50-й арміі была строга абмежавана[578]. Як мог дапусціць да такога становішча штаб і камандванне арміі – не зразумела.

Наогул дзейнасць штаба 50-й арміі і падначаленых карпусоў не была належным чынам арганізавана. Падцверджаннем гэтага з'яўляецца тое ж "Баявое распараджэнне камандуючага войскамі 2-га Беларускага фронту № 0037/оп (25.7.44г.)" дзе ў прыватнасці адзначалася незадавальняючая праца штабоў 50-й арміі і 69-га ск. Так у баявым распараджэнні падкрэслівалася неаднаразовая страта штабамі арміі кіравання сваімі войскамі. Прывядзем адзін з эпізодаў працы 69-га ск, апісаны ў гэтым дакуманце: "Праца штаба 69-га ск пры прарыве абарончай паласы па р. Нёман на поўнач ад Гродна была арганізавана дрэнна. Разлікі па арганізацыі ўзаемадзеяння на мясцовасці штабам корпуса праведзены не былі. Не было адпрацавана пытанне кіравання ў частцы перасоўвання каманднага пункта у глыбіне, на захад ад р. Нёман. 23.7.44 штакор (штаб корпуса – Д.Л.) знаходзіўся ў Яцвезь і, не правёўшы праверку дадзеных аб заняцці Рацічы, стаў перамяшчацца ў раён Рацічы, тады як перадавыя часці корпуса яго знаходзіліся на ўсход Рацічы і вялі бой за гэты пункт. Штакор быў вымушаны спыніцца ў Васарабы, не маючы там падрыхтаванага вузла сувязі; натуральна, кіраванне было парушана. У такім жа становішчы аказаліся і штабы 324-й і 307-й сд"[579]. Складваецца ўражанне, што штабы арміі жылі сваім жыццём, не арыентуючыся ў баявой абстаноўцы. Дарэчы, такое становішча вельмі нагадвае абставіны лета 1941 года, калі вайна толькі пачалася і ў савецкай арміі панавала разгубленасць. Аднак 4 гады баёў, як бачна, мала навучылі савецкае камандванне. Аднак працягнем. Штаб 50-й арміі рэгулярна затрымліваў загады, атрыманыя са штаба фронту. Адпаведна гэтыя загады адпраўляліся ў войскі з затрымкай. Тым самым палявым войскам заставалася менш часу на падрыхтоўку да аперацый. Нездавальняючай была прызнана і праца ўсіх штабных афіцэраў сувязі. Наогул штабы 50-й арміі ўсіх узроўняў няправільна выкарыстоўвалі сувязь з ніжэйшымі падраздзяленнямі.

Адсутнасць добрай разведкі і сувязі былі аднымі з галоўных прычын паражэнняў дывізій 50-й арміі і 3-га Гв. кк у ліпені 1944 года ў раёне Гродна. На жаль такія памылкі дорага каштавалі.

*Артылерыя*

Зусім непадрыхтаванымі аказаліся падраздзяленні 50-й арміі для барацьбы з нямецкай бранятэхнікай. Складаецца ўражанне, што войскі 2-га БФ і не разлічвалі сутыкнуцца з нямецкімі танкамі ці САУ. Хутчэй за ўсё, сказвалася эйфарыя пасля перамог ва ўсходняй Беларусі і ў раёне Мінска.

Часта савецкія стралковыя падраздзяленні на плацдарме вялі баі наогул без артылерыі і, зразумела, не вытрымлівалі танкавых атак. Пры батальёне знаходзіліся, у асноўным, састарэлыя 45-мм супрацьтанкавыя пушкі, якія былі малаэфектыўнымі ў барацьбе нават з сярэднімі танкамі T-IV, не гаворчы ўжо пра цяжкія танкі "Tiger". Прывядзем прыклад баёў 290-й сд. Паводле штату артылерыйскае ўзмацненне 878-га палка дывізіі на 14 ліпеня складалася з 13 мінамётаў 82-мм калібра, чатырох мінамётаў калібру 120-мм, а таксама дзвюх 76-мм гармат і адзінаццаці 122-мм гаўбіц з артылерыйскага дывізіёна 1420-га ап. Аднак на левы бераг ракі Нёман, дзе змагаўся полк, уся гэта артылерыя не трапіла. Яе не маглі пераправіць. Таму падтрымка палка была змушана весціся з-за ракі[580]. Да канца баёў гэта сітуацыя не была выпраўлена[581]. Падраздзяленні 290-й дывізіі неслі вялікія страты і не маглі рухацца наперад, стрыманыя толькі слабымі паліцэйскімі сіламі і артылерыяй СС.

Не аказалася неабходнай артылерыі і ў падраздзяленнях 42-й стралковай дывізіі. Яе роты неаднаразова траплялі пад прамыя атакі баявой групы СС, танкаў і штурмавых гармат, неслі вялікія страты. З-за адсутнасці значнай колькасці супрацьтанкавай артылерыі дывізія наогул некалькі разоў была скінута ў Нёман. Як вынік – пасля баёў у раёне Гродна гэта падраздзяленне вывелі са складу арміі на пераўкамплектаванне.

95-я сд падышла да Гродна наогул без дывізійнай артылерыі і без артылерыі ўзмацнення[582]. Ёсць сведчанні толькі пра дзеянні ў баях на плацдарме 97-га азстд са складу дывізіі. Так, паводле ўспамінаў Г.З. Адагова: "У чэрвені 1944 г. баявыя разлікі артылерыйскіх батарэй нашага дывізіёна папоўніліся з рэзерву нашай дывізіі і дывізіёна. Мне таксама прапанавалі заняць месца заражаючага ў баявым разліку супрацьтанкавай 76-мм пушкі ў 2-й батарэі. У склад нашага дывізіёна таксама ўваходзіла рота СТР (супрацьтанкавых ружжаў). Асноўнай задачай нашага артдывізіёна і роты СТР з'яўлялася барацьба з танкамі, жывой сілай і агнявымі кропкамі праціўніка"[583]. Калі 76-мм гарматы былі дзейснай сілай у барацьбе з нямецкай бранятэхнікай, то СТР ужо безнадзейна састарэлі і не былі прыдатны для гэтага.

Падводзячы высновы можна працытаваць "Журнал баявых дзеянняў 50-й арміі", дзе, у прыватнасці, адзначаецца: "330-я, 42-я, 95-я сд, якія наступалі цягам трох дзён на адну ўзмоцненую танкавую дывізію праціўніка няпоўнага складу, у выніку выключна неарганізаваных і няўмелых дзеянняў панеслі значныя страты і не дасягнулі станоўчых вынікаў". Гэта адбылося па прычыне таго, што наступаючыя баявыя парадкі пяхоты не былі дастаткова забяспечаны артылерыяй СТА і артылерыяй узмацнення для барацьбы з танкамі. У выніку незабяспечанасці першых эшалонаў пяхоты сродкамі для барацьбы з танкамі, немцам вельмі лёгка ўдавалася адкідваць іх назад[584].

У арміі не хапала боепрыпасаў. У табліцы №1 паказана іх колькасць. Натуральна, што недахоп боепрыпасаў стаў прычынай вялікіх страт сярод савецкіх войск

***Табліца № 1. Колькасць боепрыпасаў у 50-й арміі на 16 ліпеня 1944 года.***

| **Назва боепрыпасаў** | **У войсках** | |
|---|---|---|
| | штук | боекамплект |
| Вінтовачныя патроны | 2110000 | 0,25 |
| ППШ | 1801000 | 0,35 |
| Міны 82-мм | 14203 | 0,25 |
| 120-мм | 4593 | 0,25 |
| Снарады 45-мм | 21276 | 0,35 |
| 76-мм | 4222 | 0,35 |
| 76-мм (ПА-43г) | 10613 | 1,6 |
| 76-мм (ДА) | 17513 | 0,45 |
| 122-мм (гаўбіцы) | 5092 | 0,4 |
| 122-мм (пушкі) | 838 | 3 |
| 152-мм | 1982 | 2,2 |
| 57-мм (ЗІС-2) | 16129 | 0,8 |
| 85-мм (СУ-85) | 870 | 1 |

Табліца складзена на аснове Журнала баявых дзеянняў 50-й арміі (ЦАМА, Ф. 50 арміі, воп. 9769, с. 323, л. 73).

З табліцы №1 бачна, што войскі арміі адчувалі востры недахоп у боепрыпасах яшчэ да пачатку актыўных баявых дзеянняў. Весці

ж інтэнсіўную агнявую падтрымку наступаючым войскам з такой колькасцю артылерыйскіх боепрыпасаў было проста немагчыма. Адсюль і праблемы з няўдалымі наступленнямі і неапраўданымі стратамі. Недахоп боепрыпасаў адчуваўся ў войсках на працягу ўсіх баёў на плацдарме.

*Дзеянні савецкай авіяцыі*

Варта заўважыць, што авіяцыйнае прыкрыццё на плацдарме савецкіх войскаў не было арганізавана. У асобныя дні, напрыклад, падчас знішчэння немцамі пераправаў праз р. Нёман, прыкрыцця не было наогул. Гэта вельмі дзіўна, таму што забеспячэнне фарсіравання Нёмана падраздзяленнямі Чырвонай арміі павінна было быць галоўнай задачай для авіяцыі. Хутчэй за ўсё адсутнічала адпрацаванае ўзаемадзеянне авіяцыі і пяхотных і кавалерыйскіх падраздзяленняў – яны не маглі выкарыстоўваць сваё авіяцыйнае прыкрыццё ў той момант, калі гэта было неабходна, што рабілася ў Вермахце яшчэ з пачатку вайны.

Паўстае справядлівае пытанне: дзе ж была, напрыклад, 309-я знішчальная авіядывізія палк. В.М. Вуса, спецыяльна дадзеная кавалерыйскаму корпусу? Чаму яна не дапамагала адбіваць атакі нямецкіх штурмавікоў? Лейтэнант медыцынскай службы 3-га медычнага санітарнага эскадрона 6-й Гв. кавалерыйскай дывізіі М.П. Брыкель (сястра камандзіра дывізіі Гв. г.-м. П.П. Брыкеля) узгадвала пра бамбёжкі ў раёне Гродна: "А бамбілі нас сур'ёзна. Наступленне ішло з такой імклівасцю, што нашыя аэрадромы не паспявалі перабрацца на новыя месцы і самалёты нас амаль не прыкрывалі; праціўнік гэта выкарыстоўваў і бамбіў бязлітасна"[585]. Магчыма, у гэтым частковы адказ на пытанне пра тое, дзе была савецкая авіяцыя. Акрамя гэтага, трэба заўважыць, што авіяцыйныя падраздзяленні таксама панеслі страты ў папярэдніх баях. Па меркаванні Гв. г.-л. М.С. Асlікоўскага, кепскае прыкрыццё з паветра Чырвонай арміі тлумачылася тым, што 3-ці Гв. кк выйшаў з зоны дзеяння 3-га Беларускага фронту. Аднак і тут можна не згадзіцца, таму што 309-я зад уваходзіла ў склад 2-га БФ. І ўсё ж – савецкія пераправы 3-га Гв. кк і 50-й арміі руйнаваліся немцамі кожны дзень! Няўжо ж нельга было вырашыць гэтую праблему? Відаць камандванне і 50-й арміі, і 2-га Беларускага фронта не лічыла гэта неабходным. Знішчаныя пантонныя падраздзяленні замяняліся ўсё новымі і новымі. Вынік які можна зрабіць з вышэйсказанага – безабаронныя пераправы праз Нёман пакідаліся нямецкай авіяцыі па прычыне злачыннай халатнасці і авіяцыйнага і сухапутнага камандвання.

Аналіз баявых дзеянняў авіяцыі на працягу баёў у раёне Гродна паказвае, што найбольш актыўна дзейнічалі 49-ты і 162-гі знішчальныя

авіяцыйныя палкі 309-й зад. Наогул, на працягу баёў на плацдарме на левым беразе р. Нёман і ў раёне Гродна падтрымка наземных савецкіх частак ажыццяўлялася наступнымі авіяцыйнымі падраздзяленнямі:

309-й зад у складзе 110 самалётаў: 49-ты зап (на ўзбраенні знішчальнікі Ла-5), 162-гі зап (на ўзбраенні знішчальнікі Як-9), 172-гі зап (на ўзбраенні знішчальнікі Як), 272-гі зап,

290-й зад,

230-я шад (43-ці шап, 103-ці шап, 7-мы Гв.шап – на ўзбраенні палкоў самалёты Іл-2)

233-я шад (62-гі шап, 198-мы шап,)

199-й шад (136-ты Гв. шап (на ўзбраенні штурмавікі Іл-2)

96-ты Гв. бап.

Негледзячы на немалы спіс паветраных падраздзяленняў, рэзультатыўнасць іх працы была невялікай. Невядома з якой рэгулярнасцю дзейнічала авіяцыя над баявымі парадкамі савецкіх войскаў. Так у некаторыя дні самалёты вылятал па некалькі разоў. Як бы там не было, аднак становішча ў паветры ў ліпені 1944 года ў раёне Гродна складалася не на карысць савецкай авіяцыі.

***

Што да забеспячэння савецкіх войскаў медыцынскімі службамі прывядзем цікавыя дадзеныя паводле 3-га Гв. кк. Камандзір мінамётнага ўзвода і агітатар 24 Гв. кп старшына Д.І. Вадзінскі пісаў: "Медсанэскадроны дывізіі былі добра забяспечаны, мелі новыя санітарныя машыны, палаткі. Тут былі падраздзяленні: сарціровачнае, аперацыйнае, перавязачнае, эвакагрупа, пасляаперацыйнае (палявы стацыянар), аптэка. Кожнае аддзяленне мела свае палаткі, машыны, урачоў, медсёстраў. І ўсё ж варта прызнаць: персаналу медэскадрона было цяжка. Раненых было шмат, медэскадроны размяшчаліся паблізу перадавой, нярэдка абстрэльваліся артылерыяй, іх бамбіла авіяцыя, а то і групамі аўтаматчыкаў. Урачам і медсёстрам даводзілася браць у рукі аўтаматы, каб абараніць раненых"[586]. У 50-й арміі асноўная маса шпіталяў размяшчалася на правым беразе Нёмана. Таму эвакуіраваць параненых было вельмі цяжка. Зноў жа перашкаджала адсутнасць пераправў ці іх знішчэнне, нетрывалае становішча войск на плацдарме.

Такім чынам часці Чырвонай арміі, якія падышлі да Гродна і вялі баі на плацдарме на захад ад горада панеслі вялікія страты яшчэ ў папярэдніх баях (да 50% асабовага складу), амаль што не мелі падтрымкі бранятэхнікі. Кіраванне войскамі было слабым. Вельмі дрэнна дзейнічала разведка, сувязь. Войскі дрэнна арыентаваліся на мясцовасці. Камандванне 50-й арміі не забяспечыла фарсіравання р. Нёман, а авіяцыя 2-га БФ не здзяйсняла іх

надзейнага прыкрыцця. У войсках адчуваўся востры недахоп у боепрыпасах. У той жа час трэба адзначыць, што становішча ў 3-м Гв. кк было значна лепшым. Падраздзяленні корпуса былі добра аснашчаны. Штаб корпуса і дывізій дзейнічаў вельмі аператыўна. І гэта нягледзячы на тое, што корпус знаходзіўся ў больш дрэнным становішчы. Усё гэта гаворыць аб больш высокім, у параўнанні з 50-й арміяй, майстэрстве яго камандвання.

*Свіслацкі фронт*

*Колькасны склад і ўзбраенне*

Свіслацкі фронт быў працягам нямецкай абароны па цячэнню ракі Нёман на поўдзень ад Гродна. Менавіта сюды вышлі 70-ты і 121-шы карпусы 50-й арміі. Пазней тут была сканцэнтравана 49-я армія.

Гаворачы пра колькасны склад і ўзбраенне савецкіх войск па Свіслацкім фронце трэба адзначыць, што дадзеныя тут, на жаль, больш сціплыя. Савецкія войскі на гэтым адрэзку фронту ўяўлялі сабой падраздзяленні 70-га корпуса (64-я, 199-я дывізіі) і 121-га корпуса (139-я і 238-я дывізіі) 50-й арміі г.-л. І.В. Болдзіна. Фактычна да 19 ліпеня пазіцыі па рацэ Свіслач у паласе правага фланга 4-й нямецкай арміі займалі толькі 3 савецкія дывізіі (64-я, 139-я і 199-я). 238-я дывізія знаходзілася ў армейскім рэзерве і была сканцэнтравана на другім беразе Нёмана ў раёне в. Коматава. Магчыма, г.-л. І.В. Болдзін думаў увесці яе ў бой за Гродна, аднак адмовіўся ад гэтай ідэі. З 21 ліпеня савецкія сілы на гэтым адрэзку былі ўзмоцнены за кошт уведзенай у бой 49-й арміі (324-я, 343-я, 380-я і 385-я сд) і частак узмацнення. З 21 ліпеня ў складзе арміі знаходзіліся 70-ты і 121-шы карпуса. Такім чынам, на свіслацкім адрэзку фронту колькасць савецкіх войскаў магла дасягаць 45 тысяч чалавек.

Савецкі бок выкарыстоўваў на Свіслацкім фронце 42-ю Гв. атбр, а таксама 1434-ты сап. На ўзбраенні 42-й атбр. стаялі, верагодна, танкі Т-34. Нямецкі бок паведамляе пра выкарыстанне менавіта іх. Колькасць іх у брыгадзе невядомая. У баях за м. Кузніца 23 ліпеня савецкія войскі мелі 7 танкаў. Артылерыя 70-га і 121-га карпусоў, у адрозненне ад 69-га была пераапраўлена праз Нёман і ўзмацняла баявыя парадкі пяхоты. Аднак востра адчуваўся недахоп боепрыпасаў. Так артылерыя 70-га корпуса мела толькі па 10-12 снарадаў на кожную гармату[587], а ў 238-й сд на аднаго байца прыходзілася толькі па пяць патронаў20!

Свіслацкі фронт, на жаль не адыграў належнай яму ролі. Менавіта ён павінен быў стаць плацдармам для далейшага паспяховага наступлення 50-й арміі (што ў рэшце рэшт і адбылося). Аднак на працягу напружаных баёў на левым беразе Нёмана дывізіі 70-га і 121-га карпусоў амаль што не дапамаглі астатняй частцы арміі. Камандванне

ж арміі кідала ўсё новыя рэзервы менавіта на той участак фронта, дзе іх чакалі немцы, не ўлічваючы магчымасці наступлення ў абыход Гродна з поўдня. Калі ж анступленне тут было арганізавана з прыцягненнем значных сіл – яно адразу прынесла поспех.

Да чаго ж прывялі ўсе гэтыя памылкі і якія страты панеслі савецкія войскі ў баях у раёне Гродна?

### *Страты савецкіх войск.*

Вельмі важнае пытанне, якое стаяла перада мною пры напісанні гэтай кнігі было наступным: якія ж страты панеслі часці Чырвонай арміі пры вызваленні Гродна і ваколіцаў? Паспрабуем на яго адказаць.

Што да страт савецкіх войскаў, назваць канрэтную лічбу вельмі складана. Разгледзім спачатку страты 50-й арміі г.-п. І.В. Болдзіна, а таксама частак, якія дзейнічалі разам з ёй на левым беразе ракі Нёман на паўночны захад ад Гродна. У выніку баёў вельмі вялікія страты панесла 42-я сд, якая цягам некалькіх дзён вытрымлівала моцныя ўдары немцаў. У палках дывізіі заставалася па 300-400 чалавек[588]! Таму ўжо 25 ліпеня яна была выведзена на даўкамплектаванне. У рэзерв 31 ліпеня быў выведзены і сканцэнтраваны ў раёне мястэчка Сапоцкін 3-ці Гв. кк. Прыблізныя страты дывізій прыводзяцца ў табліцы №4, складзенай аўтарам на аснове дадзеных кніг "Памяць" па г. Гродна і раёну (прыводзяцца дадзеныя толькі па забітых).

***Табліца № 2. Страты савецкіх войскаў у баях на плацдарме на захад ад Гродна***

| дывізія | падраздзяленне | 17.07 | 18.07 | 19.07 | 20.07 | 21.07 | 22.07 | 23.07 | 24.07 | 25.07 | Агулам: |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **42-я сд** | 44-ты сп | 5 | 10 | 9 | 11 | 6 | 5 | 3 | | 5 | 54 |
| | 455-ты сп | 1 | 53 | 16 | 4 | 3 | 5 | 1 | 1 | 1 | 85 |
| | 459-ты сп | 12 | 7 | 1 | 1 | | | | 3 | 1 | 25 |
| | 472-гі ап | | | | | | | | 1 | 1 | 2 |
| | 4-ты азстд | 1 | | 1 | | | | | | | 2 |
| | 84-я асоб. рр-та | | 1 | | | | | | | | 1 |
| | **агулам:** | **19** | **71** | **27** | **16** | **9** | **10** | **4** | **5** | **8** | **169** |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **95-я сд** | 90-ты сп | 6 | 2 | 2 | 5 | 19 | 1 | 4 | | | 39 |
| | 161-шы сп | 12 | 5 | 8 | 3 | 7 | | 2 | 3 | | 40 |
| | 241-шы сп | 2 | 2 | 7 | 4 | 6 | 7 | | | | 28 |
| | 57-мы ап | | | 2 | | 1 | | | 1 | | 4 |
| | 97-мы азстд | | | | | 1 | | 1 | 1 | | 3 |
| | 119-я асоб. р-та сувязі | | | | | | | | 1 | | 1 |
| | **агулам:** | **20** | **9** | **19** | **12** | **34** | **8** | **7** | **6** | | **115** |
| **153-я сд** | 563-ці сп | 16 | | 1 | 1 | 3 | 9 | 4 | | | 34 |
| | 566-ты сп | | | 2 | | | | | | | 2 |
| | 577-мы сп | 1 | | | | 1 | 1 | 1 | | | 4 |
| | 1035-ты ап | | | | | 1 | | | | | 1 |
| | без падразд. | 2 | 1 | 1 | | | 1 | 1 | 1 | | 7 |
| | **агулам:** | **19** | **1** | **4** | **1** | **5** | **11** | **6** | **1** | | **48** |
| **174-я сд** | 508-мы сп | 2 | 1 | 1 | | 1 | | | 2 | | 7 |
| | 628-мы сп | 1 | | 2 | | 8 | 2 | 4 | | | 17 |
| | 598-мы ап | 1 | | | | 5 | | | | | 6 |
| | без падразд. | 2 | 1 | | 1 | | | | | | 4 |
| | **агулам:** | **6** | **2** | **3** | **1** | **14** | **2** | **4** | **2** | | **34** |
| **220-я сд** | 376-ты сп | 2 | 1 | 3 | 1 | | 3 | 2 | 4 | 5 | 21 |
| | 653-ці сп | | | 4 | | 1 | 3 | 10 | 4 | 1 | 23 |
| | 673-ці сп | | | | 1 | 1 | 2 | | 8 | 1 | 13 |
| | 660-ты ап | 3 | 1 | 2 | 5 | | 1 | | 3 | | 15 |
| | 46-ты азстд | | | | | 2 | | | | | 2 |
| | 489-я асоб. рр-та | 1 | | | | | 1 | | | | 2 |
| | асоб. вуч. буд. р-та | | | | | 10 | | | 1 | | 11 |
| | без падразд. | | | 1 | | | | 1 | | | 2 |
| | **агулам:** | **6** | **2** | **10** | **7** | **14** | **10** | **13** | **20** | **7** | **89** |
| **307-я сд** | 1019-ты сп | | | | | 1 | | 11 | 9 | | 21 |
| | 1021-шы сп | | | | 1 | 1 | | 1 | 6 | 5 | 14 |
| | 1023-ці сп | | | | | | | 1 | | | 1 |
| | **агулам:** | | | | **1** | **2** | | **13** | **15** | **5** | **36** |

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **324-я сд** | 1091-шы сп | | | | | | 1 | 1 | | | 2 |
| | 1093-ці сп | | | | 1 | 12 | 2 | 9 | 1 | | 25 |
| | 1095-ты сп | | | | | 22 | 22 | 2 | | 1 | 47 |
| | 887-мы ап | | | | | 4 | | | | | 4 |
| | без падразд. | | | | | 2 | | 1 | 2 | 1 | 6 |
| | **агулам:** | | | | **1** | **40** | **25** | **13** | **3** | **2** | **84** |
| **352-я сд** | 1158-мы сп | 3 | 1 | | | | | | | | 4 |
| | 1160-ты сп | 4 | 1 | | | | | | | | 5 |
| | 1162-гі сп | 12 | | | | | | | | | 12 |
| | 914-ты ап | | | | | | | | | | |
| | 272-гі азстд | | | | | | | | | | |
| | без падразд. | 1 | | | | | | | | | |
| | **агулам:** | **20** | **2** | | | | | | | | **22** |
| **330-я сд** | 1109-ты сп | | | | 1 | 4 | | 1 | | | 6 |
| | 1111-ты сп | | 1 | 9 | 31 | 14 | 4 | 3 | 2 | | 64 |
| | 1113-ты сп | | | 19 | 11 | 3 | 1 | 4 | 2 | | 40 |
| | 890-ты ап | | 1 | | 1 | | | | 1 | | 3 |
| | 250-ты азстд | | | 1 | | 1 | | | | | 2 |
| | 392-я отд. аўтатр. р-та | | | | | | 1 | | | | 1 |
| | без падразд. | | 1 | 2 | 38 | 6 | 16 | 2 | | | 65 |
| | **агулам:** | | **3** | **31** | **82** | **28** | **22** | **10** | **5** | | **181** |
| **32-я кд** | 121-шы кп | 2 | | | | | | | | | 2 |
| | 534-ты асоб. дыв. СПА | 1 | | | | | | | | | 1 |
| | **агулам:** | **3** | | | | | | | | | **3** |
| **5-я Гв. кд** | 22-гі Гв. кп | 5 | | | | 1 | | | | | 6 |
| | 24-ты Гв. кп | 3 | 5 | 2 | | | | | | | 10 |
| | **агулам:** | **8** | **5** | **2** | | **1** | | | | | **16** |
| **141-шы эстап** | | | | 1 | 11 | | | | | | 12 |
| | **агулам:** | | | **1** | **11** | | | | | | **12** |
| **144-ты эстап** | | | | 2 | | | | | | | 2 |
| | **агулам:** | | | **2** | | | | | | | **2** |
| **50-я сап. бр** | **217-ты інж. будаўн. бат.** | | | | | 4 | | | | | 4 |
| | **агулам:** | | | | | **4** | | | | | **4** |

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 33-я асоб. М.інж. бр | **143-ці асоб. М.інж.бат.** | | | | | 20 | 3 | | | | 23 |
| | **агулам:** | | | | | 20 | 3 | | | | 23 |
| агулам | | 101 | 95 | 99 | 132 | 171 | 91 | 70 | 57 | 22 | 838 |

Дадзеныя табліцы №2 з'яўляюцца няпоўнымі. Не выключана, што падчас баёў немагчыма было атрымаць дакладную інфармацыю аб стратах. Акрамя таго, кнігі "Памяць" не ўтрымліваюць дадзеных пра ўсе пахаванні салдат і г.д. Пахаванні салдат153-й сд і кавалерыстаў 3-га Гв. кк ёсць на тэрыторыі Рэспублікі Польшча.

Таксама існуюць пахаванні савецкіх салдат, якія не ўлічаны афіцыйна. Напрыклад, ёсць звесткі, што не былі пахаваны салдаты, што загінулі на пераправе ў в. Пышкі. Мясцовыя жыхары хавалі іх самі. Прычым не зносілі іх у агульную магілу, а хавалі адразу там, дзе яны заставаліся ляжаць пасля баёў. Пасля вайны салдат ужо ніхто не перахоўваў. Падобнае становішча было і ў в. Навумавічы. Паводле аповяду жыхара в. Навумавічы У.М. Гердэвіча, савецкіх салдат "...ніхто не хаваў. Жыта жалі – вонь страх была. Былі тут афіцэры. Сказалі салдатаў падбярыце... Іх падабраць ужо няможна было. Праз дзве нядзелі гэтых салдатаў агледзілі па гэтай воні... За рэмень зачэпіць і цяне... За голаву – галава адрываецца... Дзе якая яма – там і закідалі. І зараз косці валяюцца і ніхто не пытаў, нічога не рабіў. Там у Загаранах – там падабралі, а тут ніхто і не сцягваў..."[589] Як і ў в. Пышкі, ніякіх помнікаў у в. Навумавічы няма. У вёсцы Адамавічы ёсць магіла савецкага салдата, пахаванага мясцовымі жыхарамі. Раней там стаяў крыж, аднак ён даўно згніў, і цяпер магілу знайсці цяжка. Невядомы салдат быў пахаваны і на хутары ў в. Куколі. Да сённяшняга дня застаюцца няўлічанымі страты 99-га пантоннага батальёна, а гэта 74 чалавекі забітымі. Першапачаткова яны былі пахаваны ў в. Куколі, а затым, паводле ўспамінаў л-та С.Ф. Іванова перапахаваны ў в. Грандзічы. Аднак у грандзіцкай магіле савецкіх войнаў яны не лічацца. Як бачна, у Чырвонай арміі вельмі часта клопат за загінуўшых пераносіўся на плечы мясцовых жыхароў. Пахавальныя каманды ці не спраўляліся, ці не займаліся сваёй працай.

Аднак і афіцыйныя дадзеныя даюць уяўленне пра страты. 42-я Смаленская сд страціла 169 чалавек (з іх 10 памерлых ад ран у шпіталях за гэты перыяд). Колькасць параненых невядома, аднак, у любым выпадку, яны былі ў некалькі разоў большыя. Гэтыя дадзеныя можна параўнаць са стратамі 290-й сд, якая на працягу ўсіх баёў ваявала ў Занёманскай частцы горада Гродна і таксама панесла цяжкія страты. З 16 па 24 ліпеня яна страціла 177 чалавек забітымі і 620 параненымі



исх № 00043
15.9.44 г.

"УТВЕРЖДАЮ"
КОМАНДУЮЩИЙ ВОЙСКАМИ 50 АРМИИ
ГЕНЕРАЛ-ПОЛКОВНИК /БОЛДИН/
"31" августа 1944 г.

СОВЕРШЕННО СЕКРЕТНО
Экз. № 3

98

Ж У Р Н А Л

боевых действий войск 50 армии 2-го Белорусского фронта
с 17.7.44. по 31.7.1944 года.

17.7.44. Войска армии продолжали наступление. На правом фланге, в течение ночи на 17.7., сломив сопротивление противника на левом берегу р.НЕМАН, к утру форсировали р.НЕМАН, на фронте: КУКАЛИ /9 км. сев.ГРОДНО/, ПОНЕМУНЬ /2км. юго-вост.ГРОДНО/ и, преодолевая сильное огневое сопротивление противника, отразив 10 контратак, силою рота-батальон, при поддержке танков, самоходных орудий и авиации, продвинулись на Запад, заняли до 30 населенных пунктов и частями 153 сд /69 ск/ вышли на Государственную границу на участке: ВОЛКУШЕК, ВОЛКУШ и заняли западнее Государственной границы отм. 120,3, ЛОВИНОВО /ЛИПИНЦЫ/.

В центре и на левом фланге, встретив организованное сопротивление и отразив 6 контратак, силою рота-батальон, при поддержке танков и самоходных орудий, имели незначительное продвижение.

Командующий армией п р и к а з а л /З.16 17.7/:

69 ск – закончить форсирование р.НЕМАН и развивая наступление на Запад, к исходу 17.7 выйти на рубеж: МИХАЛУВКА, /иск/ ЛИПСК /над БЕБЖОМ/.

Разграничения: справа – НОВА-РУДА, СОПОЦКИН, АВГУСТОВСКИЙ канал до АВГУСТОВ /все пункты для 69 ск вкл./; слева – КАЛЕТАЛЕРИ, ГРОДНО, БОГАТЫРИ ПОЛНЕ, ЛИПСК /над БЕБЖОМ/ /все пункты для 69 ск иск./.

КП ШТАКОРА – с 20.00 17.7 – БОГАТЫРИ ЛЕСНА.

81 ск – форсировать р.НЕМАН, овладеть пригородом г.ГРОДНО и развивая наступление в западном направлении, к исходу 17.7 выйти на рубеж: ЛИПСК /над БЕБЖОМ/, ДОМБРАВА, БЯЛОЗОВО.

Разграничения слева: ОБУХОВО, ГИБУЛИЧИ, ОГРОДНИКИ, БЯЛОЗОВО /все пункты для 81 ск вкл./.

КП ШТАКОРА – ВЕНЕВИЧИ.

121 ск – развивая наступление в западном направлении, к исходу 17.7, выйти на рубеж: /иск/ БЯЛОЗОВО, МАЛОВЛЯНЫ.

Разграничения слева: МИНИЧИ, ДЕНИСОВИЧИ, БАРАНОВО, КУЗНИЦЫ, МАЛОВЛЯНЫ /все пункты, кроме МАЛОВЛЯНЫ, для 121 ск иск./.

Першая старонка «Журнала баявых дзеяннях» 50-й арміі

(дадзеныя ўзяты з данясенняў дывізій, прыведзеных у кнізе "Памяць. Гродна"). 330-я сд за 7 дзён баёў (з 18 па 24 ліпеня) панесла страты ў колькасці 181 чалавека забітымі.

Акрамя гэтых дывізій таксама вялікія страты былі ў 95-й сд. З 15 па 24 ліпеня яна страціла 115 чалавек забітымі. Я.П. Елісееў піша, што моцна пацярпела і 4-я асобная знішчальная супрацьтанкавая брыгада 42-й сд. Аднак якімі былі яе страты (у табліцы №4 указаны толькі 2 чалавекі), невядома.

Агульная колькасць стратаў савецкіх войскаў забітымі на плацдарме на захад ад Гродна паводле даступнай аўтару інфармацыі дасягае 1089 чалавек (улічваючы страты 290-й сд і 99-га пантоннага батальёна). Такім чынам, больш за палову ўсіх забітых у савецкіх войсках прыходзіцца толькі на 4 дывізіі (642 чалавекі).

Як відаць з табліцы, пік стратаў прыходзіўся на 21 ліпеня, калі немцы паспрабавалі скінуць у раку савецкія часці. Страты ў інжынерных падраздзяленнях у гэты ж дзень кажуць, верагодна, пра моцныя бамбёжкі пераправаў, у прыватнасці, у мястэчку Гожа (там пахаваны асабовы склад некалькіх інжынерных частак). Больш канкрэтныя лічбы па стратах савецкіх войск можна назваць па асобных падраздзяленнях на падставе іх данясенняў падчас баёў.

Асноўнымі ўдзельнікамі штурму горада Гродна былі дывізіі 36-га корпуса 31-й арміі, палкі 6-й Гв. кд і 290-я дывізія 50-й арміі. Прывядзем поўныя дадзеныя па некаторым гэтым злучэнням. Так у дні баёў за сам горад (з 13 па 15 ліпеня) 6-я Гв. кд страціла 42 чалавекі забітымі і 177 параненымі. 174-я сд страціла 16 ліпеня (падчас баёў за горад) 46 чалавек забітымі і 132 параненымі. З 14 па 16 ліпеня 352-я сд страціла 36 чалавек забітымі і 254 параненымі[590]. Такім чынам страты гэтых падраздзяленняў складаюць 124 чалавекі забітымі і 563 параненымі.

Страты савецкіх войск на іншых адрэзках выглядаюць наступным чынам. У баях за мястэчка Лунна загінула 64 савецкія салдаты і афіцэры[591]. Пры чым толькі адна 64-я стралковая дывізія 14 ліпеня страціла 40 чалавек забітымі і 56 параненымі[592]. У баях за мястэчка Скідзель і навакольныя вёскі загінулі 252 савецкія салдаты і афіцэры[593].

А зараз разгледзім страты савецкіх войск на фронце на поўдзень ад Гродна ў дадзены храналагічны перыяд. У асноўным гэта дадзеныя па колькасці загінуўшых у 70-ым і 121-ым карпусах 50-й (пазней 49-й) арміі 2-га БФ. Як і ў папярэдняй табліцы разлікі праводзіліся пры выкарыстанні кніг "Памяць". Дадзеныя прадстаўлены ў табліцы №3.

***Табліца № 3. Страты савецкіх войск на свіслацкім фронце 17-25 ліпеня 1944 года***

| дывізія | падраздзяленне | 17.07 | 18.07 | 19.07 | 20.07 | 21.07 | 22.07 | 23.07 | 24.07 | 25.07 | Агулам |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **64-я сд** | 433-ці сп | 6 | 5 | 16 | 8 | | | 1 | | | 36 |
| | 440-ты сп | 2 | 8 | 5 | | | | | 5 | | 20 |
| | 451-шы сп | 7 | 3 | 2 | | | | 13 | | | 25 |
| | 1029-ты ап | | 1 | | 3 | 3 | | | | 2 | 9 |
| | 618-я асб. рота сувязі | | | 1 | | | | | | | 1 |
| | 167-ты асоб. сап. бат. | | | 6 | 1 | | | | | | 7 |
| **139-я сд** | 718-ты сп | 1 | 3 | 6 | 4 | 1 | 2 | 11 | 6 | 10 | 44 |
| | 609-ты сп | 22 | 32 | 48 | 13 | 6 | 3 | 2 | 9 | | 135 |
| | 364-ты сп | | 1 | 22 | 16 | 1 | 2 | | | | 42 |
| | 354-ты ап | | 1 | 2 | | 2 | | 1 | | | 6 |
| | 411-я асоб. рота сувязі | | | | | 1 | | | | | 1 |
| | 195-ты асоб. сап. бат. | | | 2 | | | | 1 | | | 3 |
| | 162-я асоб. ррота | | 2 | 1 | 3 | 1 | | | | | 7 |
| **199-я сд** | 584-ты сп | 6 | 5 | | 12 | 2 | 3 | | | | 28 |
| | 617-ты сп | 3 | 6 | 1 | 3 | 2 | 1 | 5 | | | 21 |
| | 492-гі сп | 12 | 12 | 1 | 3 | 4 | 4 | 1 | | | 37 |
| | 500-ты ап | | | 2 | | 2 | 2 | 1 | | | 7 |
| | 260-я асоб. рота сувязі | 2 | | | | 2 | | | | | 4 |
| | 257-я асоб. ррота | | | 1 | | | | | | | 1 |
| | вучебная рота | | | | | | | 3 | | | 3 |
| | 2-гі медсанбат | | | | | | 1 | 1 | | | 2 |
| **380-я сд** | 1262-гі сп | | | 1 | 4 | 10 | 4 | 2 | | | 21 |
| | 1264-ты сп | | | | | 13 | 2 | | 1 | | 16 |
| | 1260-ты сп | | | | 2 | | | 20 | | 1 | 23 |
| | 945-ты ап | | | | 1 | 4 | 1 | 1 | 1 | | 8 |
| | 441-я асоб. рота сувязі | | | | | | | 2 | | | 2 |
| | вучебная рота | | | | 1 | | | | | | 1 |
| **385-я сд** | 1268-мы сп | | | | 4 | 13 | | | | | 17 |
| | 1266-ты сп | | | | 5 | 11 | 1 | | | | 17 |
| | 1270-ты сп | | | | | 6 | | | | | 6 |
| | 447-я асоб. ррота | | | | 2 | | | | | | 2 |
| | 247-я асоб. рота сувязі | | | | 1 | 2 | | | | | 3 |
| 42-я тбр | | | | | | | 35 | 1 | | | 36 |
| 1-я Гв. Шісбр | | | | | | | | 7 | | | 7 |

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2-я карп. арт.бр. | | | | | 1 | | 5 | 6 | | | 12 |
| 49-ы зен.-арт. дыв. | | | | | | | 2 | 10 | | | 12 |
| 290-ты зстап | | | | | | | 1 | 1 | 1 | | 3 |
| 593-ці зстап | | | | | | | | | 2 | | 2 |
| **19-я мінж.бр** | 484-ты мп | | | | | 1 | 5 | | 8 | | 14 |
| | 486-ты мп | | | | | | 1 | | 1 | | 2 |
| | 487-мы мп | | | | | | 1 | | | | 1 |
| агулам | | 61 | 79 | 117 | 87 | 86 | 57 | 90 | 34 | 13 | 643 |

Агульная колькасць страт (улічваючы і часці ўзмацнення) савецкіх войскаў на адрэзку свіслацкага фронту за перыяд 17-25 ліпеня 1944 года дасягае 643 чалавекі забітымі[594]. Улічваючы страты на плацдарме на захад ад Гродна, агульная колькасць страт у гэтым раёне дасягае 1732 чалавекі забітымі. Ізноў жа падкрэслім, што гэтая лічба атрымана ў выніку падлікаў забітых і пахаваных салдат і афіцэраў на могілках горада Гродна і ваколіцаў (кнігі "Памяць").

Зыходзячы з табліц № 4 і 5, страты толькі арміі г.-п. І.В. Болдзіна (без трох дывізій 31-й арміі і кавалерыстаў) – 1568 чалавек забітымі. Цікава параўнаць гэтыя дадзеныя з лічбай страт узятых з "Журнала баявых дзеянняў 50-й арміі" – афіцыйнай архіўнай крыніцай. Паводле яго дадзеных, 50-я армія страціла забітымі з 17 па 25 ліпеня 1944 года толькі 358 чалавек[595]! Розніца, як бачна, істотная. Безумоўна, апошняй лічбе даваць нельга. Аб'ектыўную інфармацыю пра страты можна атрымаць, прааналізаваўшы данясенні з дывізій 50-й арміі. Агульную лічбу стратаў (забітыя, параненыя, хворыя, прапаўшыя без вестак) можна атрымаць, параўнаўшы склад дывізій да, і пасля баёў у раёне Гродна. Якую ж лічбу мы атрымаем?

### *Табліца № 4. Склад дывізій 50-й арміі за час баёў у ліпені 1944 года**

| дывізія[3] | Колькасны склад падчас баёў у раёне Гродна | | Страты кожнай дывізіі |
|---|---|---|---|
| | да пачатку баёў | па завяршэнні баёў | |
| **42-я сд** | 5089 | 3931 | 1158 |
| **153-я сд** | 5185 | 5138 | 47 |
| **330-я сд** | 6416 | 5501 | 915 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **307-я сд** | 6866 | 6774 | 92 |
| **95-я сд** | 4907 | 3303 | 1604 |
| **290-я сд** | 5245 | 4224 | 1021 |
| **139-я сд** | 5998 | 4626 | 1372 |
| **238-я сд** | 4892 | 4754 | 138 |
| **64-я сд** | 4452 | 3710 | 742 |
| | Агулам чалавек | | |
| | 49050 | 41961 | |
| Агульныя страты арміі | 7089 чалавек | | |

* Табліца састаўлена на аснове дадзеных ЦАМА, ф. 50 арміі. У табліцы адсутнічаюць дадзеныя па 324-й, 369-й і 199-й сд

На падставе дадзеных, прыведзеных у табліцы №4, мы можам сцвярджаць, што агульная лічба страт 50-й арміі пад час баёў у раёне Гродна складае не менш за 7 тысяч чалавек! На жаль, наяўныя дакументы не дазваляюць дакладна падлічыць колькасць загінуўшых.

Ці можна было б пазбегнуць такіх стратаў? Безумоўна. Аднак для гэтага патрэбны былі б добрая падрыхтоўка аперацыі і прафесійнае яе выкананне чаго, нажаль, не было. Хто ж адказны за гэтыя страты і памылкі?

Вінаватым ў гэтых падзеях з'яўляецца, у прыватнасці, маршал Г.К. Жукаў. Менавіта ён змяніў планы наступлення 3-га Гв. кк у самы апошні момант. Хутчэй за ўсё гэта адбылося ў выніку жадання маршала пераарыентаваць войскі ў накірунку на Усходнюю Прусію. Акрамя гэтага, вінавата ў цяжкіх баях на захадзе ад Гродна і камандаванне 2-га Беларускага фронту. Яно не забяспечыла надзейнага прыкрыцця (авіяцыяй і артылерыяй) і забеспячэння пяхотным і кавалерыйскім падраздзяленням, што пераправіліся на плацдарм праз раку. Безумоўна нясе адказнасць за цяжкія баі і камандуючы 50-й арміяй г.-п. І.В. Болдзін. Менавіта ён штодзённа дапускаў памылкі пры атаках нямецкіх войскаў на плацдарме. Верагоднасць наступлення на Свіслацкім фронце ім не ўлічвалася. Камандуючы арміяй не дабіўся выканання загада аб правядзенні разведкі камандзірамі карпусоў і дывізій, не забяспечыў свае войскі надзейным авіяцыйным прыкрыццём. Сутыкнуўшыся з моцным праціўнікам, дывізіі 50-й арміі так і не здолелі прыстасавацца, наладзіць узаемадзеянне. Штабы дывізій, карпусоў і арміі не праяўлялі аператыўнасці, самастойнасці. Як вынік – цяжкія і аднатыпныя памылкі.

Пра баявыя дзеянні савецкіх войск 50-й арміі варта адзначыць, што масавы індывідуальны гераізм суседнічаў з агульнай блытанінай, расхлябанасцю і неабдуманым прыняццем рашэнняў. Гэтыя баі яшчэ раз даказалі, што не варта пагарджаць пільнасцю і ігнараваць магчымасці яшчэ дастаткова моцнага праціўніка. Упушчэнні генералаў, як заўжды, выпраўляліся гераізмам салдат і афіцэраў.

Неабходна аддаць належнае камандзіру 3-га Гвардзейскага кавалерыйскага корпуса Гв. г.-л. М.С. Аслікоўскаму. Гэты савецкі афіцэр не разгубіўся і праявіў увесь свой талент у вельмі складанай сітуацыі. Корпус дзейнічаў у акружэнні супраць моцнага ворага, які пераўзыходзіў кавалерыстаў ва ўзбраенні. Камандуючы корпусам прадбачыў верагоднасць разгортвання падзей падобным чынам і зрабіў усё магчымае, каб паставіць свае дывізіі ў як мага выгаднейшае становішча.

Усе падраздзяленні 3-га Гвардзейскага кавалерыйскага корпуса былі добра аснашчанымі і падрыхтавамі падраздзяленнямі. Акрамя таго, яны валодалі хуткасцю перасоўвання, што мела істотнае значэнне на поле бою. Такім чынам кавалерыйскі корпус можна лічыць падраздзяленнем, мала ў чым уступаючым нямецкім часцям.

*Нямецкія войскі*

*Колькасны склад*

Цяпер разгледзім праціўніка 50-й арміі і 3-га Гв. кк у раёне Гродна. Адразу трэба сказаць, што інфармацыі аб складзе і асначанасці Вермахту і СС значна больш. Тлумачыцца гэта большай цікавасцю еўрапейскіх і расійскіх даследчыкаў менавіта нямецкімі войскамі. Таму і матэрыялы нямецкіх і амерыканскіх архіваў (дзе захоўваюцца нямецкія матэрыялы) больш распрацаваны.

Корпусная група обергрупэнфюрара К. фон Готберга складалася з 3-й тд СС "Мёртвая галава", некалькі паліцэйскіх палкоў (2-га, 4-га, 17-га, 22-га палп СС, 31-га, 34-га і 36-га палсп) няпоўнага складу і некаторых частак узмацнення.

3-я тд СС была цалкам укамплектаванай і налічвала 18 тысяч чалавек асабовага складу. Улічваючы тое, што дывізія вяла баі практычна ў поўным складзе, за выключэннем аднаго танкавага, грэнадзёрскага батальёнаў, артылерыйскага дывізіёна і некаторых падраздзяленняў абслугоўвання, можна лічыць яе колькасць у баях пад Гродна раўнай 13-14 тысячам чалавек.

Адносна складу паліцэйскіх палкоў групы К. фон Готберга можна адзначыць наступнае. На 24 ліпеня ў складзе шасці паліцэйскіх палкоў, зведзеных у брыгаду "Ангальт", налічвалася, паводле нямецкіх дадзеных, 77 афіцэраў і 2398 падафіцэраў і салдат. Для параўнання, у красавіку 1944 года група обергрупэнфюрара К. фон Готберга налічвала 4 тысячы чалавек. Такім чынам на працягу аперацыі "Баграціён" група панесла страты і скарацілася амаль удвая.

Больш падрабязней мы можам разгледзіць склад некаторых паліцёйскіх палкоў. Так на 4 ліпеня ў 2-ім палп СС налічвалася ад 300 да 340 чалавек, да якіх далучылася 650 чалавек з разбітай 337-й пяхотнай дывізіі[596]. 4-ы паліцэйскі полк СС на 25 ліпеня складаўся з:

Камандзір – оберштурмбанфюрар Вальтэр Данц:

> 1-шы батальён (обрл-т Штурма) – 7 афіцэраў і 290 падафіцэраў і радавых;

> 2-гі батальён (к-н Бёзе) – 4/226;

> 3-ці батальён (м-р Эдельмана) – 7/240[597]

Агулам: 774 чалавека.

Як бачна, па колькасці байцоў паліцэйскі полк быў роўны батальёну. Падобнае становішча было і ў астатніх паліцэйскіх часцях. Напрыклад, 22-гі паліцэйскі полк СС у сярэдзіне ліпеня налічваў каля 800 чалавек. 1-шы батальён 17-га палп СС налічваў 5 афіцэраў і 248 радавых[598].

Паліцэйскія палкі складаліся пераважна з немаладых людзей (40 і больш год). На ўзбраенні гэтых падраздзяленняў стаяла старая тэхніка і састарэлае стралковае ўзбраенне (чэшскія, французскія і югаслаўскія вінтоўкі і кулямёты). Акрамя таго, байцы слаба валодалі гэтай зброяй. Сам штандартенфюрэр Г. Ангальт (камандзір 2-га палп СС) адгукаўся пра сваіх салдат як пра байцоў, якія "яшчэ не дараслі да сур'ёзных баёў". На ўзбраенні паліцэйскіх палкоў было вельмі мала супрацьтанкавай і цяжкай зброі.

Прывядзем склад яшчэ аднаго цікавага паліцэйскага фарміравання, прымаўшага ўдзел у баях за Гродна і бліжэйшых яго ваколіцах. Гэта матарызаваны батальён палявой жандармеры (таксама ўваходзіў у склад групы К. фон Готберга). Так летам 1944 г. батальён складаўся з 9 узводаў, у якіх налічвалася 180 чалавек, быў цалкам матарызаваны і добра ўзброены. Кожны салдат і афіцэр меў пісталет, акрамя вінтоўкі ці пісталет-кулямёт. Акрамя таго на ўзбраенні падраздзялення былі 17 кулямётаў, 3 мінамёты, 6 матацыклаў, 24 легкавыя і 6 грузавых аўтамабіляў[599].

Абагульняючы ўсё сказанае вышэй можна зрабіць вынік, што разам з паліцэйскімі палкамі сілы немцаў на плацдарме складалі, паводле прыкладных ацэнак, маглі складаць 18-20 тысяч чалавек.

Акрамя гэтых падраздзяленняў на плацдарме вялі баі і часці 5-й (не больш за 3 тыс. чалавек) і 19-й (не больш за 4 тыс. чалавек) танкавых дывізій, а таксама баявая група обрл-та Кнітэля, што далучыліся да баёў крыху пазней. Такім чынам колькасць нямецкай групоўкі магла дасягнуць 30 тыс. чалавек.

*Бранятэхніка*

Пад час баёў на падыходах да горада Гродна немцы выкарыстоўвалі бранетранспарцёры Sd Kfz 250/251 (у розных варыянтах) з 12-га танкавага разведвальнага батальёна. Згадкі савецкіх ветэранаў пра нямецкія танкі і САУ, што ўжываліся супраць 3-га кавалерыйскага корпуса, дывізій 31-й і 50-й армій, не адпавядаюць рэчаіснасці. Умелае выкарыстанне гэтай тэхнікі прыносіла немцам вялікую карысць.

Галоўную ролю ў баях на левым беразе Нёмана адыгрывала 3-я тд СС. Менавіта яе бранятэхніка акрыўна выкарыстоўвалася пад час усіх баёў. На 15 ліпеня 1944 года ў складзе дывізіі налічвалася танкаў, штурмавых гармат і САУ: 1 T-III (у штабе дывізіі), 28 T-IV, 15 T-VI, 48 StuG, 8 "Wespe", 4 "Hummel"[600] . Акрамя гэтага, у розныя моманты баёў у раёне Гродна немцы карысталіся часцямі 5-й тд і 19-й тд.

Пасля 10-дзённых баёў падраздзяленні 3-й СС выглядалі наступным чынам:

**Табліца № 5. 3-я тд СС "Мёртвая галава" у баях у раёне горада Гродна.**

| Падразд-зяленне дата | SS-Pz. Rgt. 3 | SS-Rz.GR 5 "T" | SS-Rz.GR 6 "E" | SS-Pz. AR 3 | SS-Pz. AA 3 | SS-Pz. Pi. Btl. 3 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 25 ліпеня 1944года | T-IV-10/14/1*;<br>T-VI-4/4/1;<br>StuG-22/15/10 | 1-ы батальён – 13/910**<br>3-і батальён – 6/666 | 1-ы батальён – 14/792<br>2-і батальён - ?<br>3-і батальён – 10/511 | 8 "Wespe",<br>4 "Hummel",<br>11 – 150-мм гаўбіцы,<br>11 – 105 мм гаўбіц,<br>4 – 100-мм гаўбіц | 10/370 | 11/640 |

* спраўныя/у кароткім рамонце/у доўгім рамонце

** афіцэраў/падафіцэраў і радавых

Як бачна з табліцы №5, бранятанкавыя сілы 3-й тд СС скараціліся больш чым у 2 разы. Акрамя таго, трэба ўлічваць, што немцы дастаткова шырока выкарыстоўвалі бранетранспарцёры SdKfz 250/251, якія таксама былі даволі эфектыўным сродкам у барацьбе з пяхотай праціўніка.

У атаках немцы ўжывалі некалькі танкаў ці штурмавых гармат, што падтрымлівалі адзін аднаго агнём (прасоўваліся яны ў межах бачнасці адзін аднаго) і прыкрытых пяхотай. Заняўшы пазіцыі, немцы маскіравалі танкі (за дамамі, галінамі дрэў і інш. прыкрыццямі) і выкарыстоўвалі іх як артылерыйскія кропкі, што кантралявалі мясцовасць перад сабой. Так пры абароне в. Ягінты нямецкія танкі і штурмавыя гарматы хаваліся ў пунях. У супрацьлеглай сцяне нямецкія танкісты рабілі невялікае акенца, праз якое танкавыя гарматы вялі агонь. Вялікую ролю адыгрывалі назіральнікі і карэкціроўшчыкі агню. Так, паводле ўспамінаў С.Б. Бараноўскага, такія назіральнікі размяшчаліся ў в. Каўбаскі на старой вышцы, каля пераправы ў в. Плябанскія (там дзейнічала жанчына – карэкціроўшчык, якая некалькі разоў наводзіла нямецкую авіяцыю на пераправу) і в. Пышкі. У в. Самборы немец хаваўся ў гняздзе бусла[601].

У немцаў было добра наладжана забеспячэнне войскаў, якія вялі бой. Пасля занятку ў в. Навумавічы падраздзяленняў групы "Кюн" 18 ліпеня эсэсаўцы адразу ж арганізавалі тут палявую базу для амуніцыі і боепрыпасаў, куды падвозілі неабходны рыштунак з асноўнай базы палка "Е" у в. Караліно[602]. Акрамя гэтага, у вёсцы быў арганізаваны палявы шпіталь. Некалькім немцам і тром экіпажам танкаў у в. Адамавічы кожную раніцу на машыне прывозілі гарачы паёк на дзень[603].

### *Авіяцыя*

Дзеянні нямецкай авіяцыі ў раёне Гродна трэба прызнаць вельмі эфектыўнымі. Негледзячы на тое, што 6-ты Паветраны флот панёс вельмі вялікія страты летам 1944 года, немцы знайшлі магчымасць спыніць наступленне войск 2-га БФ кантралюючы раку Нёман і знішчаючы пераправы на ёй.

Менавіта дзякуючы дзеянням нямецкай штурмавой авіяцыі (Ju-87 і Fw-190) на плацдарме савецкія часці неслі адчувальныя страты. Па ўспамінах савецкіх ветэранаў штурмоўкі не спыняліся. Гв. г.-л. М.С. Асlікоўскі адзначаў эфектыўныя дзеянні нямецкай авіяцыі ў раёне горада Гродна: "Авіяцыя праціўніка групамі ў 30-40 самалётаў бамбіла і штурмавала нашы баявыя парадкі. Мы неслі страты, і самыя цяжкія"[604]. Наогул, камандуючы кавалерыйскім корпусам лічыў, што замінка ў баях за горад Гродна адбылася менавіта з-за нямецкай авіяцыі[605].

Цікавае апісанне дзеянняў нямецкай авіяцыі пакінуў камандзір 2-й батарэі 178-га Гв. Конна-артылерыйскага палка 3-га Гв. кк Гв. ст. л-т М.Г. Гарабчук. Так ён успамінаў, што немцы ў баях у аўгустоўскіх

лясах "...сабралі з навакольных аэрадромаў усё, што магло падняцца ў паветра: бамбардзіроўшчыкі, знішчальнікі, штурмавікі, нейкія вучэбныя самалёты. Трэба сказаць, яны сапраўды сваю задачу выканалі: так прыціснулі нас да зямлі, што мы не маглі і кроку наперад зрабіць, трымалі пад агнём да цемры, пакуль не падышла нямецкая пяхота і не заняла абарону ўздоўж канала. Праліўны дождж, маланка ... нямецкія самалёты ў брыючым палёце, закранаючы коламі верхаліны дрэў, паліваюць нас кулямётным агнём, закідваюць бомбамі, ганяюцца за кожнай машынай, павозкай, асобнымі салдатамі"[606]. Не было б нічога дзіўнага, калі б гэтыя ўспаміны адносіліся да пачатковага перыяда вайны. Аднак ішоў ўжо 1944 год. І згодна з агульнапрынятымі ўстаноўкамі савецкая авіяцыя даўно заваявала панаванне ў паветры. На самой справе ўсё выглядала інакш.

Падобны ж выпадак узгадваў і камандзір 2-га артылерыйскага ўзвода 24-га Гв. кп Гв. л-т І. Якушын: "Нечакана лес скончыўся і эскадрон апынуўся на адкрытай прасторы... У той самы момант з ровам рухавікоў наляцелі нямецкія знішчальнікі і накіраваліся наўпрост на нас. Калі першы знішчальнік абстраляў нашу калону, прагучала гукавая паветраная трывога. Эскадрон разсыпаўся паўзводна паабапал дарогі. Я са сваёй гарматай галопам паімчаўся да маленькай вёскі, якая ляжала недалёка і была схавана густым зараснікам акацый... Знішчальнікі тым часам атакавалі разрозненую калону, і мы таксама былі абстраляныя. Кулі вішчалі акурат каля зямлі, раніўшы двух коней, якіх мы дабілі... Нямецкія знішчальнікі атакавалі нас, пакуль не наступіла цемра. Калі адна эскадрылля адлятала, на яе месца адразу прылятала наступная і не давала магчымасці змяніць укрыццё. Я ляжаў на полі на спіне і праз бульбяннік выразна бачыў самалёты; я нават мог адрозніць пілотаў"[607]. Чаму ж такі кантроль перапраў не ажыццяўлялі савецкія знішчальнікі? Думаю, прафісіяналізма ў савецкіх пілотаў хапала. Не хапала разумення крытычнага становішча ў акружаных кавалерыйскіх дывізіях у штабе 2-га Беларускага фронта.

## *Свіслацкі фронт*

### *Колькасны склад і ўзбраенне*

Абарону па цячэнню ракі займалі падраздзяленні карпусной групы г.-арт. Г. Вейдлінга (14-я пмд і 50-я пд з часцямі падмацавання). На правым флангу яна злучалася з 12-й танкавай дывізіяй 2-й арміі.

Адносна нямецкіх сілаў на свіслацкім фронце можна назваць наступныя лічбы. Напрыклад савецкі даследчык Я.П. Елісееў кажа пра колькасць некаторых цікавых нам нямецкіх падраздзяленняў:

***Табліца № 6. Колькасць нямецкіх войск па рацэ Свіслач 10-12 ліпеня 1944 года[608].***

| | | | |
|---|---|---|---|
| 123-ці гп<br>50-й пд | 1300 чалавек | 76 ручных кулямётаў,<br>20 станкавых кулямётаў,<br>10 супрацьтанкавых гармат,<br>17 пушак, 20 мінамётаў | |
| 12-я тд | 4500 чалавек | 200 ручных кулямётаў,<br>40 станкавых кулямётаў,<br>30 супрацьтанкавых гармат,<br>36 пушак,<br>40 мінамётаў | 25 танкаў,<br>35 САУ |
| Згодна нямецкай інфармацыі | | | |
| 12-я тд | 4 тгр ба-<br>тальёна,<br>1 танкавы<br>сапёр-<br>ны батальён,<br>1 танкавы<br>разведвальны<br>батальён | 10 лёгкіх палявых гаўбіц,<br>3 цяжкія палявыя гаўбіцы,<br>2 цяжкія супрацьтанкавыя гарматы, | 1 T-IV,<br>6 лёгкіх САУ<br>"Wespe" |

Дадзеныя табліцы №6 паказваюць, што пяхотны полк 50-й пд дасягаў 1300 чалавек. З дапамогай гэтай лічбы можна вылічыць колькасць усёй нямецкай дывізіі. Можна меркаваць, што па колькасці асабовага складу, яна не пераўзыходзіла 5-6 тыс. чалавек.

Група г.-л. Г. Флёрке, верагодна, была малакалькаснай: 50-я пд была перакінута з Германіі пасля перафармавання, а палкі 14-й пяхотнай матарызаванай дывізіі панеслі страты ў баях і ў выніку адступлення былі пераўтвораны ў баявую групу.

Дывізійныя 1065-ты, 1068-мы і 1069-ты грэнадзёрскія палкі (так званыя "палкі Валькірыі") прыбылі на фронт у пачатку ліпеня і папоўнілі групу г.-л. Г.Флёрке. Ніжэй прывядзём пералік падраздзяленняў з колькасцю асабовага складу па групе г.-л. Г.Флёрке.

→ 14-я пяхотная матарызаваная дывізія (група г.-л. Г. Флёрке):

> 1069-ты гп (=11-ты гп) складаўся з:

> 1-шы батальён – 413 чалавек, 26 лёгкіх, 9 цяжкіх кулямётаў, 11 сярэдніх мінамётаў;

> 2-гі батальён – 357 чалавек, 16 лёгкіх і 5 цяжкіх кулямётаў, 4 сярэднія мінамёты;

> 13-я рота – каля 86 чалавек, 4 лёгкія і 2 цяжкія кулямёты;

> 14-я рота – 123 чалавекі, 4 лёгкія кулемёты і 2 цяжкія супраць-

танкавыя гарматы. [609]

Агулам: 979 чалавек.

> 101-шы грэнадзёрскі полк складаўся з:

> 1-га батальёна – 507 чалавек, 18 лёгкіх кулямётаў, 5 цяжкіх кулямётаў, 5 сярэдніх мінамётаў, 5 лёгкіх пяхотных гармат

> 14-ты артылерыскі полк:

> 3-ці матарызаваны дывізіён– 10 лёгкіх палявых гаўбіц.

> 4-ты матарызаваны дывізіён – 5 цяжкіх палявых гаўбіц.

Такім чынам, колькасць сіл 14-й пмд магла дасягаць у лепшым выпадку 2,5-3 тыс. чалавек. Колькасць падраздзяленняў 4-й нямецкай арміі на фронце па рацэ Свіслач (улічваючы і сілы 12-й тд) не магла дасягаць **больш за 12-15 тыс. чалавек**.

Адносна колькасці бранятэхнікі супрацьлеглых бакоў нешта пэўнае сказаць цяжка. Паводле савецкай інфармацыі з табліцы №6, немцы выкарыстоўвалі на Свіслацкім фронце з 14 па 23 ліпеня падраздзяленні 12-й тд. Польскі даследчык Р.Урублеўскі адзначае, што на ўзбраенні дывізіі былі знішчальнікі танкаў Jagtpanzer IV. У баях у раёне в.Квасоўка выкарыстоўвалася батарэя 185-й цяжкай брыгады штурмавых гармат (StuG III і StuH 42). Адна штурмавая гармата была падбіта ў баях за в.Пагараны.

Больш канкрэтна можна сказаць пра выкарыстанне немцамі 12-га танкавага разведвальнага батальёна (у яго складзе 122 бронетранспарцёры). Прывядем тыпы бронетранспарцёраў, якія стаялі на ўзбраенні Pz.AA 12:

SdKfz 250/1 – бронетранспарцёр для перавозкі 5 чалавек, на ўзбраенні 1-2 кулямёты;

SdKfz 250/3 – штабны сувязны бронетранспарцёр;

SdKfz 250/5 – сувязны бронетранспарцёр;

SdKfz 250/7 – бронетранспарцёр – з 8 см мінамётам у кузаве;

SdKfz 250/9 – бронетранспарцёр з вежай (2 см аўтаматычная гармата);

SdKfz 251/1 – бронетранспарцёр для перавозкі 10 чалавек, на ўзбраенні 1-2 кулямёты;

SdKfz 251/2 – бронетранспарцёр з 8 см мінамётам у кузаве;

SdKfz 251/3 – штабны сувязны бронетранспарцёр;

SdKfz 251/7 – сапёрны бронетранспарцёр са штурмавымі масткамі па баках корпуса;

SdKfz 251/8 – санітарны бронетранспарцёр;

SdKfz 251/9 – бронетранспарцёр з 7,5 см кароткаствольнай гарматай;

SdKfz 251/11 – бронетранспарцёр для пракладкі тэлефоннага кабеля;

SdKfz 222 – 4-х калёсны лёгкі бронеаўтамабіль з вежай (2 см аўтаматычная гармата);

SdKfz 223 – 4-х калёсны лёгкі сувязны бронетранспарцёр;

SdKfz 232 – 8-мі калёсны цяжкі сувязны бронеаўтамабіль з вежай (2 см аўтаматычная гармата).

Як мы бачым, колькасць тыпаў бронетранспарцёраў толькі ў адным батальёне быў даволі стракатым. Між тым кожны з тыпаў бронемашын выконваў свае канкрэтныя задачы. Наагул разведвальны батальён танкавай дывізіі выконваў розныя задачы: разведка сілаў праціўніка і ўласных сілаў, збор інфармацыі аб мясцовасці (пераправы, броды, населеныя пункты, лясы, рэкі, балоты і г.д.), авангардныя і ар'ергардныя баі. У баях супраць пяхоты падраздяленні такога батальёна былі вельмі небяспечным ворагам.

На завяршальнай фазе баёў немцы павялічылі сваю бранятанкавую групоўку за кошт сіл 19-й тд (15 T-IV, 7 FlakPz-IV, 12 Pak 40, батарэя САУ "Hummel" і 2 батарэі САУ "Wespe"). Акрамя таго, у атаках м. Кузніца немцы выкарыстоўвалі 185-ю цяжкую брыгаду штурмавых гармат. Акрамя гэтых сіл, 23 ліпеня пазіцыі групы г.-арт. Г. Вейдлінга былі ўзмоцнены бранятэхнікай 3-й тд СС – 6 танкаў T-IV і адной батарэяй САУ "Hummel". Такім чынам, на 23-24 ліпеня 1944 года немцы мелі на фронце групы г.-арт. Г. Вейдлінга групоўку танкаў, САУ і бронетранспарцёраў колькасцю не менш за 50 адзінак.

Такім чынам, можна падвесці высновы: паводле наяўнай інфармацыі, немцы на фронце па рацэ Свіслач пераўзыходзілі савецкі бок па колькасці бранятэхнікі, аднак уступалі па колькасці пяхоты ў тры разы.

*Страты.*

Пытанне пра нямецкія страты застаецца таксама няпэўным. З аднаго боку, ёсць дакладная інфармацыя пра страты 3-й тд СС, заснаваная на данясеннях з яе падраздзяленняў. Агульная лічба страт дывізіі за 16-21 ліпеня выглядае наступным чынам: 2 афіцэры і 145 падафіцэраў і радавых загінулі ці прапалі без вестак. І гэта нягледзячы на тое, што дывізія актыўна ваявала на працягу кожнага дня. Безумоўна здзіўляе такая малая колькасць забітых. Аднак, улічваючы нямецкую пунктуальнасць і любоў да дакладнасці, гэтыя лічбы могуць адпавядаць рэчаіснасці, хаця абсалютнай пэўнасці ў гэтым няма.

Гаворачы наконт 50-й пяхотнай дывізіі можна адзначыць, што яе страты на працягу ліпеня – часткі жніўня 1944 г. дасягалі 600 чалавек забітымі.

Такім чынам згодна нямецкай інфармацыі страты 3-й тд СС і 50-й пд на працягу баёў дасягалі 747 чалавек забітымі.

На жаль, нічога не вядома пра страты паліцэйскіх палкоў корпуснай групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга. Улічваючы тое, што эсэсаўцы валодалі лепшай падрыхтоўкай і зброяй, можна зрабіць выснову, што страты паліцэйскіх былі ў сярэднім большыя, чым у 3-й тд СС. Так, ужо 16 ліпеня ў выніку баёў адна з ротаў паліцэйскіх палкоў групы обергрупэнфюрара К. фон Готберга скарацілася са 170 чалавек да 35[610].

У заключэнні можна дадаць, што паводле ацэнкі савецкага боку, немцы страцілі забітымі ў перыяд 17-25 ліпеня 4570 чалавек. У палон у той жа перыяд, паводле савецкіх дадзеных, было ўзята 183 салдаты і афіцэры[611].

Пра нямецкія страты ў тэхніцы таксама існуе мізэрная колькасць інфармацыі. І ўсё ж вядома, што ў баях 17-26 ліпеня 3-я тд СС безпаваротна страціла 2 цяжкіх танка “Tiger” (адзін з іх быў цалкам выведзены са строю савецкай артылерыяй і спалены немцамі, другі атрымаў такія сур’ёзныя пашкоджанні, што быў адпраўлены ў Германію для капітальнага рамонту[612]). Акрамя таго 9-я рота страціла амаль усе танкі з-за агня савецкай артылерыі ці з-за паломак. Аднак немцы не кідалі гэтыя танкі, а рамантавалі і вярталі ў строй. Так на 21 ліпеня спраўнымі засталіся толькі два танка. 23 ліпеня немцы таксама страцілі адну САУ “Hummel” у варыянце перавозчыка боепрыпасаў. Самаходка пры пераправе праз раку ў раёне Навасёлак звалілася ў балота і была знішчана сваім экіпажам. Падчас баёў 20-22 ліпеня дывізія страціла 3 сярэдніх танка T-IV і тры штурмавыя гарматы. Усе яны былі падбіты пад час баёў і не маглі быць эвакуіраваны. 2 сярэдніх танка былі падарваны сваімі экіпажамі[613].

Інфармацыя з савецкай літаратуры зусім іншая. Па-першае, няма лічбы агульных страт тэхнікі немцаў. С.М. Вернікаў называе 10 падбітых танкаў толькі на пазіцыях 153-й сд. Паводле ўспамінаў жыхара в. Каўбаскі С.Б. Бараноўскага, адзін нямецкі танк быў падбіты ў в. Самборы (перабіта гусеніца). Аднак немцы не кінулі яго, а здолелі эвакуяваць яшчэ адным танкам, гусеніцу адрамантавалі. Сам танк савецкія салдаты не здагадаліся вывесці са строю. Прычым аперацыя па выратаванні танка была праведзена ў тыле савецкіх войскаў, таму што суцэльнай лініі фронту не было. Паводле ўспамінаў жыхара вёскі Адамавічы Б.К. Дамброўскага, адзін пашкоджаны танк немцы, адступаючы, аблілі бензінам і спалілі. Паводле інфармацыі

Д. Гаўрыліна, адну "Пантэру" (верагодна, T-IV, бо T-V у гэтым раёне не ўжываліся) падбілі з 45-мм пушкі каля форта №1 байцы 455-га сп 42-й 18 ліпеня[614]. Яна прыціснула нагу камандзіра 6-й роты л-та Х.С. Хабаева. Яго змаглі выцягнуць з-пад танка толькі 23 ліпеня. 660-ы артполк 220-й сд у баях за в. Калеты падбіў 3 танкі і 2 САУ[615] 5-й тд. Яшчэ дзве "Пантэры" (верагодна, T-IV) былі падбіты ў баях з 174-й сд. Дарэчы, пры фарсіраванні Нёмана, па ўспамінах І.З. Івашкіна, на пазіцыях той жа 174-й дывізіі было знішчана 8 танкаў і САУ. Яшчэ 2 САУ падбілі з 45-мм гармат артылерысты 4-га асобнага знішчальна-супрацьтанкавага дывізіёна. 1 танк падбіў у Бале-Касцельнай бранябойшчык яфрэйтар А. Мадатаў. 4 танкі і 1 САУ падбіў разлік сяржанта Няплюхіна каля мястэчка Сапоцкін. Такім чынам агульная колькасць падбітай нямецкай тэхнікі складае 36 адзінак. Як бачна, савецкія і нямецкія крыніцы значна разыходзяцца паміж сабой.

Цікава адзначыць і адносіны немцаў да сваіх забітых. Паводле ўспамінаў мясцовых жыхароў (з в. Адамавічы і Навумавічы) забітых у баях салдат і афіцэраў немцы заўжды стараліся забраць. І калі савецкія салдаты часта так і заставаліся ляжаць на месцы баёў, то забітых немцаў бачылі рэдка. Па словах жыхара в. Навумавічы У.М. Гердэвіча: "Ад Пушкарэй адносілі (забітых ці раненых немцаў – Д.Л.). Тут машына пад'язжала і забірала. Потым вывозілі ў Германію. Забітых падбіралі, закопвалі. А ў нас не. На гэта наша армія не гадзілася. Што б падабраць… У дом залезці. Карову ўкрасці – гэта да. Гэтым займаліся. А каб падбіраць сваіх – не"[620].

**Дзмітрый Люцік**
**Гродна.2011 год.**

# СПАСЫЛКІ

## Прадмова

1. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941 - 1945: Энцыкл./Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) і інш. - Мн.: БелСЭ, 1990. - С. 179.

2 Елисеев Е.П. На белостокском направлении. - М. 1971. - 229с.

3 Hinze Rolf. Das Ostfront-Drama 1944. Rückzugskämpfe Heeresgruppe Mitte.-Motorbuch Verlag, Stuttgart, 1987. - 455 s.

4 Soldaten, Kämpfer, Kameraden. Marsch und Kämpfe der SS-Totenkopf-Division. Band Va, Bielefeld 1990, 341 Seiten.

5 Robert Wróblewski. 19 DPanc. Pierwsze walki w Polsce latem 1944r.// Militaria XX wieku. - № 7. - 2005.

Robert Wróblewski. Grodno 1944. Cz.1 Walki 3 dpanc SS „Totenkopf" nad Niemnem i Biebrzą w lipcu 1944 roku.//Militaria XX wieku. - № 9. - 2005.

Robert Wróblewski. Grodno 1944. Cz.2 Walki 3 dpanc SS „Totenkopf" nad Niemnem i Biebrzą w lipcu 1944 roku.//Militaria XX wieku. - № 11. - 2006.

## Раздзел 1
## Аперацыя "Баграціён"
### а) Планаванне аперацыі. Сілы бакоў

6 Штеменко С.М.Генеральный штаб в годы войны. - М.: Воениздат, 1989. - С. 171.

7 Бэйкер Л. Аналізуючы крах: новы погляд на аперацыю "Баграціён".// Arche Пачатак. - 2008. - № 5. - С. 441.

8 Tadeusz Sawicki. Niemieckie wojska lądowe na froncie wschodnim. - Warszawa, 1987. - S. 171. Дарэчы, К.Ціпельскірх памыляўся. Так ён ацэньваў сілы групы армій "Цэнтр" у 38 дывізій. Гл. Типпельскирх К. История Второй мировой войны. - М., 2001. - С.597.

9 Василевский А.М. Дело всей жизни. - Мн., 1988. - С.386-387 Батов П.И. В походах и боях. - М.: Воениздат, 1974. - С. 394

10 Operation Bagration. // Wikipedia, the free encyclopedia. [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступу : http://en.wikipedia.org/wiki/Operation_Bagration. - Дата доступу : 03.02.2010. В.Хаўпт наогул называе колькасць групы армій "Цэнтр" у 442 тыс. чалавек. Гл.: Хаупт В. Сражения группы армий «Центр». - М.: Яуза, Эксмо, 2006. - С. 306.

11 Janusz Ledwoch. PzKpfw IV. Vol. 2. - Wydawnictwo Militaria, Warszawa.- 2001. - S. 50.

12 Бронетанковые войска Германии (1939-1945 гг.) rc-mir.mobi. Форум. [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступу : http://forum.rc-mir.mobi/topic1853707_40. - Дата доступу : 09.02.2010.

13 German Luftwaffe Fighter Forces. 31 May 1944. Па матэрыялах: Price A. Last Year of the Luftwaffe. i Foreman J. Over the Beaches: The Air War Over Europe June 1st-30th. [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступу : http://carl.army.mil/nafziger/944GEAL.pdf. - Дата доступу : 01.02.2011.

14 Tadeusz Sawicki. Niemieckie wojska lądowe na froncie wschodnim. - Warszawa, 1987. - S. 167.

15 Па ацэнках камандуючага 1-ым Беларускім фронтам генерала К.К.Ракасоўскага колькасць бабруйскай групоўкі складала: 131 тыс. чалавек, 2500 гармат і мінамётаў, 356 танкаў і САУ, 700 самалётаў. Гл.: Рокоссовский К.К. Солдатский долг. - Мн., 1984. - С.236. Аднак гэтыя дадзеныя значна завышаныя. 9-я армія распалагала толькі 49 танкамі і 76 штурмавымі гарматамі. Колькасць авіяцыі таксама завышана - увесь 6-ты Паветраны флот меў 729 спраўных самалётаў.

16 У перакладзе абазначае - "Аркада палкаводцаў". Вуліца Людвігштрасэ ў Мюнхене заканчваецца гэтай адкрытай аркадай - залам з аркамі вышынёй да 20 м. Яна была пабудавана ў 1841—44 гадах па заказу Людвіга I. У гэтай зале баявой славы ўстаноўлены бронзавыя помнікі баварскіх палкаводцаў Цілі і Урэдэ.

17 Tadeusz Sawicki. Niemieckie wojska lądowe na froncie wschodnim. - Warszawa, 1987. - S. 1167-168.

[18] Штеменко С.М.Генеральный штаб в годы войны. – М.: Воениздат, 1989. – С. 178.

[19] Там жа. – С. 178.

[20] Генерал К.К.Ракасоўскі прапанаваў вельмі цікавы варыянт наступлення 1-га Беларускага фронта дзвюма моцнымі групоўкамі ў накірунку г. Бабруйск, пасля доўгіх абмеркаванняў і спрэчак гэты варыянт быў прыняты. Рокоссовский К.К. Солдатский долг. – Мн., 1984. – С.237-238.

[21] Штеменко С.М.Генеральный штаб в годы войны. – М.: Воениздат, 1989. – С. 180.

[22] Дроговоз И.Г. Танковый меч страны Советов. – М., Мн., 2001. – С.28.

[23] Россия и СССР в войнах XX века: Статистическое исследование. – М., 2001. – С.296. Лемяшонак У.І. Вызваленне – без грыфа "Сакрэтна". – Мн., 1996. – С.62.

[24] Типпельскирх К. История Второй мировой войны. – М., 2001. – С.595.

[25] Штеменко С.М.Генеральный штаб в годы войны. – М.: Воениздат, 1989. – С. 190.

[26] Генерал С.М. Шчеменка па гэтаму повадзу адзначаў, што «...Верхоўны Галоўнакамандуючы сказаў, што член Вайсковага савета 2-га Беларускага фронту Л.З. Мехліс піша яму аб мягкацеласці Пятрова, аб яго нядзольнасці забяспечыць поспех аперацыі. Мехліс даклаў таксама, што Пятроў нібы хворы і ўдзяляе лекарам шмат часу. Для нас гэта было поўнай нечаканасцю. Мы ведалі Івана Яфімавіча як самаадданага баявога камандзіра, які цалкам аддаваўся справе, вельмі разумнага военначальніка і цудоўнага чалавека. Ён абараняў Адэсу, Севастопаль, узводзіў абарону на Церыку. Мне прыйшлося неаднаразова бываць у яго ў Чарнаморскай групе войскаў на Паўночна-Каўказскім фронце, у Асобнай Прыморскай арміі, і я быў упэўнены ў яго высокіх камандзірскіх і партыйных якасцях. Відаць, у Сталіна былі якіясьці прадузятыя адносіны да Пятрова. Толькі ў студзені Івана Яфімавіча адхілілі ад камандвання Асобнай Прыморскай арміяй, у маі прызначылі з павышэннем на 2-гі Беларускі фронт, а праз паўтара месяца зноў знялі, каб яшчэ праз два месяцы — 5 жніўня таго ж 1944 года — зноў прызначыць на пасаду камандуючага фронтам. Цяпер ужо 4-ым Украінскім». Штеменко С.М.Генеральный штаб в годы войны. – М.: Воениздат, 1989. – С. 182-183.

[27] Штеменко С.М.Генеральный штаб в годы войны. – М.: Воениздат, 1989. – С. 183.

[28] Там жа. – М.: Воениздат, 1989. – С. 187.

## б) Правядзенне аперацыі "Баграціён"

[29] Лемяшонак У.І. Вызваленне – без грыфа "Сакрэтна". – Мн., 1996. – С.74.

[30] Типпельскирх К. История Второй мировой войны. – М., 2001. – С.597.

[31] Там жа. – С.598.

[32] 501-й тяжёлый танковый батальон. // Немецкие части и соединения на Витебском направлении. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.pobeda.witebsk.by/land/epizode/501batl/. – Дата доступу : 01.02.2011.

[33] Дроговоз И.Г. Танковый меч страны Советов. – М., Мн., 2001. – С.28

[34] Шарипов А.А. Черняховский. – М., 1985. – С.227-228.

[35] Маршал А.М.Васілеўскі яшчэ да пачатку аперацыі прагназаваў, што наступленне на аршанскім накірунку будзе цяжкім і 5-ю танкавую армію мэтазгодна ўвесці ў прарыў на ўчастку 5-й агульнавайсковай арміі. Гл.: Штеменко С.М. Генеральный штаб в годы войны. – М.: Воениздат, 1989. – С. 186.

[36] Ротмистров П.А. Время и танки. - М.: Воениздат, 1972. – С.190-191.

[37] Бурдейный А. Впереди Минск! [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://battles.h1.ru/minsk1.shtml. – Дата доступу : 04.05.2010.

[38] Дарэчы, у палон пад г. Віцебск трапілі: кімандзір LIII-га пяхотнага корпуса генерал Гальвіцэр, начальнік штаба корпуса палкоўнік Шміт, камандзір 206-й пд генерал-лейтэнант Хіцер, камандзір 197-й пд палкоўнік Прой. Василевский А.М. Дело всей жизни. – Мн., 1988. – С.408. Лемяшонак У.І. Вызваленне – без грыфа "Сакрэтна". – Мн., 1996. – С.80.

[39] Лемяшонак У.І. Вызваленне – без грыфа "Сакрэтна". – Мн., 1996. – С.94.

[40] Батов П.И. В походах и боях. М.: Воениздат, 1974. – С.406.

[41] Типпельскирх К. История Второй мировой войны. – М., 2001. – С.599.

[42] Жуков Г.К. Воспоминания и размышления. – С.229.

[43] Рокоссовский К.К. Солдатский долг. – Мн., 1984. – С.245.

[44] Лемяшонак У.І. Вызваленне – без грыфа "Сакрэтна". – Мн., 1996. – С.85.

[45] Рокоссовский К.К. Солдатский долг. – Мн., 1984. – С.246.

[46] Батов П.И. В походах и боях. – С.414. Гл. Таксама: Рокоссовский К.К. Солдатский долг. – Мн., 1984. – С.247.

[47] Типпельскирх К. История Второй мировой войны. – М., 2001. – С.603.

[48] Лемяшонак У.І. Вызваленне – без грыфа "Сакрэтна". – Мн., 1996. – С.90. Колькасць захопленай тэхнікі, асабліва танкаў і САУ завышана ў некалькі разоў.

[49] Типпельскирх К. История Второй мировой войны. – М., 2001. – С.596.

[50] Tiger w akcji 1944. – Wydawnictwo Militaria, Warszawa. – № 252. – S.44.

[51] Па матэрыялах форума: rc-mir.mobi. Форум [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://forum.rc-mir.mobi.http://forum.rc-mir.mobi/topic1853707_40. - Дата доступу: 04.03.2010.

[52] Tiger w akcji 1944. – Wydawnictwo Militaria, Warszawa. – № 252. – S.45

[53] Па матэрыялах форума: rc-mir.mobi. Форум [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://forum.rc-mir.mobi.http://forum.rc-mir.mobi/topic1853707_40. - Дата доступу: 04.03.2010.

[54] Hinze R. Das Ostfront-Drama 1944. – S. 131.

[55] Operation Bagration: Soviet Offensive of 1944. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : www.historynet.com/operation-bagration-soviet-offensive-of-1944.htm/. – Дата доступу: 02.05.2010.

[56] Hinze R. Das Ostfront-Drama 1944. – S. 38.

[57] Robert Wróblewski. Bobrujsk. Zaglada 20 DPanc latem 1944r.// Militaria XX wieku. - № 16. – 2007. – S.65.

[58] 4 Panzer Division. 1944-45. – Wydawnictwo Militaria, Warszawa. – № 102 – 2000. – S. 6

[59] Лемяшонак У.І. Вызваленне – без грыфа "Сакрэтна". – Мн., 1996. – С.106.

[60] Хаупт В. Сражения группы армий «Центр». – С. 335.

[61] Дроговоз И.Г. Танковый меч страны Советов. – М., Мн., 2001. – С.29-30.

[62] Типпельскирх К. История Второй мировой войны. – М., 2001. – С.604.

[63] Василевский А.М. Дело всей жизни. – Мн., 1988. – С.411

[64] Hinze R. Das Ostfront-Drama 1944. – S. 184.

[65] Tadeusz Sawicki. Niemieckie wojska lądowe na froncie wschodnim. – Warszawa, 1987. – S. 174-175.

[66] Табліца складзена па матэрыялах артыкула: Operation Bagration: Soviet Offensive of 1944. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : www.historynet.com/operation-bagration-soviet-offensive-of-1944.htm/. – Дата доступу: 02.05.2010.

[67] Россия и СССР в войнах XX века: Статистическое исследование. – М., 2001. – С.296.

[68] Дроговоз И.Г. Танковый меч страны Советов. – М., Мн., 2001. – С.30.

Раздзел 2.

Баі на падыходах да горада Гродна.

а) Сілы і планы бакоў. Выхад савецкіх войскаў да мястэчка Скідзель

[69] Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941 – 1945: Энцыкл./Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелСЭ, 1990. – С. 83

[70] Елисеев Е.П. На белостокском направлении. – С. 37. 4-я паветраная армія складалася з:

1. 229-й зад (на 1.07 – 91 знішчальнік) – палк. М.М.Волкаў
2. 309-й зад (на 1.07 – мела 110 знішчальнікаў) – палк. В.М.Вус
3. 230-й шад (на 1.07 – 106 штурмавікоў) – г.м. С.Г. Гецьман
4. 233-й шад (на 1.07 – 90 штурмавікоў) – палк. У.І.Смалавік
5. 325-й нбад (на 1.07 – 121 бамбардзіроўшчык)
6. 164-га асобнага Гвардзейскага разведвальнага авіяцыйнага палка
7. 209-га асобнага карэкціровачна-разведвальнага авіяцыйнана палка
8. 184-га асобнага авіяцыйнана палка сувязі
9. 1550-га зенітна-артылерыйскага палка.

[71] *Генерал-маёр П.М.Котаў-Леганькоў* да мая 1944 г. быў начальнікам штаба Прыморскай арміі. Прызначаны на пасаду кіраўніка аперыўнага ўпраўлення штаба 2-га БФ. У 1950 г. з'яўляўся начальнікам штаба Народна-Вызвольнай арміі Кітая і ваенным аташэ ў гэтай краіне. Быў вайсковым саветнікам пры кантынгенце Кітайскіх народных добраахвотнікаў у Карэі падчас грамадзянскай вайны ў гэтай краіне. Па матэрыялах артыкулаў: Приморская армия (Отдельная Приморская армия).// Великая Отечественная война 1941 – 1945. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://victory.mil.ru/rkka/units/03/79.html. – Дата доступу : 22.10.2010. і Первые боевые действия советских войск за рубежом после ВМВ. // Альманах Войны, история, факты. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://almanacwhf.ru/?no=5&art=7. – Дата доступу : 22.10.2010.

[72] Елисеев Е.П. На белостокском направлении. – С. 29-30.

[73] Елисеев Е.П. На белостокском направлении. – С.63

[74] Там жа. – С.64

[75] *Болдзін Іван Васільевіч* - нарадзіўся 15 жніўня 1892 года ў сялянскай сям'і, у в. Высокае, Інсарскага павета, Пензенскай губерні. У войску з 1914 года. У 1917 годзе - старшы унтэр-афіцэр. У дні Лютаўскай рэвалюцыі яго абіраюць членам палкавога камітэта. Пасля кастрычніка 1917 года накіроўваецца на радзіму, у Пензенскую губерню, для арганізацыі работы па ўстанаўленні Савецкай улады. Быў абраны старшынёй Інсарскага павятовага выканкама, а праз некаторы час ён становіцца намеснікам старшыні Пензенскай губвыканкама. У 1919 годзе І.В.Болдзін быў дэлегатам V Усерасійскага з'езда Саветаў. Пензенскі губкам партыі накіраваў І.В.Болдзіна ў РККА. У кастрычніку 1919 года ён ваяваў супраць войскаў Юдзеніча, вёў баі з польскімі войскамі, камандаваў ротай, батальёнам, а з ліпеня 1920 года становіцца камандзірам 52-га стралковага палка 6-й стралковай дывізіі. У 1924 годзе І.В.Болдзін камандаваў 252-м стралковым палком, абіраўся дэпутатам гарадскога Савета горада Тула. У передваенныя гады І.В.Болдзін паступае ў Вышэйшую стралковую школу, потым у Ваенную акадэмію ім. М.В.Фрунзе. У 1938 годзе быў прызначаны на пасаду камандзіра 17-га стралковага корпуса. У жніўні 1938 года быў камандуючы войскамі Калінінскай акругі. У 1939 Болдзін камандаваў конна-механізаванай групай у час паходу савецкіх войскаў у Заходнюю Беларусь. З кастрычніка 1939 г. камандуючы войскамі Адэскай Вайсковай Акругі, з ліпеня 1940 года - намеснік, а са студзеня 1941 - 1-й нам. камандуючага войскамі Заходняй Асабовай Ваеннай Акругі. У канцы чэрвеня 1941 узначаліў камандаванне войскамі, адрэзанымі ў раёне гарадоў Беласток – Гродна ад асноўных сіл фронту, і, ведучы звыш месяца цяжкія баі ў тыле ворага, вывеў іх з акружэння. З кастрычніка 1941 г. камандуючы 19-й арміяй. 21 лістапада 1941 года быў прызначаны камандуючым войскамі 50-й арміі, якая абараняла Тулу. Камандаваў арміяй да лютага 1945 года. 15 ліпеня 1944 - прысвоена званне генерал-палкоўнік. З красавіка 1945 І.В.Болдзін намеснік камандуючага 3-ім Украінскім фронтам. Пасля вайны Болдзін камандаваў войскамі Усходне-Сібірскай

вайсковай акругі, быў намеснікам камандуючага Кіеўскай вайсковай акругі. З 1958 года ў Групе генеральных інспектараў Міністэрства Абароны СССР. Памёр І.В.Болдзін 28 сакавіка 1965 г, пахаваны ў Кіеве. Па матэрыялах сайта: Хронос. Всемирная история в интернете. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.hrono.ru/biograf/bio_b/boldin_iv.html. – Дата доступу : 21.08.2010.

[76] Журнал баявых дзеянняў 50-й арміі Ф. 50 арміі, воп. 9769, с. 323, л. 16.

[77] Никифоров Н. Штурмовые бригады Красной армии в бою. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://lib.rus.ec/b/171237/read#t9. – Дата доступу : 01.02.2011.

[78] Мощанский И. Инженерно-штурмовые части РВГК. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://army.lv/ru/inzhenerno-shturmovie-chasti-rvgk/3011/4736. – Дата доступу : 02.01.2011.

[79] Па матэрыялах форума: Форум сайта REIBERT.info. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://reibert.info/forum/showthread.php?p=1177157. – Дата доступу : 02.01.2011.

[80] Никифоров Н. Штурмовые бригады Красной армии в бою. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://lib.rus.ec/b/171237/read#t9. – Дата доступу : 01.02.2011.

[81] Цікава адзначыць, што генерал А.А.Цюрын быў асуджаны ў кастрычніку 1941г. на 7 гадоў выпраўляльна-працоўных лагераў за здачу немцам горада Арол. Будучы камандуючым Арлоўскай вайсковай акругай ён не змог арганізаваць для абароны наяўныя ў горадзе сілы. Пакінуў у горадзе больш за 500 параненых байцоў, маёмасць і прадукты харчавання на 10 млн. рублёў. Сам генерал пры гэтым вырваўся з горада. У студзені 1942 г. генерала А.А.Цюрына вызвалілі са зняволення і вярнулі на вайсковую службу. Гл. Звягинцев В.Е. Война на весах Фемиды. – М., 2006. – С. 188-191.

[82] Журнал баявых дзеянняў 50-й арміі Ф. 50 арміі, воп. 9769, с. 323, л. 17.

[83] Там же. – л. 17.

[84] История боевых действий ордена Ленина Краснознамённого 3-го Гвардейского Гродненского кавалерийского корпуса в период Великой Отечественной войны 1941-1945 годов. Рукопись.– С.79.

[85] Па матэрыялах сайта "Танковый фронт. 1941-1945". [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://tankfront.ru/ussr/gvkk/gvkk03.html. – Дата доступу : 01.05.2010.

[86] Горелк Г. и Е. Лэхаим! Или Хаим на коне. (Диалог воспоминаний отца и размышлений сына). – ИнтерСамИздат, 2009. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://ggorelik.narod.ru /LeHaim_W/LeHaim_W4.htm. – Дата доступу : 10.10.2010.

[87] Jakuszyn Iwan. Czerwony kawalerzysta. – Warzsawa, 2007. – S.67-68.

[88] Па матэрыялах сайта: Великая война. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.velikvoy.narod.ru.. – Дата доступу : 10.08.2010.

[89] Елисеев Е.П. На белостокском направлении. М. 1971. – С.123.

[90] Водзинский Д.И. Испытание мужеством. Т. 2. – С.46

[91] Tadeusz Sawicki. Niemieckie wojska lądowe na froncie wschodnim. – Warszawa, 1987. – S. 174-175.

[92] *Гельмут Вейдлінг* – нарадзіўся ў 1891 годзе, у горадзе Хальберштат, Саксонія. У арміі з 1911 года. У 1939 годзе – палкоўнік, камандзір 56-га артылерыйскага палка. З лютага 1942 года камандаваў 86-й пяхотнай дывізіяй. Генерал-маёр. Са студзеня 1943 года – генерал-лейтэнант, з кастрычніка – камандзір XXXXI-га танкавага корпуса. Са студзеня 1944 года – генерал ад артылерыі. З 19 чэрвеня генерал знаходзіўся ў адпачынку. Па вяртанні на фронт (3 ліпеня 1944г.) ён атрымаў загад на фарміраванне заграджальнай групы на захад ад Налібоцкай пушчы. Група павінна была забяспечыць тылы армій ад дзейнасці патрызан. Штаб павінен быў быць укамплектаваны з афіцэраў XXXXI-га танкавага корпуса і спецыяльна прысланых афіцэраў. Аднак высветлілася, што штаб танкавага корпуса не быў знішчаны. Таму штаб групы Вейдлінга быў аб'яднаны са штабам 6-га армейскага корпуса, які страціў свайго камандзіра. З гэтага часу (з 10 ліпеня) група была перайменавана ў "карпусную групу Вейдлінга". Пазней генерал зноў уступіў у камандаванне XXXXI-ым танкавым корпусам. У 1945 годзе быў камандзірам LVI-га тк. У красавіку 1945 года самовольна перадыслакаваў штаб корпуса, за што быў тэрмінова прыгавораны да смяротнага пакарання. Генерал быў выкліканы асабіста А.

Гітлерам і пераканаў яго ў мэтазгоднасці сваіх дзеянняў, пасля чаго 24.04.1945 года быў прызначаны камандуючым абаронай Берліна. Спрабаваў арганізаваць абарону горада. 02.05.1945 года Г.Вейдлінг подпісаў капітуляцыю нямецкіх войск у сталіцы і здаўся з рэшткамі гарнізона савецкім войскам. Утрымліваўся ў Бутырскай і Лефортаўскай турмах (Масква), а затым ва Уладзімірскай турме. 27.02.1952 года вайсковым трыбуналам войск МУС Маскоўскай акругі прыгавораны да 25 год заключэння ў лагерах. Па афіцыйнай версіі памёр у турме ад сардэчнага захворвання. Па матэрыялах сайтаў: ХРОНОС. ВСЕМИРНАЯ ИСТОРИЯ В ИНТЕРНЕТЕ. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.hrono.ru., а таксама Die Ritterkreuzträger der Wehrmacht und der Waffen-SS. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.ritterkreuztraeger-1939-45.de. Гл. таксама: Robert Wróblewski. Panzer Aufklärungs Abteilung 12.//Militaria XX wieku. - № 35. – 2010. – S. 73.

93 *Герман Флёрке* – нарадзіўся 23 кастрычніка 1893 года ў Гановеры. У Першую сусветную вайну - лейтэнант 74-га пяхотнага палка. Пасля заканчэння вайны - у рэйхсверы (да 1934 года), у 12-м пяхотным палку. У 1935 годзе - маёр, інспектар вайсковых школ. З сакавіка 1939 года - камандзір 1-га батальёна 53-га пяхотнага палка 14-й пд. Камандзір 53-га пп. У маі 1943 года быў прызначаны камандзірам 14-й пд. У 1945 годзе камандзір LXVI-га армейскага корпуса на Заходнім фронце. Трапіў у палон да амерыканцаў. Пасля вайны быў у саюзе нямецкіх салдат. Памёр у 1979 годзе. Паводле інфармацыі сайта: Die Ritterkreuzträger der Wehrmacht und der Waffen-SS. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.ritterkreuztraeger-1939-45.de.

94 За час баёў у адступленні 14-я дывізія (яна ж група «Флёрке») усё ж панесла вельмі вялікія страты. Нельга сказаць дакладна, якія з яе падраздзяленняў уцалелі і якая была іх колькасць. Аднак вядома, што ўжо ў пачатку ліпеня ў склад дывізіі пачалі перакідваць з тэрыторыі Германіі запасныя часці. У нямецкай тэрміналогіі яны называюцца «палкі-Валькірыі». Гэта назва ўжывалася па аналогіі са скандынаўскай міфалогіяй. Лічылася, што гэтыя палкі, нібыта адроджаныя з нябыту павінны былі аднаўляць нямецкія падраздзяленні. У склад 14-й дывізіі ўвайшлі 1065-й, 1068-й і 1069-й палкі-Валькірыі. Такім чынам, на момант апісваных баёў дывізія складалася ў асноўным з гэтых палкоў. 17 ліпеня 1069-й полк быў ператвораны ў 11-й грэнадзёрскі полк, а 101-ы полк адраджаўся падобным чынам. На 20 ліпеня 14-я дывізія складалася са:

> штаба дывізіі;

> штабной роты 53-га пп;

> 1-га батальёна 101-га гп;

> 1-га батальёна 11-га гп;

> 1-й роты 14-га фузілернага батальёна;

